# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

***Дапаможнік для студэнтаў***
***філалагічных спецыяльнасцей***

УДК 808.26(075.8)
ББК 81.411.3-923
Б43

Аўтары: дацэнты кафедры беларускага мовазнаўства УА “ВДУ імя П.М. Машэрава” **Л.І. Злобін, І.В. Бондал, Я.Н. Марозава, В.Э. Зіманскі,** старшы выкладчык кафедры беларускага мовазнаўства УА “ВДУ імя П.М. Машэрава” **Н.П. Даўбешка**

Р э ц э н з е н т:
дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”
кандыдат філалагічных навук *Г.А. Арцямёнак*

Дапаможнік прызначаны для студэнтаў-практыкантаў філалагічных спецыяльнасцей і ўключае ў сябе практыкаванні і заданні да асноўных тэм школьнага курса беларускай мовы, асобныя правілы, табліцы, схемы, алгарытмы. Студэнты IV і V курсаў у час педагагічнай практыкі змогуць выкарыстоўваць матэрыялы дапаможніка пры падрыхтоўцы планаў-канспектаў урокаў, правядзенні факультатыўных заняткаў па прадмеце, самастойных і кантрольных прац, урокаў па развіцці мовы.

Дапаможнік можа быць выкарыстаны таксама школьнікамі, настаўнікамі, студэнтамі пры вывучэнні беларускай мовы.

**УДК 808.26(075.8)**
**ББК 81.411.3–923**

© Злобін Л.І. [і інш.], 2008
© УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2008

# У В О Д З І Н Ы

Дапаможнік “Беларуская мова” прызначаны ў першую чаргу для студэнтаў IV–V курсаў філалагічных спецыяльнасцей і мае на мэце аказанне ім метадычнай дапамогі пры падрыхтоўцы да ўрокаў беларускай мовы ў час педагагічнай практыкі ў сярэдніх і старэйшых класах агульнаадукацыйнай школы. Матэрыял дапаможніка накіраваны на паглыбленне і абагульненне ведаў выпускнікоў школ па ўсіх раздзелах курса беларускай мовы і падрыхтоўку іх да цэнтралізаванага тэсціравання.

Дапаможнік можа быць таксама скарыстаны настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры.

Змест дапаможніка арыентаваны на рэалізацыю такіх задач навучання, як замацаванне і паглыбленне ведаў і ўменняў вучняў па розных раздзелах курса беларускай мовы, удасканаленне арфаграфічнай і пунктуацыйнай пісьменнасці, развіццё інтэлектуальных і творчых здольнасцей. Лінгвістычны матэрыял падаецца лінейна, у адпаведнасці з парадкам вывучэння яго ў школьным курсе мовы. Дапаможнік уключае ў сябе тэарэтычны матэрыял і выключэнні з правілаў па асобных, найбольш складаных ці супярэчліва асветленых у розных крыніцах тэмах школьнага курса беларускай мовы, практычныя заданні, табліцы, схемы і алгарытмы да большасці тэм, якія выносяцца на цэнтралізаванае тэсціраванне. Прапанаваныя табліцы, схемы і алгарытмы прадугледжваюць развіццё зрокавай памяці, павінны садзейнічаць трываламу засваенню тэарэтычнага матэрыялу. Фармулёўкі правіл і падбор практычнага матэрыялу маюць на мэце папярэдзіць магчымыя тыповыя памылкі школьнікаў і абітурыентаў. Практыкаванні для замацавання правіл і тэставыя заданні накіраваны на развіццё лагічнага мыслення, кемлівасці, узбагачэнне слоўнікавага запасу, фарміраванне навыкаў культуры мовы.

У адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі ўзмоцнена маўленчая накіраванасць курса беларускай мовы.

Адзін з асноўных напрамкаў у працы настаўніка – фарміраванне асобы вучня, выхаванне яго сапраўдным грамадзянінам, адукаваным суразмоўнікам. Гэтаму садзейнічае сістэма заданняў і практыкаванняў у дапаможніку, у першую чаргу — звязныя тэксты, якія маюць вялікі эстэтычны і выхаваўчы патэнцыял, адпавядаюць асноўным педагагічным патрабаванням: інфармацыйна насычаныя, стылёва разгалінаваныя, лексічна і сінтаксічна разнастайныя. Многія з іх носяць культуразнаўчы характар, адлюстроўваюць моўную спадчыну, гісторыю, традыцыі і навацыі беларускага народа.

Дапаможнік “Беларуская мова” з’яўляецца арганічным дапаўненнем да існуючых падручнікаў беларускай мовы і дапаможа студэнту разнастаіць і ўзбагаціць навучальны працэс у школе.

# ФАНЕТЫКА. АРФАЭПІЯ. ГРАФІКА. АРФАГРАФІЯ

**1.** *Вызначце “чацвёртае лішняе”. Абгрунтуйце свой выбар.*

а) слова, гук, націск, склад;
б) склад, слова, гук, літара.

**2.** *Назавіце ў прыведзеным сказе галосныя гукі і санорныя. Чым санорныя адрозніваюцца ад звонкіх зычных?*

Сапраўдны друг прыходзіць і тады,
Калі ад грому трэскаецца неба,
Калі няма каму падаць вады
Ці падзяліцца чэрствай лустай хлеба. *(С. Грахоўскі)*

**3.** *У прапанаваных словах ахарактарызуйце зычныя гукі паводле глухасці-звонкасці. Выдзеліце санорныя зычныя.*

Дружына, талака, калектыў, гурт, войска, аб’яднанне, саюз, сябрына, натоўп, крыху, мізэрны, брыль, цыліндр.

**4.** *Выпішыце словы, у якіх <u>толькі</u> <u>адзін</u> мяккі зычны гук.*

Злева, святло, схіл, скеміць, сям’я, дзверы, раён, вераб’іны, радасць.

**5.** *Выпішыце з тэксту словы, у якіх сустракаюцца гукі, няпарныя па цвёрдасці-мяккасці.*

Чалавек ідзе туды, куды кладзецца дарога. Мала праходзіць за сваё кароткае жыццё чалавек, які б ён ні быў хутканогі. Ён падобны да мухі, што садзіцца на гарачы ад сонца полаг шатра, поўзае па ім, і, пэўна, уяўляецца ёй гэты полаг бясконцым сусветам. І не разумее муха, што, апроч полага, ёсць бязмежны стэп, а за стэпам — снежнагаловыя страшныя горы, а за імі — акіян. *(Паводле Л. Дайнекі)*

**6.** *Вызначце гукавы і літарны склад слоў. Якімі гукамі яны падобныя і адрозніваюцца?*

Мел, мол, мель, моль; мэта, мета, мецць; палёт, пілот, палоць.

**7.** *Вызначце, колькі гукаў і літар у слове* ***двое****. Падлічыце, колькі разоў кожны з гукаў сустракаецца ў прыведзеным выказванні Н. Мацяш.*

Хто бездапаможны ў роднай мове – той невук, хоць ведае дзвесце моў.

**Гукапіс —** гэта такія гукавыя паўторы (найчасцей — у вершаванай мове), якія ўзмацняюць мілагучнасць і сэнсавую выразнасць тэксту. У залежнасці ад характару гукаў, якія паўтараюцца, адрозніваюць два асноўныя тыпы гукавых паўтораў. **Алітэрацыя** – прадвызначанае пэўнымі мастацкімі задачамі паўтарэнне аднолькавых або падобных зычных гукаў; **асананс —** паўтарэнне аднолькавых або падобных галосных гукаў.

**8.** *Прачытайце ўрывак з тэксту. Вызначце, як суадносяцца асаблівасці яго гукавой арганізацыі са зместам.*

Зімовы дзень звініць, як звон,
Завейнай сцюжай загайданы.
Схаваў палеткі і лясы
Марозна-летаргічны сон.
*(А. Грачанікаў)*

**9.** *Параўнайце словы беларускай мовы і іх адпаведнікі ў рускай мове. Якія вы можаце назваць фанетычныя асаблівасці беларускай мовы?*

Колосья – калоссе, ночью – ноччу, желтый – жоўты, правда – праўда, осень – восень, мгла – імгла, дети – дзеці, дядя – дзядзька, тихий – ціхі, город – горад, сигнал – сігнал, рябина – рабіна, чистый – чысты, восемь – восем, воробьи – вераб'і, сижу – сяджу, рождение – нараджэнне.

**10.** *Прачытайце верш. Выпішыце словы, у якіх адлюстраваны асаблівасці беларускай фанетыкі.*

Пакуль яшчэ ў сівых дзядоў
У вуснах тояцца паданні;
Пакуль сланечнік будзіць зноў
Мяне ў вераснёўскім ранні;
Пакуль мы помніць будзем тых,
Хто ў святых баях забіты;

Пакуль вясновыя сады
Выводзяць птушак на арбіты;
Пакуль яшчэ ідуць у бой
З маной і раўнадушшам смела,—
То не загінуць мове той,
Што з вуснаў мацярок зляцела.
*(Н. Гальпяровіч)*

**11.** *Які гук вымаўляецца на месцы выдзеленых літар у прапанаваных прыказках і прымаўках? Патлумачце значэнне прыказак і прымавак.*

1. Ад дабра дабра н***е*** шукаюць. 2. Была калісь праўда, дык ***і***ржа з'***е***ла. 3. У чужым воку бачым сучок, а ў сва***і***м н***е*** заўважаем і бервяна. 4. Сам н***е*** гам ***і*** другому н***е*** дам. 5. Голы разбою н***е*** ба***і***цца. 6. Куды ***і***голачка, туды ***і***

нітачка. 7. Блізка локаць, ды н*е* ўкусіш. 8. Б*е*з меры няма веры.

**12.** *Прачытайце тэкст услых і вызначце, якія гукі перадаюцца выдзеленымі літарамі.*

Ах ты, дарожачка дахаты! Нема***г***чыма апісаць усю бездань пачуццяў, што раптам ахопліваюць тваё сэрца. І няхай там нікога ***з*** блі***з***кіх не засталося, і хаты даўно няма, і груша сало***д***кая ***с***пілавана, а на пляцы ***ц***віце чужая бульба, няхай а***д***туль ра***з***ляцеліся твае сябры-аднаго***д***кі, павыходзілі заму***ж*** дзяўчаты, няхай ты сюды не наведваўся "тысячу гадоў", пра ўсё гэта н***е*** хочацца ***і*** думаць, і ты н***е*** думаеш, бо ***ш***чымліва ные рада***с***цю сэрца ***з*** кожным новым кіламетрам. Адно просіцца: ху***тч***эй, хутчэй. *(Паводле Г. Марчука)*

**13.** *Са сказаў выпішыце словы, у якіх вымаўленне не адпавядае напісанню. Растлумачце прычыны неадпаведнасці.*

1. Не вырвеш з нас жывую нашу душу, бы з дзяснаў слабых набалелы зуб, бо мы народ вялікі, непарушны, народ, што да зямлі прырос, як дуб. *(Каратк.)* 2. Калі слязы не знала вока, цаны не ведаеш слязам. *(Бр.)* 3. Пустазелле губіць поле, а няслава – усё людское. *(Ак.)* 4. У лёгкай, як ветрык, спаднічцы, кароткай і вузенькай, дзяўчына як быццам плыве над травой лугавой. *(Бур.)* 5. Калі плуг перастане купацца ў раллі, з'есць яго іржа да астачы. *(П. М.)* 6. Хоць навокал хамства расцвіло, не збірайце для душы атруту і нікому не рабіце зло нават і ў адчайную мінуту. *(Бур.)* 7. О, боязь за другога чалавека!.. Адна ты робіш чалавека з нас. *(Н. М.)* 8. Месяц з неба, бы спуджаны лебедзь, вось нырнуў і пагас за далёкім прыціхлым сялом. *(Віт.)*

● *Пастаўце націск у падкрэсленых словах.*

**14.** *Змяніце словы ці падбярыце роднасныя такім чынам, каб гукі **[г], [к], [х]** чаргаваліся з **[ж], [ч], [ш]**.*

Узор: воў***к*** – ваў***ч***анё, вер***х*** — вяр***ш***ыня.

Гарох, страх, луг, рука, мурог, дарога, дрогнуць, мокнуць, суха, крык, Бог, бераг, мех, дапамагаць, мяккі, лёгкі, смех, крок, грэх, павук, бок, сяку, ілгаць, імгла.

**15.** *Праскланяйце назоўнікі. Звярніце ўвагу, у якіх склонах адбываецца чаргаванне зычных **[к] : [ц]** у аснове. Запішыце гэтыя склонавыя формы.*

Вёска, дачка, навука, дзяўчынка, рэчка, думка, лаўка.

**16.** *Запішыце словы згодна з арфаграфічнымі правіламі.*

[м’асцовас'ц'], [гал'эрэја], [раз'б'ар], [фудбол], [мачын], [рашыфравац'], [абјэжджаны], [ац'існуц'], [с'ац'э], [п'іјан'іна], [вашк'і], [прајэст], [б'аз'л'удз'э], [л'эдз'в'э], [л'уцк'і], [рыхтујэс'а], [л'эс'в'іца], [рашчыс'ц'іц'], [агл'эц'], [ваgзал].

**17.** *Запішыце словы ў фанетычнай транскрыпцыі.*

Адценне, барацьба, дзьмухавец, падказка, разводдзе, змяіны, абыякавасць, прадчуванне, заінець, развітанне, віцебскі, варотцы, нясвіжскі.

**18.** *Выпішыце словы, у якіх адбываецца падаўжэнне зычных. Словы з марфалагічным падваеннем не выпісвайце.*

Паўгод..зе, дзевяц..ю, камен..е, тэр..ыторыя, Ган..а, ал..ея, суф..ікс, мадон..а, Ул..яна, тэн..іс, кал..іграфія, бал..ада, Палес..е, ат..эстат, ас..іміляцыя, ад..ацца, камен..ы, навод..аль, рун..ю, аповесц..ю, сувяз..ю, раз..лавац..а, ноч..у.

**19.** *Знайдзіце памылкі ў адказах. Растлумачце іх.*

1. Калі я пішу, у мяне гук “бэ” атрымліваецца непрыгожым.
2. *Сад – сядзь.* У гэтым выпадку [а] не змякчае зычны, а [я] змякчае.
3. У слове *з’яднанне* 8 літар, 9 гукаў.

**20.** *Аднолькава ці па-рознаму вымаўляюцца словы і іх формы? Свае назіранні адлюструйце ў транскрыпцыі, запісаўшы словы парамі.*

а) словы са значэннем ’галаўны ўбор, звычайна металічны, у выглядзе шлема (у ваенных, пажарнікаў і інш)’ і ’апавядальны твор вуснай народнай творчасці або літаратурны твор пра выдуманыя падзеі, нярэдка з удзелам чарадзейнай, фантастычнай сілы’;

б) памяншальна-ласкальнае да *нага* і памяншальна-ласкальнае да *ноша*;

г) форма 1-й асобы адзіночнага ліку дзеяслова *вазіць* і форма 1-й асобы адзіночнага ліку дзеяслова *вадзіць*;

д) форма ж. р. пр. часу дзеяслова *весці* і форма ж. р. пр. часу дзеяслова *віць.*

**21**. *Запішыце словы па-беларуску і расстаўце ў іх націскі.*

Аре́ст, зерно́, киломе́тр, кулина́рия, ва́ленок, борода́вка, до́чка, магази́н, решето́, ржа́веть, комба́йнер, зна́харь, докуме́нт, посла́нец, осо́ка, реме́нь, ве́рба, спина́, щаве́ль, цеме́нт, о́кунь, по-ста́рому, никуда́, заводско́й, подо́шва.

**22**. *У прыведзеных словах пастаўце асноўны націск, а таксама пабочны, калі ён ёсць. Устаўце прапушчаныя літары. Паназірайце, якім чынам націск у словах звязаны з іх правапісам.*

С..ляне, с..лянін, ап..кун, л..снік, л..снічоўка, п..сняр, п..сняры, ап..рацыя, в..ранда, с..кунда, ч..рствы, ч..рсцвець, ц..на, ац..ніць, пам..няць, вым..няць, ш..рсцяны, кр..вавы, гл..таць, ж..ўтароты, т..ўстаскуры, в..даварот, выс..кагорны, мн..гагалоссе, Н..вагрудак, в..льнадумец, вогн..ахоўны, агн..стрэльны, камен..бітны, знешн..палітычны, ліўн..адвод, сярэдн..рускі.

**23.** *Прачытайце тэкст. Паразважайце, чаму выкарыстоўваем мы запазычаныя словы. Запішыце выдзеленыя словы ў алфавітным парадку.*

Пастаянныя зносіны татараў з беларусамі пакінулі адметны след у беларускай мове. На думку акадэміка Я. Карскага, у ёй налічваецца каля 50 слоў цюркскага (татарскага) паходжання, якія ўспрымаюцца сучаснымі беларусамі як звыклыя і не патрабуюць спецыяльнага тлумачэння, напрыклад: *баран, шапка, курган, базар, кавун, база, сарафан, халва, бакалея, баламут, біклага, гойдацца, бусел, дуда, гарбуз, харч, дыван, кайданы, кабан, калач, багатыр, каўпак, каракуль, кафтан, андарак, кінжал, сабака, тавар, таракан, бачыць, торба, тытунь, туман, буран, халат, чай, хамут, шалаш, балавацца* і інш. У мастацкай, гістарычнай, навукова-папулярнай літаратуры знаходзім шэраг цюркізмаў (*казна, армяк, хан, есаул, аршын* і інш.), якія выйшлі з актыўнага складу лексікі і зрэдку ўжываюцца ў сучаснай мове, але выкарыстоўваюцца ў творах на гістарычную тэматыку для ўзнаўлення абставін пэўнай эпохі, мовы герояў або з мэтай стылістычнай афарбоўкі. *(Паводле І. Канапацкага)*

**24.** *Запішыце тэкст па-беларуску. Назавіце асаблівасці беларускага алфавіта ў параўнанні з рускім.*

Текст речи практически исчезает в момент его создания, поэтому и воспринимать его можно только в этот момент. В отличие от этого текст письма, нанесенный на какой-либо материал, может сохраниться во времени и может быть перемещен в пространстве. В этом огромное преимущество письма перед языком, имеющим в другом отношении, как средство живого непосредственного общения, большие преимущества

перед письмом. Поэтому язык и письмо не вытесняют, а дополняют друг друга. *(По А. Моисееву)*

**25.** *Вызначце суадносіны паміж літарамі і гукамі ў словах. Выпішыце спачатку словы, у якіх колькасць гукаў і літар супадае, затым — словы, у якіх літар больш, чым гукаў, і, нарэшце, словы, у якіх гукаў больш, чым літар.*

Вольнасць, шчыры, яркі, эцюд, звычай, ельнік, інтуіцыя, дыялог, пісьмовы, баявы, дзяўчына, дажджы, дзьмухавец, паядынак, здароўе, сузор'е, дробязь, з'ехаць, прыгаршчы, шэсць, жвавы, адукацыя, надзея.

**26.** *Падзяліце словы на дзве групы: у першую ўключыце словы, у якіх спалучэннем літар* ***дз, дж*** *абазначаецца адзін гук, у другую — словы, у якіх гэтымі літарамі абазначаюцца два гукі.*

Мундзір, дзіўны, падземны, падзяка, надзвычайны, адзнака, адзінокі, падзорны, адзывацца, ураджай, аджыць, прыгладжаны, джынсы, паджаць, пакрыўджаны, агледжу, паджылкі, джунглі, паседжанне, джаз.

**27.** *Вызначце "чацвёртае лішняе". Абгрунтуйце свой выбар.*

а) дзынкнуць, пэндзаль, надзвычай, дзякуй;
б) дзень, абедзве, ледзьве, адзвінець

**28.** *У якіх словах мяккі знак указвае на мяккасць папярэдняга зычнага, а ў якіх — раздзяляе зычныя і галосныя?*

Роўнядзь, пакіньце, медальён, кудысьці, шампіньён, цырульня, смяльчак, павільён, Ільіч, вішанька, мальберт, кампаньён, няньчыць, раменьчык, пісьменнасць, ласьён, канферансье, затуманьваць, Ульяна.

## Прынцыпы беларускай арфаграфіі

**29.** *Прачытайце тэкст. Выпішыце словы, напісанне якіх заснавана на фанетычным прынцыпе арфаграфіі.*

Полацкае княства мела вялікую патрэбу ў адукаваных людзях. Школы існавалі тут і да Ефрасінні, але заснаванне асветніцаю манастыроў, яе чынная педагагічная дзейнасць далі школьнай справе новы магутны штуршок.

Дзеці ў тагачасных школах вучыліся чытанню, пісьму, лічбам і царкоўным спевам. У літаратурных помніках той эпохі часта можна сустрэць пахвалу кніжнаму вучэнню. Яны прыпадабняюць людзей без

навукі да бяскрылых птушак: як тая птушка не можа падняцца ў неба, так і чалавек не дасягае без кніг дасканаласці розуму.

Грамаце вучылі па царкоўных кнігах — “Псалтыры”, “Часаслове”, “Апостале”.

Прыкладна так пачынала спасцігаць грамату дзятва і ў школах, адчыненых рупнасцю Ефрасінні. Аднак высокаадукаваная ігумення імкнулася пашырыць веды звычайнай навучальнай праграмы: апрача царкоўнаславянскай, юныя палачане вучылі грэцкую і лацінскую мовы, атрымлівалі звесткі па прыродазнаўстве, рыторыцы, медыцыне. Вялікая ўвага надавалася гісторыі: вучні павінны былі добра ведаць радавод дынастыі Рагвалодавічаў, важныя падзеі з мінуўшчыны Полацкай зямлі і ўсяго ўсходняга славянства. Напэўна, школа давала веды і па сусветнай гісторыі. *(Паводле У. Арлова)*

**30.** *Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Вызначце, на якім прынцыпе арфаграфіі заснаваны гэтыя напісанні.*

Ад горада да горада, ад с..ла да с..ла ўю..ца, б..гуць дарогі. Б..гуць праз палі і л..сы, лугі і балоты. То цяжка, стомле*(н)*на ўзлаз..ць на пагоркі, нібы прагнуць пагл..дзець, што ж там, далей, то весела ..падáюць *(у)* ніз, у ла..чыны, нібы хоч..ць ад некага ..хавацца. Бітыя, а..саджа*(н)*ныя в..кавымі бярозамі, *(я,е)*сакарамі, і ле*(дз,ц)*ь прыкметныя ў траве с*(ь)*цяжынкі; дарогі крывыя, з грэблямі на к..жн*(а,ы)*м кіламетры і вузенькімі др...ўля*(н)*нымі масткамі; дарогі роўныя, як струна, на ўвесь а..сяг лю*(дс,ц)*кога вока; дарогі кружныя і дарогі прамыя. Хто пратаптаў вас, дарогі, і колькі людзей вас перамер*(ы,а)*ла сваімі нагамі *(ў)* здоўж і *(ў)* поперак, зімою і летам, гра..кай вясною і ў даж*(ж, дж)*лівую восень?

Прыходзілі на з..млю людзі, а*(д,т)*тупвалі на дарогах наканава*(н)*ныя лёсам кіламетры і гады і зноў ішлі ў з..млю, а дарогі в..ліся і в..ліся гэтак *(жа)*, як ую..ца яны і цяпер, як будуць віцца і пасля, як мы ады*(й)*дзем і на з*(ь)*мену нам пры*(й)*дуць іншыя... *(Паводле Б. Сачанкі)*

## <u>Правапіс</u> <u>галосных</u> <u>*О, Э – А*</u>; <u>*Е, Ё – Я*</u>

**31.** *Падбярыце аднакаранёвыя словы так, каб літары* ***О, Э*** *сталі не пад націскам. Растлумачце напісанне гэтых слоў.*

Шэпт, рэмень, крэсліць, прэсны, трэск, цэгла, шэсць, прэс, сэрца, крошка, пошта, дрот, шчодры, пост, рэўнасць, бровы, жоўты, шэры, шэрсць, спрэчка, запрэгчы, шчэбет, жэрдка, стрэльба, дровы.

**32.** *Запішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары. Сфармулюйце правіла, якому адпавядае напісанне выдзеленых слоў.*

Ц..на, **бр..зент**, хр..стаматыя, д..сант, ч..мадан, тры.., адр..с, майст..р, бухгалт..р, лод..р, лід..р, р..дкалессе, ж..тон, ч..мпіён, пр..зідэнт, р..ферэндум, ас..нсаваць, мар..ва, ябл..чны, д..легат, Ч..баксары, Ч..рнігаў, Ч..лябінск, хр..шчэнне, **д..рыжор**, **д..настыя**, ад..кватны, др..вотня, гр..моты, **ц..р..монія**, д..мантаж, **інж..нер**, р..дыска, **канц..лярыя**.

**33.** *Устаўце прапушчаныя літары і запішыце словы.*

Кал..ндар, ц..мнаваты, п..ц..рня, ..нот, л..г..нда, б..склапотны, н..дабраякасны, аб..ззброіць, п..рон, л..мантаваць, м..тро, ц..гавіты, с..зон, се..ць, с..мнаццаць, пам..ць, дзес..ць, ап..тыт, біл..цёр, ..рлычок, п..нал, кал..жанка, вын..ньчыць, ал..горыя, м..тодыка, Прып..ць, Ал..ксандр, ..ўропа, бал..рына, ц..гнікі, Н..ва, Н..красаў, Напал..он, св..ткаваць, з..л..наваты, Вал..р'ян, Б..тховен, ве..лка, высв..тліць, з..ніт, с..ржант, м..даль, п..дагог, с..лянін, с..ляне, н..добра, п..цім..тровы.

**34.** *Спішыце, устаўце прапушчаныя літары. Праверце напісанне па арфаграфічным слоўніку.*

Гл..таць, кр..вавы, ч..рапаха, абл..дз..нець, ч..рга, др..зіна, пл..яда, с..стра, дзес..ць, дз..сяты, в..ражба, л..б..дзіны, торф..брыкет, стом..троўка, в..ршок, ц..гавіты, уп..ц..рых, н..д..бразычлівы, св..таяннік, ж..рдка, ч..дзіць, см..ючыся, ш..рсцяны, мац..рык, тр..скатня, В..зувій, В..рсаль, па..зды, ц..люлоза, інт..лігентны, г..рань, ц..жкаваты, се..лка, сув...зь, д..ліжанс, П..цігорск, літ..ратура, камп'ют..р, інц..дэнт, зац..ментаваць.

**35.** *Запішыце словы па-беларуску, растлумачце правапіс* ***о, э, а, е, ё, я***.

I. Тематика, Кремль, температура, аттестат, прогрессивный, демонстрация, телевизор, корреспондент, десант, редактор, референдум, секретарь, адрес, орден, рессора, рекорд, цензура, театр, обелиск, Берлин, Некрасов, балерина, метро, телеграф, аллегория, метафора, методика, нелёгкий, операция, Евангелие, кибернетика, лекционный, персона, терем, секрет, Сенегал, Тернополь, горечь.

II. Молоко, дорога, чернеть, барокко, сопрано, адажио, шестёрка, деревянный, жемчужный, черёмуха, мастер, лотерея, инженер, канцелярия, осмыслить, десант, Европа, жетон, шедевр, редколесье, шестьсот, племена, освещение, безоблачный, кленовый, Белград, дежурный, ефрейтор, земледелец, веранда, сенсация, кедровник, вековой, выделить, зелень, турне, Семипалатинск.

**36.** *Выпішыце з тэксту дзесяць слоў на правапіс* ***О, Э – А; Е, Ё – Я.***

Мы часта самі на сабе адчуваем, што адной кнігі не можам дачытаць, а другая чытаецца лёгка, ад яе нялёгка адарвацца. Усё ў ёй хораша, натуральна... Мовы тут як бы няма, вы нават як бы не чытаеце, а бачыце, перажываеце, жывяце ўнутраным жыццём твора. Вы сочыце за падзеямі, зжываецеся з вобразамі, адчуваеце каларыт, атмасферу, характары. Вось гэта і ёсць майстэрства. І сакрэт гэтага майстэрства просты — мова. Трэба ведаць яе чараўнічае багацце і законы будовы, лад яе. *(Я. Скрыган)*

**37. I.** *Адзначце словы, дзе пішацца літара:*

***Е*** 1) зан..падаць, 2) б..зглуздзіца, 3) в..лікадушны, 4) в..рбалоз, 5) п..рэсты;
***Э*** 1) ц..гліна, 2) д..путат, 3) інж..нер, 4) т..мпература, 5) ц..люлоза;
***Я*** 1) н..значны, 2) з..ленаваты, 3) с..кунда, 4) с..ржант, 5) н..ёмка;
***А*** 1) лат..рэя, 2) д..фект, 3) д..скусія, 4) ц..нзура, 5) д..лікатны.

**II.** *Адзначце словы, у якіх пішацца літара:*

***Ы*** 1) ч..снок, 2) р..сора, 3) др..зіна, 4) ч..чэнец, 5) кр..вавы;
***Э*** 1) экз..мпляр, 2) Ц..йлон, 3) тун..ль, 4) пр..зент, 5) эпіт..т;
***А*** 1) Ш..ўчэнка, 2) гл..таць, 3) ч..бор, 4) с..кратарыят, 5) р..спубліка;
***Я*** 1) П..трусі́, 2) по..с, 3) ап..тыт, 4) Мендз..лееў, 5.) л..йтэнант;
***Е*** 1) п..сняры, 2) п..цярня, 3) Смал..вічы, 4) с..мсот, 5) кал..ндар.

## <u>Правапіс галосных у складаных словах</u>

**38.** *Ад чаго залежыць правапіс галосных у складаных словах? Выпішыце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца літара* ***А.***

Ільн..валакно, ільн..семя, с..нцапёк, д..бразычлівы, п..ўнаўладны, ст..гадовы, б..яздольны, в..страверхі, св..ечасовы, в..семсот, н..вабранец, ф..таграфія, п..стскрыптум, зл..язычнасць, к..лераадчувальны.

**39.** *Запішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары. Пастаўце націскі. Назавіце заканамернасць, якая адзначаецца пры ўжыванні галосных* ***О, А*** *ў першай частцы складаных слоў.*

П..знаспелы, п..знацвет, в..даўстойлівы, р..знакаляровы, ч..рнарабочы, м..таспорт, п..ўн..водны, кр..вапраліццё, н..ваабраны, ст..тысячны, шт..хвілінны, м..вазнаўства, в..дападзел, шкл..завод, сл..ваўжыванне, п..ліграфія, п..ліграфічны, др..бналессе, ш..равокі, н..д..брасумленны, усх..дазнаўства, зб..жжаўборка, сл..ваформа, тр..хпавярховы, св..ечасовы, м..тагонкі, п..ўнапраўны, пуц..водны, п..ўкілаграма, п..ўнаўладны, мн..гаматорны, п..лігібрыдны, р..знакаляровы, чырв..нашчокі, р..дкалессе, п..ўнаўладдзе, в..страпахучы, н..вагрэчаскі, с..нцапёк.

**40.** *Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс галосных у складаных словах.*

1. Калі дваццацігадовы светл..валосы з добрымі блакітнымі вачамі хлопец пачаў у 1923 годзе падпісвацца сакавітым і тлустым як сама зямля Случчыны псеўданімам "Кузьма Чорны" проза беларуская яшчэ не была шыр..камаштабнай. *(Ад.)* 2. У небе бяздонным дзе хмаркі купаюцца ў золаце яркіх агнёў вольныя песні шт..дзень разліваюцца. *(К-с)* 3. Сябры былі аднолькава в..льналюбівымі, д..брадушнымі, д..бразычлівымі. 4. Менталітэт — своеасаблівы тып мыслення св..табачання асобнага чалавека або якой-небудзь супольнасці. 5. Дзяўчыне здавалася, што ў ч..рнабровага ш..равокага хлопца нешта здарылася. 6. Св..ечасова падаць дакументы для атрымання пашпарта. 7. Д..брасумленна выконвайце абавязкі.

**41.** *Адзначце нумары слоў, у якіх пішацца літара*

***О*** 1) выс..кавітамінны, 2) гал..вакружэнне, 3) д..ўгалецце, 4) д..брабыт, 5) д..брасуседскі, 6) зак..напраект, 7) ф..таздымак, 8) ст..годдзе, 9) м..такрос, 10) в..страверхі;

***Е*** 1) кра..від, 2) жыцц..радасны, 3) вугл..здабыча, 4) бо..прыпасы, 5) сво..-часова, 6) сярэдн..азіяцкі, 7) зерн..сховішча, 8) кон..гадоўля, 9) кле..-варня, 10) ус..магутны;

***А*** 1) в..даахоўны, 2) пр..цілеглы, 3) ф..таграфія; 4) ст..тысячны, 5) ч..рнаплодны, 6) п..літэхнікум, 7) с..нцастаянне, 8) шт..лета, 9) зак..надаўства, 10) пр..ставалосы;

***Я*** 1) н..добразычлівы, 2) з..леналісты, 3) в..лікадзяржаўнасць, 4) ус..вед, 5) пал..вод, 6) ус..ночная, 7) л..саахова, 8) св..тлафор, 9) крыв..носны, 10) ча..апрацоўка.

***<u>ЗАПОМНІЦЕ</u>:***

Св***я***тлоадчуванне, св***я***тлолюбівы, св***я***тлолячэнне, св***я***тлабоязь, св***я***тломаскіроўка, св***я***тлатэхніка, св***я***тлацень, св***я***тлафор — утвораны ад словазлучэння з 1-й часткай — назоўнікам *св<u>я</u>тло*;

ус***ё***абдымны, ус***ё***бачны, ус***ё***ахопны, ус***ё***відушчы, ус***ё***даравальны, ус***ё***магутны ('які *ўс<u>ё</u>* можа'), ус***ё***вед, ус***ё***пераможны — утвораны ад словазлучэння з 1-й часткай — займеннікам <u>ніякага</u> роду *ус<u>ё</u>*.

## <u>Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах</u>

**42.** *Перакладзіце на беларускую мову наступныя словы. Падкрэсліце іншамоўныя спалучэнні галосных у словах з рускай мовы і ў перакладзе. Вусна растлумачце іх правапіс.*

## I варыянт

| | | | |
|---|---|---|---|
| абитур**ие**нт<br>ав**иа**тор<br>акс**ио**ма<br>ав**иа**ция<br>ав**иа**ционный<br>арх**ео**лог<br>ассоц**иа**ция<br>аттракц**ио**н<br>а**у**д**ие**нция<br>а**у**кц**ио**н<br>алмаз *( 2 вары-янты: 1 – алмаз, 2 – д**ыя**мéнт)*<br><br>баст**ио**н<br>библ**ио**графия<br>б**ио**граф<br>б**ио**графия<br>б**ио**логический<br>б**ио**ника<br>билл**ио**н<br><br>вар**иа**нт<br>в**ио**лончель<br>в**иа**дук *(падвéсны мост над ярам, дарогай, ракой, чыгункай)*<br><br>ген**еа**логия<br>ген**иа**льный<br>гиг**ие**на<br>гиг**ие**нический<br>гранд**ио**зный | грац**ио**зный<br><br>д**иа**гноз<br>д**иа**гностика<br>д**иа**гональ<br>д**иа**метр<br>д**иа**пазон<br>д**иа**фрагма<br>д**ие**та<br>д**ие**тический<br>д**ио**птрúя<br><br>**Ие**русалим<br>ид**ео**лог<br>ид**ео**логия<br>ид**ио**тический<br>импрессар**ио**<br>**ио**н<br>**ио**низация<br>**йо**г<br>**йо**гурт<br>**йо**д<br>**Ио**рдания<br><br>кан**ьо**н<br>к**ио**ск<br>кл**ие**нтура<br>коллекц**ио**нер<br>конв**ейе**р<br>коэффиц**ие**нт<br><br>Л**ео**нид<br>лос**ьо**н<br><br>ма**йо**нез<br>ма**йо**р, ма**йо**рат | ма**йо**ран<br>мар**ио**нетка<br>матер**иа**л<br>мемор**иа**льный<br>мет**ео**рит<br>милиц**ио**нер<br>милл**ио**н<br>милл**иа**рд<br><br>н**еа**политанский<br>н**ео**н<br>Н**иа**гара<br>ни на **йо**ту<br>Нью-**Йо**рк<br><br>ок**еа**н<br>ок**еа**нский<br>ор**ие**нтация<br>ор**ие**нтир<br>офиц**иа**нт<br><br>пал**ео**нтология<br>патр**ио**т<br>патр**ио**тизм<br>пед**иа**тр<br>пенс**ио**нер<br>пер**ио**д<br>п**иа**нино<br>потенц**иа**л<br>п**оэ**зия<br>пр**ио**ритет<br>провинц**иа**л<br>професс**ио**нал<br><br>ра**йо**нный | рад**ио**узел<br>рац**ио**н<br>рац**ио**нализатор<br>р**еа**билитация<br>р**еа**гировать<br>р**еа**лизм<br>рег**ио**н<br><br>селекц**ио**нер<br>скол**ио**з<br>сольфедж**ио**<br>соц**иа**льный<br>спартак**иа**да<br>спец**иа**льный<br>стад**ио**н<br>стац**ио**нар<br><br>т**ео**рема<br>трилл**ио**н<br><br>фе**йе**рверк<br>ф**иа**лка<br>физ**ио**лог<br>фил**иа**л<br>ф**ио**рд<br>ф**ио**летовый<br>фо**йе**<br>фортеп**иа**но<br><br>чемп**ио**н<br>чемп**ио**нат<br>шампин**ьо**н<br><br>энтуз**иа**зм<br>эпид**иа**скоп<br>Эф**ио**пия |

## II варыянт

| | | | |
|---|---|---|---|
| аж**ио**таж<br>аккомпан**иа**тор<br>аккорд**ео**н<br>аккорд**ео**нист<br>амм**иа**к<br>антиб**ио**тик<br>арх**ео**логия<br>арх**ие**пископ<br>ар**еа**л<br>астер**ои**д<br><br>бактер**ио**логия<br>библ**ио**фил<br>б**иа**тлон<br>б**ио**химия<br>брилл**иа**нт<br>бул**ьо**н<br><br>вар**иа**ция<br>вегетар**иа**нец<br>вид**ео**телефон<br><br>г**иа**цинт<br>глад**иа**тор<br><br>дивиз**ио**н<br>д**ие**з<br>д**ио**птр<br>д**иа**дема<br>*(1. Галаўная павязка грэч. жрацоў; галаўны ўбор цароў у стараж. 2. Жаночае галаўное ўпрыгожанне з дарагіх камянёў)*<br>д**иа**бет<br>д**иа**лект | **ие**менец<br>**йо**ди́д● *(выключэнне: **ё** не пад нац.)*<br>**йо**дизм ● (выкл.)<br>**йо**дированный●<br>**йо**т, **йо**тация ●<br>**йо**та<br>**йо**тированный●<br>**Йо**шкар-Ола<br>ид**ио**т<br>ид**еа**л<br>ид**еа**лизировать<br>**ие**роглиф<br>**ие**рархия<br>иллюз**ио**нист<br>импресс**ио**нист<br>ингред**ие**нт<br>иниц**иа**тор<br>иниц**иа**тива<br>ихт**ио**завр<br><br>кабр**ио**лет<br>колон**иа**лист<br>комед**иа**нт<br>комиссар**иа**т<br>кондиц**ио**нер<br>кард**ио**грамма<br>кард**ио**лог<br>кар**иа**тида<br>клав**иа**тура<br>кр**ео**л<br><br>лег**ио**н<br>лег**ио**нер<br><br>ма**йо**лика<br>ман**иа**кальный | маф**ио**зи<br>моц**ио**н<br>мельх**ио**р<br>мерид**иа**н<br>мет**ео**р<br>милл**иа**рдер<br>милл**ио**нер<br>мин**иа**тюра<br>мисс**ио**нер<br>мир**иа**ды<br>м**ио**кард<br><br>нац**ио**нализм<br>н**ео**логизм<br><br>ол**еа**ндр<br>олимп**иа**да<br>ор**ео**л<br>орф**оэ**пия<br>офиц**ио**з<br><br>панс**ио**н<br>патр**иа**рх<br>п**оэ**тесса<br>п**ое**динок *(не на гэта правіла: яканне)*<br>п**иа**ла<br>плаг**иа**т<br>пров**иа**нт<br><br>рад**ио**активный ● *(не на гэта правіла: як пол**е**ахоўны)*<br>рад**ио**грамма ● *(выключэнне: **ё** не пад націскам)* | рад**иа**ция<br>р**еа**кция<br>р**еа**льный<br>р**ео**стат<br>рег**ио**нальный<br>рекв**ие**м<br><br>стер**ео**тип<br><br>т**ео**ретик<br>т**еа**трал<br><br>фол**иа**нт<br>физ**ио**номия<br>фил**иа**л<br>ф**иа**ско<br><br>шп**ио**н<br>шп**ио**наж<br><br>эмоц**ио**нальный<br><br>юн**ио**р |

# Правапіс У, Ў пасля галосных у іншамоўных словах

| **У пачатку слова – У** | **У сярэдзіне слова – Ў** | У фіналях (канцоўках) – У: *-ул, -ум, -уз, -ус, -ун, -ут, -умф, -унд* |
|---|---|---|
| в**а** **у**нівермагу, д**а** **у**ніверсітэта, пр**а** **у**нікальнасць, фін**а**-**у**горскі (СБМ), в**а** **у**нісон, з-з**а** **у**рагану і г. д. | а**ў**дыторыя, іхтыяза**ў**р, ка**ў**стычны, бра**ў**нінг, га**ў**біца, ба**ў**эр. **Выключэнне**: фа**у**на, са**у**на, ка**у**зальны, ка́**у**цкі (-я́нства), Ла**у**ра, Да**у**́рыя | сакса**ул**, Барна**ул**; кампенды**ум**, шлагба**ум**, меды**ум**; пакга́**уз**, блакга́**уз**, цэйхга́**уз**; со**ус**, стра**ус**, Сіры**ус**, архівары**ус**; кло**ун**, Бра**ун**, Кейпта́**ун**; ра**ут**, Рэ**ут**, лака**ут**; тры**умф**, ра**унд**. **Таксама:** Ланда**у**, Бешта**у**, Краката**у**, Алата**у**, г. Біса**у**, шо**у**, фра**у**. **Але**: а**ўт**, тайм-а**ўт**, нака**ўт**, ска**ўт**, накда**ўн**, кампа**ўнд**, дрэдно**ўт**. |

**43.** *Запішыце словы* ***ў слупок,*** *падкрэсліце месца арфаграмы, вусна растлумачце правапіс* ***У, Ў.***

А..льны, Се..л, а..ра, па..за, калоквi..м, ма..зер, рады..с, а..кцыён, прэзіды..м, а..дыенцыя, бра..нінг, Бернард Шо.., ла..рэат, кансілі..м, архівары..с, тры..мфатарскі, шлагба..м, га..птвахта, Да..рыя, джо..ль, ва ..ладзівастоку, ліноле..м, ка..чук, кантрольна-..ліковы, еса..л, кента..р, індывіду..м, ба..л, барна..льскі, ваку..м, па-..дарнаму, ра..т *(званы вечар, урачысты прыём)*, нака..т, ва ..ніверсітэце, паўднёва-..сходні, тра..лер, да ..ніверсама, стра..с, сімпозі..м, умля́..т *(нямецк.: ö, ü)*, тры..мфатар, фа..на, па-..чарашняму, прамені ..льтрафіялетавыя, аквары..мны, фіна-..горскі, Ланда.., тэрапе..т, тэрары..м, За..ралле, лака..т, кло..н, накда..н *(спарт.)*, перпе́ту..м-мо́біле; гучнае “..ра” ..дарыла ў вушы; пра ..нікальны выпадак, а..дыторыя, пакга..з *(склад для захоўвання грузаў пры чыгуначных станцыях, партах і пад.)*, тры..мвіра́т *(саюз трох палітычных дзеячаў у Старажытным Рыме, які меў на мэце захапіць вярхоўную ўладу. // Жарт. Пра трох асоб, якія аб’ядналіся для сумеснай дзейнасці)*, тры..мф, блакга..з *(абарончая пабудова з дрэва ці інш. для вядзення кругавога кулямётнага і артылерыйскага агню)*, тры..мфальны, іхтыяза..р, ва..чар, Санта Кла..с, Рэ..т, цэйхга..з *(ваенны склад зброі і абмундзіравання)*, ра..нд, кампа..нд [1*) від паравой машыны;* 2) *сумесь я.-н. рэчываў, якія не з’яўл. хімічным злучэннем*], Бешта.., але..т *(карэнны жыхар Але..цкіх астравоў)*, кла..нада, па..з бераг, не ..рэгуляваць, не ..таймаваць, астрана..т, аэрана..т, мане..р, касмана..т, фармацэ..т, да ..ніятаў, За..шачча, ваен..рач, на ..рне.

**44.** *Запішыце словы, устаўляючы* ***у*** *або* ***ў.***

Ла..рэат, ва ..універсітэце, аўтар-..кладальнік, а..ра, Брэсцкая ..нія, за ..ралам, бакала..р, а..дыторыя, Да..рыя, паўночна-..сходні, а..тсайдэр, тайм-а..т, індывіду..м, За..шачча, а..кцыён, фіна-..горскі, не ..нікальны, ва..чар, шлагба..м, фа..на, радасна-..знёсла, тыраж газеты “Народная воля” ..зрос, літа..ры, іна..гурацыя, Барна..л, архівары..с, па-..збекску, За..ралле, Далёкі ..сход, Ланда.. , перпету..м-мобіле, а..дыенцыя, астрана..т, майстры-..мельцы, на ..рале, “Вясёлка” ..першыню друкуе.

**45.** *Выпішыце* ***нумары*** *слоў, у якіх пішацца* ***ў*****.**

1) па-..чарашняму; 2) ваку..мны; 3) да ..рэчча; 4) натары..с; 5) а..кцыён; 6) а..тсайдэр; 7) галоў..рач; 8) выпукла-..вагнуты; 9) калёквi..м; 10) ва ..ніформе; 11) га..біца; 12) гука..лоўнік; 13) ка..чук; 14) дзейнічаць ва ..нісон 15) пранёсся ..раган; 16) шэдэ..р; 17) опі..м; 18) э..каліпт; 19) ла..р; 20) мя..каць; 21) дыназа..р; 22) і..даізм; 23) і..рыт; 24) аквана..т; 25) акія-нары..м; 26) акіяна..т; 27) аквана..т; 28) а..ды́тар; 29) кансорцы..м *(эк.)*; 30) сакса..л; 31) хары..с; 32) цёплыя ..нты; 33) дрэдно..т *(вялікі быстраходны браняносец, папярэднік лінейнага карабля)*; 34) п’еса ”Тутэйшыя” ..бачыла свет.

**46.** *Замяніце наступныя выразы адным словам. Словы запішыце.*

***Варыянт 1***

1. Афіцыйны прыём у высокапастаўленай асобы. 2. Склад для грузаў пры чыгуначных станцыях, партах. 3. Від паравой машыны; сумесь я.-н. рэчываў, якія не з’яўляюцца хімічным злучэннем. 4. Бліскучы поспех, выдатная перамога. 5. Выдатны твор літаратуры, мастацтва.

***Варыянт 2***

1. Ваенны склад зброі і абмундзіравання. 2. Службовая асоба, якая сведчыць і афармляе розныя юрыдычныя дакументы, акты. 3. Спартсмен або каманда, якія занялі ў спаборніцтвах адно з апошніх месц. 4. Буйная птушка, якая бегае, водзіцца ў пустынях Афрыкі. 5. Тэрміновая работа на судне, у якой удзельнічае ўся каманда (*перан.* Неадкладная спешная работа, выкліканая адсутнасцю планамернасці ў працы).

***Варыянт 3***

1. Істота з конскім тулавам і чалавечай галавой і грудзьмі ў старажытнагрэчаскай міфалогіі. 2. Падарожны куфэрак круглаватай формы. 3. Нарада, звычайна міжнародная, па якім-небудзь пытанні. 4. Па-мяшканне, прызначанае для чытання лекцый, дакладаў. 5. Саюз трох палітычных дзеячаў у Старажытным Рыме, які імкнуўся захапіць вярхоўную ўладу (*перан.* Тры асобы, якія аб’ядналіся для сумеснай дзейнасці).

**<u>Словы для даведак</u>:** а..дыторыя, пакга..з, тры..мф, шэдэ..р, а..рал, ба..л, ра..т, кента..р, тры..мвірат, стра..с, натары..с, а..тсайдэр, сімпозі..м, кампа..нд, цэйхга..з.

## Правапіс прыстаўных галосных і зычных

**47.** *Выберыце і запішыце правільныя варыянты адказаў.*

Прыстаўны зычны ***В*** пішацца:

а) перад націскным ***о*** ў пачатку і ў сярэдзіне слова;
б) перад пачатковымі ***о, у*** ў запазычаных словах;
в) перад прыставачным ***у;***
г) перад каранёвым ***у*** ў беларускіх словах.

**48.** *Запішыце словы. Растлумачце, чаму ў адных словах ёсць прыстаўны* ***В,*** *а ў іншых — няма.*

Вучылішча, опера, ода, урна, універмаг, Навуменка, азёрны, вузел, вучань, Омск, завулак, вобыск, вокны, увачавідкі, абласны, абады, Лявон, шэравокі, абвуглены, унія, завушніцы, навука, Об, Урал, оптыка, аконны, ураджай, войкаць, вулей, вусны, вока, вуха, вывудзіць, вугаль, востраў, увогуле, завочна, Обаль,васпаваты, водсвет, вокіс, воцат, вастрыня, офіс, унцыя, акалічнасць, уюн, навобмацак, оптам, узбудзіць.

**49.** *Запішыце словы, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы, дзе трэба, прыстаўныя* ***В, Г.***

На(в)укападобны, (в)одбліск, Ля(в)он, (в)указ, (в)опіс, (в)успамін, (в)одгулле, (в)оспа, (в)оперны, (Г)анна, горад (В)Осла, (в)обер-афіцэр, (в)ускапаны, Лары(в)он, Мікалай Мікалаевіч (В)Озераў, (в)ачаняты, (в)осемдзесят, (в)універсам, (в)успышка, (в)одгалас, (в)астрэйшы, (В)Обаль, (а)мшэлы, (г)этак, (в)орыва, на(в)астрыць, (в)ужовы, (в)обад, (в)удзільна, (в)альховы, (в)аколіца, на(в)окал, (в)унты, (в)успомніць, (В)Ожагаў, г.(В)Ушачы, г.(В)Урэчча, (В)Уолт (В)Уітмен, да(г)этуль, (в)обыск, (в)універсітэт, (в)ураджайны, (в)одсвет, на(в)аколле, (в)оканне, па(в)укападобны, Бела(в)ус, (в)азёрная гладзь, (в)оптыка, На(в)ум, слухай (в)ушамі і глядзі (в)ачыма, г.(В)Орша, за(в)ушніцы, (в)узейшы, (в)унія, (в)уé вяроўку, на(в)оддалек, звіць па(в)уціну, (в)астрыё нажа, у (в)ачах, па(в)учынае кодла, (в)одкуп, (в)упраж, Тадэ(в)уш Касцюшка, (в)отчына *(гіст.)*, (в)отруб’е, (в)аконны.

**50.** *Спішыце словы, падкрэсліце прыстаўныя галосныя. Растлумачце іх наяўнасць ці адсутнасць.*

Пад ..льдом, з ..ржышча, ён ..лгаў, ..мгненна, за..рдзецца, па ..ржэўніку, пакрылася ..ржой, у ..ржышчы, над ..лбом, да ведаў ..мкнуцца, права на ..льготны праезд, пад ..льноцерабілку, такі ..лгун, серп ..ржавы, ..мгла, на ..льнозаводзе, пад ..льдзінай, за..ржавець, па..мчацца, на веласіпедзе ..мчыць, вол ..рвануўся.

**51.** *Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Растлумачце правапіс літар і пастаноўку знакаў прыпынку.*

1. Мінуліся ночы ..мгла і сум былы змоўк. *(К-с)* 2. Пераваліўшы ўзгорак ..рвануліся ўперад на поўнай хуткасці разгорнутым строем панесліся да ма..клівага зялёнага дэпо на “апорны пункт”. *(І.М.)* 3. Ле..ь-ле..ь дымяцца нагрэтыя за дзень палі, губляючы ў змроку р..знакаляровыя афарбоўкі. Дзе-нідзе падасць яшчэ голас жаўранак, спалоханы нечым, ды па-ранейшаму звіняць ручаі, і гэты звон у пал..вой цішыні асабліва м..ладычны. *(Хадк.)* 4. І будуць шпаркія вагоны нас у даль бя..крайнюю ..мчаць. (*Дуд.)* 5. Не люблю я ўдагонку ..мчацца на выбітых сце..ках ідэй. *(Я.П.)* 6. Ад ва..зальных пабудоў засталіся толькі чырвоныя каменныя падмуркі ды памяты з вырваным бокам ..ржавы бак в..данапорнай вежы што ляжаў на раллі. *(І.М.)* 7. Усюды — голыя сцены пустыя паліцы што да..ней угіналіся ад цяжару і на якіх цяпер дзе-нідзе стаялі парожнія за..ржавелыя бляшанкі. *(К-с)* 8. Бацька Н..ман шчыры да касы паслаў хваль ..мклівы вырай. *(Бар.)*

## Правапіс зычных і іх спалучэнняў

**52.** *Прачытайце словы, правільна вымаўляючы спалучэнні зычных. Праверце правільнасць перадачы гэтых спалучэнняў на пісьме, змяняючы форму слова ці падбіраючы для праверкі роднаснае слова.*

Узор: пя***с***чаны – пя***с***ок.

Завязка, перабежчык, грузчык, нарэзка, тормаз, на градцы, краявід, аўтаадказчык, загадчык, намазка, багаж, караняплод, у печцы, прагіб, касьба, грузчык, указка, перавозчык, казка, малацьба, даследчык, прыказка, дудка, моладзь, грып, дроб, снег, каска, просьба, на лодцы, у ватовачцы, лётчык, рэзчык, матчын, радыёперадатчык, недасведчанасць, жаніцьба, міраж, дождж, мігцяць.

**53.** *Устаўце прапушчаныя літары. Праверце правільнасць свайго напісання, змяніўшы словы або падабраўшы да іх роднасныя.*

Про..ьба, завя..ь, адрэ..це, перабе..чык, пераплё..чык, ва..кі ўкла.., сцера..чыся, жані..ьба, нашча..кі, перамо..ца, адмові..ся, рэ..ька, ка..ьба, на палі..цы, зага..ка, ма..чымасць, дасве..чаны, про..кі, лю..скі, аб’ез..чык, перагаро..ка, пара..каваць, дара..ца, на кла..цы, апа..кі.

**54.** *Утварыце прыметнікі ад наступных геаграфічных назваў. Прыметнікі запішыце, абазначце ў іх корань і суфікс.*

Нясвіж, Палессе, Баранавічы, Чашнікі, Глыбокае, Слаўгарад, Брэст, Белавежа, Прыпяць, Старыя Дарогі, Калінкавічы, Лельчыцы, Бешанковічы, Ушачы, Ганцавічы, Маларыта, Карэлічы, Бераставіца, Хойнікі, Чавусы, Касцюковічы, Добруш, Навагрудак, Свіслач, Ваўкавыск.

● *З якой літары будуць пісацца прыметнікі, калі да іх дадаць словы* ***раён, вуліца?***

**55.** *Як у беларускай мове перадаюцца этымалагічныя спалучэнні зычных* ***стл, здн, стн, рдц, рдн, лнц****? Словы запішыце ў адпаведнасці з арфаграфічнымі нормамі.*

Капус(*т*)ны, міласэр(*д*)ны, балас(*т*)ны, кантрас(*т*)ны, праяз(*д*)ны, помс(*т*)лівы, кантак(*т*)ны, фарпос(*т*)ны, Рэмбран(*д*)т.

**56.** *Запішыце правільна словы, раскрыўшы дужкі.*

Кампос(*т*)ны, ад(*д*)зячыць, на(*д,т*)хненне, Слу(*т,ч*)чына, ма(*с*)штаб, рас(*с*)ол, лан(*д*)шафт, ас(*в,ф*)альт, салда(*тс,ц*)кі, гара(*дс,ц*)кі, сусе(*дс,ц*)кі, заво(*дс,ц*)кі, вільнюс(*с*)кі, лі(*дс,ц*)кі, латы(*ш*)скі, паляшу(*кс,ц*)кі, лю(*дс,ц*)кі, ры(*ж*)скі, уша(*чс,ц*)кі, бешанкові(*чс,ц*)кі, белаве(*ш,ж*)скі, поз(*д*)ні, помс(*т*)лівы, свіс(*т*)нуць, Шмі(*д*)т, бязлітас(*т*)на.

**57.** *Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары і растлумачце іх правапіс.*

Выяз..ны, аблас..ны, радас..ны, ненавіс..ны, крапас..ны, мнагамес..ны, бязлітас..ны, неміласэр..ны, пачэс..ны, балас..ны, абстрак..ны, брыз..нуць, бліс..нуць, злос..нік, вус..на, роднас..ны, крос..ны, ярас..ны, кантрас..ны, со..нца, пас..лаць, паз..ней, у..чуванне, абя..зброіць.

**58.** *Спішыце, устаўце прапушчаныя літары. Назавіце асаблівасці напісання спалучэнняў зычных.*

Хіс..нуцца, міласэр..ны, невыраз..ны, аб’яз..ны, ..часце, ненавіс..ны, Бран..т, вус..ны (адказ), Краншта..т, карыс..ны, бязлітас..ны, Энгельгар..т, у..чапіць, ра..чуліць, выяз..ны, ра..чоска, злос..ны, аблас..ны, ра..чытаць, Гумбаль..т, ра..чысціць, ні..чымны.

**59.** *Запішыце словы згодна з арфаграфічнымі нормамі. Назавіце прынцыпы арфаграфіі, на якіх грунтуецца правапіс гэтых слоў.*

Ро[ш]чына, дара[ч̄]ык, ра[шч]эсваць, сто[х], падво[шч]ык, слаўгара[ц]кі, бру[ш]чатка, бя[ш̄]умна, но[з’]біт, недасве[ч̄]анасць, рэ[ц’]ка, мые[с̄’]я, газе[ч̄]ык, зака[шч]ык, ра[ш]чыніць (дзверы), [ш]чышчаць.

**60.** *Запішыце словы па-беларуску, растлумачце напісанне спалучэнняў зычных.*

Устный, проездной, скоростной, бессмертный, поздно, безвыездно, капустный, Кронштадт, аванпостный, шестнадцатый, счастливый, форштадт, отдалённый, балластный, Рембрандт, свистнуть, областной.

**61.** *Спішыце, пастаўце знакі прыпынку, устаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі.*

1. (*Не*) вялічкі б..розавы гаёк ля самага возера стаяў нібы пад шкляным каўпаком сілуэты вострых і плакучых в..ршáлін а..біваліся на фон.. неба прыгожа і велічна але застыла як на карціне. *(Кул.)* 2.Вецер дождж за вокнамі хістае..ца рэ..кае голле дрэў. *(Лупс.)* 3.Хмары віселі ні..ка а на другі дзень паміж іх высвечвала сонца і на ўзлес..і мокрая лаза здавалася гатовай ра..пусціць перш.. лісц..йка. *(К.Ч.)* 4. З поўдня балоты зноў падб..раліся да саламяных за(*і*)мшэлых радоў стрэх але ў гэты бок ішла найбольш сув..зь са светам і тут на дрыгве была намо(*ш,с*)чана даро..ка. *(І.М.)* 5. Людзі што зноў адзін за адным варочаліся ў Сумлічы ра..казвалі што грузавікі з дзяўчатамі і хлопцамі проста выехалі на скрыжаван..е і а..туль рушылі па дароз.. той што вядзе на Бабруй(*с,ш*)чыну і далей. *(К.Ч)* 6. Ля самай старой хаты ў вёсцы была прытульная м(*я,е*)сціна хата стаяла крыху ў глыб двара і перад ёю раслі клёны і каштаны. *(К.Ч.)*

## Правапіс *Д – Дз, Т- Ц*

**62.** *Спішыце словы, раскрываючы дужкі.*

Кар(ды,дзі)яграма, я(т,ц)вягі, (Дзе,Дэ)тройт, (ды,дзі)ліжанс, (дзі, ды)рван, каман(ды,дзі)роўка, Ва(ты,ці)кан, (дзе,дэ)канат, бал(ты,ці)йскі, (ды, дзі)зайн, Багра(ці,ты)ён, (ц,т)вёрдасць, (тэ,це)атр, ра(дзі,ды)ус, (дэ, дзе)кабрысты, (ці,ты)ран, (дэ,дзе)партамент, амяр(ц,т)велы, (ды,дзі)скатэка, (дз,д)ве, (д,дз)весце, (д,дз)веры, Лю(д,дз)міла, ба(т,ц)вінне, мя(д,дз)ведзь, Ма(ц,т)вей, валакар(ды,дзі)н, мун(ды,дзі)р, ак(цё,то)р, каман(ды,дзі)р,

Я(д,дз)віга, у Лі(т,ц)ве, прак(ты,ці)кант, (ты,ці)раж, (Дзі,Ды)дро, апла-(ды,дзі)сменты, ра(ты,ці)фікацыя, (ды,дзі)спетчар, (ты,ці)паж, (ды,дзі)с-контны, (тэ,це)арэтык.

**63.** *Перакладзіце словы на беларускую мову. Вусна растлумачце наяўнасць або адсутнасць **дзекання, цекання.***

| 1 варыянт | 2 варыянт | 3 варыянт | 4 варыянт |
|---|---|---|---|
| 1) фонетика | 1) грамматика | 1) на флоте | 1) цветение |
| 2) этюдник | 2) в ракете | 2) десант | 2) дизель |
| 3) студент | 3) динамо | 3) в порту | 3) в винограде |
| 4) на старте | 4) увертюра | 4) гвардейский | 4) кратер |
| 5) индеец | 5) на заборе | 5) мундир | 5) в огороде |
| 6) тираж | 6) аттестат | 6) телескоп | 6) фантастика |
| 7) диктор | 7) динамит | 7) термос | 7) билетёр |
| 8) антенна | 8) латинский | 8) деталь | 8) в посуде |
| 9) командировка | 9) возбудить | 9) Матвей | 9) литвинка |
| 10) телеграмма | 10) термометр | 10) дискотека | 10) в компоте |

**64.** *Запішыце па-беларуску. Растлумачце правапіс **Д – Дз, Т – Ц.***

Модификация, дизельное топливо, Тюмень, подвезти, пьедестал, ноктюрн, диатез, квартира, в агентстве, мундир, Оноре́ де Бальзак, жакетик, Гаити, декабристы, гвоздь, авторитетный, аптечный киоск, зачерствевший хлеб, в искусстве, тираж, клятвенный, тигровая шкура, вахтёр, подвиг, диссертация, бигуди, в аббатстве, твёрдый, Палестина.

## Правапіс прыставак. Правапіс *І, Ы, Й* пасля прыставак

**65.** *З дапамогай прыставак **З-, УЗ-, РАЗ-, БЕЗ-** утварыце новыя словы. Запішыце іх. Растлумачце напісанне прыставак.*

Біць, ведаць, везці, ламаць, малоць, віцца, ганарыцца, радавацца, цягнуць, вешаць, даходны, вобразны, кроў, пошліна, бегчы, змена, злучнік, сыпаць, сушыць, спрэчка, злавацца, сінець, зубы, сувязь, сэнс.

**66.** *Запішыце словы. Абазначце прыстаўкі, растлумачце іх правапіс.*

**I.** А..бегчы, па..біць, а..гаварыць, а..званіць, па..касіць, а..казаць, па..вязаць, па..глядаць, а..дзяліць, с..рваць, на..стрыгчы, а..мятаць, на..гры зці, а..межаваць, а..весці, па..бяліць, а..гарнуць, ад..спацца, на..тачыць, а..шукаць, на..шыць.

**ІІ.** На..ліць, а..кусіць, пад..спець, па..грызці, на..вязаць, а..качаць, на..гарэць, а..сыпаць, а..віць, а..рэзаць, пад..спець, па..купіць, на..клеіць, а..водзіць, а..жываць, на..ламаць, па..румяніць на..пісаць, а..біць, па..-весці.

**67.** *Разгледзьце ніжэй прыведзеную схему і прывядзіце прыклады на асноўныя пункты правіла пад лічбамі ① і ②.*

**Узор**: *спад + ілба → спадылба; за + іграць → зайграць.*

**1** **на зычны + *і* .... → *ы* ....**

**Выключэнне:**

**між-**
**звыш-**
**дэз-**
**контр-**
**пан-**
**суб-**
**пост-**
**транс-**
**гіпер-**
**супер-** + ***і***... → ***і***...

А таксама ў некаторых **складаных словах:**

*трансітальянскі, трансіарданскі, гіперінфляцыя, контрідэя…*
*дзяржінспекцыя, бортінжынер, палітінфармацыя, спортінвентар…*

---

**2** **на галосны + *і* ... → *й* ...**

**Выключэнне:**

калі **і** **утварае склад:** *заікацца, заікнуцца, заінець, заіскрыцца, заінтрыгаваць, праінфармаваць, праігнараваць, праіснаваць, праілюстраваць, праігрываць, пераігрываць, праіндэксаваць, саіскальнік, суіснаваць, неістотна* і ў некаторых іншых.

**68.** *Выберыце і запішыце правільныя варыянты адказаў.*

Літара ***і*** пішацца:

а) пасля прыставак на зычны;
б) калі ўтварае склад;
в) пасля прыставак на галосны;
г) пасля прыставак ***між-, звыш-, пан-, дэз-, суб-, транс-, супер-, контр-.***

**69.** *Запоўніце табліцу прыкладамі.*

| ***ы*** | ***й*** |
|---|---|
| Пасля прыставак на зычны | Пасля прыставак на галосны |
| Пад***ы***граць, … | Пера***й***менаваць, … |

Ня..начай, непр..мальны, пад..сці, за..мгліцца, за..граць, па..менна, за..сці, дэз..нфармацыя, ува..шоў, раз..сціся, с..сці, без..менны, контр..гра, пера..сці, пра..нфармаваць, аб..лгаць, за..канне, вы..шаў, аб..граць, пра..снаваць, звыш..мклівы, за..нелае, пера..маць, аб..сці, пры..шоў, за..скрыцца.

**70.** *З дапамогай розных прыставак (дзе трэба — і суфіксаў або постфіксаў) утварыце новыя словы.*

Імя, ісці, іграць, мець, імперыялістычны, індустрыялізацыя, ікаць, імчацца, іначай, інфармацыя, інфекцыя, ілгаць, імклівы, імправізаваць, імшыць, інтрыгаваць, ідэйны, іменаваць, інфаркт.

**71.** *Перакладзіце сказы на беларускую мову, запішыце іх. Падкрэсліце словы, у якіх пасля прыставак пішацца* ***І, Ы, Й.***

1. Человек никогда не должен быть безынициативным. 2. Попробовали обойти город стороной, по полю, но из этого тоже ничего не вышло. 3. Надеяться на выигрыш. 4. Найти выход из трудного положения. 5. Донимать насмешками. 6. Пойти за водой. 7. Придумать занимательный сюжет о турпоходе. 8. Заискрилось поле в лучах холодного зимнего солнца.

**72.** *Адзначце словы, у якіх пішацца літара.*

***Й*** 1) пера..маць, 2) за..скрыцца, 3) ня..накш, 4) аб..сці, 5) пера..менаваць;
***Ы*** 1) звыш..мклівы, 2) раз..сціся, 3) пад..ходзячы, 4) за..скрыцца, 5) пра..снаваць;
***І*** 1) ад..ходзіць, 2) між..нстытуцкі, 3) без..дэйны, 4) контр..гра, 5) дэз..-інфармацыя.

## Правапіс падоўжаных зычных. Марфалагічнае падваенне.

**73.** *У якіх умовах адбываецца падаўжэнне зычных? Запішыце словы ў адпаведнасці з правілам.*

Ма(*с*)саж, смелас(*ц*)цю, ра(*с*)сол, Аксін(*н,ь*)я, ба(*л*)лада, ю(*н*)нат, Піка(*с*)со, бы(*ц,т*)цам, кел(*л,ь*)я, до(*н*)на, Тац(*ц,ь*)яна, а(*л*)лея, Ме(*к*)ка, Жа(*н*)на, ка(*р*)рэспандэнт, но(*ч*)чу, мы(*ш*)шу, Адэ(*с*)са, пале(*с*)скі, суд(*зь,дз*)я, заці(*ш*)ша, то(*н*)на, А(*л*)ла, ма(*н*)на, палоз(*з,ь*)е, гру(*п*)па.

**АДРОЗНІВАЙЦЕ** выпадкі фанетычнага падаўжэння, якое ўтвараецца ў выніку асіміляцыі зычнага з наступным гукам [ j ], ад марфалагічнага падваення зычных, якое адбываецца на стыку марфем: *галлё, Свіцяззю, заці**шш**а — паддобрыцца, расступіцца, раззлавацца, дзённы, кішэнны.*

**74.** *Выпішыце са сказаў словы з фанетычным падаўжэннем зычных, а потым — з марфалагічным падваеннем. Растлумачце, як узнікла фанетычнае падаўжэнне і марфалагічнае падваенне.*

1. Над палосамі свежай раллі, над жытняй рунню і травой цэлы дзень не змаўкаюць цудоўныя песні-званочкі жаўранкаў і грукатанне трактара. *(Б.)* 2. Жыццё я не зблытаю з сонечным ззяннем, бо гэтулькі колераў мае яно! *(П. М.)* 3. Шматлікіх рэчак буйнае разводдзе па ўсёй краіне радасна гудзе. *(Зв.)* 4. Каласы схіляе долу збожжа. *(П. М.)* 5. Бачу родныя ўзвышшы стройных волатаў-лясоў. *(Хвед.)* 6. Жыццё — найадказнейшы экзамен, яго ніяк не абмінеш. *(Ю.С.)* 7. Восенню, калі прыйшла пара ўборкі ўраджаю, юннаты з гордасцю падводзілі вынікі. *(Г. Ш.)* 8. На панелях кладуць узоры муляры,— рыхтуйце, людзі, наваселле. *(М. К.)* 9. Журыўся на Палессі журавель. *(Бар.)* 10. Па ўзбярэжжы пад соснамі стаялі палаткі, а найчасцей проста ”Масквічы” і ”Волгі”, у якіх спалі ноччу іх уладальнікі. *(І. Н.)* 11. Дождж вясенні несціхана лье, кроплямі на шкле аконным скача. *(П. М.)* 12. Усміхнулася сонца, дыхнула цяплом, міла, гожа праменне рассеяла. *(М. В.)*

**75.** *Спішыце словы, устаўляючы, дзе гэта патрэбна, прапушчаныя літары.*

Ранен..е, запеч..а, ран..е, зваліц..а, заз..яць, практыкаван..е, змянен..е, мыш..у, закрыц..ё, дванац..аць, мас..аж, адзен..е, злаўчыц..а, багац..е, стаго..дзе, узбярэж..а, імгнен..е, ван..а, Іл..інічна, Кас..янаў, рун..ю, аповесц..ю, сувяз..ю, шыр..ю, разво..дзе, мас..а, Сібір..ю, свежасц..ю, ат..эстат, груп..а.

**76.** *Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Падкрэсліце словы з фанетычным падаўжэннем зычнага. Вызначце, у межах якой марфемы адбылося падаўжэнне.*

1. Мабыць памыляюцца тыя паэты і піс..меннікі якія бачаць у восені адно толькі заміран..е жыц..я. *(І.Н.)* 2. Лопнуць павін..а гэта ветраная халадэча знясіліцца і апас..ці на з..млю с..негам ці дажджом. *(Жур.)* 3. Ламач..а пачалі скірдаваць у кустах за с..ценамі павеці далей ад дасужага ..ока. *(Кудр.)* 4. Амаль па ўсіх прадметах было паўтарэн..е і ён не браўся за кнігі спадзеючыся на сваю пам..ць. *(І.Н.)* 5. І кожны мес..ц на працягу двухсот гадоў адно дрэва дае па два..цаць-два..цаць пяць арэхаў. *(Я.М.)* 6. У промн..х со..нца трапеча паветра насычанае пахам жыц..яносных сокаў з..млі. *(Сам.)* 7. А наверсе па-ранейшаму патрэскваюць пад нагамі дробнае суч..а і старыя хвойныя шышкі. *(Б.)* 7. Раз н..праўда ці ашука а сумлен..ю навек мука. *(Прык.)*

## Правапіс мяккага знака і апострафа

**77.** *Выберыце і запішыце правільныя варыянты.*

Якую функцыю выконвае ў мове мяккі знак?

а) абазначае мяккасць зычных перад цвёрдымі;
б) выконвае раздзяляльную функцыю;
в) абазначае мяккасць зычных перад мяккімі.

**78.** *Выпішыце спачатку словы з раздзяляльным мяккім знакам, затым — са змякчальным, потым — з апострафам. Растлумачце іх правапіс.*

**I.** Нальём, мадзьяр, каньён, аб’інець, Ілья, Васільеў, лазь, Савельеў, ад’езд, аб’ём, ледзьве, трох’ярусны, абаўю, Лук’ян, браканьер, трох’ярусны, струменьчык, лёгенькі, праходзьце, вось, у барацьбе.

**II.** Разьбяр, бацькі, праменьчык, святло, Х’юстан, пісьменнік, дзьме, сядзьце, відэльцы, звесься, Об’ю, просьба, дзядзька, раз’юшаны, чэрвеньскі, Ульянаў, нальеш, у пісьме, мільён.

**79.** *Спішыце, устаўляючы апостраф або мяккі знак.*

Міл..ён, Лавуаз..е, Сал..еры, Васіл..еў, ранц..е, В..етнам, Мал..ер, інтэрв..ю, ад..ютант, кур..ер, парц..еры, нос..біт, кан..ён, Дзям..янавіч, ін..екцыя, кан..юнктура, кан..юнктывіт, куп..існы, камп..ютэр, з..едліва, бракан..ер, інтэр..ер. раз..юшаны, міл..ён, Лаўрэнц..еў, Заслаў..е, між..ярусны, Соф..я, марсел..еза, сен..ёр, ад..ютант, надвор..е, малакроў..е, п..яўка, рэл..еф, салаў..іны, Кас..ян, узмор..е, ал..янс, ар..ергард.

**80.** *Запішыце словы, згрупаваўшы іх паводле пунктаў правіла "Правапіс мяккага знака і апострафа".*

Штос..ці, ледз.., двух..ярусны, аб..інець, л..е, п..яўка, ц..мяны, ц..ма, дзьме, дз..муць, кон..мі, раз..бяр, раз..ба, дзес..ці, пяц..дзесят, шэсц..сот, людз..мі, ліпен..скі, восен..скі, струмен..чык, парц..е, ал..янс, аб..ём, раз..езд, б..юць, кап..ё, сен..ёр, верф..ю, лез..це, соцен..ка, вас..мёрка, звес..ся, грудз..мі, пас..янс, саф..ян, кал..е, медал..ён, сядз..це.

**81.** *Выпішыце асобна словы з мяккім знакам і апострафам.*

Камен..чык, поз..ні, ледз..ве, подз..віг, сляз..мі, хатын..скі, чамус..ці, Грыгор..еў, шампін..ён, яблын..ка, салаў..іны, бар..ер, Ул..яна, канферанс..е, раз..юшаны, між..ярусны, Мар..іна Горка, аб..інелы, Марэс..еў, Мантэск..é, разан..скі, вішан..ка, песен.., соцен.., аршан..скі, цянь-шан..скі.

**82.** *Запішыце словы, устаўляючы, дзе трэба, літары і знакі.*

Восем..дзесят, студзен..скі, вас..мёрка, сустрэн..ся, парц..еры, аб..яднанне, вераб..іны, самадзяржаў..е, дз..веры, жнівен...скі, стан..це, ц..вілы, барац..біт, сур..ёзны, бул..ён, аб..ява, цюмен..скі, піс..меннасць, мен..ш, ін..шы, шэсц..сот, едз..це, Н..ю-Йорк, п..еса, аген..чык, у радас..ці, саф..ян, кампан..ён, ваз..мі, пяц..дзесят, міл..ярд.

**83.** *Спішыце, паставіўшы патрэбныя літары і знакі. Растлумачце правапіс апострафа і мяккага знака.*

1. Васіль аж дрыжаў: па-вар..яцку часта і шалёна закалацілася сэрца. *(Дал.)* 2. Гэй, наперад, покі сэрца б..ецца, рвецца на прастор. *(Куп.)* 3. Ой вы, хвалі рэчан..кі-красы, вашых песен.. л..юцца галасы. *(Я.П.)* 4. Губляе верасень залочанае пер..е і ў пераддз..вер..е восені ідзе. *(Зв.)* 5. Галоўнае, з чаго складаецца сутнас..ць прыгожай, радаснай з..явы, імя якой Колас,— заўсёды і поўнас..цю з намі. *(Б.)* 6. Ты ажываў, п..ючы жывую сілу, — яго [бору] смалы гарачае настой. *(Зв.)* 7. Жылі ўжо Куранi і ў гэту чэрвен..скую рань . *(İ.М.)*

## Ужыванне вялікай літары

**84.** *Дапоўніце пункты правіла прыкладамі, запішыце.*

З вялікай літары пішуцца:

а) прыналежныя прыметнікі, утвораныя ад уласных імён пры дапамозе суфіксаў ***-ев- (-еў), -ёв- (-ёў), -ов- (-оў), -ав- ( -аў), -ін (-ын):*** ... ;

б) прыналежныя прыметнікі, якія адпавядаюць сінанімічным спалучэнням са словамі *імя* або *памяці*: ... ;

в) лічэбнікі ў складзе ўласных імён, калі яны абазначаюцца словамі: ... ;

г) назвы гістарычных эпох і падзей, апрача агульных назоўнікаў: ... ;

д) першае слова ў назвах навучальных устаноў, розных аб’яднанняў, арганізацый, таварыстваў: ... .

**85.** *Растлумачце напісанне вялікай літары. Напісанні якіх слоў можна аднесці да дыферэнцыраваных?*

**I.** Пётр Першы, Рычард Ільвінае Сэрца, Бонч-Бруевіч, Жан-Жак Русо, Барклай дэ Толі, форд, маўзер, дамавік, русалка, Баба-Яга, баба-яга, Міхасёў сшытак, Мурчыны кацяняты, пракрустаў ложак, Берынгаў праліў, купалаўскія традыцыі, Гібралтар, Забайкалле, Заходняя Еўропа, Маскоўская шаша, аповесць “Жураўліны крык”, востраў Зямля Прынца Карла, Заходне-Сібірская нізіна, Лас-Вегас, Мацей Бурачок, Чэшская рэспубліка, Люксембург, Паўночная Італія, Кіеўскі бульвар, сузор’е Вялікага Пса, Скандынаўе, фотаздымкі Месяца, 9 Мая, медаль “За адвагу”, другая сусветная вайна, Арабская Рэспубліка Егіпет, магдэбургскае права, полацкая Сафія, Турава-Пінскае княства.

**II.** У ледніковы перыяд, Міжнародны год кнігі, Медны бунт, Кубак свету па біятлоне, Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь, Коласаўская стыпендыя, коласаўскія творы, Інстытут міжнародных зносін, “Руская праўда”, Цётка, Сафійскі сабор, Генеральны Пракурор Рэспублікі Беларусь, Рэфармацыя, каралева Даніі, мітрапаліт, том Выбраных твораў Кузьмы Чорнага, бульба “агат”, ІЛ-18, абкам, Дзяржвыд, АЭС, МАЗ, нэп, Бі-бі-сі, рэнтген, Алексій II, завод “Прамень”, мыс Добрай Надзеі, Арыён, 8 Сакавіка, Беларускі дзяржаўны універсітэт, Жуччыны шчаняткі, Марс, беларускі абутак, Генеральная Асамблея ААН, медаль “За працоўную доблесць”.

**86.** *Запішыце назвы:*

| | |
|---|---|
| 1) ордэнаў, медалёў, нагрудных знакаў; | 5) беларускіх газет; |
| 2) беларускіх часопісаў; | 6) беларускіх свят; |
| 3) міжнародных арганізацый; | 7) складаных прозвішчаў; |
| 4) беларускіх навучальных устаноў; | 8) беларускія састаўныя геаграфічныя назвы; |

**87.** *Спішыце, раскрываючы дужкі.*

Племя (Р,р)адзімічаў, (П,п)анчанкава паэма, планета (З,з)ямля, (Т, т)аварыства беларускай мовы, (П,п)алачанін, (К,к)упалава паэма, (Б,б)рылёўскі стыль, (П,п)алескія балоты, (Д,д)октар навук, (Н,н)ародны артыст, (З,з)аслужаны дзеяч навукі і культуры, (М,м)іністр (Л,л)ёгкай прамысловасці, (Н,н)інін сшытак, эпоха (А,а)драджэння, (У,у)сходнія славяне, (А,а)йчынная гісторыя, (Г,г)рамадзянская вайна, Генрых (Ч,ч)ац-

вёрты, (П,п)адуанскі універсітэт, (С,с)карынаўскія чытанні, (В,в)ялікая (А,а)йчынная (В,в)айна, (Р,р)эспубліка Беларусь, (Д,д)амоклаў меч, (М,м)алдаўскі вінаград, (В,в)іцебскі (Д,д)зяржаўны (У,у)ніверсітэт, (К,к)аралеўства Нарвегія, сузор'е (В,в)ялікай (М,м)ядзведзіцы, (П,п)алата (П,п)радстаўнікоў (Н,н)ацыянальнага (С,с)ходу (Р,р)эспублікі Беларусь, (О,о)рдэн (Д,д)ружбы (Н,н)ародаў, (Д,д)ом літаратараў, (Т,т)узікава будка, (Л,л)едніковы перыяд, (М,м)іністэрства (Т,т)ранспарту, (В,в)ялікая (К,к)ітайская (С,с)цяна, (П,п)аўночны (Л,л)едавіты (А,а)кіян.

**88.** *Вусна ўстаўце патрэбныя літары, расстаўце знакі прыпынку.*

На *(П,п)*оўдні Беларусі на ўзбярэжжы наравістай Прыпяці дзе само паветра напоўнена духам *(П,п)*аляшуцкіх легенд і паданняў стаіць *(С,с)*таражытны Тураў сэрца *(П,п)*алескага краю былая *(С,с)*таліца некалі моцнага *(К,к)*няства *(Р,р)*адзіма *(З,з)*латавуста зямлі *(Б,б)*еларускай пісьменніка-прапаведніка Кірылы *(Т,т)*ураўскага.

Назва мястэчка хутчэй за ўсё паходзіць ад імя яго заснавальніка *(В,в)*аражскага князя *(Т,т)*ура брата *(Р,р)*агвалода (уладара *(П,п)*олацкай *(З,з)*ямлі, бацькі *(Р,р)*агнеды) па іншай версіі ад назвы вымерлага дзікага быка.

У 2-й палове X і пачатку XI ст. Тураў вылучаўся адметнай роляй у сацыяльна-палітычным жыцці *(С,с)*таражытнарускіх княстваў. Ён знаходзіўся на водным шляху ў Кіеў і ўладарылі тут старэйшыя сыны *(В,в)*ялікага *(К,к)*іеўскага князя. У часы *(С,с)*вятаполка Тураў меў значэнне самастойнага княства і разам з *(П,п)*олацкім і *(С,с)*маленскім стаў асветніцкім цэнтрам *(С,с)*таражытнай *(Р,р)*усі. Але ў 2-й палове XП ст. *(Т,т)*ураўскае княства ўступіла ў стадыю феадальнай раздробленасці і Тураў страціў сваё ранейшае палітычнае значэнне.

Адметнасцю сённяшняга мястэчка якое захавала патрыярхальныя рысы з'яўляецца помнік Кірылу *(Т,т)*ураўскаму (скульптар Міхась Іванкоў) адкрыты на *(З,з)*амкавай *(Г,г)*ары 11 траўня 1993 года. Адзін з першых манахаў *(С,с)*таражытнай *(Р,р)*усі ў маўклівым задуменні спасцігае цішыню *(Я,я)*го *(В,в)*ялікасці Турава. Можа і ён чакае калі здарыцца цуд знойдуцца ўсе крыжы што некалі прыплылі сюды з Кіева узнімецца з балота старая царква на **(***Б,б)*арысаглебаўскіх могілках і для людзей зямлі *(Б,б)*еларускай настане час росквіту час *(Р,р)*энесансу... *("Роднае слова")*

**89.** *Адзначце словы, у якіх пішацца вялікая літара:*

**Варыянт 1**

(М,м)іністэрства (А,а)дукацыі, (Б,б)еларускія лясы, (Д,д)зень настаўніка, Арганізацыя (А,а)б'яднаных (Н,н)ацый, (М,м)іхасёвы прыгоды,

(П,п)ершае (М,м)ая, (А,а)рыядніна ніць, (Д,д)он (К,к)іхот, (П,п)алескія краявіды, (М,м)едаль ”За адвагу”, (Б,б)ожая маці, (Л,л)еднiковы перыяд, Лопэ (Д,д)э Вэга, (Д,д)апятроўская эпоха, (М,м)інскі трактарны завод.

**Варыянт 2**

(К,к)упалаўскі стыль, (З,з)аходняя Беларусь, (П,п)раметэеў агонь, Новы (Г,г)од, (Н,н)арачанскія краявіды, (Д,д)зень нараджэння, (С,с)ярэднявечча, (С,с)карынаўская стыпендыя, Мамін-(С,с)ібірак, (Н,н)ародны пісьменнік, Вялікая (А,а)йчынная вайна, Таварыства (Б,б)еларускай мовы, Дзень (Д,д)руку, пасёлак Новая (В,в)ёска, (А,а)хілесава пята.

**90.** *Прачытайце тэкст. Растлумачце правапіс вялікай або малой літары.*

ВАСІЛЬ УЛАДЗІМІРАВІЧ БЫКАЎ

Васіль Уладзіміравіч Быкаў нарадзіўся 19 чэрвеня 1924 года ў вёсцы (Б,б)ычкі (У,у)шацкага (Р,р)аёна (В,в)іцебскай (В,в)обласці. Бацька яго ўдзельнічаў у (П,п)ершай (С,с)усветнай вайне, а затым у (Г,г)рамадзянскай. Васіль Быкаў, скончыўшы ў 1939 годзе восем класаў (К,к)убліцкай (С,с)ярэдняй (Ш,ш)колы, паступіў на (С,с)кульптурнае аддзяленне (В,в)іцебскага (М,м)астацкага (В,в)учылішча. Аднак восенню 1940 года ў сувязі з пагаршэннем матэрыяльнага становішча сям’і і адменай (Д,д)зяржаўных (С,с)тыпендый вымушаны быў пакінуць вучобу ў вучылішчы. Паступіў у (В,в)іцебскую школу ФЗН, дзе вучыўся да (М,м)ая 1941 года. У чэрвені экстэрнам здаў экзамены за дзесяты клас (К,к)убліцкай (Ш,ш)колы.

У самым пачатку (В,в)ялікай (А,а)йчыннай (В,в)айны быў мабілізаваны на абарончыя работы. У зіму 1941-1942 гадоў жыў на (С,с)танцыі (С,с)алтыкова ў (А,а)ткарску (С,с)аратаўскай (В,в)обласці, дзе вучыўся ў (Ч,ч)ыгуначнай (Ш,ш)коле. Улетку 1942 года быў прызваны ў (Ч,ч)ырвоную (А,а)рмію, скончыў (С,с)аратаўскае (П,п)яхотнае (В,в)учылішча і з 1943 года ваяваў на (Д,д)ругім і (Т,т)рэцім (У,у)краінскіх (Ф,ф)рантах.

Пасля дэмабілізацыі жыў у (Г,г)родне, працаваў мастаком у (Г,г)родненскіх (М,м)айстэрнях, у рэдакцыі (А,а)бласной газеты “(Г,г)родзенская (П,п)раўда”. У 1949 - 1955 гг. Зноў служыў у (С,с)авецкай (А,а)рміі. Быў абраны (С,с)акратаром (Г,г)родзенскага (А,а)ддзялення (С,с)аюза (П,п)ісьменнікаў БССР (1972 - 1978).

З’яўляецца (Л,л)аўрэатам (Л,л)ітаратурнай (П,п)рэміі (І,і)мя Я. Коласа, (Дз,дз)яржаўнай (П,п)рэміі СССР, (Л,л)енінскай прэміі. З 1980 года — (Н,н)ародны (П,п)ісьменнік БССР. *(Л. Савік)*

# Правапіс складаных назоўнікаў

**91.** У **левы** слупок запішыце назоўнікі, у **правым** слупку коратка растлумачце іх напісанне.

**ЗЛІТНА:**

1. ***Радыё***хвалі, ***радыё***камітэт, ***фота***здымак, ***фота***копія, ***фота***картка, ***фата***графія, ***авія***база, ***аэра***флот, ***мікра***клімат, ***агра***біялогія, ***кіна***фестываль, ***грос***майстар, ***аэрафота***прыбор, ***вела***спорт, ***мата***цыкл, ***мота***крос, ***спорт***лато, ***контр***рэвалюцыя, ***контр***удар, ***контр***меры, ***гоф***маршал, ***хлор***вініл.
2. Жывёлагадоўля, торфабрыкет, вадасховішча, вуглездабыча, халадакамбінат, золатаздабыча.
3. БелТА, БелАМ, Днепрагэс, Дзяржюрвыдавецтва.
4. Мір*гарад*, Звяні*гарад*, Слаў*гарад*, Іван*горад*, Светла*горск*, Зелена*градск*, Петра*град*, Пецяр*бург*.
5. Дзяржыдрэва, дзяржыморда, верціхвостка, Вернідуб, Пакацігарошак, сарвігалава, скапідом, гарыцвет, балігалоў**;** **але:** перакаці-поле, узвей ∅-вецер, Гуляй ∅- поле.
6. ***Паў***яблыка, ***паў***метра, ***паў***вярсты, ***паў***капы́; **але:** ***паў***-Беларусі, ***паў***-Сібіры, ***паў***-Віцебска.
7. ***Нава***полацк, ***Нава***зыбкаў, ***Нава***ельня, ***Нава***беліца, ***Нова***сібірск, ***Нова***расійск, ***Нова***барысаў, ***Стара***барысаў**;** **але:** ***Стара***-Канстанцінаў, ***Нова***-Вязнікі і некаторыя іншыя. (Няма тут парадку)

**ПРАЗ ЗЛУЧОК:**

1. Жар∅-птушка, сон∅-трава, папараць∅- кветка, генерал ∅-лейтэнант, прэм'ер ∅-міністр.
2. ***Унтэр***-афіцэр, ***лейб***-гвардыя, ***экс***-чэмпіён, ***экс***-прэзідэнт, ***контр***-адмірал, ***штаб***-кватэра, ***віцэ***-прэзідэнт.
3. Кілават-гадзіна, самалёта-вылет, грам-атам, электрон-вольт, чалавека-дзень, кілаграм-сіла, койка-дзень, тона-кіламетр**;** **але:** працадзень.

| | |
|---|---|
| **4.** Норд-ост, норд-вест, зюйд-ост, зюйд-вест.<br><br>**5.** Мамін-Сібірак, Міклуха-Маклай, Дунін-Марцінкевіч, Бялыніцкі-Біруля, Жаліó-Кюры, Салтыкоў-Шчадрын; **<u>але</u>:** Васка **да** Гама, Лопэ **дэ** Вэга...<br><br>**6.** Рыо-дэ-Жанейра, Растоў-**на**-Доне, Нікалаеўск-**на**-Амуры, Франкфурт-**на**-Одэры.<br><br>**7.** Порт-Артур, Сан-Францыска, Іcык-Куль, Улан-Удэ, Буда-Кашалёва, Давыд-Гарадок, Санкт-Пецярбург, Лос-А́нджэлес, Ост-Індыя, Гусь-Хрустальны, Петрапаўлаўск-Камчацкі**;** **<u>але</u>:** Індакітай, Чэхаславакія.<br><br>**8.** ***Усць***-Абакан, ***Усць***-Каменагорск, ***Ніжне***-Амурскі, ***Верхне***-Ангарск, ***Верх***-Ільмень**;** **<u>але</u>:** ***Верхня***дзвінск.<br><br>**9.** Дзвіна-рака, Князь-возера**;** хлапчук-гарэза, баба-яга, хата-чытальня, вагон-рэстаран, дзяўчына-красуня, рабочы-латыш, дуб-волат, лён-даўгунец; **<u>але</u>:** рака Дзвіна, возера Свіцязь, красуня дзяўчына, герой горад, мільянер калгас, волат дуб. (З двума агульнымі назоўнікамі — спрэчны момант)<br><br>**10.** Хлеб-соль, шляхі-дарогі, гусі-лебедзі.<br><br>**<u>А С О Б Н А</u>:**<br><br>Справ***<u>а</u>*** справ***<u>ай</u>***, работ***<u>а</u>*** работ***<u>ай</u>***, гульн***<u>я</u>*** гульн***<u>ёй</u>***.<br>Усё ўсякае**;** раз ***за*** разам, час ***ад*** часу, дзень ***у*** дзень, з дня ***ў*** дзень, адзін ***у*** адзін, слова ***ў*** слова… | |

**92.** Адзначце **<u>нумары</u>** назоўнікаў, якія пішуцца праз злучок.

| **<u>Варыянт 1</u>** | **<u>Варыянт 2</u>** |
|---|---|
| 1) паў/лугавіны | 1) бія/цыкл |
| 2) экс/чэмпіён | 2) контр/ідэя |
| 3) Бяла/Падляска | 3) Пяці/горск |
| 4) зубра/пітомнік | 4) Сямі/палацінск |
| 5) палі/тэхнікум | 5) мёда/варэнне |
| 6) меда/варня | 6) чае/апрацоўка |
| 7) проціва/газ | 7) шкло/кераміка |
| 8) чая/піцце | 8) нова/будоўля |

| | |
|---|---|
| 9) шкла/посуд | 9) Гі/дэ/Мапасан |
| 10) жыцце/апісанне | 10) паў/абарот |
| 11) паў/участка | 11) след/у/след |
| 12) раз/у/раз | 12) плакун/трава |
| 13) стоп/кран | 13) праграма/мінімум |
| 14) Леанарда/да/Вінчы | 14) бліц/турнір |
| 15) Улан/Батар | 15) каза/дзераза |
| 16) Ла/Манш | 16) блок/схема |
| 17) коне/завод | 17) Доўнар/Запольскі |
| 18) Бонч/Бруевіч | 18) віцэ/канцлер |

**93.** *Спішыце, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс складаных назоўнікаў.*

(Кіна) павільён, дом (музей), Магілёў (Падольскі), дальна (бачнасць), (гука) запіс, (горад) музей, (гідра) тэхнік, (праца) дзень, (электра) механік, (Бічэль) Загнетава, (мікра) клімат, (салон) магазін, Камень (на) О́бі, (станка) будаванне, (вагон) рэстаран, горы (Сіхатэ́) Алінь, Лада (Заблоцкі), (сімфонія) балада, (Порт) Артур, Па (дэ) Кале, (Нова) сібірск, (віцэ) адмірал, (земле) апрацоўка, (шкло) валакно, (груза) перавозка, (стэрэа) сістэма, (сацыял) рэфармізм, (Нью) Йорк, далай (лама), (мідзі) спадніца, (каютъ) кампанія, (кока) кола, (вундэр) кінд, (гогаль) могаль, (ваен) урач, (альфа) часціца, (прыма) балерына, (плакун) трава, (паў) Гомеля, (паў) яблыка.

**94.** *Спішыце, раскрываючы дужкі. Устаўце прапушчаныя літары ў складаных назоўніках. Расстаўце знакі прыпынку.*

1. Борзда адыходзіла назад станцыя з высокаю *(в..да)* качкаю закрываючыся свежаю зеленню раслін. *(К-с)* 2. *(Чырв..на)* армейцы расчысцілі снег падрыхтавалі месца для вогнішча. *(К-с)* 3. Магутныя бульдозеры зараўноўвалі на руінах варонкі ад *(авія)* бомбаў. *(Пасл.)* 4. Дождж тужліва барабаніў у дрэвы, падаў разам з бярозавым ды асінавым *(ж..ўта)* лісцем на сыры дол. *(А.М.)* 5. Зямля заглынула атруту панюхаць боязна *(мяту)* руту. *(Р.Б.)* 6. *(Н..ва)* грудак (а мясцовыя людзі яго чамусьці на польскі манер называюць *(Н..ва)* градак) кіламетраў на семдзесят у наваколлі ляжыць на *(Н..ва)* грудскім узвышшы. *(Каратк.)*

## <u>Правапіс складаных прыметнікаў</u>

**95.** Запішыце прыметнікі **ў левы слупок** злітна, праз злучок ці асобна. **У правым** растлумачце іх напісанне **<u>па ўзоры</u>:**

| | |
|---|---|
| 1) *светла-зялёныя палеткі* | адценне колеру; утворана ад *светлы* **і** *зялёны* (ад **раўнапраўных** паняццяў); = **і** |
| 2) *нізкааплатны* | у базе — **галоўны і залежны** кампаненты з **падпарадкавальнай** сувяззю: *нізкая* ***аплата***; утворана складана-суфіксальным спосабам |
| 3) *глыбокапаважаны* | утворана ад *глыбока паважаны* спосабам **чыстага словаскладання,** без злучальнай галоснай; абазначае **адно паняцце** |
| 4) *граматычна правільны* | абазначае **два** самастойныя **паняцці** |
| 5) ***Паўднёва-****Афрыканская Рэспубліка* | складаныя прыметнікі з першай часткай ***усходне-, заходне-, паўднёва-, паўночна-*** ў складзе **геаграфічнай назвы** |
| 6) *паўднёваафрыканскія землі* | **гл. пункт 2:** ад галоўнага і залежнага кампанентаў *Паўднёвая* ***Афрыка*** + суфікс |
| 7) *валгадонскі* | суфіксальнае ўтварэнне ад *Валгадонск* — **ад складанага назоўніка,** які пішацца **злітна** |
| 8) *цянь-шанькі рэгіён* | суфіксальнае ўтварэнне ад *Цянь-Шань* — **ад складанага назоўніка,** які пішацца **праз злучок** |
| 9) ***пры****будакашалёўскія краявіды* | ад *Буда-Кашалёва* — ад **складанага** уласнага назоўніка, які пішацца праз злучок, але **ёсць прыстаўка** (утворана **прыставачна-суфіксальным спосабам)** |
| 10) *жуль-вернаў/скія прыгоды* | суфіксальнае ўтварэнне **ад імя і прозвішча** *Жуль Верн* |
| 11) *паўночна-ўсходні накірунак* | напрамкі свету (гл. таксама пункт **1** ) |
| 12) *старажытнагрэчаскі алфавіт* | ад галоўнага і залежнага кампанентаў з падпарадкавальнай сувяззю *старажытныя грэкі* |

| | |
|---|---|
| 1) агніста/чырвоны ўсход<br>2) вечна/зялёны ўбор<br>3) добра/падрыхтаваны ўрок<br>4) народна/дэмакратычны лад<br>5) мала/вядомы верш | 25) бел∅/чырвона/белы сцяг<br>26) хутка/цечная аперацыя<br>27) добра/прадуманае рашэнне<br>28) добра/ўпарадкаваная кватэра<br>29) мала/выразны малюнак |

| | |
|---|---|
| 6) высока/таленавіты журналіст | 30) адмыслова/зробленая рэч |
| 7) вузка/калейная чыгунка | 31) чыста/вымытая сарочка |
| 8) незвычайна/прыгожы край | 32) стылістычна/нейтральная лексіка |
| 9) усходне/славянская мова | 33) давыд/гарадоцкія краявіды |
| 10) заходне/еўрапейскі Рэнесанс | 34) высака/якасны адбор |
| 11) Заходне/Сібірская нізіна | 35) дзівосна/багаты ўраджай |
| 12) заходне/сібірскія лясы | 36) ціха/плынны ручэй |
| 13) пры/чарна/морскі клімат | 37) паўднёва/славянскі народ |
| 14) буда/кашалёўскія дарогі | 38) доўга/чаканы госць |
| 15) пры/давыд/гарадоцкія ўзгоркі | 39) пярэдне/баковы кавалак |
| 16) Івана/Франкоўскі раён | 40) сто/гадовы дзед |
| 17) леў/талстоўскі матыў | 41) шмат/павярховы дом |
| 18) стара/славянскія літары | 42) івана/франкоўскія палі |
| 19) светла/каштанавыя валасы | 43) маладзёжна/будаўнічы атрад |
| 20) бледна/жоўтае адзенне | 44) смугла/твары юнак |
| 21) руса/валосы хлопец | 45) літаратурна/мастацкі часопіс |
| 22) паўднёва/заходні вецер | 46) горна/алтайскі луг |
| 23) глыбака/думны позірк | 47) за/ісык/кульскія прасторы |
| 24) густа/населены пункт | 48) снежна/белае покрыва |

**96.** *Запішыце складаныя* ***прыметнікі і назоўнікі*** *разам, асобна ці праз злучок. Вусна растлумачце іх правапіс.*

Агра/тэхніка, аўта/пілот, высока/адукаваны, вышэй/пералічаныя, грунтоўна/прадуманы, гуслі/самаграі, дзівосна/прыгожы, думкі/мары, заходне/германскі, зюйд/вест, кілаграм/калорыя, кіна/кадр, кіна/канцэрт, кіселе/падобны, класава/варожы, кола/гусенічны, коне/завод, конна/гвардзеец, конна/спартыўны, контр/адмірал, контр/атака, контр/манеўр, контр/меры, контр/разведка, корма/ўборачны, культурна/масавы, культ/масавы, купля/продаж, крытыка/бібліяграфічны, крэйсер/авіяносец, лева/бярэжжа, лева/бярэжная, легка/вагавы, леса/тэхнічны, лёгка/маторны, лёгка/ўзброены, лёгка/ўспрыняты, ліберальна/манархічны, мала/вопытны, мала/габарытны, мала/дасведчаны, малочна/кансервавы, малочна/кіслы, малочна/таварны, малочна/мясны, масла/завод, матч/турнір, мед/санбат, мела/драма, макра/космас, мікра/раён, міні/ансамбль, мота/дром, мота/лодка, мяса/малочны, мяса/прадукты, мяса/раслінны, навукова/абгрунтаваны, навукова/папулярны, народа/насельніцтва, народа/ўладдзе, народна/гаспадарчы, народна/дэмакратычны, обер/пракурор, обер/яфрэйтар, паліт/эмігрант, паў/акна, паўднёва/афрыканскі, паў/Мінска, празрыста/сіні, праца/дзень, прэс/канферэнцыя, псеўда/навуковы, пяці/сот/кіламетровы, радыё/тэлеграма, сама/адвод, свежа/марожаны, складана/скарочаны, сон/трава, стара/дарожскі, трох/павярховы, экс/міністр.

**97.** *Ад прапанаваных словазлучэнняў утварыце складаныя прыметнікі, растлумачце іх правапіс.*

Доўга чакаць, мала хлеба, малочны і мясны, мала ўжываецца, розныя планы, розныя бакі, рымскі і каталіцкі, светлы і чырвоны, сівыя валасы.

• *Падбярыце да кожнага прыметніка назоўнік, атрыманыя словазлучэнні запішыце.*

**98.** *Спішыце сказы, ад слоў у дужках утвараючы складаныя прыметнікі; дапасуйце іх да назоўнікаў. Вусна растлумачце правапіс прыметнікаў.*

1. Каля дуба бярозка ўзнялася высокая, бела (коры), станам і ліствой ясна (вокі). *(К.Б.)* 2. Не стаяць мне з сярпом в..стра (зубы) у жыце, не схіляцца сярод шапаткіх каласоў. *(Гіл.)* 3. Я люблю гэтыя прасторы, люблю неаглядныя руж..ва (сіні) далі іх. *(К-с)* 4. Пачакай, хутка (цечны) дзень! Затрымайся хоць на імгненне. *(В.Ж.)* 5. Наперадзе ехаў светла (бароды) чалавек у жалезнай шапцы і падобнай да рыбінае лускі жалезнай кашулі. *(У.А.)* 6. Ксеня, з вялікімі цёмна (сіні) вачыма, ч..рна (валосы) і зграбная, жыве сваім жыццём. *(Л.Г.)* 7. Луг успыхнуў раптам і засвяціўся, замільгаў такімі ж самымі брыльянтавымі агеньчыкамі — ад халодна (сіні) да гарача (аранжавы). *(Я.С.)* 8. Быццам нейкая ц..нтра (бежны) сіла разагнала іх убакі, да небасхілу...

**99.** *Адзначце нумары слоў, якія пішуцца разам.*

А: 1) анты_навуковы, 2) контр_удар, 3) дваццаці_тонны, 4) дызель_маторны, 5) светла_русы.

Б: 1) кветка_ружа, 2) паўтара_гадовы, 3) малочна_белы, 4) сёе_тое, 5) стара_славянскі.

В: 1) мікра_клімат, 2) сіні_сіні, 3) добра_прачытаны, 4) інфра_чырвоны, 5) гідра_ турбіна.

Г: 1) сто_кіламетровы, 2) літаратурна_мастацкі, 3) гультай_гультаём, 4) жылі_былі, 5) Масква_рака.

**100.** *Адзначце словы, якія пішуцца праз злучок.*

А: 1) перакаці_поле, 2) электра_зварка, 3) агра_біялогія, 4) самалёт_знішчальнік, 5) поўна_метражны.

Б: 1) авія_база, 2) Буда_Кашалёва, 3) расліна_верас, 4) чыста_беларускі, 5. пан_ісламізм.

В: 1) высока_ўзняты, 2) шарыка_падшыпнік, 3) віцэ_прэзідэнт, 4) крыжа_падобны, 5) горка_салёны.

Г: 1) сарака_дзённы, 2) супер_вокладка, 3) прэс_цэнтр, 4) рыба_меч, 5) ультра_гукавы.

**101.** *Устаўце, дзе трэба, літары. Зрабіце фанетычны разбор адзначаных слоў.*

1. Ягор пра боты нават не **за..каўся** ф пры бацьку. *(В.Б.)* 2. Затарахцеў рухавічок, і ў клубе за..грала рады..ла. 3. Пачынае..ца ўсё з любві — **а..чужэн..е** ф, боль і н..навісць. *(Янішч.)* 4. Выр..сла ў нас многа цыц..ронаў, з мікрафончыкам ля іх — і цыц..рончыкі. *(Панч.)* 5. Была калісь праўда, ды за..ржавела. *(Прык.)* 6. Сучаснае кітайскае пісьмо мае больш за сорак тыс..ч і..рогліфаў. *(М.П.)* 7. Там кожнае дрэ..ца дыхае знаёмым вод..рам, у кожным с..певе птушак і журчан..і ручайка (ў,у)гадвае..ца гучан..е ма..чынай песні. *(Стар.)* 8. Над гэтым салда(тс,ц)кім капцом дарагім прашу аднагодкаў: праверце, ці не зараслі дзе да родных магіл сц..жынкі (ў,у) полі і (ў,у) сэр(д)цы! *(Гіл.)* 9. Уз..дуць з..рн(е,я)ты — ліху канец. *(У. Ж.)* 10. (І)мшарыны стракацяць (р..зна)каляровымі сыраежкамі, бабкамі, падасінавікамі. *(Сач.)* 11. Далей была густая цемра, напо(е,я)ная (в)острым смалістым пахам і гаркаватым (в)осеньскім туманам. *(Пасл.)* 12. Колькі вярова..цы ні ві..ца, а канцу быць. *(Прык.)* 13. І ў вераб..я ёсць сэр..ца. *(Прык.)* 14. (Ш,с)часлівы той, каго на..чадкі помн..ць. *(Прык.)* 15. Багдановіч чамус..ці, узяўшы свой ба(у,ў)льчык, вы..шаў з вагона. Поезд стаяў перад апу..чаным шлагба..мам. *(Мік.)*

**102.** *Устаўце прапушчаныя літары і растлумачце напісанне слоў.*

Б..розавік, л..дзяш, р..ўнадзенства, св..тлата, в..льналюбівы, квец..нь, м..днастволы, кап..жы, в..трыска, ц..плыня, н..ўгамонны, ж..ўталісце, жыцц..радасны, св..ткаванне, сн..гіры, мал..ўнічы, м..целіца, р..зна-каляровы, п..ршацвет, сп..вакі, з..мляроб, б..лізна́, н..ўстойлівы, с..нцапёк, з..ляніна, в..снянка, в..сяліць, свеж..нькі, мн..гагалоссе, п..сняры, п..рун.

**103.** *Выканайце тэставыя заданні.*

**<u>ВАРЫЯНТ І.</u>** 1. *У якіх словах трэба пісаць літару* ***<u>я</u>****?*

1) Н..свіж, 2) Х..рсон, 3) ц..гнік, 4) п..цярня, 5) зав..зці.

2. *Адзначце словы, дзе пішуцца спалучэнні* ***<u>ія</u>*** *(****<u>ыя</u>****):*

1) ак..н, 2) ген..логія, 3) пр..рытэт, 4) арх..логія, 5) ід..логія.

3. *У якіх словах пішацца* ***<u>й</u>****?*

1) раз..грацъ, 2) сы..сці, 3) ня..начай, 4) пера..мацъ, 5) за..грацъ.

4. *У якіх словах трэба ўставіць літару?*

1) на ..льнозаводзе, 2) пад ..льдом, 3) хлеб ..ржаны, 4) ..мгла, 5) ..мшара.

5. *Адзначце словы, дзе пішацца прыстаўная* ***<u>в</u>****:*

1) ..орша, 2) Лары..он, 3) ..ордэн, 4) аб..углены, 5) на..уковы.

6. *У якіх словах пішацца літара* **т***?*
1) ба..вінне, 2) плас..(і,ы)нка, 3) кар..(е,э)ж, 4) ..(е,э)геран, 5) муль..(і,ы)плікацыя.

7. *Адзначце словы, якія пішуцца разам:*
1) жыцця_здольны, 2) праца_ўладкаванне, 3) норд_ост, 4) праца_ёмкі, 5) шэра_чорны.

8. *Адзначце словы, напісаныя правільна:*
1) Людвіг Ван Бетховен, 2) Паўночны полюс, 3) Бярэзінскі запаведнік, 4) бешанковіцкі лес, 5) нацыянальная Акадэмія навук Беларусі.

9. *У якіх словах літара* **ю** *абазначае два гукі?*
1) раз'юшаны, 2) нюанс, 3) сцюжа, 4) Юрацішкі, 5) льюцца.

10. *Адзначце словы, у якіх вымаўляюцца падоўжаныя гукі:*
1) аддзячыць, 2) адчуваць, 3) усміхаешся, 4) зжаты, 5) гарадскі.

11. *Адзначце словы, у якіх літара* **ц** *абазначае мяккі гук [***ц'***]:*
1) сцэна, 2) цемра, 3) цнатлівы, 4) цэліцца, 5) цвёрды.

12. *Адзначце радкі, дзе ўсе падкрэсленыя літары абазначаюць націскныя галосныя:*
1) прадвесне, буйны (дождж), выразна, мысленне, данізу,
2) прыкрасць, спакваля, гаўбіца, дыспансер, гушчар,
3) фарміраваць, адзінаццаць, старэнькі, прамень, металургія.

**ВАРЫЯНТ II.** 1. *Адзначце словы, дзе пішацца* **о***:*
1) адажы.., 2) аб..ронец, 3) абл..кі, 4) Токі.., 5) б..равы.

2. *У якіх словах трэба ўставіць літару* **ы** *?*
1) д..макратыя, 2) гр..моты, 3) тр..о, 4) ябл..чны, 5) ц..р..монія.

3. *У якіх словах пішацца літара* **і** *?*
1) раз..граць, 2) аб..мшэлы, 3) за..нелы, 4) дэз..нфармацыя, 5) без..менны.

4. *Адзначце словы, у якіх не трэба ўстаўляць прапушчаную літару:*
1) ..опера, 2) ..урна, 3) ..узел, 4) ..окны, 5) На..ум.

5. *Адзначце словы, у якіх не трэба ўстаўляць літару* **і***:*
1) на ..льнозаводзе, 2) пад ..лбом, 3) высокае ..ржышча, 4) над ..льдом, 5) білет ..льготны.

6. *У якіх словах прапушчана* **дз***:*
1) брыга..ір, 2) ..(э,е)по, 3) сцюар..(е,э)са, 4) ..(і,ы)скамфорт, 5) ..(е,э)фект.

7. *Якія словы пішуцца разам?*
1) каротка_часовы, 2) кілават_гадзіна, 3) зелена_лісты, 4) вагона_рамонтны, 5) жалеза_бетон.

8. *Адзначце словы, напісаныя няправільна:*
1) Баркалабаўскі летапіс, 2) Купалаўскія персанажы, 3) сізіфава праца, 4) коласаўская манера пісьма, 5) курган Славы.

9. *У якіх словах не супадае колькасць літар і гукаў?*
1) дзесьці, 2) вясновы, 3) адчай, 4) разносчык, 5) насенне.

10. *Адзначце словы, у якіх літара* **я** *абазначае два гукі:*
1) звязка, 2) ячменны, 3) з’яднацца, 4) патрыярх, 5) па-летняму.

11. *Адзначце словы, у якіх ёсць гук [ **j** ]:*
1) узнаўляць, 2) сям'я, 3) па-іхняму, 4) пяцярня, 5) перыёдыка.

12. *У якіх радках усе падкрэсленыя літары абазначаюць націскныя галосныя?*
1) спіна, валёнкі, бляхар, выгнанец, рэзюме,
2) бліскавіца, цэнтнер, дакалыхаць, інструмент, давідна,
3) акунь, прысмакі, вясніцы, паліграфія, перавязь.

# ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ

**104.** *Выберыце правільныя варыянты адказаў:*

1. Сінанімічныя рады ўтвараюць наступныя словы:

а) планета, космас;
б) удзячнасць, прызнанне;
в) гармонія, суладнасць;
г) слынны, славуты;

2. Іншамоўнымі з'яўляюцца словы:

а) багацце; б) ландшафт; в) пяшчотна; г) слынны; д) рытм; в) гармонія.

● *Значэнне незразумелых запазычаных слоў высвятліце ў "Слоўніку іншамоўных слоў" А.М.Булыкі.*

**105.** *Выберыце правільныя варыянты адказаў.*

З'ява мнагазначнасці

а) спрыяе развіццю мовы;
б) збядняе мову, абмяжоўвае яе лексічны запас;
в) эканоміць моўныя сродкі;
г) ляжыць у аснове вобразнасці.

**106.** *Складзіце і запішыце сказы з выдзеленымі словамі ва ўсіх значэннях.*

1. **Душа** — 1) унутраны, псіхічны стан чалавека; яго перажыванні, настрой, пачуццё; 2) уласцівасць характару; 3) чалавек; 4) *перан.* натхніцель, арганізатар чаго-н.

2. **Клас** — 1) група вучняў аднаго года навучання; 2) пакой для заняткаў у класе; 3) разрад, група (*па якой-н. класіфікацыі*); 4) *разм.* высокі ўзровень чаго-н.

3. **Кранаць** — 1) датыкацца да каго-н., чаго-н.; даставаць; 2) *перан.* хваляваць; 3) прыводзіць у рух.

● *Вызначце, якім шляхам утварылася 3-е значэнне слова* ***душа****: а) метафара; б) метанімія; в) сінекдаха.*

● *Пры супастаўленні якіх значэнняў слова* ***клас*** *назіраецца метанімія.*

**107.** *Прачытайце радкі з верша Кастуся Цвіркі. Як вы разумееце сэнс назвы? Растлумачце лексічнае значэнне слоў з першых двух радкоў верша.*

ПЕРЛЫ РОДНАЙ ЗЯМЛІ

Абрус — абцас — азярод — арэлі...
Вясёлка — вырай — вярба — ваўчкі...
Як міла пазвоньваюць, сэрца грэючы,
Чыстых бацькоўскіх слоў ланцужкі!

● *Назавіце словы, ужытыя ў пераносным значэнні.*

**108.** *Запішыце сінонімы і антонімы да слоў* ***салодкі, свежы*** *ў прыведзеных кантэкстах.*

| Слова | Сінонім | Антонім |
|---|---|---|
| салодкі (сон) | | |
| салодкі (успамін) | | |
| салодкі (чай) | | |
| салодкая (усмешка) | | |
| свежы (ранак) | | |
| свежая (газета) | | |
| свежы (хлеб) | | |
| свежы (погляд) | | |

**109.** *Раскрыйце значэнне міжмоўных беларуска-рускіх амонімаў у мінімальным кантэксце. Словазлучэнні запішыце.*

<u>У з о р</u>: множны ***лік*** (число) — ***лик*** (твар) святых; ***прозвішча*** (фамилия) Аросева — обидное ***прозвище*** (мянушка).

Пакой, маніць, поўнач, краскі, свет, нядзеля, дыван, блага, ліст, бяседа.

**110.** *Якія пары слоў з'яўляюцца паронімамі? Раскрыйце іх лексічнае значэнне.*

Жарабя – жабяня; гліняны – глiнiсты; запаленне – запальванне; зубчасты – зубчаты; журавінны – жураўліны; палымнеюць – палаюць; эфектны – эфектыўны.

● *Складзіце і запішыце сказы са словамі-паронімамі. Пры неабходнасці звяртайцеся да "Слоўніка паронімаў беларускай мовы" С.М. Грабчыкава.*

**111.** *Спішыце, выбіраючы з дужак патрэбнае слова.*

1. Настаўнік павінен быць (*чуллівы, чулы*), добры. 2. Мінск стаў для мяне (*улюбёным, любімым*) горадам. 3. Прастата і народнасць мастацкага стылю робяць мову "Новай зямлі" багатай, (*каларыйнай, каларытнай*). 4. Такія (*святы, святкаванні*), як Купалле, Каляды, адлюстроўваюць багаты народны вопыт беларусаў. 5. Дуб гэты рос у глыбінных лясных (*недрах, нетрах*).

**112.** *Устанавіце адпаведнасць паміж моўнымі з'явамі і іх назвай.* **<u>Узор</u> <u>запісу</u>: А 3; Б 4; В 4…**

| | |
|---|---|
| **А.** *Дзяўчынка* ***Надзея*** *— Грэла сэрца* ***надзея.*** | **1.** Антонімы |
| **Б.** ***Прастудлівае*** *дзіця —* ***Прастудная*** *хвароба.* | **2.** Паронімы |
| **В.** ***Карэктны*** *адказ —* ***Правільны*** *выраз.* | **3.** Сінонімы |
| **Г.** *Пацярпеў* ***фіяска*** *— Атрымаў* ***няўдачу.*** | **4.** Мнагазначныя словы |
| **Д.** ***Малаціць*** *жыта —* ***Малаціць*** *у дзверы.* | **5.** Амонімы |
| **Е.** ***Асобныя*** *меркаванні —* ***Асабістыя*** *рэчы.* | |
| **Ё.** *Рыпучы* ***жураўель*** *— У небе шэры* ***жураўель.*** | |
| **Ж.** *Прыродны* ***фактар*** *— Абгрунтаваны* ***факт.*** | |
| **З.** ***Баечная*** *мараль —* ***Байкавая*** *коўдра.* | |
| **І.** *Сядзець на* ***лаве*** *— У расплаўленай* ***лаве.*** | |
| **К.** *Аддаваць* ***перавагу*** *— Мець* ***прыярытэт.*** | |
| **Л.** ***Спагадлівая*** *душа —* ***Жорсткая*** *натура.* | |

**113.** *Выберыце правільныя адказы з прапанаваных. Запішыце.*

1) ***кляваць носам*** — а) ісці побач; б) драмаць; в) павольна есці;

2) ***як серада на пятніцу*** — а) незадаволена; б) блізка; в) зрэдку;

3) ***у сабакі вачэй пазычыць*** — а) пільна ўглядацца; б) быць надакучлівым; в) набрацца нахабства;

4) ***лісам падшыты*** — а) цёплы; б) хітры; в) рыжы; г) хуткі; д) драпежны;

5) ***зарабіць, як Заблоцкі на мыле*** — а) прагадаць; б) выйграць, узбагаціцца.

**114.** *Складзіце такія пары сказаў, каб у адным з іх прыведзеныя спалучэнні выступалі як свабодныя, а ў другім — як фразеалагізмы.*

Задраць галаву, пусціць чырвонага пеўня, стаць на ногі, умытая расіцаю, смецце з хаты выносіць, табаку важыць.

**115.** *Прачытайце. Растлумачце сэнс прыведзеных выразаў. У тэкстах якога стылю мовы іх можна ўжыць?*

*З трыма-чатырма выразамі складзіце і запішыце сказы.*

Зляцець з языка. Язык і да Кіева давядзе. Язык аб зубы біць. Трымаць язык за зубамі. Мухі ў носе. Доўгі язык. Гаварыць з пенай на губах. Сказанага слова за губы не вернеш. Пальца ў рот не кладзі. І жала, і прала, і ткала, а ўсё языком. Зляцець з языка. Бойкі на язык. Языка няма.

**116.** *Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннем.*
**Узор запісу: А 1; Б 5; В 6…**

| | |
|---|---|
| **А.** *Вуды закідваць* | **1.** *Вельмі даўно* |
| **Б.** *Даставаць гізунты* | **2.** *Вельмі мала* |
| **В.** *За дзедам шведам* | **3.** *Вельмі прыгожы* |
| **Г.** *Рукой пайсці* | **4.** *Рабіць намёк на што-небудзь* |
| **Д.** *Як Пілiп з канапель* | **5.** *Здзіўлена, разгублена* |
| **Е.** *Выкручваць сырыцу* | **6.** *Нечакана, знянацку* |
| **Ё.** *Напрамілы бог* | **7.** *Вельмі шчыра і настойліва* |
| **Ж.** *З жабіны прыгаршчы* | **8.** *Моцна здзекавацца* |
| **З.** *Хоць вады напіся* | **9.** *Добра весціся, гадавацца (пра жывёл, птушак)* |
| **І.** *Як гусь на бліскавіцу* | **10.** *Муштраваць, цалкам падпарадкоўваць сваёй волі* |
| | **11.** *Павольна, не спяшаючыся* |
| | **12.** *Лавіць рыбу* |

**117.** *Прачытайце ўрывак з паэмы Я.Коласа “Новая зямля”. Выпішыце фразеалагізмы, растлумачце іх значэнне. Пры неабходнасці карыстайцеся “Фразеалагічным слоўнікам беларускай мовы” І.Я.Лепешава.*

За колькі дзён да касавіцы
Касцы заглянуць на паліцы,
Каб малаток знайсці і *бабку:*
Ідзе работа, не спі ў шапку.
Агледзьце, братцы, добра косы,
Каб не псаваць свае пракосы,
Каб не ўвадзіць людзей у грэх,
Касарства зводзячы на смех.

Пахібка знойдзецца якая,
Наш дзядзька першы не ўтрывае
І на пакошу тыкне пальцам:
Бяда няўмекам і нядбайцам,
Хто шнур зжуе няроўным плехам —
Антось яго ўжо дойме смехам,
Задзене проста за жывое,
Хоць сэрца ў дзядзькі і не злое.

● *Якая стылістычная роля фразеалагізмаў у гэтым тэксце?*

● *Растлумачце лексічнае значэнне слова* ***бабка*** *ў дадзеным кантэксце. Якія яшчэ лексічныя значэнні мае гэтае слова?*

# МАРФЕМІКА

## Марфемная будова слова

Да марфем адносяцца карані, прыстаўкі, суфіксы, канчаткі, постфіксы, інтэрфіксы. Прыстаўкі, суфіксы і постфіксы могуць мець словаўтваральнае і формаўтваральнае (граматычнае) значэнні. Напрыклад: прыстаўка ***пера-*** ў слове ***пера****чытаць* мае словаўтваральнае значэнне 'зноў' і граматычнае значэнне закончанага трывання; суфікс ***-іст*** у назоўніку *прагра****міст*** мае словаўтваральнае значэнне дзеючай асобы; формаўтваральны суфікс ***-ў*** у дзеяслове *се****ў*** мае граматычнае значэнне м. р., адз. л., пр. ч. Словаўтваральныя постфіксы ***-сьці (-сь)*** і ***-небудзь*** у неазначальных займенніках і прыслоўях маюць словаўтваральнае значэнне няпэўнасці. Формаўтваральны постфікс ***-це*** ў дзеясловах мае граматычнае значэнне загаднага ладу, 2-й асобы, мн. ліку. Постфікс ***-ся (-ца, -цца)*** у зваротных дзеясловах ма́е граматычнае значэнне зваротнасці, акрамя таго, можа выражаць і словаўтваральнае значэнне, напрыклад, значэнне ўзаемнасці (*абдымац****ца****, вітац****ца***), сумеснасці дзеяння (*сысці****ся****, мірыц****ца****, дзяліц****ца***), накіраванасці дзеяння на суб'ект (*абувац****ца****, апранац****ца***) і іншыя словаўтваральныя значэнні.

**Асцерагайцеся памылкі!**

Постфікс ***-ца*** сустракаецца ў інфінітывах, у формах 3-й ас. адз. і мн. л. дзеясловаў II спражэння і ў форме 3-й ас. мн. л. дзеясловаў I спражэння: *палохац****ца****, схілі́ц****ца****; ён схіл**іц**-****ца****; яны схіл**яц**-****ца****; яны палохај **уц**-****ца****.*

Постфікс ***-цца*** сустракаецца толькі ў дзеясловах I спражэння ў форме 3-й ас. адз. л.: *ён палохај* э ***цца****, вітај* э ***цца****, стрыж* э ***цца.***

Інтэрфікс — гэта марфема, якая прымацавана паміж марфемамі і служыць для іх злучэння ў складаных словах. Напрыклад, у наступных словах інтэрфіксамі з'яўляюцца злучальныя галосныя ***і, а, е, я*** і спалучэнні гукаў ***ух, ох:*** *пяц****і****бальны, лес****а****воз, сін****е****-зялёны, жыцц****я****здольны, дв****ух****моўе, тр****ох****'ярусны* і г. д. Інтэрфіксы ні словаўтваральнага, ні граматычнага значэння не маюць, але выконваюць словаўтваральную функцыю — злучаюць асновы пры ўтварэнні складанага слова.

**118.** *Прачытайце. Растлумачце на прыведзеных прыкладах дзеясловаў, як вы разумееце выказванне аўтара. Якія адценні значэнняў надаюць прыстаўкі прыведзеным аднакаранёвым дзеясловам?*

Адчуванне слова можна развіваць у сабе толькі ўважлівымі адносінамі да састаўных элементаў слова, якія часта выступаюць носьбітамі самых тонкіх адценняў значэння, што адрозніваюць адно слова ад другога.

Параўнаем: *пераплаціць, выплаціць, аплаціць*; *выпісаць, надпісаць, перапісаць, прыпісаць, упісаць* і г. д. *(А. Ціханаў)*

Д а в е д к а**.** Значэнні: 1) поўнасцю, да канца выканаць дзеянне; 2) ахапіць аб’ект дзеяннем; 3) перабольшыць меру; 4) накіраваць дзеянне ўнутр; 5) вылучыць, выдзеліць што-н. ці каго-н. з чаго-н.; 6) зноў, паўторна выканаць дзеянне; 7) дадаць, далучыць; 8) зверху**.**

**119.** *Параўнайце значэнні слоў з аднолькавымі марфемамі. Што агульнае ў іх семантыцы? Сфармулюйце гэтае агульнае значэнне аднолькавай марфемы ў словах кожнага рада. Пры неабходнасці карыстайцеся даведкай унізе.*

1. Раз’яднаць, разбурыць, раскрышыць, разбіць, разваліць.
2. Развешаць, размеркаваць, раскласці, расставіць.
3. Доктарскі, камандзірскі, шахцёрскі, выкладчыцкі, інжынерскі.
4. Гомельскі, мазырскі, пе́трыкаўскі, любанскі, віцебскі.
5. Восеньскі, снежаньскі, ліпеньскі, жнівеньскі, майскі.
6. Беларуска, украінка, татарка, грузінка, цыганка.
7. Спартсменка, масажыстка, паэтка, бібліятэкарка, кухарка.
8. Грубіянка, скандалістка, інтрыганка, транжырка, шантажыстка.
9. Сваячка, унучка, праўнучка, цётка, нявестка.

Д а в е д к а**:** Значэнні**:** 1) размеркаванне (прадметаў); 2) разбурэнне (прадметаў); 3) назва асобы жаночага полу паводле прафесіі, роду дзейнасці; 4) назва асобы жаночага полу па роднасці і сваяцтве; 5) назва асобы жаночага полу па адметнай якасці, тыповай рысе характару; 6) назва асобы жаночага полу па нацыянальнай прыналежнасці; 7) адносіны да месца; 8) адносіны да часу; 9) адносіны да прызначэння.

**120.** *Ці аднолькавыя паводле марфемнага складу наступныя словы з падобнымі гукавымі спалучэннямі? Графічна падзяліце словы на марфемы. Пры неабходнасці звяртайцеся да ”Школьнага марфемнага слоўніка беларускай мовы” А.М.Бардовіча, Л.С.Мормыш, Л.М.Шакуна (Мн., 2005).*

**I.** Пернік, варэнік (*параўн.*: ва́раны), ляснік, выдатнік, настольнік.

Надомніца, першакурсніца, грэшніца, капліца, завочніца, куніца, грыбніца.

Канчатак, пятак, мастак, узлесак, панядзелак (*гіст.*: па + нядзел + ак), нашчадак, світанак (*параўн.*: світаць, святло), мацунак, жаваранак.

**II.** Старанна, гасцінна (*параўн.*: гасц-ін-ая), зеляніна, піяніна, дысцыпліна, маліна, свяшчэнна (*параўн.*: святы́, асвяціць), дрэнна.

Пазатухаць, пазакласавы, пазакласны, пазачыняць, пазабіраць.

Па-мойму, тайму, свайму, буралому, па-нашаму, вашаму, атаму.

**121.** *Выпішыце словазлучэнні ў 5 слупкоў у адпаведнасці з наступнымі значэннямі прыстаўкі* **з- (с- ):** *1) спалучыць разам, у адно*; *2) накіраваць рух уніз*; *3) цалкам, поўнасцю ахапіць дзеяннем прадмет*; *4) здзейсніць рух у абодва бакі*; *5) дзейнічаць да поўнага знікнення прадмета.*

Склеіць аркушы; зляцець з дрэў; з’ехаць з гары; сшыць полкі спадніцы; змацаваць цвікамі; сысці з неба; спісаць стрыжань; змазаць усю нагу; злётаць у магазін; зганяць у горад; скасіць поле; сцерці сцірку (абцас); зрысаваць аловак; змераць поле; злазіць у пограб.

**122.** *Складзіце словазлучэнні са словамі і размяркуйце іх у адпаведнасці з пералічанымі ў папярэднім практыкаванні значэннямі прыстаўкі* ***з- (с- ).***

Злучыць, скаціцца, злезці, звязаць, збегчы, змыліць, збегаць, з’ездзіць, змераць, згрызці, скапáць.

●*У якіх з прыведзеных слоў прыстаўка* ***з-*** *мае значэнні, не названыя ў папярэднім практыкаванні?*

**123.** *Выберыце патрэбныя словы з тых, што ў дужках, і правільна ўтварыце словазлучэнні. Пры неабходнасці звяртайцеся да тлумачальных слоўнікаў.*

(Ганар***лів***ае, ганар***ов***ае, ганар***ыст***ае) званне; (***на***рэзаць, ***па***рэзаць) талерку сыру; (запас***н***ая, запас***лів***ая) вавёрка; (дождж***ав***ая, дождж***лів***ая) вада; (***на***дзець, ***а***дзець) акуляры; (загад***а***ць, загад***ва***ць) аддзелам; сінелі (гор***н***ыя, гор***ск***ія, гар***ыст***ыя) вяршыні; (ружав***е***ць, ружов***і***ць) ад сораму; (румян***е***ць, румян***і***ць) шчокі; (выклад***а***ць, выклад***ва***ць) беларускую мову; (вад***к***ая, вадз***ян***ая, вадзян***іст***ая) баня; (сусед***н***яя, сусед***ск***ая) вёска.

**124.** *Разгледзьце табліцу і дапоўніце яе сваімі прыкладамі.*

| **Постфікс -*ца*** | **Постфікс -*цца*** |
|---|---|
| асвятляць **ца** (інф.)<br>асвятляj\|уц\|**ца** (3 ас. мн. л.) | асвятляj\|э\|**цца** ( I спр., 3 ас. адз. л.) |
| адасобіць **ца** (інф.)<br>адасоб\|яц\|**ца** (3 ас. мн. л.)<br>ён адасоб\|іц\|**ца** (II спр., 3 ас. адз. л.) | ——— |

**125.** *Падзяліце дадзеныя словы на марфемы.*

Выказваючыся, расчульваецца, прысваенне, шчымлівасць, зацікавіўшыся, напрактыкавацца, паўстагоддзя, беззмястоўнасць, вогнетушыцель.

# Аснова, яе віды

У словах адрозніваюць **тры віды асноў.** Іх трэба размяжоўваць. У адным і тым жа слове могуць быць словазменная, словаўтваральная і формаўтваральная асновы.

1. С л о в а з м е н н у ю аснову выдзяляюць **пры марфемным аналізе** слоў. Яе для кароткасці называюць адным словам — а с н о в а. Гэта частка слова без словазменнай марфемы (без канчатка) Напрыклад: *караткашэрсн-ы, зайшл-а, сінь∅*□, Нязменныя словы і нязменныя формы слоў маюць ч ы с т у ю а с н о в у (без канчаткаў): *клішэ, БДУ, цішэй, мабыць, несучы, несці*.

Формаўтваральныя інфінітыўныя суфіксы ***-ці, -чы, -ць***, суфіксы дзеясловаў прошлага часу ***-ў, -л-, ∅***, суфіксы дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, словаўтваральныя нулявыя суфіксы ўключаюцца ў словазменную аснову.

2. С л о в а ў т в а р а л ь н у ю аснову (або б а з у) выдзяляюць **пры словаўтваральным разборы**. Словаўтваральная база — гэта частка вытворнага слова без словаўтваральнага сродку. Напрыклад, у слове ***за****йсці* словаўтваральная аснова (база) — *ісці*, у слове *землекарыстанне* словаўтваральная база — аснова назоўніка *зямля* і цэлае слова *карыстанне*, у слове *БелТА* словаўтваральная база — частка базавага прыметніка ***Бел****арускае* і пачатковыя гукі слоў ***т****элеграфнае* ***а****генцтва.*

3. Ф о р м а ў т в а р а л ь н а я аснова — гэта частка слова без канчатка і формаўтваральнага суфікса. Яе звычайна вылучаюць **пры марфалагічным аналізе** слоў. Напрыклад, у тым жа дзеяслове *зайсці* тры формаўтваральныя асновы: 1) аснова інфінітыва *зайс'*-(*ці*); 2) аснова будучага часу *зойд*-(*уць*) і 3) аснова прошлага часу *зайшо*-(*ў*□). У формаўтваральную аснову не ўключаюцца формаўтваральныя суфіксы і прыстаўкі: *знайшо*-(*ў*), (*най-*)*-цяпл*-(*ейш-ы*), *смял*- (*ей*).

Асновы бываюць **члянімыя на марфемы** (або падзельныя) і **нечлянімыя** (непадзельныя). У большасці слоў асновы члянімыя на марфемы:
*сад-ок*□, *дзе-сьці*, *чыт-а-ць*, *аб-у-ць*, *выс-ок-і*, *ніз-к-і*, *дал-ёк-і* і інш. Нечлянімыя асновы бываюць і ў вытворных, і ў невытворных словах: *сад*□, *сін-і*, *ВНУ*, *зарплат-а*. (Два апошнія прыклады — вытворныя словы, але асновы ў іх нечлянімыя). Таму **нелагічна называць нечлянімыя асновы невытворнымі, а члянімыя — вытворнымі.** Дзеясловы тыпу *чытаць, вучыць, рабіць*, прыметнікі тыпу *высокі, нізкі, далёкі* — гэта словы невытворныя, але асновы ў іх члянімыя на марфемы.

**126.** *Выпішыце словы з нечлянімай асновай. Якія з іх з'яўляюцца вытворнымі? Памятайце: нулявыя суфіксы бываюць толькі ў вытворных*

*словах, пры ўтварэнні якіх ад апошняга базавага слова як агульная частка бярэцца поўная ці ўсечаная аснова.*

1) журнал, 2) ганарыцца, 3) будынак, 4) каменне, 5) КамАЗ, 6) рулет, 7) голуб, 8) хутка, 9) здароўе, 10) язда, 11) фіксаж, 12) ЦУМ.

**127.** *Ці адно і тое ж абазначаюць паняцці 'слова без канчатка' і 'слова з нулявым канчаткам'? Выпішыце словы, якія не маюць канчаткаў, і падзяліце іх на марфемы.*

**I.** Загаворваць, прабел, лесавік, *(ён)* весел, кашпо, позна, пакрыўдзіўся, насілу, непазнавальна, узгорак, узмацніўшыся, паліто, некуды, заіскрыцца *(інф.)*, дзьмухавец, усміхаешся.

**II.** 1) імкліва, 2) пехатой, 3) змарыўся, 4) паціху, 5) уверсе, 6) Байкал, 7) Лавуазье, 8) побач, 9) узлесак, 10) стрыгся, 11) захапляцца, 12) смеючыся.

**128.** *Выпішыце словы з нулявым канчаткам і падзяліце іх на марфемы. Да якой часціны мовы адносіцца кожнае слова?*

1) спрадвеку, 2) насып, 3) трубаўкладчык, 4) дагледжанасць, 5) далеч, 6) заціхаць, 7) рыхтаваўся, 8) БАМ, 9) склаўшы, 10) рэзюме, 11) мадам, 12) збоку, 13) збочыў, 14) столь, 15) галіфэ, 16) несучы.

**129.** *Знайдзіце ў кожным радзе чацвёртае лішняе. Адказ абгрунтуйце.*

1) жыць, жывы, жыхар, жывіца;
2) мяшаць, мяшалка, мяшок, мешаніна;
3) прадзед, прабабка, прарадзіма, прапанова;
4) пазарастаць, пазавайсковы, пазачыненыя, пазатушаныя;
5) замок, адамкнуць, замыкаць, намокнуць;
6) сястрыца, вадзіца, крыніца, травіца;
7) серабрысты, трактарысты, машыністы, веласіпедысты;
8) свежасці, прынесці, сплесці, звесці.

**130.** *Выпішыце словы, якія няправільна падзелены на марфемы. Падзяліце іх правільна сімваламі, як паказана ва ўзоры.*

Узор: ваj-уй-□, тваj-[э], канч-а-так-□

1) ус-памін-□; 2) вы-хад-∅-□; 3) ба-я-цца; 4) рад-уj-учы-ся; 5) на-пал-ов-у; 6) за-вул-ак-□; 7) пра-дзед; 8) шост-∅-ы; 9) да-памаг-чы; 10) у-ніз-∅-□; 11) бяз-рук-і; 12) па-вуц-інн-∅-е; 13) за-верш-а-н-ас-ць; 14) стом-л-ен-ы.

**131.** *У якіх радах ёсць памылкі ў марфемным падзеле слоў? Выпішыце гэтыя словы і правільна падзяліце іх на марфемы.*

1) productName-ш-л-і, пад-ыс-ці, най-мац-н-ей-ш-ы, най-горш-ы;
2) вад-а-пой-∅-□, уз-бярэжж-∅-а, у[j-у]ць *(вяроўку),* а-баран-я[j-у]ць;
3) раз-ві-ва[j-э]м, па-варуш-ы́-ц-ца, гні-л-ас-н-ы, уз-мор-[j-э];
4) вы-йс-ці, пады-гр-а-ць, па-гаспадар-ск-у, с-палох-ан-ы;
5) бес-па-сад-ачн-ы, бес-пры-туль-н-асць-□, з-бядн-ел-ы, на-бег-а-ўшы-ся.

**132.** *Абгрунтуйце падзел слоў на марфемы шляхам падбору аднакаранёвых слоў, адкідаючы па чарзе кожную марфему, пачынаючы з канца слова.*

<u>Узор</u>**:** Рас-сціл-а-ц-ца — рассціла-ць, рассціла-ў, сцел- [е] **.**

А-судж-энн-е; вод-а-ляч-энн-е; пад-фарб-оў-ва-л-і-ся; за-варуш-ы-л-і-ся; с-пакой-н-а; сардэч-н-асць-□; вільгац-е-ў-стой-лів-ы; шэрсц-е-а-прац-оў-к-а.

**133.** *Знайдзіце ў кожным радку слоў лішняе з пункту гледжання іх марфемнай будовы ці значэння марфем. Адказ абгрунтуйце.*

1. Ляс***ы***, галас***ы***, нов***ы***, сын***ы***.
2. Шэсцьсот□, двухсот□, восемсот□, дзевяцьсот□.
3. Кліка***ць***, чапа***ць***, чарава***ць***, чароўнас***ць***.
4. Кудысь***ці***, зацвіс***ці***, завез***ці***, даплес***ці***.
5. Каз***ін***ы, радз***ін***ы, кац***ін***ы, асл***ін***ы.
6. Радыст***к***а, тэлефаніст***к***а, сувязіст***к***а, нікеліроў***к***а.
7. Сваяч***к***а, узбеч***к***а, таджыч***к***а, нем***к***а.
8. Чарн***іц***ы, сун***іц***ы, клубн***іц***ы, бруснi***ц***ы.

**134.** *Выпішыце* ***<u>нумары</u>*** *слоў, марфемны склад якіх адпавядае ўказанай схеме***.** *(У схемах значком □ абазначаны любы канчатак, не толькі нулявы).*

| **Варыянт 1**<br>∩ ▬ ∩ ∧ ∧ □ | **Варыянт 2**<br>¬ ∩ ∧ □ | **Варыянт 3**<br>¬ ∩ ∧ ∧ |
|---|---|---|
| 1) землечарпалка | 1) падкручвай | 1) па-майстэрску |
| 2) землетрасенне | 2) на́двае | 2) дапаласкаць |
| 3) каменяломня | 3) нерэальны | 3) падагрэць |
| 4) канавакапальны | 4) незвычайны | 4) падабраць |
| 5) караткашэрсны | 5) памыўшы | 5) напрарэзваць |
| **Варыянт 4**<br>¬ ∩ ∧ ∧ □ | **Варыянт 5**<br>¬ ¬ ∩ ∧ ∧ □ | **Варыянт 6**<br>¬ ∩ ▬ ∩ ∧ ∧ |
| 1) перабінтоўваць | 1) недасяжнасць | 1) незлапамятнасць |
| 2) абдумванне | 2) пазацягваць | 2) стрыножыць [т] |

| | | |
|---|---|---|
| 3) паляпшэнне<br>4) нарыхтоўвалі<br>5) парасцярушвалі | 3) выпакутаваў<br>4) напазычалі<br>5) паперайначвалі | 3) заходнеўкраінскі<br>4) нераўнамерна<br>5) уціхамірыць |

**135.** *Выпішыце адпаведна пад літарамі* **а)** *і* **б)** **<u>нумары</u>** *слоў, марфемная будова якіх адпавядае наступным схемам:* а) ¬ ∩ ∧ ∧ ; б) ¬ ∩ ∧ □ *(тут □ — любы канчатак, не толькі нулявы).*

1) па-чалавечы; 2) перабежка; 3) засмаліць; 4) абясшкодзіць; 5) незавершаны; 6) адарваны; 7) няякасна; 8) схаваў; 9) задуменны.

**136.** *Выпішыце* **<u>нумары</u>** *слоў, марфемны склад якіх адпавядае схеме:* ¬ ∩ ∧ □ *( тут □ — любы канчатак, не толькі нулявы).*

1) вымяраць; 2) загадка; 3) без’языкі; 4) найлепшы; 5) давеку; 6) дарадчык; 7) давезці; 8) бездажджоўе; 9) дацямна**.**

**137.** *Выпішыце* **<u>нумары</u>** *слоў, марфемны склад якіх адпавядае схеме:* ¬ ∩ ∧ ∧**.**

1) па-чалавечы; 2) засмаліць; 3) *(трэба)* абясшкодзіць; 4) незавершанасць; 5) *(было)* адарвана; 6) няякасна; 7) схаваў; 8) задуменна**.**

**138.** *Прачытайце. Выпішыце словы з нулявымі канчаткамі і падзяліце іх на марфемы. Ці могуць зменныя словы тыпу* ***смажце*** *не мець канчатка? Ці ёсць нулявы канчатак у нязменных слоў тыпу* ***позна, убок?***

Праштрафіўся верабей. Усе птушкі пагналіся за ім і загналі ў дупло. Але той быў такі хітры, што выбраў дзірку ў дупле якраз па сабе: большы за яго не ўлезе, а меншы калі ўлезе — ён яго выкіне. Вырашылі браць яго, як моцную крэпасць, на змор. Чакалі-чакалі, аж настала ноч, і ўсе захацелі спаць. Каго пакінуць на варце? Ясна каго, саву. Яна ўначы не спіць. А сава была ў той час голая, як абшчыпаная курыца. Ну і паставіла сваю ўмову: ”Усе ў пер’ях, то чаго я маю голая хадзіць? Скідайцеся па перайку”. Ну, усе і скінуліся. Адзін шэрае пер’е даў, другі — рудае, трэці — белае ці карычневае. Стала сава, як і ўсе, толькі што пер’е дужа рознае. Сядзела яна ўсю ноч, сядзела. А раніцай птушкі заспалі, і яна, начная істота, пачала куняць. Верабей вылез і ўцёк… Урэшце яго ўсё ж спаймалі. І, у знак пакарання, звязалі ногі. Вось ён цяпер і скача адразу дзвюма. А птушкі як толькі ўбачаць саву, дык адразу кожная сваё пяро дзярэ з яе. З гвалтам: ”Аддай мае перайкі, бо няма чаго было браць, калі ўсцерагчы не магла”**.** *(У. Караткевіч)*

# СЛОВАЎТВАРЭННЕ

У адрозненне ад марфемнага аналізу, пры якім вызначаюцца ўсе марфемы ў слове, задача словаўтваральнага аналізу — вызначыць, як утварылася слова: 1) ад якой словаўтваральнай базы, 2) пры дапамозе якіх словаўтваральных сродкаў і 3) якім спосабам. Напрыклад: назоўнік *жыццярадасн**асць*** утварыўся ад асновы складанага прыметніка *жыццярадасны* пры дапамозе суфікса ***-асць*** суфіксальным спосабам.

Пры словаўтваральным аналізе не абазначаюцца ўсе марфемы ў вытворным слове, а вызначаюцца толькі 2 кампаненты: 1) словаўтваральная база і 2) словаўтваральны сродак (сродкі) ва ўтвораным слове. Пры графічным запісе напрамак стрэлкі паміж двума кампанентамі паказвае на вытворнае слова.

С л о в а ў т в а р а л ь н а я б а з а — гэта агульная з вытворным словам частка базавага слова (слоў). Гэта могуць быць часткі слоў (*сельскі карэспандэнт → селькор*), аснова слова ці слоў (*пяць□ гадоў → пяцігоддз∅е*), усечаная аснова (*высокі → высь∅*), усё слова ці словы (*ісці → сысці; мала вядомы → малавядомы*) і інш.

С л о в а ў т в а р а л ь н ы с р о д а к — гэта словаўтваральныя марфемы (прыстаўка, суфікс, постфікс, інтэрфікс) і іншыя фармальныя паказчыкі, з дапамогай якіх утворана слова. Трэба **памятаць**, што ў якасці словаўтваральнага сродку не могуць далучыцца адначасова два ці больш суфіксаў або адначасова дзве прыстаўкі.

Каб правільна вызначыць **базавае слова** (г. зн. слова з шэрага аднакаранёвых, ад якога непасрэдна ўтварылася вытворнае слова), трэба акрэсліць месца вытворнага слова ў словаўтваральным ланцужку. З некалькіх аднакаранёвых слоў базавым з'яўляецца тое, якое знаходзіцца ў словаўтваральным ланцужку найбліжэй да вытворнага слова, г. зн. не толькі непасрэдна звязана з ім па сэнсе, але і **ма́е найбольшую колькасць агульных з ім марфем.** Напрыклад, назоўнік *падкрэсліва**нн**е* можна растлумачыць як працэс ці вынік дзеяння ад дзеясловаў *крэсл**іць**,* ***пад**крэсліць*, *падкрэсл**іва**ць*, але толькі апошні з іх па колькасці марфем знаходзіцца найбліжэй да назоўніка *пад-крэсл-іва-**нн**-е.* Паслядоўнасць утварэння гэтых слоў выразна відаць у с л о в а ў т в а р а л ь н ы м л а н ц у ж к у, г. зн. радзе аднакаранёвых слоў, звязаных адносінамі **паслядоўнай вытворнасці:** *крэсл**і**ць → **пад**крэсліць → падкрэсл**іва**ць → падкрэсліва**нн**е.* Гэтак жа для адноснага прыметніка *жалезабетон**н**ы* базавым словам з'яўляецца складаны назоўнік *жалезабетон*□ (а не два простыя словы *жалеза* і *бетон*). Для назоўніка *жыццярадасн**асць*** словаўтваральнай базай з'яўляецца аснова складанага прыметніка *жыццярадасны* (а не асновы двух назоўнікаў *жыццё* і *радасць*).

**139.** *Зрабіце словаўтваральны аналіз вытворных слоў з верша па ўзоры, прыведзеным у табліцы. Строга прытрымлівайцеся* ***парадку словаўтваральнага разбору*** *(гл. дадатак). Разбор праверце па ”Школьным словаўтваральным слоўніку беларускай мовы” пад рэд. А.М.Бардовіча.*

| Слова з тэксту (запісваецца без змен) | Базавае слова (-ы) у пачатк. форме. Словаўтвар. база (абазначыць графічна) | Утворанае слова ў пачатк. форме. Словаўтвар-ны сродак | Спосаб словаўтварэння |
|---|---|---|---|
| 1. Кагосьці | *хто* | *хтосьці* | постфіксальны |
| 2. Вадасховішча | *вад а, сховішча* | *вадасховішча* | асноваслоўасклад. |
| 3. Узыходзіў | *хадзіць* | *узыходзіць* | прыставачны |
| 4. Ужывайся | *ужываць* | *ужывацца* | постфіксальны |
| 5. Верыў | *вера* | *верыць* | суфіксальны |
| 6. *(Сярод)* адвеяў | *адве[j а]ць* | *адве[j ∅ а]* | нульсуфіксальны |

ПАМЯЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Ён рэлігійны. Ён святы.
Каб гэтак верыць, гэтак верыць,
Што голас будзе з нематы,
Што ёсць адчыненыя дзверы;
Што ўсвядоміцца народ
Сярод завеяў і адвеяў;
Што ўжо спыніўся перарод,
Што ўжо світанне ціха спее.
Ён рэлігійны. Ён святы.
”Я быў. Я ёсць. Я вечна буду”,—
Сказаў з-пад небнай пекнаты,
Бо верыў і сабе, і люду... *(І. Чыгрын)*

● *Як вы думаеце, чаму ўсім нам зразумелы сэнс аказіянальных слоў, г. зн. неагульнапрынятых у мове,— аўтарскіх неалагізмаў* ***усвядоміцца, адвеяў, небнай?***

**140.** *Прачытайце. Якія карціны Алеся Марачкіна ведаеце вы? Якія з іх найбольш усхвалявалі вас, чым яны вам спадабаліся, запомніліся?*

*Выпішыце выдзеленыя словы і зрабіце іх словаўтваральны аналіз па прыведзенай у папярэднім практыкаванні схеме. Не адступайцеся ад* ***парадку словаўтваральнага разбору.***

Смутак, з якім **міжволі** ўзіраешся ў карціны Алеся Марачкіна, незаўважна **пераходзіць** у **захапленне**, захапленне будзіць у сэрцы любоў

да зямлі, **вызначанай** для нас Богам, любоў да **хараства**, праз якое мы спасцігаем Яго, любоў да паэзіі, **увасобленай** у такіх зямных і такіх **незямных** фарбах, што душа пачынае шчымець!

Жыццё — вечнае, хараство — вечнае, і адно трэба: каб яны **спалучаліся** праз захапленне наша і любоў. І тады ўспыхвае святло. І зацвітаюць кветкі. І **схіляюцца** да іх каханыя. І пачынае спяваць душа… Запыніцеся на колькі імгненняў, з дапамогаю мастака **ўгледзьцеся** ў знаёмы краявід, у знаёмыя і такія чужыя звычайна твары — і **адчуеце**, не зможаце не адчуць **непаўторнасці** іх, у якой адной ужо цуд, цуд Божага **благаслаўлення.**

У Алеся Марачкіна няма ніводнай змрочнай карціны. Нават самыя змрочныя фарбы свецяцца на яго палотнах. Нават самыя змрочныя падзеі гісторыі, асветленыя яго **натхненнем,** яго натхнёным пэндзлем, **абуджаюць** не скруху, не жальбу, а гордасць. Гордасць за наш народ.

Часам я **па-добраму** зайздрошчу Алесю: вынесці з маленства і захаваць у душы такую **зачараванасць** усім, што нас у гэтым жыцці акружае, **няпроста.** Асабліва цяпер, калі, здаецца, сам час пагарджае намі, **загнанымі** ў яго сіло. *(Т. Бондар)*

**141.** *Прачытайце словаўтваральныя ланцужкі. Абгрунтуйце правільнасць абазначэння ўтварэння слоў іх матывацыяй.*

Адчуць → адчу***ва***ць → адчува***нн***е.
Гадаць → ***пры***гадаць → прыгадац***ца*** → прыгад***ва***цца.
Лавіць → ***вы***лавіць → вылоўл***іва***ць → вылоўліва***нн***е.
Хваля → хвал***ява***ць → ***ус***хваляваць → усхвалява***н***ы.

**142.** *Прачытайце. Растлумачце правапіс прапушчаных літар і знакаў прыпынку. Выпішыце з тэксту 6 – 7 слоў, у склад якіх уваходзіць не менш за 4 марфемы, і зрабіце іх словаўтваральны аналіз.*

Павел Восіпавіч Сухі… Гені..льны канструктар-наватар, зорка сусветнай аві..цыі. За сваё жыц..ё ён стаў аўтарам 50 ар..гінальных самалётаў больш за 30 з якіх былі вырабл..ны і выпр..баваны. Кожную сваю мадэль Сухі надз..ляў неч..м р..валюцыйн..м, зусім новым, не трад..цыйн..м для тагачаснай аві..цыі. Абганяў свой час! На яго машынах устанаўлівалі сусветныя р..корды скорасці і вышыні палёту, яны б..злітасна зні..чалі ворага ў гады Вялікай Айчыннай вайны, самалёты з маркай ” СУ ” добра вядомыя і сёння. Быў Павел Восіпавіч чалавекам надзвычай сціплым н..назойл..вым н..колі н.. хадзіў у ”любімчыках”, доўгі час яго праца была строга зас..крэч..на але тал..нт браў сваё: яркая асоба прыкметна вылучалася сярод канструктараў.

Такім земляком ганарыцца трэба а беларусы яго амаль не ведаюць. Яму б помнік пры жыц..і паставіць але ў Мінску няма н.. вуліцы яго імя н.. нават м..мары..льнай дошкі…

Нарадзіўся П. В. Сухі 10 ліпеня 1895 года ў м..ст..чку Глыбокае што на Віц..бшчыне. У 1995 годзе аві..цыйны свет а..значыў 100-гадовы юбілей гені..льнага аві..канструктара. (”*Звязда*”)

**143.** *Вусна абгрунтуйце правільнасць утварэння словаўтваральных ланцужкоў, растлумачыўшы значэнне кожнага вытворнага слова праз базавае.*

У з о р**:** Глухі → глуш-***ы***-ць → ***пры***-глушыць → прыглуш-***ва***-ць.

Глуш***ы***ць — ’рабіць *глухім*’; ***пры***глушыць — ’*крыху*, не ў поўнай меры *глушыць*’; прыглуш***ва***ць — ’*неаднаразова прыглушыць* што-небудзь’.

Верны → ***ня***верны → нявернi***к***.
Біць → ***пра***біць → прабі***ва***ць → прабіва***ца*** → прабіва***ючы***ся.
Форма → ***а***фармі***ць*** → афармл***енн***е.
Глядзець → гля***ну***ць → ***а***глянуць → аглянуц***ца*** → агляд***ва***цца.

**144.** *Утварыце словаўтваральныя ланцужкі да прапанаваных слоў. Запішыце іх, пачынаючы з невытворнага слова, як паказана ва ўзоры. Пры неабходнасці карыстайцеся словаўтваральнымі слоўнікамі.*

У з о р**:** Судзіць → ***а***судзіць → асудж***ан***ы (*дзеепрым.*) → асуджаны (*наз.*).

Цяпло → цёпл∅ы → ***а***цяпл***і***ць → ацяпл***я***ць → ацяпляц***ца***.

Пісаць → пісь***м***о → пісьм***енн***ы → пісьмен***нік*** → пісьменні***цк***і (пісьменнік + ***ск***і)

Пабяліўшы, разбіванне, зацвярдзеласць, стрымана, расслабіцца, зернесушылка, нявольніцтва.

# Спосабы словаўтварэння

**М а р ф е м н ы я** (або марфалагічныя) спосабы словаўтварэння:

**I. А ф і к с а л ь н ы я с п о с а б ы.**

Пры іх новыя словы ўтвараюцца пры дапамозе **афіксаў,** г. зн. любых марфем, акрамя каранёвых. Гэта наступныя 8 спосабаў:

**1. Прыставачны:** *радзіма*[1] → *прарадзіма*, *які* → *нейкі*, *есці* → *з’есці*. Пры гэтым спосабе прыстаўка далучаецца не да асновы, а да ўсяго слова.

[1] Значком асновы ⌊___⌋ тут і далей абазначана не словазменная аснова, а словаўтваральная база.

**2. Суфіксальны:** *нарадзіць → нараджэнне, чатыры → чацвёра, бульбаўборка → бульбаўборачны, вясёлы → весяліць),*

**3. Прыставачна-суфіксальны:** *дождж □ → бездажджоў* [j э], *глыбокі → паглыбіць), векавечны → увекавечыць).*

Разнавіднасць гэтага способу — **прыставачна-нульсуфіксальны:** *зямля → беззямелл∅е, лес □ → узлесс∅е, балота → забалоцц∅е.*

**4. Постфіксальны:** *што → штосьці* (-сь ), *як → як-небудзь, несці → несціся, паглыбіць → паглыбіцца.*

**5. Прыставачна-постфіксальны:** *бегаць → дабегацца, бегчы → разбегчыся, цярпець → нацярпецца.*

**6. Суфіксальна-постфіксальны:** *гонар □ → ганарыцца, смех → смяяцца, куст □ → кусціцца.*

**7. Прыставачна-суфіксальна-постфіксальны:** *шчодры → расшчодрыцца, гаварыць → перагаворвацца, смех□ → насміхацца,*

**8. Нульсуфіксальны**: *сіні → сінь∅, стукаць → стук∅, пяць□ → пят∅ы, зневажаць → зняваг∅а, адплаціць → адплат∅а.*

**II. С п о с а б ы  с к л а д а н н я:**

**1. Словаскладанне.** Пры ім новае слова ўтвараецца шляхам зліцця двух цэлых слоў, без злучальнага галоснага (інтэрфікса), які ва ўтвораным слове паяўляецца толькі на месцы канчаткаў базавых слоў: *мáла вераго́дны → мàлавераго́дны, глыбóка паважáны → глыбòкапаважáны, кінó* і *тэáтр* □ → *кінатэáтр.*

**2. Асновасловаскладанне.** Тут апошні кампанент словаўтваральнай базы роўны цэламу слову, а папярэдні — аснове слова: *высокі* і *мастацкі → высокамастацкі, закон* □ і *праект* □ → *законапраект, першая крыніца → першакрыніца.*

**3. Складана-суфіксальны** (або **асноваскладанне з суфіксацыяй**): *дабрá зычыць → добразычлівы, плоская гара → Пласкагор*[ jэ], *чатыры паверхі → чатырохпавярховы.*

Разнавіднасцю складана-суфіксальнага спосабу з'яўляецца **складана-нульсуфіксальны.** : *плыт*□ і *гнаць → плытагон∅, левы бераг* □ → *левабярэжж∅а, чорныя вочы → чарнавок∅і.*

**4. Абрэвіяцыя** — утварэнне складанаскарочаных слоў:

**а) складовыя** абрэвіятуры: *Беларуская Энцыклапедыя → БелЭн, камандзір батальёна → камбат* (пры складовай абрэвіяцыі складваюцца адвольныя часткі базавых слоў); **б) літарныя** і **гукавыя** абрэвіятуры: *Вялікае княства Літоўскае → ВКЛ* (чытаецца па літа-

рах: [вэкаэл]), ”*Літаратура і мастацтва*” → *ЛіМ* (вымаўляецца па гуках, як адзін склад: [л'ім]); гэтак жа: *ААН, ГЭС, нэп, ЦУМ*; **в) змешаныя** абрэвіятуры: *медыцынская сястра* → *медсястра, педагагічны савет* → *педсавет* (складваюцца частка слова і цэлае слова); *Беларуская акадэмія мастацтваў* → *БелАМ*; *Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі* → *ЭЛіМБел* (складваюцца часткі адных базавых слоў і пачатковыя гукі ці літары другіх).

**145.** *Прачытайце вышэй прыклады спосабаў словаўтварэння і прывядзіце свае аналагічныя прыклады на ўсе спосабы.*

**146.** *Растлумачце, чаму ніжэй прыведзеныя прыклады адносяцца да ўказаных спосабаў словаўтварэння, а не да прыставачнага.*

| Суфіксальны | Постфіксальны | Прыставачна-постфікс. |
|---|---|---|
| 1. Дагледж***ан***ы | 1. Далучыц***ца*** | 1. ***На***бегац***ца*** |
| 2. Надакучлів***а*** | 2. Далечвац***ца*** | 2. ***На***глядзец***ца*** |
| 3. Дакупл***іва***ць | 3. Намазвац***ца*** | 3. ***Вы***спац***ца*** |
| 4. Безабаронн***асць*** | 4. Абліц***ца*** | 4. ***Раз***ляцец***ца*** |
| 5. Памешва***нн***е | 5. Зачапіц***ца*** | 5. ***Рас***хварэц***ца*** |

**147.** *Згрупуйце словы па спосабах словаўтварэння і запішыце па ўзоры.*

| **Суфіксальны спосаб** | **Прыставачны спосаб** | **Прыставачна-суфіксальны спосаб** |
|---|---|---|
| *абавязаны,…* | ***па**дзякаваць,…* | *усыпіць,…* |

Непаўналетні, дапатопны, адпачынак, бяздушны, бездакорна, напарнік, даўгавечнасць, унічыю, ачышчаць, псеўданавуковы, пераначаваць, звышідэальны, бавоўнаўборачны, непаваротлівы, бяссонніца, па-студэнцку, пазабюджэтны, змаладу.

**148.** *Растлумачце, чаму прыведзеныя прыклады аднесены да суфіксальнага спосабу, а не да складана-суфіксальнага і не да асновасловаскладання?*

Хлебаўбарач***н***ы, водаўстойлів***асць,*** громаадвод***н***ы, водаправод***чык,*** дамасед***к***а, дружалюбн***а,*** электрадуг***ав***ы, ледарэз***н***ы, лесастэп***ав***ы, вузкалоб***асць,*** шматбаков***а.***

**149.** *Выпішыце словы, утвораныя складана-суфіксальным спосабам. Абазначце ў іх словаўтваральныя сродкі. Звярцеся па ”Школьным словаўтваральным слоўніку беларускай мовы” пад рэд. А.М.Бардовіча.*

Марозаўстойлівасць, маслападобны, маслабойка, лесасплаўны, лесанарыхтоўка, лесаахоўны, лесапаркавы, легкаплаўкасць, левабярэжны, кіназдымачны, кінамастацтва, простанародны, пяцігадовы, самародкавы, самаўпэўнена, светасузіральны, тонкавалакністы, торфаздабыча, цеплалюбівы, целагрэйка, цестамясільны.

**150.** *Выпішыце ў тры слупкі словы, утвораныя ўказанымі спосабамі, як паказана ва ўзоры ў прыведзенай табліцы.*

| Асновасловаскладанне | Складана-нульсуфіксальны (або складана-бяссуфіксны) | Абрэвіяцыя (або складанаскарочанае слова) |
|---|---|---|
| узаем*а*выручка<br>турб*а*генератар… | туп*а*нос∅ы<br>тр*ох*галов∅ы… | турпаход<br>лінкор… |

Збожжаачыстка, вадавоз, хлебаўборка, хлебазавод, фізкультура, фенаменальнасць, усенародна, турбаза, тупадзюбы, фальшываманетчык, усеагульны, усёабдымны, усёдаравальнасць, мапед, тунелебудаванне, трэцякласнік, трубаўкладчык, трохскладовы, тавараабменны, сівалосы, сенаўборачны, санапрацоўка, санбат, саракагоддзе, марозаўстойлівы.

Нельга змешваць пералічаныя вышэй спосабы ўтварэння слоў у сучаснай мове (так званае марфемнае словаўтварэнне) са спосабамі, якія вылучаюцца ў гістарычным мовазнаўстве (з так званымі немарфемнымі спосабамі). Да немарфемных спосабаў адносяцца:

**1. Пераход слоў з адной часціны мовы ў другую,** напрыклад: *Гаварыў ясна,* ***проста*** (прыслоўе) і ***Проста*** *не ведаў тады* (часціца); разнавіднасць гэтага спосабу — пераход прыметнікаў і дзеепрыметнікаў у назоўнікі (тыпу *шакаладнае* ***марожанае; ранены*** *стагнаў*) — з’яўляецца прадуктыўным працэсам і ў сучасным словаўтварэнні.

**2. Утварэнне амонімаў** у выніку разыходжання ў значэннях былых мнагазначных слоў, напрыклад: *кулак I* (’сціснутая кісць рукі’) і *кулак II* (’заможны селянін’).

**3. Зрашчэнне** некалькіх слоў у адно ў працэсе іх гістарычнага развіцця, напрыклад: *сёння, цяпер, датла, нельга.* Пры гэтым спосабе лексічнае значэнне састаўных кампанентаў утворанага слова затушавана, і таму ў сучаснай беларускай мове такія ўтварэнні, як *нельга, сёння, цяпер, датла, заўжды, зусім, потым* і падобныя, лічацца невытворнымі.

**151.** *Спішыце і падкрэсліце выдзеленыя словы як члены сказа. Запішыце над імі, якімі часцінамі мовы яны з’яўляюцца. Як (з якіх часцін мовы) яны ўтварыліся? Як называецца такі спосаб утварэння слоў?*

**Вядомы** магічныя ўздзеянні асобных людзей на жывёл. Многія **святыя** (св. Антоні, св. Францыск Асізскі, св. Серафім Сароўскі) сябравалі з жывёламі — з мядзведзямі, ільвамі. Такіх выпадкаў у хрысціянскай літаратуры апісана многа. Але **тое** ж было вядома **яшчэ** ў эпоху Антычнасці: напрыклад, вялікі Піфагор валодаў **настолькі** магутнымі гіпнатычнымі здольнасцямі, што позіркам спыняў статак раз’юшаных быкоў.

Ёсць і **яшчэ больш** дзіўныя сведчанні. Адзін з **самых** шануемых рускіх **святых** Сергій Раданежскі наклаў закляцце на змеяў на тэрыторыі **вакол будучай** Троіцка-Сергіевай лаўры ў радыусе прыкладна дваццаці кіламетраў. Самае цікавае, **што** ўжо 600 гадоў, **як** сцвярджаюць мясцовыя сяляне, змеі ў гэты запаветны круг не запаўзаюць: іх генетычная памяць занатавала магічную забарону на з’яўленне ў пэўнай мясцовасці.

Былі і ў беларусаў магутныя ведуны, якія ўмелі накладваць закляцце на некаторую тэрыторыю, абараняючы яе **гэтым** часцей за **ўсё** ад ваўкоў. У такім выпадку ўтваралася нейкае моцнае псіхаэнергетычнае поле, але **што гэта за** поле і як чалавек здольны яго ўтварыць, навука пакуль не ведае. *(Т. Шамякіна)*

**152.** *Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку. Выпішыце складаныя словы і графічна растлумачце іх утварэнне.*

*Ці можна лічыць складанымі словы, выдзеленыя ў тэксце? У якім раздзеле навукі аб мове вывучаюцца прыдаткі?*

● *Каго яшчэ са славутых беларускіх адраджэнцаў ведаеце вы?*

Ал..ксандр Уласаў адзін з н..многіх мужных і празарлівых беларускіх адраджэнцаў хто на золку ХХ ст..годдзя кінуў выклік цемрадзі і б..здарожжу што былі зрабіліся лёсам Беларусі.

Ведаем пра А.Уласава да крыўднага мала. Адно што быў р..дактарам першай стабільнай і масавай беларускай газеты ”Наша ніва”. Той жа хто ўсв..доміў с..бе якую в..лізáрную работу за 9 гадоў існаван..я прарабіла гэтае п..ры..дычнае выдан..е дзеля ўсв..дамлен..я беларусамі с..бе як народа а сваёй культуры як сам..каштоўных вартасцяў пэўна аддаў у душы належнае Ал..ксандру Уласаву. Быў ён сынам свайго н..простага часу і мусіў брацца за рознага віду дзейнасць. Быў дасканалым **журналістам-арган..затарам** бо, акрамя ”Нашай нівы”, прычыніўся яшчэ да засн..ван..я і р..дагаван..я час..пісаў ”Саха” ”Лучынка” быў аўтарам актуальных ар..г..нальных публікацый па пытан..ях мясцовага грамадскага сам..кіраван..я з..мл..карыстан..я каап..рацыі бягучай палітыкі. У **пасл..р..валюцыйны** час насуп..рак розным панкáм з польскай адм..н..страцыі здол..ў адкрыць у родным мяст..чку Рáдашкавічы беларускую гімназію і доўгі час утрымл..ваць яе. Абраны заходн..беларускім жыхарствам у сойм Польшчы як сенатар, шмат зрабіў каб абараніць беларускую школу

родную асвету ад палан..зацыі. Быў проста добрым этычным чалавекам годным сынам свайго народа.

У верасні 1939 года спадз..ваўся што новая прышлая ўлада будзе ўдзячная яму за н..малую ахвярную працу на беларускай духоўнай ніве. Памыліўся… А.Уласаў памёр у 1940 г. у Сібіры, па дарозе ў Марыінскія лагеры. *(Паводле А. Ліса)*

**153.** *Спішыце, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Вусна растлумачце іх правапіс. Назавіце спосаб утварэння кожнага слова.*

Д..браахвотна, д..бравольна, д..брадушнас(*ь*)ць, д..браякас(*т*)ны, д..ўгат..рміновы, д..ўгац..рпен..е, дзев..ностагод..е, д..бразычлівец, д..брасумленна, дн..ачы(*с,ш*)чальны, др..бнашэрс(*т*)ны, др..бнатвары, др..бнапамес(*т*)ны, ж..ўтагаловы, ж..ўталісты, з..латакрылы, з..латавалосы.

**154.** *Прачытайце. Дайце тэксту загаловак. Выпішыце выдзеленыя словы і падзяліце іх на марфемы. Зрабіце словаўтваральны аналіз гэтых жа слоў.*

У спадчыну ад мінулых пакаленняў нам дасталася **велізарная** колькасць **назваў населеных** пунктаў, рэк і азёр, палёў і **сенажацяў**, урочышчаў. На зямлі нашай Бацькаўшчыны, бадай, не знойдзеш **аніводнай** народнай назвы, якая б узнікла выпадкова, без дай прычыны, без сувязі з гістарычным мінулым чалавека, з **нейкімі** асаблівасцямі прыроднага асяроддзя, умовамі вытворчай дзейнасці жыхароў. Сам народ **ніколі** не назаве сваё **паселішча** словам, якое ў **чымсьці** не адпавядала б, а тым больш пярэчыла б ісціне. Ці не таму, **высветліўшы** раней **незразумелую** нам назву горада ці вёскі, мы часта лепш пачынаем разумець іх **мінулае**, асаблівасці **жыццядзейнасці** людзей, іх звычкі і норавы?

**З’яўляючыся** спрадвечным аўтарам сваёй мясцовай тапаніміі, народ сам ніколі не ідзе на яе **перайменаванне**, хоць з прычыны істотных сацыяльна-эканамічных, палітычных і нават **прыродна-кліматычных** змен назва перастае адпавядаць новым умовам. **Выключэннем** могуць быць толькі назвы, якія ў далёкім мінулым маглі **навязаць** людзям розныя **прыгнятальнікі** ў мэтах **прыніжэння** іх чалавечай годнасці. *(Паводле Л. Лыча)*

**155.** *Выпішыце* **нумары** *слоў, утвораных прыставачным спосабам.*

1) напісаны, 2) перапісваць, 3) узлесак, 4) завіруха, 5) назаўжды, 6) нагуляцца, 7) завязь, 8) пацяплець, 9) заціснуты, 10) забегацца, 11) ачалавечыцца, 12) абцяжарваць, 13) выгрузка, 14) растлумачваць, 15) узнавіць, 16) расфасоўка, 17) рассякаць, 18) па-летняму, 19) абшар, 20) выпісвайце, 21) выцягніце, 22) неўраўнаважаны, 23) ззаду, 24) назаўтра.

**156.** *Выпішыце* **<u>нумары</u>** *слоў і формаў слоў, утвораных суфіксальным спосабам.*

1) аўторак, 2) выганяйце, 3) бязмоўны, 4) дагледжаны, 5) неспазнаны, 6) бязлітасны, 7) пасеў, 8) прышчэпка, 9) зацікавіўшыся, 10) заворваць, 11) лаўка ('магазін'), 12) бавоўнаўборачны, 13) водаправодны, 14) першакласны, 15) велікадушны, 16) зводніцтва, 17) жыццяздольнасць, 18) жыццеўстойлівы, 19) саманаграванне.

**157.** *Выпішыце* **<u>нумары</u>** *слоў, утвораных прыставачна-суфіксальным спосабам.*

1) акругліць, 2) акруціць, 3) аціпляцца, 4) ацэначны, 5) зачарсцвелы, 6) па-веснавому, 7) выглянцаваць, 8) выветрыванне, 9) дарэчы, 10) за́малада, 11) залетась, 12) бессардэчны, 13) заадно, 14) разразанне, 15) размалёваць, 16) недасведчанасць, 17) узброіўшыся, 18) заслужыўшы, 19) палепшыць, 20) ацаніць.

**158.** *Выпішыце* **<u>нумары</u>** *слоў, утвораных постфіксальным спосабам.*

1) адступніца, 2) выкладчыца, 3) насмяяцца, 4) замацавацца, 5) залюбавацца, 6) усміхнуцца, 7) пераміргвацца, 8) куды-небудзь, 9) дагуляцца, 10) збірацца, 11) якісьці, 12) праслязіцца, 13) засмяяцца, 14) пераабуўшыся, 15) уладкоўвацца.

**159.** <u>*Вусна*</u> *абгрунтуйце падзел на марфемы шляхам падбору аднакаранёвых слоў, адкідаючы па чарзе кожную марфему, пачынаючы з канца слова.* <u>*Пісьмова*</u> *зрабіце словаўтваральны аналіз слоў.*

У з о р: Тунел-е-буд-ав-а-нн-е — *тунелебудаванн-*[***я***], *будава-**ць**, выбудоўваць,* (або *пабудов-*[***а***]), *буд-**ынак**, тунель* □
⌊тунель⌋ □, ⌊будаванне⌋ → тунелебудаванне (асновасло795аскладанне)

Вы-бель-ва-ц-ца; с-клей-ва-нн-е; у-тр-ой-ва-ц-ца; за-газ-ав-а-н-асць □; збожж-а-ў-бор-ач-н-ы; не-а-праўд-а-н-а; не-па-варот-лів-ы.

# МАРФАЛОГІЯ

## Сістэма часцін мовы

**Сістэма часцін мовы** не з'яўляецца застылай і нязменнай, канчатковай. Паміж часцінамі мовы назіраецца ўзаемадзеянне. Словы з адной часціны мовы пераходзяць у другую. Звычайна прычынай такога пераходу з'яўляецца змена сінтаксічнай функцыі слова. Часта ў назоўнікі пераходзяць прыметнікі і дзеепрыметнікі, мяняючы пры гэтым не толькі сінтаксічную функцыю, але і граматычныя катэгорыі: род становіцца пастаяннай, нязменнай катэгорыяй; лік, склон — незалежнымі; паяўляецца здольнасць дапасоўваць да сябе азначэнні: ***Паляўнічы*** *нож* (прыметнік, змяняецца па родах). *Наш* ***паляўнічы*** *вярнуўся* (назоўнік мужчынскага роду). Падобны пераход з адной часціны мовы ў другую назіраецца і ў наступных прыкладах: ***Камандуючы*** *ехаў наперадзе* (дзеепрыметнік перайшоў у назоўнік). ***Нашы*** *прыляцелі* (займеннік — у назоўнік). ***Ва́раная*** *бульба* (дзеепрыметнік — у прыметнік). *Ідзе* ***сабе*** *пацiху і песеньку напявае* (займеннік — у часціцу). *Чытаць* ***лежачы*** *шкодна* (дзеепрыслоўе — у прыслоўе). ***Адны*** *пайшлі,* ***другія*** *засталіся* (лічэбнікі — у назоўнікі). *Засталіся* ***адны*** *мы* (лічэбнік — у часціцу). *Дасягнуў поспехаў* ***дзякуючы*** *настойлівасці* (дзеепрыслоўе — у прыназоўнік). *Стаіць* ***пасярэдзіне*** *хаты* (прыслоўе — у прыназоўнік).

Асобныя групы слоў пачынаюць вылучацца ў самастойную часціну мовы. Напр., фарміруюцца ў самастойную часціну мовы безасабова-прэдыкатыўныя словы (скарочана БПС); іх яшчэ называюць прэдыкатыўнымі прыслоўямі. Параўнайце: *На дварэ цiха* ( БПС ). *Гаварыў цiха* (прыслоўе).

**160.** *Прачытайце. Якімі часцінамі мовы звычайна з'яўляюцца выдзеленыя словы, узятыя без кантэксту? Да якіх часцін мовы яны адносяцца ў дадзеным кантэксце? Якія класіфікацыйныя прыметы вы ўлічвалі пры вызначэнні часцін мовы ?*

— Ат, няхай... Зраблю **гэта заўтра...**

Так дні пры дні мы адкладваем і адкладваем **многае,** што можна было б пры жаданні зрабіць сёння, на заўтра, быццам **заўтраў** тых наперадзе ў нас — лічыць не злічыць.

Мінаюць дні, тыдні, месяцы, гады... і **нязробленага** збіраецца **ўсё** больш і больш, а **заўтраў** застаецца **ўсё** менш і менш. **І** калі наступае старасць, нямогласць, мы з жахам азіраемся назад, на **пражытае,** і бачым, колькі чаго маглі зрабіць, ды не зрабілі. Не зрабілі толькі **таму, што** адкладвалі на заўтра... *(Б. Сачанка)*

**161.** *Спішыце словазлучэнні і падбярыце да іх сінанімічныя, замяняючы дзеясловы і прыметнікі назоўнікамі. Назавіце спосаб іх утварэння. З якой мэтай можа выкарыстоўвацца такая замена ў тэкстах?*

Узор. Зялёнае лісце — *зелень∅* лісця, ціхая ноч — *цішыня* ночы.

Падрыхтаваць заданне — …, прасторныя палеткі — …, шматлікія ўражанні — …, хадзіць па кабінетах — …, запісваць назіранні — …, загадваць кафедрай — …, надпісваць зверху — …, выходзіць на сцэну — …, устанавіць сістэму — …, здольны да працы — …, блакітныя азёры — …, аб’яднаць народ — …, храбры воін — …, сіняе неба — …, белы снег — …, іграць у тэатры — …, вызначаць род — …, тоўсты камель — …, фарсіраваць Буг —… .

## Прынцыпы размежавання слоў па часцінах мовы

**162.** *Прачытайце. На якую тэму гэты тэкст? Спішыце, устаўце прапушчаныя літары, вусна растлумачце іх правапіс. У першых трох сказах пазначце над словамі, якой часцінай мовы з’яўляецца кожнае з іх.*

Дзе б я н.. быў, куды б н.. закінуў мяне лёс, сэрца маё заўсёды рвецца дамоў, у родную вёску. І шчыра прызнáюся, што н..ма для мяне ..часлівейшых хв..лін, як ехаць дамоў, да маці, да сваіх з..млякоў, дзе кожная пядз.. зямлі исходж..на тваімі нагамі, дзе з маленства знаёмыя кожнае дрэўца ў лесе, кожны сіні васілёк і белы рамонак пры дарозе. На неба..хіле выразна вырысо..ваюцца вёскі Ульянаўка, Маргі, а там, за н..вялікім ляском, вясёлым і светлым ад б..ланогіх бяроз, стаіць мая родная вёска Славінск. Побач з лесам ра..кінуўся вялікі палетак кармавога лубіну з гаркаватым вод..рам. Ра..цвіў ён на сонцы так хараша, што ад яго яркага ж..ўтацвету ажно прыжмурваеш вочы. У паветры зв..няць пчолы, пры дарозе стракоч..ць конікі, а з поўдн.. мя..кі в..льготны вец..р прыносіць духмяны вод..р кан..шыны. І так хораша робі..ца на с..рц.., што, здаецца, не ідзеш, а нібы ляціш на ветры. *(Паводле В. Дайліды)*

Пры размежаванні слоў па часцінах мовы ўлічваюцца асноўныя 1) семантычныя, 2) марфалагічныя і 3) сінтаксічныя прынцыпы, а таксама 4) асаблівасці словаўтварэння часцін мовы.

Семантычны прынцып размеркавання слоў азначае, што словы аб’ядноўваюцца ў пэўную часціну мовы з улікам **абагульненага** граматычнага **значэння** ўсіх слоў гэтага класа. Напр., усе назоўнікі маюць абагульненае значэнне прадметнасці, усе прыметнікі — абагульненае значэнне прыметы, дзеясловы — абагульненае значэнне дзеяння і г. д.

Марфалагічны прынцып азначае, што пры класіфікацыі слоў

па часцінах мовы ўлічваецца зменнасць/нязменнасць слова, спосаб змянення (скланяецца, як назоўнік, прыметнік, лічэбнік, ці спрагаецца, як дзеяслоў), якія граматычныя катэгорыі мае слова. Напр., значэнне прадметнасці ў назоўнікаў выражаецца пастаяннай граматычнай катэгорыяй роду і зменнымі катэгорыямі ліку, склону; у прыметнікаў сінтаксічна залежныя ад назоўніка словазменныя катэгорыі роду, ліку, склону.

С і н т а к с і ч н ы прынцып адлюстроўвае адрозненне часцін паводле тыповых для іх сінтаксічных функцый, спосабаў сінтаксічнай сувязі. Напр., назоўнікі звычайна выконваюць функцыі дзейніка і дапаўнення, прыметнікі — азначэння, дзеясловы — выказніка, прыслоўі — акалічнасці, службовыя словы не з'яўляюцца членамі сказа. Прыметнікі дапасуюцца да назоўнікаў і займеннікаў, не могуць спалучацца з дзеясловамі; прыслоўі прымыкаюць да дзеясловаў, прыметнікаў і прыслоўяў.

Пры класіфікацыі часцін мовы трэба ўлічваць і іх тыповыя а с а б л і в а с ц і  с л о в а ў т в а р э н н я. Напрыклад, назоўнікі і прыметнікі актыўна ўтвараюцца пры дапамозе суфіксаў, дзеясловы — пры дапамозе прыставак, абрэвіяцыя характэрна толькі для назоўнікаў.

**163.** *Запішыце, якімі часцінамі мовы з'яўляюцца словы. Адказ абгрунтуйце, кіруючыся прынцыпамі размежавання слоў па часцінах мовы.*

Траіць, тройка, трое, трэці, утрая, утрох, натрае, утраіх, траяк, трайны.

Увасьмёх, восьмы, васьмёра, восем, васьмёрка, увасьмярых, васьміметровы, адна восьмая.

Чацвяртак, чацвёрка, чацвёрты, учацвярых, чацвёра, чвэрць.

Упяцёх, пяцёра, пяты, пяцёрка, упяцярых, пяціметровы, пяцімільённы.

**164.** *Прачытайце. Вусна растлумачце правапіс прапушчаных літар. Адкажыце, якімі часцінамі мовы з'яўляюцца выдзеленыя словы*; *вызначце іх сінтаксічную функцыю. Адказ абгрунтуйце.*

**Па..час** падарожжаў даводзілася бачыць н.. толькі неглюбскія ручнікі, але панямонскія і мотальскія, івацэвіцкія і ляхавіцкія, пінскія і клецкія, калінкавіцкія і тураўскія, ручнікі іншых раёнаў і р..гіёнаў Беларусі. Усе яны ўражвалі сваёй першароднасцю. Мо **таму,** што былі сапраўднымі творамі народнага маста..тва? Але неглюбскія прыкметна адрозніваліся ад астатніх — і больш **акрэсл..ным** арнам..нтам, і больш кідкай кал..ровай гамай, нарэшце, памерамі.

У жыцці нашага народа ручнік выконваў шмат функцый. На першае месца, здае..ца, варта паставіць ахоўную, карані якой ідуць у далёкія дахр..сці..нскія часы. **Скажам, такое:** на ручнік прымалі **н..ванаро..жанага**. Тонкі, мя..кі, бялёны на сонцы, ён з'ўляўся нібы пасрэдн..кам пам..ж кол..шнім светам і ц..перашнім, у які н..маўля трапляла. У вясковай

хаце бохан хлеба заўсёды ляжаў на ручніку. Ручнік характ..рызаваў і н..весту. Цікав..чыся пасагам, сваты перш за ўсё імкнуліся паглядзець, якія ў яе ручнікі. Бо ў іх, як нідзе лепей, адл..строўвалася ўмельства будучай гаспадыні, яе духоўны свет і, калі хочаце, яе характ..р. Ручнікамі ўпрыгожвалі іконы, люстэркі, рамкі з ф..такарткамі **родных** і **блізкіх.** На ручнік ставілі **маладых,** каб у іх была агульная дарога ў жыцці. Н..чым іншым, а ручнікамі яднілі рукі ж..ніха і н..весты, абвязвалі тых жа сватоў, на ручніку ўзвышаўся вясельны каравай. Выказва..чы гасцям павагу, хлеб-соль падносілі толькі на ручніку. Калі чалавек зав..ршаў сваю жыццёвую дарогу, яго клалі на ручнік, ім жа і накрывалі. На ручніках апускалі труну ў магілу. Ручнік вешалі на крыж. Ручнік служыў людзям і на Радаўніцу — яго рас..ц..лалі на магіле **па..час** пам..нальнай трап..зы. **Карацей,** усе этапы чалавечага жыцця праходзілі пад знакам ручніка. *(Я. Пархута)*

- *Вызначце спосаб утварэння вытворных прыметнікаў*
- *Вусна перакажыце, у якіх сітуацыях выкарыстоўваюць ручнік беларусы.*

**165.** *Пад лічбай* **I** *выпішыце* ***нумары*** *слоў, утвораных нульсуфіксальным спосабам, пад лічбай* **II** — *складана-нульсуфіксальным. Вызначце часціну мовы кожнага слова.*

**I в.** 1) здароўе; 2) замуж; 3) заўвага; 4) насып; 5) пазыка; 6) дзяльба; 7) лісце; 8) лівень; 9) аб'ява; 10) пятнаццаты; 11) заячы; 12) пахвала; 13) шосты; 14) жыццё; 15) палоззе; 16) здаваць.

**II в.** 1) небакрай; 2) лесасплаў; 3) цукраварня; 4) нафтавоз; 5) лесанасаджэнне; 6) літгурток; 7) цемнаскуры; 8) леспрамгас; 9) левабярэжжа; 10) велікадушнічаць; 11) верхаглядства; 12) сямідзесяты; 13) буракаўборачны.

## Род і лік назоўнікаў

Род з м е н н ы х назоўнікаў звычайна вызначаюць **граматычна** — па наборы канчаткаў пры скланенні. Род у назоўнікаў — **нязменная катэгорыя,** назоўнікі не змяняюцца па родах, у тым ліку пастаянны род маюць назоўнікі агульнага роду.

**Цяжкасці ў вызначэнні роду** часам выклікаюць назоўнікі агульнага роду, нязменныя назоўнікі і складанаскарочаныя словы (абрэвіятуры).

Да а г у л ь н а г а р о д у адносяцца:

**1. Агульныя назоўнікі на -*а* (-*я*)**, якія абазначаюць асоб мужчынскага і жаночага полу; большасць з іх абазначаюць адмоўную характарыстыку асобы і маюць стылістычна заніжаную экспрэсіўную афарбоўку: *нэндза, нядбайла, заіка, жмінда, туляга, беларучка* і інш.; ёсць агульныя назоўнікі са станоўчай ацэнкай і са стылістычна нейтральнай афарбоўкай:

*самавучка, малайчына, калега, цёзка.* <u>**Не блытаць**</u>**:** да агульнага роду не адносяцца назоўнікі на *-а* (*-я*), якія абазначаюць **род заняткаў, прафесію** асоб мужчынскага і жаночага полу. Такія назоўнікі адносяцца да **м. р:** *ваяка, суддзя, прамоўца, творца, тамада, стараста, старшыня* і пад.

**2. Бытавыя формы ад афіцыйных уласных імён:** *Жэня, Шура, Саша, Валера, Вася* (ад *Васіль* і *Васіліна, Васіліса*).

**3. Прозвішчы з канчаткам *-а* (*-я*) і прозвішчы з асновай на зычны:** *Свірка, Пархута, Паходня, Біруля; Багдановіч, Русак, Кудравец, Янішчыц* і падобныя, у якіх па канчатку не відаць полу асобы, а таксама **нязменныя прозвішчы:** *Дзідро, Ючко, Бізэ, Мялкіх* і г. д.

Род <u>**нязменных**</u> назоўнікаў вызначаецца **па семантыцы:**

Да **мужчынскага роду** адносяцца:

1. Назвы **асоб мужчынскага полу** — мужчынскія імёны, формы звароту да мужчын, тыповыя мужчынскія прафесіі: *Вано, Іліко, Гогі, Вісэ́нтэ, Пу́бліо*; *мсье, дэндзі* (франт, элегантна апрануты свецкі чалавек); *аташэ* (кансультант пры пасольстве), *рэ́феры́* (суддзя ў спартыўных спаборніцтвах), *міка́да* (тытул японскага імператара), *ку́лі* (насільшчык, грузчык, чорнарабочы ў некаторых краінах Азіі), *парцье́* (швейцар у гасцініцы).

2. Назвы **жывёл, птушак, насякомых,** іншых **жывых істот:** *дынга, зе́бу* (буйна́я рагатая жывёла), *э́му* (страус), *марабу́* і *фламінга* (назвы птушак). Выключэнне: *івасі* (рыба сямейства селядцовых) — ж. р.; *цэцэ* (афрыканская муха) — ж. р.; *калібры* — дапускаюцца варыянты: і ж. р., і м. р.

3. Нязменныя назвы **гарадоў:** *Баржомі, Мехіка, Мантэвідэ́о, Більба́о, Сарэ́нта, Біса́у, Сант'я́га*; **астравоў:** *Капры, Таіці, Барнео, Сікоку, Хансю, Кюсю, Пуэрта-Рыка, Ко́рфу* і інш. (<u>у нязменных уласных назвах</u> род вызначаецца <u>па агульных назоўніках</u>).

Да **жаночага роду** адносяцца:

1. Назвы **асоб жаночага полу** — жан. імёны, формы звароту да жанчын: *Ніно́, На́ні, Эдзі, Элізабет, Жанэт, Жулі́; пані, фрэйлен, мадэмуазе́ль, місіс.*

2. Нязменныя назвы **рэк:** *Шпрэе, Лімпапо, Міссу́ры, Маке́нзі, Арынока, Хуанхэ́;* **дзяржаў:** *Конга, Марока, Манака, Малі, Самалі́;* **пустынь:** *Гобі, Калахары, Руб-Эль-Ха́лі;* **гор:** *Ай-Пе́тры, Мак-Кінлі, Кіліманджара*; **газет:** "*Юманітэ*", "*Таймс*", "*Гра́нма*"; **арганізацый:** *ЮНЕСКА, УЕФА, ФІФА, ФІДЭ* і іншыя нязменныя ўласныя назоўнікі, у якіх да жаночага роду адносіцца агульны назоўнік, што абазначае родавае паняцце.

Да **ніякага роду** адносяцца:

1. **Неадушаўлёныя** нязменныя назоўнікі: *авеню, амплуа, журы, трыо, барока, дынама* ('від машыны'; але: "*Дынама*" *гудзеў* — м. р.: 'стадыён' або 'футбольны клуб') і мн. іншыя. <u>Выключэнне</u>: *салямі* — ж. р., *кальрабі* (від капусты) — ж. р., *кофе* — м. р. (не блытаць са зменным *кава* — ж. р.).

2. Нязменныя назвы **азёр, мораў:** *Эры, Лох-Нэс, Ха́нка, Фі́джы.*

3. Нязменныя словы ці застылыя формы слоў, якія перайшлі ў назоўнік з іншых часцін мовы і абазначаюць абстрактныя паняцці: *Мы верылі ў светл**ае** **Заўтра**. Пачулася гучн**ае** **"ўра"**. Мне надакучыла тва**ё** **"пачакай"**.*

**166.** *Вызначце і запішыце род наступных назоўнікаў. Сэнс незразумелых слоў высняйце па тлумачальных слоўніках і слоўніках іншамоўных слоў.*

Непаседа, ваявода, Нізавец, назола, гарэза, лэдзі, Элен, міс, Баку, Янцзы, какаду, гну, Дэлі, кімано, валацуга, няўмыцька, неўмывака, канферансье, кенгуру, Кракатау, алоэ, Гюго, полымя, Хуліо, Хасэ́, Юбко, бярэмя, птушаня, брыво, праныра, старшына, Бядуля, Чылі, Осла, танга, По (рака і прозвішча).

**Асцерагайцеся памылкі !**

Не блытайце вызначэнне роду **ўласных нязменных** назоўнікаў **са зменнымі,** у якіх род вызначаецца не па семантыцы, а граматычна — па канчатках. Напр., назвы *Сева́н* □, *Селіге́р* □, *Хаса́н* □ (азёры) — м. р., бо скланяюцца як *дом* □, а возера *Свіцязь* □ — ж. р., бо скланяецца, як *сенажаць* □. Гэтак жа *Уфа* (горад) — ж. р., *Сінгапур* □ (дзяржава) — м. р., *Арарат* □ (гара) — м. р., *Арыён* □ (сузор'е) — м. р., а *Пухавічы* (горад), *Мака́рычы* (вёска) не маюць роду, бо з'яўляюцца множналікавымі назоўнікамі, як *сані, дрожджы.*

**167.** *Падбярыце да назоўнікаў азначэнні і запішыце словазлучэнні ў форме адз. л., укажыце род назоўнікаў. Вусна абгрунтуйце свой адказ. Да якіх назоўнікаў немагчыма далучыць азначэнні ў адз. ліку ?*

Сочы, шчаня, Балхаш, калека, Кутаісі, Антоніо, галіфэ, Нарач, Свіслач, Асіповічы, Галіна Польскіх, Сухумі, Пя́рну, Ватэрлоо, Байкал, Місісіпі, Туапсэ́, Гродна, Шуміліна, неўставака, інтэрв'ю, Душанбе, Перу́, Ара́гві, Сардзінія, поні, Галілео Галілей, Катры́н, Гаі́ці, бра, світанне, пенснэ, дырэктар, Страдывары (прозвішча), сакратар Алена Пятроўна, фіяска.

**168.** *Пры спісванні выпраўляйце граматычныя памылкі ў вызначэнні роду.*

Такая забіяка, пякучы боль, доўгая цень, пясчаная насып, маладая шымпанзэ, рагаты гну, бабуліна камода, не павёў брывом, аўстралійская кенгуру, любімая мазоль, ціхім Нарачам, славутая трыо, багаты ранцье, злая сабака, спелае яблыка, зялёная вусень, твой подпіс, накрыўся шынялём, конскае капыта, родным Жыткавічамі, пабудаваная БАМ, россыпам алмазаў, БЕЛТА паведаміў, вялікая ахапка, стары парцье.

**169.** *Знайдзіце граматычныя памылкі і запішыце выпраўленыя варыянты.*

**I вар.** 1) карабельны верф; 2) цёмна-вішнёвы вуаль; 3) шырокай груддзю; 4) шэрая гусь; 5) з задавакай Васем; 6) дзікая дынга; 7) пра далёкую БАМ; 8) закончыўся бал; 9) з боллю ў сэрцы; 10) новая вальера.

**II вар.** 1) настойка шалфея; 2) не хапіла шампу́ра; 3) без на́ступу не абысціся; 4) жылі пры пекары; 5) поўзалі па пню; 6) ісці па дажджу; 7) гаварыць пры камандзіру; 8) прабірацца па балотам; 9) не было сухавею; 10) на двары пахаладала.

**III вар.** 1) ехалі па запрашэнню ўрада; 2) апусціліся жалюзі; 3) памятаю тваё рандо; 4) Віцяў камп'ютэр; 5) бабулькін клопат; 6) бразнуць дзвярыма; 7) бег рагаты зебу; 8) запахла валяр'яна; 9) пахучая канапля; 10) Косціны рэфераты.

**IV вар.** 1) салодкі сітро; 2) гэты зазнайка вечна адзін; 3) гэтакі няўмека; 4) ваеннае аташэ; 5) шырокая каноэ; 6) звольнілася дырэктар Іванова; 7) рознакаляровыя мулінэ; 8) пацягнула гарам; 9) чорная толь; 10) высокая антрэсоль.

**Асцерагайцеся памылкі!**

| **П а - б е л а р у с к у** | **П а - р у с к у** |
|---|---|
| Камода, табака, таполя, жырафа, гусь, кішэнь і кішэня — **ж. р.** | Комод, табак, тополь, жираф, гусь, карман — **м. р.** |
| Шаль, гар, сып, на́сып, пачак, стэп, сабака — **м. р.** | Шаль, гарь, сыпь, на́сыпь, пачка, степь, собака — **ж. р.** |
| Кру́пы, каноплі, буякі, дрыжыкі, паводзіны — **толькі мн. л.** | Крупа́, конопля́, голубика, дрожь, поведение — **толькі адз. л.** |
| Грудзі, дзверы — **толькі мн. л.** | Грудь / груди, дверь / двери — **2 формы л.** |
| Чарніла — **толькі адз. л.** | Чернила — **толькі мн. л.** |

**170.** *Запішыце словазлучэнні ў левы слупок, а ў правы — іх пераклад на беларускую мову; вызначце род і лік назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.*

Освещённая комната, спелая брусника, крупная черника, сладкая земляника, лёгкая изморозь, отечественный шампунь, душевный покой, вечерние сумерки, твоё поведение, вечные хлопоты, уроки пения, белая ромашка, прошла неделя, цинковые белила, оконченная рукопись, стоптанная ту́фля, спелое яблоко, серебряная медаль, наступило отчаяние, мокрый пол, чистый родник, запахло гарью, большу́ю охапку, с болью в сердце, выстиранное бельё, стояла сушь.

**171.** *Выпраўце памылкі ва ўтварэнні некаторых словазлучэнняў.*

Густы пыл, твой каромысел, на зялёных лісцях, горкі палын, першы сажань, салдацкая шынель, прыхаваная фальш, балючая мазоль, чорны бездань, мядовая квецень, разбітай броўю, шырокай груддзю, наліць газы , бязважкі газ, адчуўся горыч, стары верф, такі давер, вялікі плеш, які жаль, вясёлы россып, гэтае ДАІ.

**172.** *Дапоўніце алгарытм вызначэння роду абрэвіятур сваімі прыкладамі.*




**173.** *Перакладзіце на беларускую мову, абазначце род і лік назоўнікаў у рускіх і ў беларускіх словах.*

● *Складзіце невялікі звязны тэкст, выкарыстаўшы выдзеленыя ўнізе словы.*

Дробь I (*для ружья*), дробь II (*математ.*), дробь III [1) дробный стук; 2) трель] , конопля, пригоршня, отброс, аллея, голубика, сумерки, калитка, хлеба́, кружево, отношение, овощи, общение, кладбище, лекарство, дрожь, сливки, остаток (*пищи*), колосья (*собират.*), лестница (*приставная, переносная*), заросль.

С л о в ы  д л я  д а в е д а к: **веснічкі,** карункі, **прысады,** рэшткі (ежы), прыгаршчы, **адвячорак, збажына, агародніна,** дрыжыкі, адносіны, зносіны, **могілкі,** смятанка, адкіды, **калоссе, лекі,** шрот, дроб, дробат, **пошчак,** драбіны, буякі, **каноплі,** зараслі (зараснік).

| Тыпы назоўнікавага скланення |
|---|
| **1. Назоўнікі 1-га скланення:**<br>1) **ж. р.** на **-*а* (-*я*):** *хата, душа, нага, бабуля, сям'я*;<br>2) **аг. р. жаночага полу** на **-*а* (-*я*):** *малайчына* (*Іна*), *ляўша* (*Юля*);<br>3) **м. р.** на **націскны -*а́* (-*я́*):** *суддзя́ Ілья́, тамада́ Кузьма́*;<br>4) **аг. р. мужчынскага полу** на **націскны -*а́* (-*я́*):** *сірата́ (Фама́), ляўша́ (Лука́)* |
| **2. Назоўнікі 2-га скланення:**<br>1) **м. р.** з нулявым канчаткам: *брат*□, *стол*□;<br>2) **н. р.** на **-*о*, -*а*, -*е*, -*ё*:** *акно, збожжа, поле, кап'ё*;<br>3) **5** назоўнікаў **н. р.** на **-*мя*:** *вымя, семя, цемя, полымя, бярэмя*;<br>4) **м. р.** на **-*а*** з ацэначным суфіксам **-*ішч*-:** *насішча, галасішча* і пад. |
| **3. Назоўнікі 3-га скланення:**<br>**ж. р.** з нулявым канчаткам: *печ*□, *мыш*□, *сенажаць*□ |
| **4. Рознаскланяльныя назоўнікі:**<br>1) **м. р.** на **ненацiскны -*а* (-*я*):** *ваяво́да Дані́ла, дзя́дзя Ва́ня*;<br>2) **аг. р. мужчынскага полу** на **ненацiскны -*а* (-*я*):** *запява́ла (Мікіта), ціхо́ня (Віця)*;<br>3) **тры** назоўнікі **н. р.** на **-*мя*:** *імя́, племя, стрэмя*;<br>4) назвы **маладых істот** з суфіксам **-*яц*-** у адз. л. і **-*ят*-** у мн. л. ва ўскосных склонах: *дзіця, немаўля, кураня, медзведзяня, сланяня.*<br>Слова ***маці*** можа адносіцца да рознаскланяльных і да нулявога скланення: у *Р., Д., М. склонах* — *маці* і *мацеры.* |
| **5. Назоўнікі нулявога скланення** (або **нязменныя**): *фае, купэ, кенгуру, Хельсінкі, Кракатау, фрау Эдзіт Піяф, Гурло́, Ючко́, Сядых* |
| **6. Па-за тыпамі скланення (множналікавыя):**<br>*Жыткавічы, Мака́рычы, сані, абцугі, нажніцы, грудзі* |

## Канчаткі назоўнікаў 1-га скланення на -*а* (-*я*)

У беларускай мове, у адрозненне ад рускай, усе **прозвішчы на -*а*, -*я* скланяюцца:** жаночыя — па 1-м скланенні, як *Іра, цётка, бабуля,* а мужчынскія — як рознаскланяльныя назоўнікі на **-*а*, -*я*** тыпу *тата, Янка, дзядуля:* Р. *Кліменк**і** Вольгі* і *Васіля, Бірыл**ы** Алены* і *Міколы*; Д. *Варвашэн**і** Ганне* і *Варвашэн**ю** Суцяпан**у***; Т. *Скарын**ай** Інай* і *Скарын**ам** Францішк**ам**.*

*Табліца 1*

| **1-е склан.:** **ж. р.** на ***-а, -я*** і **аг. р. ж. полу** на ***-а, -я;*** **м. р.** з націскнымі ***-а́, -я́*** і **аг. р. м. полу** з націскнымі ***-а́, -я́*** | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Склон | А с н о в а | | | |
| | цвёрдая | зацвярдзелая | на **г, х ; к** | мяккая |
| **Д.** і **М.** | ***-е*** | ***-ы*** | ***-е ; -э́, -ы*** | ***-і*** |
| | *старшыне, плаксе Ганне, сіраце* | *ханжы́, задзіры Веры* | *скру́се, рацэ́, цёзцы Вользе* | *сям'і, Ільі́, старшыні́, соні Юлі* |
| **Т.** | ***-о́й (-о́ю), -ай (-аю)*** | | | ***-ёй (-ёю), -яй (-яю)*** |
| | *старшыной (-ою), плаксай (-аю) Ганнай (-аю)* | *ханжой (-ою), задзірай(-аю) Верай (-аю), ляўшой (-ою)* | *скрухай (-аю), ракой(-ою), цёзкай (-аю) Вольгай (-аю)* | *сям'ёй(-ёю), Ільёй(-ёю), старшынёй (-ёю), соняй (-яю) Юляй* |

## Канчаткі рознаскланяльных назоўнікаў на *-а (-я)*

*Табліца 2*

| **Рознаскланяльныя назоўнікі:** **м. р.** з **не**націскнымі ***-а, -я*** і **аг. р. м. полу** з **не**націскнымі ***-а, -я*** | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Склон | А с н о в а | | | |
| | цвёрдая | зацвярдзелая | на **г, к, х** | мяккая |
| **Д.** і **М.** | ***-у*** | | | ***-ю*** |
| | *старасту, мужчыну, непаседу Мікіту* | *творцу, прамоўцу, задзіру Мішу* | *бацьку, сабаку, калегу Янку* | *дзядулю, Віцю, соню Васю* |
| **Т.** | ***-ам*** | | | ***-ем*** |
| | *старастам, мужчынам, непаседам Мікітам* | *творцам, прамоўцам, задзірам Мішам* | *бацькам, сабакам, калегам Янкам* | *дзядулем, Віцем, сонем Васем* |

**174.** *Запішыце імёны і прозвішчы ва ўказаных склонах.*

**Д. скл.:** прабачыць (Пятро Сабаленка); даверыцца (Марыя Роўда); званіць (Іван Ючко); падарыць (Міша Кляўчэня); аднесці (Ліда Валёха).

**В. скл.:** наведаць (Таня Цярэня); сустрэць (Сцяпан Хаме́ц); дапамагчы (Вара Мятла); любіць (Воля Зязюля); вітаць (Валянцін Жа́ўрыд).

**<u>Т. скл.</u>:** сустрэцца з (Іна Бата́н); пабачыцца з (Ірына Калянковіч); спаткацца з (Коля Шабу́ня); вітацца з (Вера Гамолка); сябраваць з (Аляксандр Гладкоў); ганарыцца (Дзіма Родзін); захапляцца (Леў Талстой); працаваць з (Алег Сафонаў).

**175.** *Знайдзіце сказы з граматычнымі памылкамі. Запішыце іх правільна.*

1. Неўзабаве сын вярнуўся з арміі старшым сяржантам. 2. Палявыя і лугавыя кветкі для мяне самыя найпрыгажэйшыя. 3. Граб цвярдзей іншых дрэў. 4. Найвялікшая асалода — адпачыць пасля гарадскога тлуму на беразе ляснога возера. 5. Дарога пачала спускацца ў лагчыну, і дзяўчына пайшла хутчэй. 6. Спадабаўся Пецяў даклад. 7. Бярозы здаваліся гусцей іншых дрэў. 8. Заўсёды імкнуўся ведаць найноўшыя дасягненні ў навуцы. 9. На бягу ўскінуў на плечы дзядулін кажух. 10. У тым жа годзе атрымаў пасаду малодшага навуковага супрацоўніка.

**176.** *Параўнайце склонавыя канчаткі назоўнікаў* ***Іваноў, Мініна, дзіця.*** *Вызначце іх род і асаблівасці скланення.*

| | | |
|---|---|---|
| Н. *Іваноў* □ (як *брат* □) | *Мініна* (як *Алена*) | *дзіця* (як *галлё*) |
| Р. *Іванова* (як *брата* ) | *Мінінай* (як *роўнай*) | *дзіцяці* (як *солі*) |
| Д. *Іванову* (як *брату*) | *Мінінай* (як *роўнай*) | *дзіцяці* (як *солі*) |
| В. *Іванова* (як *брата*) | *Мініну* (як *Алену*) | *дзіця* (як *галлё*) |
| Т. *Іванов**ым*** (як *нов**ым***) | *Мінінай* (як *роўнай*) | *дзіцём* (як *галлём*) |
| М. *(па) Іванову* (як *па брату*) | *(па) Мінінай* (як *па роўнай*) | *(па) дзіцяці* (як *па солі*) |

**177.** *Праскланяйце словазлучэнні* ***Барысаў Ігар, Гарбачова Аліна; горад Барысаў, пасёлак Шчучын****. Параўнайце іх склонавыя канчаткі. Якія адрозненні заўважылі вы ў скланенні прозвішчаў і адпаведных тапонімаў?*

**178.** *Запішыце імёны і прозвішчы вучняў свайго класа ў Д. і Т. склонах.*

**179.** *Спішыце сказы, ставячы ў Д., М. ці Т. склоне ўзятыя ў дужкі назоўнікі. Абазначце ў іх канчаткі і вусна растлумачце правапіс (звяртайцеся да табліцы ”Тыпы назоўнікавага скланення”).*

**І.** 1. Шэпча маці (*уцеха* — Д. скл.) адзінай: ”Мір табе, дарагое дзіця”. (*Гл.*) 2. Туравец быў добрым (*прамоўца*). (*І. М.)* 3. Восенню кветкі завянуць у полі, (*кветка* — Д. скл.) завялай ізноў не цвісці. (*Куп.*) 4. Ёй хацелася пагаварыць, але (*Кузьма*) не было часу. (*К-с*) 5. Юзік з (*Юрка*) выйшлі на

вуліцу. (*К. Ч.*) 6. Ён падышоў к (*суддзя*). (*Б.*) 7. А (*бацька* — Д. скл.) ды (*мачыха*) гэта не ў нос. (*Крап.*) 8. Спеваком ды (*музы́ка*) завуць пяшчотна салаўя. (*Бр.*) 9. Паветра было густа настоена на (*хвоя*). (*Хадк.*)

**II.** 1. Месцамі ў (*шарэнга*) былі прарывы. (*Сам.*) 2. Не на людзях жа пускаць слёзы (*Міколка*). (*Лыньк.*) 3. Ён знікаў, хаваўся ў высокай (*асака*). (*Грам.*) 4. Але ўсюды ціха, толькі шамаціць у (*страха́*) халодны вецер ды недзе на (*дарога*) гудзе машына. (*В. Б.*) 5. І (*дачка*) не спіцца летняй ночкаю, у дачкі на сэрцы неспакой. (*Панч.*) 6. Хаджу я, браце ты мой, трэці год ужо (*старшыня*) калгаса. (*Б.*) 7. Саромелася спачатку, не хацелася такой (*бальшуха* — Д. скл.) садзіцца за буквар з малымі. (*Як.*) 8. Мы з (*Санька*) вачэй не можам адарваць ад сяржанта. (*І. С.*)

**180.** *Перакладзіце на беларускую мову (прыназоўнік* ***к*** *у Д. склоне <u>не замяняйце</u> <u>на</u> спалучэнне прыназоўніка <u>**да** з Р. скл.</u> назоўніка). Укажыце род і склон назоўнікаў, абазначце ў іх канчаткі.*

**I.** Сидеть на ольхе, дружить со старшиной роты, встретиться с председателем колхоза, подойти к дочке, к местному самоучке, приехать к старосте Петру, беседовать о нашей старосте группы, бежать с Костей за Алёшей и Машей, быть благодарным судье, рассчитаться с дядей, идти со своим коллегой, казался тихоней, направиться к Диме, увидеться с деревенским тамадой и запевалой, остаться на руке и на ручке.

**II.** Встречаться со свидетельницей Олей Горбачёвой, назначить свидание свидетелю Ивану Ючко́, отдаться науке, не давать покоя парню-лежебоке, быть больши́м обжорой, принести счастье бедному калеке, сидеть на площадке с дедушкой Кузьмой, был самоучкой, росла умницей, стал человеком-невидимкой, свела судьба с бедолагой Мишей, в имени твоём, в пламени сияющем.

**181.** *Вызначце семантыку назоўнікаў, від іх асновы і запоўніце табліцу па ўзоры. Вусна растлумачце правапіс канчаткаў.*

| **Р. скл.** | **М. скл.** |
|---|---|
| *поўдзень — поўдн**я***<br>*захад — захад**у*** | *кароль — пры карал**ю***<br>*Гамбург — у Гамбург**у*** |

<u>**Р. скл.**</u>**:** неалагізм, агітпункт, антракт, антрацыт[т], антыкварыят, архаізм, бераг, вальс, вірус, геній, рот, твар, трон, тыраж, тэкст, яр.

<u>**М. скл.**</u>**:** шалаш, трактар, морж, І. Мележ, глядач, Фаміч, вораг, пасаг, заяц, тварэц, лось, Алесь, чай, гультай, брат, прынцып.

# Правапіс канчаткаў назоўнікаў м. р. 2-га скланення

У назоўніках м. р. 2-га скланення **цяжкасць выклікае** напісанне канчаткаў у Р. і М. склонах адз. л.

У **Р. склоне** большасць назоўнікаў м. р., як і назоўнікі н. р., маюць **канчатак *-а* *(-я)*.** Гэта **канкрэтныя** назоўнікі, якія абазначаюць асоб, жывых істот, часткі цела: *госця, аленя, шчупака, рота, локця* (але: *твару*); канкрэтныя прадметы і іх часткі: *класа, абцаса, штатыва*; прадпрыемствы, арганізацыі, установы: *завода, урада, саюза, ФАПа, інстытута*; акрэслены прамежак часу: *года, тыдня, месяца*; назвы рэльефу, мясцовасцей, адміністрацыйных адзінак: *берага* (як і *мора, поля*), *ручая, яра, фіёрда, акіяна, раёна, рэгіёна*; адзінкі вымярэння: *градуса, метра, ампера*; навуковыя тэрміны: *катэта, сінуса, русізма* і інш.

**Канчатак** ***-у*** ***(-ю)*** маюць:

**1) абстрактныя** назоўнікі, якія абазначаюць: а) абстрактныя паняцці, пачуцці, адчуванні: *прынцыпу, аўтарытэту, сэнсу, вопыту, настрою, голаду, сораму, суму*; б) апрадмечаныя дзеянні, стан: *догляду, адпачынку, гоману, ходу, пераезду, смеху, сну*; в) грамадска-палітычныя паняцці, навуковыя тэорыі, вучэнні: *апартунізму, класіцызму, ідэалізму, дарвінізму, камунізму*; г) неакрэсленыя прамежкі часу: *веку, часу, узросту, тэрміну, перапынку, антракту, рэгламенту*; д) назвы прасторавых паняццяў, памеру, формы: *прастору, краю, выраю, шляху, стэпу, з усходу, верху, памеру*; е) да абстрактных прымыкаюць назвы з'яў прыроды, стыхійных бедстваў: *снегу, грому, граду, марозу, холаду, пажару, агню, змроку, шторму*;

**2) рэчыўныя** назоўнікі, якія абазначаюць розныя рэчывы, матэрыял, хімічныя элементы, назвы тканін: *бялку, ячменю, воцату, пылу, кобальту, шоўку, нейлону*; выключэнне: *хлеба, аўса*;

**3) зборныя** назоўнікі: *натоўпу, чароту, хмызняку, ажынніку, друзу, рамонку, лёну, лубіну, гаю* (але калі ёсць памяншальны суфікс ***-ок,*** то ўжываецца канчатак ***-а:*** *гайка, ляска*);

**4)** назоўнікі **ва ўстойлівых выразах:** *з году ў год, з веку ў век, ні следу ні знаку, даць маху, з'ехаць з глузду, ні роду ні племені* і г. д.

**Мнагазначныя** назоўнікі мужчынскага роду 2-га склан. у залежнасці ад значэння могуць мець абодва канчаткі: ***-а (-я)*** і ***-у (-ю)***. Напрыклад: *каля чыгуначнага пераезд**а*** (канкр.: пэўнае месца); *не пачыналі пераезд**у*** (абстр.: працэс); *з дагавор**а** вынікае* (канкр.: дакумент); *між імі не было дагавор**у*** (абстр.: 'дамоўленасці' — апрадмечанае дзеянне); *стаялі каля ясен**я*** (канкр.: прадмет); *мэбля з ясен**ю*** (рэчыўны: матэрыял); *прадстаўнікі беларускага народ**а*** (канкр.: нацыя); *мноства народ**у** сабралася* (зборны: сукупнасць людзей); *недалёка ад дом**у**, выйсці з дом**у*** (абстр.: родныя мясціны, жыллё, ачаг); *каля цаглянага дом**а*** (канкр.: будынак), *збіліся з курс**у*** (абстр.: напрамак); *навучэнец першага курс**а**, выкладанне курс**а** беларускай мовы* (канкр.: год навучання; навуковая дысцыпліна).

У **М. с к л о н е** назоўнікі м. р. 2-га склан. адрозніваюцца канчаткамі ў залежнасці ад таго, з'яўляюцца яны **асабовымі** (назвамі асоб) ці **неасабовымі**. У моўнай практыцы найбольш часта змешваюць канчаткі асабовых і неасабовых назоўнікаў з зацвярдзелай і мяккай асновамі. Іх трэба размяжоўваць: асабовыя назоўнікі маюць канчатак ***-у (-ю)*** (пры цвёрдай аснове — і варыянтны канчатак *-е*), а неасабовыя — ***-е, -ы, -у, -і*** ў залежнасці ад асновы ( гл. табл. 3, 4).

У в а г а! Канчатак ***-і*** маюць у М. склоне і назоўнікі **н. р. з мяккай асновай:** *па захаванні спадчыны, па ўжыванні, па значэнні, па тэлебачанні, па насенні, па адраджэнні* і г. д. Неасабовыя назоўнікі м. р. правільна ўжываць так: *па змесце, па ўзоры*, а не *па зместу, па ўзору*. Разнабой у друку ва ўжыванні такіх назоўнікаў м. і н. р. з канчаткам ***-ю*** (***-у***) тлумачыцца неразмежаваннем (змешваннем) граматычных нормаў беларускай і рускай моў. Для **рускай мовы** нормай з'яўляецца канструкцыя **"па + Д. скл.** назоўніка", а для **беларускай мовы — "па + М. скл. "**.

**182.** *Прачытайце прыклады. Растлумачце адрозненне ў канчатках Р. склону адных і тых жа назоўнікаў.*

**I.** 1. Прыехалі 10-га лістапад***а***. Тады яшчэ не было лістапад***у***. 2. Каля трактарнага завод***а***. Без завод***у*** гадзіннік не пойдзе. 3. На вуліцы не чутно ні гук***у***. Зацвярдзелага зычнага гук***а***. 4. Выпіска з загад***а*** па школе. Без загад***у*** не страляць! 5. Ліст клён***а***. Лаўка з клён***у***. 6. Галінка каштан***а***. Зараснікі каштан***у***. 7. Гукі ваеннага марш***а***. Урачыстага марш***у*** салдат.

**II.** 1.Час залатога лістапад***у***; шостага лістапад***а***. 2. Кветка васільк***а***. Настойка з васільк***у***. У жыце мноства васільк***у***. 3. Неперарўзыдзены майстар пейзаж***а*** І.І.Шышкін. Назіранне навакольнага пейзаж***у***. 4. Вінтоўка без запал***а***. У голасе няма запал***у***. 5. У наборы корпуснай мэблі не было гардэроб***а***. Збор у тэатры каля гардэроб***а***. З усяго гардэроб***у*** артыста. 6. У вокнах няма ні агеньчык***а***. Даць агеньчык***у*** на распал. Чалавек без агеньчык***у*** ў душы.

**183.** *Выпішыце словазлучэнні са словамі, у якіх прапушчаны літары. Устаўце прапушчаныя літары і вусна растлумачце іх правапіс.*

**I.** 1. Матчыны рукі ніколі не чуюць цяжар.. свайго дзіцяці. *(Саб.)* 2. Сэрца маё замірае ад страх.. перад гэтым суровым суддз.. . *(У. П.)* 3. Ужо блізка сенакос.. нахапілася раптам некалькі навальніц. *(І.М.)* 4. Думаю, да золак..мы ўправімся. *(Сам.)* 5. У лагчын.., каля балот.., уцалеў ад агн.. хутар. *(К. Ч.)* 6. Пасля антракт.. ў зал.. панавала ўрачыстая цішыня. *(Мік.)* 7. Васіль даехаў да свайго надзел.. , спыніў каня, саскочыў з воз.. . *(І. М.)* 8. Мёд.. пах ідзе ад грэчкі. *(К-с)* 9. Самай выдатнай фігурай адраджэння быў Францыск Скарына, сын купца з Полацк.. . *(Каратк.)* 10. А птушкі з выра.. ляцяць. *(К-с)* 11. Крык, поўны бол.., адча.. і гнев.., востра разрэзаў маўчанне ночы. *(Сам.)*

**II.** 1. Так сказаў і знік без след.. . *(К-с)* 2. Агн.. ў вокнах нідзе не было, але Скуратовіч не спаў. *(К. Ч.)* 3. Ніхто не ішоў адчыняць: або не чулі стук.., або не было дома. *(К-с)* 4. Сышоў з поезд.., збіты з толк.. і з троп.. . *(Пестр.)* 5. Адзін адказ: няма, брат, ход.., хоць з мост.. кідайся ў воду. *(К-с)* 6. Назарэўскі да гэтага час.. ўсё вывучаў блытаныя паказанні Міхала Тварыцкага. *(К. Ч.)* 7. Цьмяным перламутрам пачалі адсвечваць кусты арэшнік.. . *(Луж.)*

***Табліца 3***

| **2-е склан. м. р. а с а б о в ы я** | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Аснова | цвёрдая | зацвярдзелая | на **г, к, х** | мяккая |
| **М. скл.** | ***-е (-у)*** | ***-у*** | | ***-ю*** |
| па, на, пры, у | *па куме, пры дзеду, суседу, па прадзеду, сыне (у)* | *па мужу, пры доктару, на байцу, па Тадэвушу* | *па Алегу, арнітолагу, пастуху, конніку* | *па кавалю, на герою, па цесцю, пры Мікалаю* |

***Табліца 4***

| **2-е склан. м. р. н е а с а б о в ы я** | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Аснова | цвёрдая | зацвярдзелая | на **г, х ; к** | мяккая |
| **М. скл.** | ***-е*** | ***-ы*** | ***-е; -у*** | ***-і*** |
| па, на, у, пры | *у гневе, на слане, у сне, у рове, у гарбузé, у народзе* | *у метры, на маршы, у мячы, па маржы́, па стрыжы́* | *у стозе, пры бульдогу, на сцягу, па даху, па ваўку, у змроку* | *у ча́і, у га́і, у цэ́ні (цяні́), на алені, па пні, на рулі, у болі, у жалі* |

**184.** *Прачытайце. Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі і вусна растлумачце іх правапіс. Вызначце род, склон і тып скланення выпісаных назоўнікаў.*

Яго называюць ”сталіцай беларускага поўдн..”. А яшчэ часцей — ”беларускай Швейцары..”. Тут значна цяплей, чым у цэнтр.. Беларусі. Швейцарыя ў наш..м уяўленн.. — дзівоснае і маляўнічае спалучэнне гор, лясоў і вады, і ўсё гэта надта ж стасуецца да воблік.. Мазыр.. .

Горад уражвае яшчэ здалёк, з акна аўтобус.., што імчыць цябе асфальтоўкай з Калінкавіч. Паабапал — звычайн.. палеск.. роўнядзь з лясамі і пералескамі і з доўгімі россыпамі і малюсенькімі лапікамі чысцютка жоўтага, ажно белага, пяск.. . Мост доўгі, ледзь не на вярсту, пад ім — ”спакойная і павольная” Прыпяць, цёмн.. плынь яе флегматычна пагойдваецца ў акаймаванн.. пясчана-белых берагоў. А за мостам, на другім

баку ракі,— высачэзныя, парослыя дрэвамі і кустоў..м пагоркі-кручы, па стромы.., звілісты.. схіла.. іх збягаюць уніз да Прыпяці будынкі.

Маляўнічая панарама горада адкрываецца з самага высокага месц.. Мазыр.. — з курган.., на якім узвышаецца суровы белы абеліск з Вечным агнём ля падножжа. Глядзіш адсюль на горад — і здаецца, што не сама прырода, а нейкі казачны асілак-волат, змагаючыся з як..сьці ненажэрн.. страшыдл.., нашпурляў-наварочаў гэтыя в..лізáрныя гурбы пяск.. . Мінула шмат час.., пясчаныя кручы параслі травою і лесам, а яшчэ праз гады зацішныя мясціны на бера(г, з).. ракі аблюбавалі пад жытло людзі. *(Паводле М. Гіля)*

**185.** *Спішыце, ставячы ў М. склоне ўзятыя ў дужкі назоўнікі. Вусна растлумачце іх правапіс.*

**I.** 1. Стаяць дрэвы ў жнівеньскай (*краса*), дарогі — у ячменнай (*пацяруха*). (*Грах.*) 2. Замаркоціўся дзед, асабліва па (*Андрэй*). (*К-с*) 3. Вясна ў поўным (*росквіт*). (*Як.*) 4. І вось ужо амаль усе беглі па (*жыта*). (*В.Б.*) 5. Скрыпяць і галосяць колы па (*жвір*). (*М. Т.*) 6. На (*рог*), у (*завулак*), натоўп людзей. (*Скр.*) 7. Скакун ехаў па лясной (*дарога*) на белым (*конь*). (*Шаш.*) 8. Яўхім павёў вачыма па (*пакой*)... (*І. М.*) 9. Мікола не астаўся ў (*доўг*). (*Ц. Г.*)

**II.** 1. На самым (*верх*) гэтай каробачкі сядзела цёмная шапачка. (*К-с*) 2. Аднойчы ў (*плуг*) на (*ралля*) жывёлы спрэчку завялі. (*Крап.*) 3. Яна плакала па (*брат*). (*Р. Н.*) 4. На (*войт*) была новая з цёмнага сукна світка і новыя боты. (*Як.*) 5. Тралейбус бег па Магілёўскай (*шаша*). (*У. К.*) 6. Гэта ў цябе, Язэп, ад таго, што зану́дзеў ты па (*Міхал*). (*К. Ч.*) 7. Бачу, што ўсе яны сядзяць, як зайцы ў (*гарох*). (*Крап.*) 8. Белая ноч на (*двор*). (*Лыньк.*) 9. Ён быў на (*двор*) свае сядзібы. (*Лыньк.*)

**186.** *Пастаўце наступныя назоўнікі ў Д. склоне адз. л. Пісьмова растлумачце правапіс канчаткаў, як паказана ва ўзоры ў табліцы.*

| Н. скл. | Д. скл. |
|---|---|
| *Рэчка* | *рэчц**ы*** — ж.р. 1-га склан., аснова на <u>к</u> |
| *Лойка (Юра)* | *Лойк**у*** — аг. р. м. полу, рознаскланяльны |
| *Іна* | *Ін**е*** — ж. р. 1-га склан., цв. аснова |
| *Валя* | *Вал**і*** — аг. р. ж. полу, 1-га склан. і<br>*Вал**ю*** — аг. р. м. полу, рознаскланяльны |

Сям'я, дачка, шчака, Змітрок Бядуля, елка, страха́, Таня, Пятро Глебка, дуга, тамада Іван, Ірына Варвашэня, боль, глухме́нь, задавака, лебедзь, палын, лесастэп, слодыч, суддзя Замоцін, полымя, скорапіс, накіп, хвоя, ханжа, чаромха, Пеця.

**187.** *Пастаўце наступныя назоўнікі ў Т. склоне адз. л. Пісьмова растлумачце правапіс канчаткаў, як паказана ва ўзоры ў табліцы.*

| Н. скл. | Т. скл. |
|---|---|
| *Баль* | *бал**ем*** — м. р. 2-га склан. |
| *Квецень* | *квецен**ню*** — ж.р. 3-га склан. |
| *Шура* | *Шур**ай*** — аг. р. ж. полу, 1-га склан. і<br>*Шур**ам*** — аг. р. м. полу, рознаскланяльны |

Цень, кіпень, Свір, дэталь, жаль, шыр, шпіталь, шчолач, моль, педаль, Пціч, Грыша, Віця, Алесь Асіпенка, г. Старобін, Генадзь Бураўкін, г. Крычаў, Уладзімір Глушакоў, Францыск Скарына, ляўша Нічыпар, флеш, фальш, Саўка, дзядзя, россып.

**188.** *Пастаўце наступныя назоўнікі ў М. склоне адз. л. Пісьмова растлумачце правапіс канчаткаў, як паказана ва ўзоры ў табліцы.*

| Н. скл. | М. скл. |
|---|---|
| *Рой* | *у ра**і*** — м. р. 2-га склан., неасабовы, мяккая аснова |
| *Гарох* | *у гарох**у** (-се)* — м. р. 2-га склан., неасабовы, аснова на ***х*** |
| *Урач* | *пры ўрач**у*** — м. р. 2-га склан., асабовы |
| *Айсберг* | *на айсберг**у*** — м. р. 2-га склан., неасаб., аснова на *г* (выключэнне) |

З а ў в а г а. Не калькуйце рускі прыназоўнік ***о***, не ўжывайце ў М. склоне без патрэбы кальку з рускай мовы ***аб*** на месцы беларускіх прыназоўнікаў ***у, на, па, пры*** !

Правадыр, рысь, бой, шалаш, трактар, дырэктар, морж, Алесь Вечар, пух, чытач, млын, мост, мядзведзь, рэвізор, пасаг, кажух, Цюрых, ланцуг, чарадзей, ячмень, Пятрусь Макаль.

**189.** *Пастаўце наступныя назоўнікі ў Р. склоне адз. л. Пісьмова растлумачце правапіс канчаткаў, як паказана ва ўзоры ў табліцы.*

| Н. скл. | Р. скл. адз. л. |
|---|---|
| *Рупар* | *рупар**а*** — канкрэтны (прадмет быту) |
| *Парк* | *парк**у*** — зборны (зялёныя насаджэнні)<br>*парк**а*** — канкрэтны (месца стаянкі транспарту) |
| *Стрэптакок* | *стрэптакок**а*** — канкрэтны (бактэрыя) |

З’езд, квас, рот, твар, загар, антрацыт, агнямёт, абрус, асфальт, сінонім, беларусізм, дыялектызм, фашызм, геній, пад’езд, агітпункт,

амідапірын, яр, бастон, міткаль, паркаль, паланізм, покер, вальс, маніфест, погляд, попыт, ручаёк, жарганізм, пікет, поліартрыт, рух, персанаж, калектыў, рынг, боршч, авёс.

**190.** *Складзіце са словамі пары словазлучэнняў ці невялікіх сказаў так, каб назоўнікі стаялі ў Р. склоне адз. л. і мелі ў адным выпадку канчатак* ***-а (-я),*** *а ў другім —* ***-у(-ю).*** *Вусна растлумачце выбар канчатка.*

Узор: *Лінія фронт**у**. Байцы 1-га Беларускага фронт**а**.*

Год, апарат, дагавор, хор, флот, сад, рамонак, мухамор, пад'езд, пропуск.

**191.** *Раскрыйце значэнне міжмоўных амонімаў, карыстаючыся слоўнікамі: "Межъязыковые омонимы и паронимы" (Грабчиков С.М.), тлумачальным і перакладным слоўнікамі. З беларускімі словамі прыдумайце такія словазлучэнні, каб назоўнікі стаялі ў Р. склоне адз. л. Запішыце па ўзоры.*

| У рускай мове | У беларускай мове | Прыклад |
|---|---|---|
| Гонор — *ганарыстасць, фанабэрыстасць* | Гонар — *маральная годнасць; чэсць, пашана, павага* | *Не мець гона-р**у*** |

**I.** Лик — лік, сход — сход, стежок — сцяжок, склон — склон, свет — свет, пыл — пыл, примус — прымус, плот — плот, початок — пачатак, пах — пах, покой — пакой, поверх — паверх, наставник — настаўнік, падеж — падзеж, придаток — прыдатак.

**II.** Отказ – адказ, удел – удзел, уезд – уезд, словник – слоўнік, скарб – скарб, столь – столь, молодь – моладзь, спор – спор, час – час, мех – мех, мастак – мастак, сполох – спалох, злодей – злодзей, речь – рэч, артикул – артыкул, трус — трус.

**192.** *Пры спісванні выпраўляйце граматычныя памылкі ва ўжыванні родавых, лікавых і склонавых формаў назоўнікаў. Вусна растлумачце іх правапіс.*

Сваімі коньмі; па вынікам экзаменаў; малому кацяняці; стукнуўся груддзю; бадзяцца па лясам, па дарогам; новымі дзвярыма; трывожыцца па начам; малое парасяці; прыйшоў з дзіцяці; стукнуць па сталу; на суседчыным кураняці; глядзець па тэлебачанні; белай гуссю; тваім велічам; бясконцай глыб'ю; к Цярэні Васілю; к Валёха Колі; з Цацоха Марынай, з Кудравец Ільёй; з Галотам Міколам.

# Ступені параўнання прыметнікаў

**193.** *Ад дадзеных слоў утварыце ўсе магчымыя формы ступеней параўнання (пры неабходнасці звяртайцеся да табліцы). Растлумачце, чаму ад некаторых прыметнікаў немагчыма ўтварыць ніводную форму ступеней параўнання.*

**I.** Слабы, маленькі, яснавокі, звычайны, чорны, эфектыўны, велічэзны, бронзавы, блізкі, зручны, смачны, белагруды, звышімклівы.

**II.** Глыбокі, глыбокапаважаны, вялізны, **велізарны,** апантаны, настойлівы, патрэбны, шарападобны, інфрачырвоны, архіважны, ядавіты, жоўты, правільны, левы, фальшывы, неабсяжны, сонны, аднарукі, светларужовы, мудры.

| УТВАРЭННЕ СТУПЕНЕЙ ПАРАЎНАННЯ ПРЫМЕТНІКАЎ | | |
|---|---|---|
| **Форма** | **Вышэйшая ступень** | **Найвышэйшая ступень** |
| **ПРОСТАЯ ФОРМА** | ***-ейш- (-эйш-):***<br>*Кісл**ы** → кісл**ейш**ы, выс**окі** → выш**эйш**ы*; суплетывацыяй асноў: *добры → лепшы, дрэнны → горшы, малы → меншы, вялікі → большы*;<br>***-ей, -эй, -ай*** — не ўжываць, бо яны аманімічныя з прыслоўямі ў вышэйшай ступені параўнання. (Ужываецца ў фальклоры, у мастацкім стылі, часцей у паэзіі) | ***най-:***<br>*кіслейшы → **най**кіслейшы*;<br>зрэдку: *вялікі → **най**вялік**ш**ы, новы → **най**ноў**ш**ы, багаты → **най**багат**ш**ы, дарагі → **най**дарож**ш**ы* |
| **СКЛАДАНАЯ ФОРМА** | ***больш, менш:***<br>*кіслы → **менш** кіслы, высокі → **больш** высокі*<br>**НЕЛЬГА:** ~~***больш** кісл**ейш**ы*~~ | ***самы, найбольш, найменш:***<br>*кіслы → **самы** кіслы, **найбольш** кіслы, **найменш** кіслы*<br>**НЕЛЬГА:** ~~***самы** кісл**ейш**ы, **найбольш** кісл**ейш**ы*~~ |

**194.** *Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Ці згодны вы з меркаваннем Сашы Пятрова? Пісьмова абгрунтуйце сваю думку двума-трыма сказамі, выкарыстаўшы ў іх якасныя прыметнікі. Вусна ўтварыце ад іх ступені параўнання.*

МНЕНИЕ САШИ ПЕТРОВА

Какая разница — писать ”моршрут” или ”маршрут”, ”велосипед” или ”виласипед” ? От этого ведь велосипед мотоциклом не становится. Важно только, чтобы всё было понятно. А какая там буква в середине стоит — ”а” или ”о”,— это, по-моему, совершенно безразлично. И зачем только люди сами себе жизнь портят? Когда-нибудь они, конечно, додумаются и отменят сразу все правила. Но пока ещё люди до этого не додумались, а додумался только я один… *(По А. Алексину)*

Пры ўтварэнні ступеней параўнання прыметнікаў і ўжыванні іх у мове нярэдка **дапускаюцца наступныя п а м ы л к і.**

♦ Выкарыстанне **нязменных формаў вышэйшай ступені параўнання** прыметнікаў з суфіксамі ***-ей, -эй, -ай*** тыпу *леп**ей**, выш**эй**, гор**ай*** лічыцца адхіленнем ад літаратурнай нормы (яны аманімічныя адпаведным формам прыслоўяў у вышэйшай ступені параўнання), хаця такія формы прыметнікаў і ўжываюцца ў фальклорных творах, у мастацкай літаратуры, куды трапляюць з жывой гаворкі: *Няма здрады мацн**ей**, чым здрада бліжняга.* (Пр.) *Дараж**эй** за ўсё свабода. Леп**ей** за ўсё мне на свеце мясціна тая, дзе я нарадзіўся і ўзрос.* (Кір.) *І не было нічога ярч**эй** за сонца на родным небе, і не было нічога смачн**ей** матчынага хлеба.* (Панч.)

Адрозніваць такія формы прыметнікаў ад прыслоўяў трэба шляхам замены і вызначэння сінтаксічнай функцыі ў сказе: прыметнікі замяняюцца прыметнікамі з суфіксам ***-ейш- (-эйш-)*** і ў сказе з’яўляюцца азначэннем або выказнікам, а прыслоўі замяняюцца прыслоўямі і ў сказе з’яўляюцца акалічнасцю. Напрыклад: *І чым далей, тым гусцей здаваліся гэтыя развіслыя тоўстыя бярозы.* (К-с) Прыметнік *гусцей* замяняецца на прыметнік *гусц**ейш**ымі*, у сказе ўваходзіць у склад выказніка. Гэтак жа: *Зямля, ты стала для мяне радней і даражэй.* (Панч.) = *радн**ейш**ай* і *даражэйшай. Мацней не знаем пачуцця.* (Бр.) = *мацн**ейш**ага. Пайшла ціш**эй**.* (І. М.) — прыслоўе *цішэй* адпавядае прыслоўю *больш ціха* .

♦ **Вышэйшая ступень параўнання** прыметнікаў звычайна ўжываецца **з** аб’ектам параўнання ў форме **1) В. склону** з прыназоўнікам ***за***: *Ён быў старэйшы **за** сябра на два гады.* **2) Н. склону** з параўнальным злучнікам ***чым*** або ***як***: *Ён быў старэйшы, **чым** сябар* (або: ***як*** *сябар*), *на два гады. Сёлетні ўраджай лепшы, **як** леташні* (або: ***чым*** *леташні*). Формы Р. склону без прыназоўніка тыпу *смял**ей** яго, святл**ей** расы* — гэта рускія канструкцыі, іх ужыванне з’яўляецца адхіленнем ад нормаў беларускай мовы.

♦ Пры ўтварэнні **складаных формаў** ступеней параўнання словы ***больш, менш, самы, найбольш, найменш*** трэба далучаць да зыходных формаў прыметнікаў, а не да формаў вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання**:** *самы цёплы, самы разумны* (а не *самы цяпл**ейш**ы*, не *самы разумн**ейш**ы* і г. д.)

♦ **Найвышэйшая ступень параўнання** звычайна ўжываецца з аб'ектам параўнання ў форме **1) Р. склону** з прыназоўнікам ***з*** або ***сярод*:** *Ляжыць на зямлі* ***най**вышэйшая* ***з*** *сосен* (або ***сярод*** *сосен*)**;** **2) В. скл.** з прыназоўнікам ***за*** і займеннікам ***усё*** або ***ўсіх*:** *Ён мне* ***най**даражэйшы* ***за*** ***ўсіх*** ( або: ***най**даражэйшы* ***за*** ***ўсё*** ).

**Не блытаць:** У рускай мове прыметнікі з суфіксам ***-ейш-*** тыпу *добр**ейш**ий в мире человек, полезн**ейш**ие вещи, древн**ейш**ие орудия труда* — гэта найвышэйшая ступень ("превосходная степень"), а ў беларускай мове — вышэйшая. Таму ў беларускай мове такім рускім канструкцыям адпавядаюць простыя або складаныя формы найвышэйшай ступені параўнання**:** ***най**лепшы (**най**дабрэйшы) ў свеце*; ***самыя*** *карысныя рэчы*; ***самыя*** *старажытныя прылады працы.*

**195.** *Знайдзіце сказы з граматычнымі памылкамі і запішыце выпраўленыя варыянты.*

1. Людская праца ўсіх дужэй на свеце. 2. Ён невысок, не надта ёмак. 3. Хто смялей цябе? 4. Ноч даўжэй за дзень. 5. Антось быў самы весялейшы з усіх хлопчыкаў. 6. Яна мне радней сястры. 7. Галя больш светлавокая, чым яе мама. 8. Наш клёнік стаў яшчэ больш пушыстым. 9. Ён куды большы за мяне ростам. 10. Нашы грушы саладзейшыя ў свеце. 11. Да мяне вярнуўся ранейшы настрой. 12. З цягам часу валасы ў яго сталі менш русыя, чым у дзяцінстве. 13. Рака Дняпро найшырэйшая за Прыпяць. 14. Лепшы спосаб заварвання чаю — калі тым чаем сяброў прывячаю. 15. Хто ж дужэй ад грамады? 16. І ў самай большай на свеце пасудзіне ёсць дно. 17. Твае сённяшнія вершы намнога весялейшыя. 18. Больш горшай бяды не бывае. 19. І хоць ён адышоў ад нас, але з намі засталася жывая памяць аб ім, засталася яго каштоўнейшая спадчына… 20. З глыбінь пачуццяў нараджаюцца думкі і мары, ахопленыя невыразным зачараваннем, і жыццё здаецца паўней і прыгажэй. 21. Захочаш мець — мацней жадай.

**196.** *Перакладзіце сказы на беларускую мову і запішыце іх. Параўнайце ўтварэнне ступеней параўнання прыметнікаў, а таксама кароткіх формаў якасных і прыналежных прыметнікаў у беларускай і рускай мовах.*

1. Длинна зимняя ночь. *(С. Аксаков)* 2. Зала и гостиная были темны. *(А. Пушкин)* 3. Но Чацкий не только умнее всех прочих лиц. […] Он

чувствителен, и весел, и остёр. *(И. Гончаров)* 4. Уже поднимались выше тополей розовые утренние туманы. *(М. Шолохов)* 5. Восточный склон Сихотэ-Алиня более полог, чем западный… *(В. Арсеньев)* 6. Дорога с каждым шагом становилась тяжелее, и заметно было, как лошади бежали неохотнее. *(Л. Толстой)* 7. Пожалуй, кое в чём он был прав. *(М. Шолохов)* 8. Мать приказала отпереть дедушкин кабинет. *(С. Аксаков)* 9. Муж хозяйки был моложе Филиппа Петровича лет на пятнадцать. *(А. Фадеев)*

**197.** *Падбярыце 10 прыкладаў на першую схему пад умоўнай назвай* ***ЦёТаЧКа*** *і па 2 – 3 прыклады — на астатнія схемы.*

1) ***Ц, Т, Ч, К*** + ***СК*** = ***ЦК***; + ***СТВ*** = ***ЦТВ***

2) ***С*** + ***СК*** = ***СК*** (адбываецца сцяжэнне *СС*)

3) ***Д*** + ***СК*** = ***ДСК*** (каранёвае ***Д*** **захоўваецца**)

4) ***Г, К, Х, З, Ж, Ш*** + ***СК*** = ***ГСК, КСК, ХСК, ЗСК, ЖСК, ШСК*** (каранёвы зычны застаецца **нязменным**)

**<u>Узор</u>:** *Краве**ц*** → *краве**цк**і; све**т*** → *све**цк**і* (правіла "***ЦёТаЧКі***").
*Гарадок* → *гарадо**цк**і* (аснова на *к*, **славянская** геаграфічная назва).
*Эвенк* → *эвенк**ск**і* (аснова на *к*, **неславянская** назва нацыянальнасці).

**198.** *Успомніце, калі ў прыметніках перад суфіксам* ***-ск-*** *мяккі знак захоўваецца. Ад назоўнікаў пры дапамозе суфікса* ***-ск-*** *утварыце адносныя прыметнікі, вусна растлумачце іх правапіс.*

**І.** Кубань, Докшыцы, Чашнікі, Данбас, кузнец, Егіпет, Каўнас, эскімос, Арэса, флот, Парнас, Закаўказзе, Таганрог, казах, Волга, Чаркасы, Туніс, Гарынь, мастак, Цюмень, Калінкавічы, Радунь, Іртыш, гігант, дысідэнт, Івянец, юнак, шавец, Геленджык, таджык, Есентукі, Прага, Варонеж, кангалезец, Смаргонь, Давыд-Гарадок, печанег, дэпутат.

**ІІ.** Іпуць, Лань, Чавусы, стралец, Эльбрус, матрос, Прусія, індус, дацэнт, Любань, салдат, калмык, чэх, Рыга, Нясвіж, Кузбас, Гасконь, ткач, батрак, Булонь, Жыткавічы, Тамань, вараг, прэзідэнт, бурлак, каракалпак, Ірак, Лейпцыг, Хатынь, Баранавічы, лабарант, Балхаш, Чыкага, асістэнт, Бялград, басмач, альпініст.

**199.** *У беларускай мове ў мастацкім стылі для выражэння прыналежнасці асобе ці жывёле ў асноўным ужываюцца прыналежныя прыметнікі, а ў дзелавым і навуковым стылях — часцей родны склон назоўніка (гэта граматычная норма рускай мовы). Замяніце, дзе можна, форму выражэння прыналежнасці на сінанімічную — з прыналежным прыметнікам.*

Нара **барсука;** парада **бацькі;** рукі **матулі;** заклікі **партыі;** сын **Пятра Анатолевіча;** цацка **Толі;** кажушок **Міхаські;** сэрца **Ганулькі;** доля адзінокіх **старых;** зарплата **лабаранта** Гудковай; дупло **вавёркі;** творы **С. Грахоўскага;** верш **Р. Барадуліна;** проза **Я. Сіпакова.**

## Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі

**1. Уласнаколькасны** лічэбнік ***адзін (адна, адно, адны)*** дапасуецца да назоўнікаў у родзе, ліку, склоне ва ўсіх склонах. [1] Напр.:

Н. *адзін□ дом□, адн**а** сцян**а**, адн**о** акн**о**, адн**ы** варот**ы***

Р. *адн**аго** дом**а**, адн**ой** сцян**ы**, адн**аго** акн**а**, адн**ых** варот*□ і г. д.

**2. Уласнаколькасны** лічэбнік ***два (дзве)*** і зборны ***абодва (абедзве)*** дапасуюцца да назоўнікаў у родзе і склоне ва ўсіх склонах. Напр.:

Н. *дв**а** (абодв**а**) стал**ы**, дзв**е** (абедзв**е**) ручк**і***

Р. *дв**ух** (абодв**ух**) стал**оў**, дзв**юх** (абедзв**юх**) ручак*□

Т. *(з) дв**ума** (абодв**ума**) стал**амі**, дзв**юма** (абедзв**юма**) ручк**амі***

**3. Уласнаколькасныя** лічэбнікі ***тры, чатыры*** дапасуюцца да назоўнікаў у склоне ва ўсіх склонах. Напрыклад:

Н. *тр**ы**, чатыр**ы** дуб**ы**, рэчк**і***

Р. *тр**ох**, чатыр**ох** дуб**оў**, рэчак* □

Т. *(з) тр**ыма**, чатыр**ма** дуб**амі**, рэчк**амі***

**4. Уласнаколькасныя** лічэбнікі **ад *пяці* і вышэй і ўсе *зборныя*** (*двое, пяцёра, дзевяцера, адзінаццацера* і пад.), а такама ***нуль*** кіруюць назоўнікамі (патрабуюць ад іх формы Р. склону мн. л.) у Н. і В. склонах, а ў астатніх склонах дапасуюцца да назоўнікаў у склоне. Напрыклад:

Н. *пяць□ рублёў, дво**е** кацянят*□ — кіраванне Р. склонам мн. л.

Р. *пяц**і** рублёў, два**іх** кацянят*□ — дапасаванне ў склоне

Д. *(к) пяц**і** рубл**ям**, два**ім** кацянят**ам*** — дапасаванне ў склоне

В. як Н. (пры неадушаўлёных назоўніках) або як Р. (пры адушаўл.)

Т. *(з) пяц**цю** рубл**ямі**, два**імі** кацянят**амі*** — дапасаванне ў склоне

М. *(у) пяц**і** рубл**ях**, (па) два**іх** кацянят**ах*** — дапасаванне ў склоне

---

[1] Колькасныя лічэбнікі падзяляюцца на а) уласнаколькасныя, б) зборныя і в) дробавыя. **Уласнаколькасныя** — гэта лічэбнікі, якія абазначаюць цэлы лік: *адзін, два, трыста пяць* і г. д.

**Але:** ***тысяча, мільён, мільярд*** і іншыя назвы буйных велічынь кіруюць назоўнікамі ва ўсіх склонах, а не толькі ў Н. і В.:

Н. *тысяча рублёў* В. *тысячу рублёў*
Р. *тысячы рублёў* Т. *(з) тысячай рублёў*
Д. *(к) тысячы рублёў* М. *(у) тысячы рублёў*

**5. Дробавыя** лічэбнікі кіруюць назоўнікамі (патрабуюць ад іх формы Р. склону адз. л.) ва ўсіх склонах. Напрыклад:

Н. *дзве пятыя метра* В. *дзве пятыя метра*
Р. *дзвюх пятых метра* Т. *дзвюма пятымі метра*
Д. *дзвюм пятым метра* М. *(у) дзвюх пятых метра*

**Але:** лічэбнік ***паўтара (паўтары)*** кіруе ў Н. і В. склонах Р. склонам адз. л., а ў астатніх склонах патрабуе ад назоўніка мн. ліку, сам жа лічэбнік пры гэтым не змяняецца:

Н. *паўтара літра,* *паўтары міскі*
Р. *паўтара літраў* ( і *літра*), *паўтары місак* □ ( і *міскі* )
Д. *паўтара літрам,* *паўтары міскам*
В. *паўтара літра,* *паўтары міскі*
Т. *(з) паўтара літрамі,* *паўтары міскамі*
М. *(у) паўтара літрах,* *( у) паўтары місках*

**Увага !** Калі дробавы лічэбнік заканчваецца на ***тысяча, мільён, мільярд*** і іншыя назвы буйных велічынь, то пры скланенні яны прымыкаюць у адз. ліку, а назоўнік прымыкае ў мн. ліку:

Н. *дзвесце цэлых і дзве пятыя* ***мільёна рублёў***
Р. *двухсот цэлых і дзвюх пятых* ***мільёна рублёў***
Д. *(к) двумстам цэлым і дзвюм пятым* ***мільёна рублёў***
В. як Н.
Т. *(з) двумастамі цэлымі і дзвюма пятымі* ***мільёна рублёў***
М. *(у) двухстах цэлых і дзвюх пятых* ***мільёна рублёў***

**6. Састаўныя ўласнаколькасныя** лічэбнікі дапасуюцца да назоўнікаў або кіруюць імі ў залежнасці ад таго, якім словам заканчваецца састаўны лічэбнік:

1) калі словам ***адзін (адна, адно, адны),*** то гл. пункт **1** (будзе поўнае дапасаванне ў родзе, ліку і ў склоне ва ўсіх склонах):

Н. *сто адзін* □ *рубель* □; *сто адно акно*; *сто адна рака*; *сто адны вароты*

Р. *ста аднаго рубля*; *ста аднаго акна*; *ста адной ракі*; *ста адных варот* □ і г. д.;

2) калі словам ***два (дзве),*** то гл. пункт **2** (будзе дапасаванне ў родзе і склоне):

Н. *трыццаць* □ *два рублі*; *трыццаць* □ *дзве кнігі*
Р. *трыццаці двух рублёў*; *трыццаці дзвюх кніг* □ і г. д.

3) калі словам ***тры*** ці ***чатыры,*** то гл. пункт **3** (дапасаванне ў склоне);

4) калі словамі ***пяць, шэсць*** і г. д., то гл. пункт **4** (кіраванне Р. склонам мн. ліку ў Н. і В. склонах).

**7. Парадкавыя лічэбнікі** дапасуюцца да назоўнікаў ва ўсіх склонах у родзе, ліку і склоне, як прыметнікі. Гэта поўнае дапасаванне:

Н. *дзвесце друг**і** дом*□; *дзвесце друг**ая** старонк**а***

Р. *дзвесце друг**ога** дом**а***; *дзвесце друг**ой** старонк**і***

Д. *дзвесце друг**ому** дом**у***; *дзвесце друг**ой** старонц**ы*** і г. д.

Як відаць з прыкладаў, у колькасных састаўных лічэбніках скланяецца кожнае слова, а ў парадкавых састаўных лічэбніках змяняецца толькі апошняе слова.

Сінтаксічная сувязь **паміж словамі ў межах дробавых лічэбнікаў** такая ж, як і вышэй апісаная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі. Таму трэба правільна чытаць дробавыя лічэбнікі тыпу 1,2 %; 0,04; $^{3}/_{25}$; 4,2 га: *адн**а** цэл**ая** і дзв**е** дзесят**ыя** працэнт**а*** (а не *адзін цэл**ы***, не *дв**а** дзесят**ых***); *нуль цэл**ых** і чатыры сот**ыя***; *тры дваццаць пят**ыя***; *чатыры цэл**ыя** і дзве дзесят**ыя** гектар**а*** і г. д.

**200.** *Прачытайце, звяртаючы ўвагу на выдзеленыя арфаграмы і на характар сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі. Вусна назавіце лексіка-граматычны разрад кожнага лічэбніка, вызначце склон лічэбнікаў і назоўнікаў, растлумачце ўжыванне канчаткаў у назоўніках.*

Два стал***ы***, вос***ем*** бібліятэк, тры***цц***а́ц***е***ра гусей, два***цц***а́ц***е***ра дзяцей, чатыры вялік***ія*** дрэўц***ы***, ***д***в***ух***сотпяц***і***тыс***я***чны кіламетр, або***дв******а*** сыны, або***е*** маладажоны, в***ас******е***мна***цц***аць ват, дзев***яць***сот тон, шэс***ць***сот тры***цц***аць шэсць метраў, с***ем***сот два***цц***аць дз***е***вяты нумар, адзіна́***цц***аць вёсак, с***е***мна***цц***аць с***я***ржантаў, двухміл***ьё***нны трактар.

**201.** *Прачытайце тэкст услых, правільна называючы лічбы словамі.*

Паводле перапісу 1979 г., беларусы ў рэспубліцы складалі 79,4 %, з іх назвалі беларускую мову роднай 83,5 % , другой мовай — 10,1 % . Сярод прадстаўнікоў іншых народаў, якія жывуць у Беларусі, 40,2 % назвалі беларускую мову другой або роднай. Для некаторых гарадоў Беларусі характэрны тып моўнай сітуацыі, пераходны да ”ірландскага”. Напрыклад, у Мінску ў 1979 г. беларусы складалі 68,4 % , назвалі беларускую мову роднай 42,3 % усяго насельніцтва, роднай і другой — 67,5 % (беларусы — 59,7 % , прадстаўнікі іншых народаў — 7,8 %). У той жа час прадстаўнікі небеларускай нацыянальнасці, якія жывуць у іншых рэспубліках, але раней жылі ў БССР, нярэдка валодаюць беларускай мовай. Так, паводле перапісу 1970 г., за межамі БССР беларускую мову назвалі другой або роднай 57466 чалавек небеларусаў. *(Энцыклапедыя ”Этнаграфія Беларусі ”)*

**202.** *Запішыце прыклады словамі, замест кропак дапішыце адказы.*

1) Да 14 дадаць 11, 2 — будзе ... 2) Ад 24587, 5 адняць 121, 3 — будзе ... 3) К 700 дадаць 1100 — будзе ... 4) 8866 : 2 — = ... 5) 13,4 × 2 = ...

**203.** *Вусна вызначце лексіка-граматычны разрад кожнага лічэбніка і характар сінтаксічнай сувязі яго з назоўнікам. Спішыце, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары.*

Два..цаць тры вялікі.. акн..; ст..(?)два..цаці(?)пяц(?)гадовы юбілей; (*абодва, абедзве*) акн..; (*абое, абодва*) малад(*ых, ыя*) жаніх(*і, а*); (*абое, абедзве*) нявесты; тры..цаці(?)тыс..чны танк; два варан(*ы́х, ы́я*) кан(*я́, і́*); трох(?)міл(*іа, ья*)рдны рахунак; тыс..ча в(*о, а*)с..мсот вос..мдз..сят дз..вяты год; (*два, дзве*) трэц(*іх, ія*) метр(*а, аў*); чатыры цэл(*ых, ыя*) і тры восьм(*ых, ыя*) (*стагі, стога*); нуль цэл(*ы, ых*) і два..цаць тры сот(*ыя, ых*) працэнт(*а, аў*); пяць два..цаць трэц(*іх, ія*) кавалк(*а, і, аў*); тры два..цаць пят(*ыя, ых*) (*часткі, частак*).

**204.** *Падбярыце да лічэбнікаў назоўнікі і запішыце ўтвораныя словазлучэнні ў Т. склоне. Лічбы запісвайце словамі.*

668; 900-ы; 412; $^{3}/_{15}$; 0, 02; $^{4}/_{5}$; 3,003; 64,3; 213; 311-мільённы.

**205.** *Знайдзіце словазлучэнні з граматычнымі памылкамі і запішыце выпраўленыя варыянты.*

1. Каля двух цэлых і адной трэцяй бочкі. 2. Тры вялікія рыбіны. 3. З чатырыста пяццюдзесяццю трыма скрынкамі. 4. З дзвюмастамі двума малюнкамі. 5. У двухстах сарака дзвюх тонах. 6. У дзвюх цэлых і дзвюх дзесятых грама. 7. Адзін цэлы і тры сотыя кілаграма. 8. Да чатырох тысяч дзвюхсот дзевяноста дзвюх тон. 9. З паўтары тысячамі рублёў. 10. Дзве цэлыя і сем дзесятых шклянкі. 11. Паміж дзвюмястамі трыццаццю двума вучнямі.

**206.** *Знайдзіце словазлучэнні з памылкамі. Запішыце выпраўленыя варыянты.*

1) абедзвюмя нагамі; 2) шасцюдзесяццю вучнямі; 3) пяцідзесяццю метрамі; 4) на дзвюхстах грамах; 5) з паўтары тонамі; 6) восемсот васьмідзесяты літр; 7) два высокіх дуба; 8) абодвума дакладамі; 9) у пяціста кіламетрах; 10) убачыў іх абаіх.

**207.** *Раскрыйце дужкі і запішыце лічэбнікі словамі ва ўказаным склоне.*

1) **Т. скл.** 259000 рубл(ёў, ямі); 2) **Н. скл.** 32 $^{4}/_{5}$ гектар(а, аў);
3) **М. скл.** 862130 кніг(□, ах); 4) **Н. скл.** 223 $^{3}/_{4}$ тон(□, ы).

**208.** *Прачытайце. Выпішыце ўсе лічэбнікі, запісваючы іх словамі. Зрабіце іх поўны марфалагічны разбор (узор гл. у дадатку).*

Лютая зіма 1941 года для насельніцтва і партызан Піншчыны стала самым цяжкім выпрабаваннем. Ужо ў студзені партызанскія разведчыкі атрымалі звесткі, што фашысты рыхтуюцца да блакады.

10 лютага адборныя фашысцкія войскі пайшлі ў наступленне. Тры дні пры трыццаціградусным марозе атрад В. А. Васільева вёў бой з карнікамі. Супраць партызан былі накіраваны 45 тысяч галаварэзаў… Уварваўшыся ў невялікі пасёлак Навіна, гітлераўскі палкоўнік загадаў 70-гадоваму Міхаілу Цубу весці карнікаў у размяшчэнне партызан. Ён наадрэз адмовіўся, і фашысты па-зверску забілі яго. Нямецкі афіцэр звярнуўся з той жа прапановай да 75-гадовага Івана Цубы, на вачах у якога быў забіты малодшы брат. Іван згодна кіўнуў галавой.

Гарачая нянавісць да ворага перапоўніла сэрца селяніна. Ён вырашыў паўтарыць подзвіг Івана Сусаніна. Трапіўшы ў непраходнае балота, фашысты зразумелі, што яны ў пастцы. Раз’юшаныя галаварэзы закатавалі героя, але і самі не здолелі выбрацца з лесу. На досвітку іх разграмілі партызаны.

Пасля вайны братам-патрыётам Цубам быў пастаўлены помнік, а сам пасёлак перайменаваны ў вёску Цубы. *(Паводле І. Холада)*

## Ужыванне некаторых займеннікаў

Пры ўжыванні займеннікаў пад уплывам рускай мовы нярэдка парушаюцца граматычныя нормы беларускай мовы. Асаблівай увагі патрабуе ўжыванне наступных займеннікаў: асабовага ***ты***, зваротнага ***сябе***, азначальных ***сам*** і ***самы***, адмоўных ***ніхто***, ***нішто***.

**1.** Займеннікі ***ты*** і ***сябе,*** у адрозненне ад рускай мовы, па-беларуску ў Д. і М. склонах пішуцца з літарай ***а*** ў аснове:

| | |
|---|---|
| Н. *ты*, — | В. *цябе, сябе* |
| Р. *цябе, сябе* | Т. *табой (-ою), сабой (-ою)* |
| **Д. *табе, сабе*** | **М.** *(пры)* ***табе,*** *(на)* ***сабе*** |

**2.** У моўнай практыцы трэба адрозніваць азначальныя займеннікі ***сам*** і ***самы***.

Калі займеннік *сам* (*само́, сама́, са́мі* ) абазначае спосаб дзеяння, ужываецца ў значэнні ’самастойна’, паказвае, што асоба ці прадмет без чыёй-небудзь дапамогі ўтвараюць дзеянне, то ў такіх выпадках займеннік пераходзіць у прыслоўе: *Калі ты гай бярозавы спаткаеш у дальнім краі ці між родных ніў — заўжды бярозку тую прыгадаеш, якую сам калісьці пасадзіў.* (Прых.)

Азначальны займеннік ***са́мы*** (***са́мае, са́мая, са́мыя***) мае ўзмацняльна-выдзяляльнае значэнне, паказвае на крайнюю мяжу распаўсюджання прыметы, з'явы: *Песня, што ўзляцела ў неабдымную прастору неба, раптам спадае да* ***са́май*** *зямлі, нібы шукаючы чагосьці і баючыся, што хутка прыйдзе вечар.*(А.С.)

Калі займеннік ***са́мы (-ае, -ая, -ыя)*** ужываецца не з назоўнікам, а з прыметнікам і разам з ім утварае складаную форму найвышэйшай ступені параўнання, то ён самастойным членам сказа не з'яўляецца, пераходзіць у формаўтваральную часціцу: *Ужо ў* ***са́мым раннім*** *узросце ў дзіцяці развіваецца думка і мова, выхоўваюцца адносіны да дабра і зла.* (Віт.)

Ва ўскосных склонах у займенніку ***сам*** (***само́, сама́, са́мі*** ) націск па́дае **на канчатак,** а ў займенніку ***са́мы*** (***са́мае, са́мая, са́мыя***) **— на аснову:**

| | |
|---|---|
| Н. *сам, само́, сама́, са́мі*<br>Р. *само́га* (м. і н. р.), *само́й, самі́х*<br>Д. *само́му* (м. і н. р.), *само́й, самі́м*<br>В. *сам (само́га), само́, саму́, самі́х*<br>Т. *самі́м* (м. і н. р.), *само́й, самі́мі*<br>М. *(у) самі́м, (у) само́й, (у) самі́х* | Н. *са́мы, са́мае, са́мая, са́мыя*<br>Р. *са́мага* (м. і н. р.), *са́май, са́мых*<br>Д. *са́маму* (м. і н. р.), *са́май, са́мым*<br>В. *са́мы (са́мага), са́мае, са́мую, са́мыя (са́мых)*<br>Т. *са́мым* (м. і н. р.), *са́май, са́мымі*<br>М.*(па) са́мым, (па) са́май, (па) са́мых* |

Звярніце ўвагу: у займенніку ***сам*** націск па́дае менавіта на **першы** галосны канчатка, а не на апошні; гутарковыя формы *самаго́, самаму́* памылковыя, гэта адхіленне ад нормы.

**3.** Трэба адрозніваць ужыванне займеннікаў у канструкцыях:

**1)** ***не хто іншы, як…; не што іншае, як…*** і **2)** ***ніхто іншы не…; нішто іншае не…*** **.** Першыя спалучэнні з займеннікамі *хто* (гэта ўсечаная форма ад няпэўнага займенніка *хтосьці*) і *што* (усечаная форма ад няпэўнага займенніка *штосьці*) ужываюцца ў сказах, дзе няма другога адмоўя. Другія ж словазлучэнні *ніхто іншы не…*; *нішто іншае не…* ужываюцца ў сказах, дзе пры выказніку ўжо ёсць адмоўе ***не***. Напрыклад:

1) *Гэта было* ***не што іншае, як*** *зямлянка*. (Або: *…**не што іншае, а** зямлянка)*. Тут слова ***што*** можна замяніць на ***штосьці*** або ўсё спалучэнне замяніць на часціцу ***менавіта***: *Гэта была* ***менавіта*** *зямлянка.* Аналагічна: *Прыйшоў* ***не хто іншы, як*** *мой даўні сябар.* (*…**не хто іншы, а** мой даўні сябар*; *…**не хтосьці іншы, а**…*; *Прыйшоў* ***менавіта*** *мой даўні сябар*).

2) ***Нішто іншае,*** *акрамя футбола з хакеем, Кацю не цікавіла.* ***Ніхто іншы*** *ў гэты склеп не заглядваў.* Тут можна апусціць слова ***іншае: Нішто,*** *акрамя футбола з хакеем, Кацю не цікавіла.* ***Ніхто*** *ў гэты склеп не заглядваў.*

**4.** Нельга калькаваць рускія аднаслоўныя адмоўныя займеннікі ***некого, нечего*** і механічна палітарна перакладаць іх на беларускую мову. У нашай мове ім адпавядаюць двухслоўныя выразы ***няма каго, няма чаго.***

**Асцерагайцеся памылкі!**

| П а - р у с к у | П а - б е л а р у с к у |
|---|---|
| *Не́кого послать, не́чего дать, не́кем заменить, не́чем занять* | *няма каго паслаць, няма чаго даць, няма кім замяніць, няма чым заняць* |

**209.** *Параўнайце ўжыванне займеннікаў* ***ты*** *і* ***сябе*** *ў беларускай і рускай мовах і перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову па ўзоры.*

Р. *добавлял от с**е**бя — дадаваў ад с**я**бе;*
*видел у т**е**бя — бачыў у ц**я**бе;*
*сидел у т**е**бя —*
Д. *похвастался т**е**бе — пахваліўся т**а**бе;*
*отказал с**е**бе — адмовіў с**а**бе;*
*передал т**е**бе —*
*построить с**е**бе —*
В. *искал т**е**бя — шукаў ц**я**бе;*
*занять с**е**бя —*
*любил т**е**бя —*
М. *нуждался в т**е**бе — меў патрэбу ў т**а**бе;*
*грустил о т**е**бе —*
*напоминал о т**е**бе —*
*сшит по т**е**бе —*

**210.** *Спішыце, устаўляючы патрэбны па сэнсе займеннік.*

1. Здаецца, каб меў крылы, узмахнуў бы імі і, як магутны птах, узляцеў бы высока-высока над гэтай ракой, што ціха плюскоча ля (*са́мых, самі́х*) ног. *(Г. Ш.)* 2. Во толькі рабіць гэта не надта хацелася (*са́маму, самому, самаму́*) Бураву, лепш, каб ужо хто іншы.*(В. Б.)* 3. Каля (*самога, самага*) берага б’е з-пад зямлі крыніца з серабрыстай сцюдзёнай вадою. (*В. В.*) 4. З усіх сродкаў выхавання, якія ёсць у нас, у людзей, (*самі́м, са́мым*) выпрабаваным і надзейным было і будзе слова. *(Віт.)* 5. Адчуванне таго, што Ганна толькі госцяю стала, было ў кожнага і ў (*самай, самой*) Ганны. *(К. Ч.)* 6. Іх абстралялі і забралі ўсіх жывых, але (*самога, самага*) іхняга начальніка, якога даўно ўжо шукаюць, паміж імі не было. *(К. Ч.)*

**211.** *У якіх сказах ужыты формы займенніка* ***сам,*** *а ў якіх —* ***самы?*** *Выпішыце сказы, у якіх ёсць формы займенніка* ***сам****. Пастаўце ў ім націск. Устаўце прапушчаныя літары.*

1. Як тая рабіна, цвіла ў гэтае лета Ганна. Яшчэ, здаецца, учора была гарэза, падлетак, а вось ужо ў сам..й добрай пары дзяўчына, у сам..й красе сваёй! *(І. М.)* 2. На пірамідзе гумна бачу даўно знаёмы выступ буслінага

гнязда, а на гняздзе — сам..га бусла. *(Б.)* 3. Дзень быў вясёлы, сонца свяціла з сам..га ранку. *(Кул.)* 4. Неўзабаве ціша запанавала ў класе, нават старэйшыя вучні, якія самі чыталі гэты твор і ведалі яго на памяць, уважліва ўслухоўваліся ў кожнае слова настаўніка. *(С.А.)* 5. У такія хвіліны я, вядома, не звяртаў увагі на бэз, хоць стаяў ён у мяне пад сам..м носам. Затое пасля экзаменаў пах бэзу да сам..га вечара п'яніў мне галаву. *(І. Н.)* 6. Не жадай іншым таго, чаго не жадаеш сам..му с..бе. *(Пр.)*

**212.** *Выпішыце* ***нумары*** *сказаў, у якіх на месцы пропуску трэба ўставіць займеннік* ***сябе*** *ў Р. ці В. склоне.*

1. Пасля вайны коней не хапала, дык на … аралі. 2. А гады бесклапотнага дзяцінства і юнацтва не забываем, пакідаем у … на ўсё жыццё. 3. Досыць дакараць яе, яна і так сама … не рада. 4. Сама … 8 Сакавіка падарыла кветкі. 5. Не звяртай на … ўвагі, не засяроджвайся на фізічных недахопах, а радуйся прыгажосці і шчодрасці душы. 6. Самому … стала няёмка ад выказанай ім самім праўды. 7. У чужой кампаніі дзяўчыне стала не па … . 8. Кудлач быў добрым і верным сторажам, чужых блізка да … не падпускаў. 9. Не шукай непатрэбнага, лішняга клопату ні … , ні іншым. 10. Гаспадар ён так … , але хоць мужчынская шапка вісела ў хаце. 11. Дзядзька даў … зарок больш не хадзіць на паляванне. 12. Несла ношку на … . 13. Нахіліўся і ўбачыў у … пад нагамі вожыка.

**213.** *Знайдзіце сказы з граматычнымі памылкамі ва ўжыванні займеннікаў і запішыце выпраўленыя варыянты.*

1. Чужое возьмеш — сабе на карысць не пойдзе... 2. Я цябе такое раскажу, што ў цябе адпадзе ахвота пярэчыць. 3. Не стаў сабе дачасна помнік і ў бяссмерце не спяшы, лаві не ўласнай славы промні, а сонца кожнае душы. 4. Каля самога плоту раслі крапіва і чыстацел. 5. Мне хацелася не раз самаму́ ўзляцець у неба. 6. Падышоў к са́маму берагу і зірнуў уніз. 7. Прыдбаў сябе ў "Букінісце" рэдкую кнігу. 8. Ты старэйшы, на цябе ўвесь клопат ляжа. 9. Па падворку хадзіў ніхто іншы, як сын. 10. Каля берага ракі стаяў разложысты дуб. Калі ён параўняўся з ім, то пачуў брэх сабакі. 11. Настаўнік параіў несці кнігі да сябе. 12. Каля жыта на самай мяжы стаяла не што іншае, як новы камбайн. 13. Каля самай школы Алег убачыў дырэктара. Ён падышоў да яго. 14. Які-ніякі, а ўсё-такі свой дом. 15. Ідучы ў армію, сын папрасіў маму не выкідваць свае сшыткі. 16. Табе, шчодры сялянскі стол, хочацца сказаць ласкавае слова. 17. Хто-ніхто ўжо працаваў на полі. 18. Сусед раіў Андрэю схаваць сына, але ён яго не паслухаўся. 19. Жыў ціха, некаму не жаліўся на свой лёс. 20. І некага нам папракаць… 21. На радзіме цябе знаёмы кожны сустрэчны. 22. Завітала цётка Фядора не так сябе, а па важнай справе.

**214.** *Спішыце, выбіраючы з дужак адпаведны займеннік.*

1. Зрабіць (сябе, сабе). 2. Прывучыў (сябе, сабе) к парадку. 3. Павіншаваў (табе, цябе). 4. Стукнуўся аб (цябе, табе). 5. Самі (сабе, сябе) шкодзім. 6. Загадалі яму (самаму, самому). 7. У (самым, самім) патайным месцы. 8. Каля (самой, самай) рэчкі. 9. Убачылі (самаго, самога, самага) прэзідэнта.

**215.** *Выпішыце* **нумары** *сказаў, у якіх няправільна ўжыты займеннікі.*

1. Няўжо цябе больш прыемна частавацца, чым самому дарыць пачастункі? 2. Самай гаспадыні дома не было, у агародчыку варушылася толькі старая маці. 3. Хацелася самаму́ праплыць на лодцы. 4. Ніхто не зробіць горш табе, чым сам сабе. 5. Бабуля папрасіла ўнучку купіць сабе малака. 6. Нішто іншае не пакідае ў душы такі яркі след, як першае каханне. 7. У госці завітаў ніхто іншы, як яго даўні сябар. 8. Калі на галінку пераскоквала вавёрка, з яе сыпаўся снег. 9. Тады ён усё ўспомніць цябе, усё прыгадае. 10. Зрэдку хто-ніхто заглядваў у гэтую балоцістую мясціну.

**216.** *Якая маўленчая з'ява парадзіруецца ў наступным урыўку?*

Дубы каля хаты, дубы ля дарогі,
дубы на прылессі, дубы ля ракі…
Дубовы пагляд і суровы, і строгі.
Ад збытку дубоў аж дубеюць радкі.
*Г. Юрчанка*

**217.** *Прачытайце ўрыўкі з сачыненняў выпускнікоў школ, звярніце ўвагу на выдзеленыя словы. Якія памылкі дапушчаны ў выкарыстанні займеннікаў як сродку сувязі частак сказаў і частак тэксту? Выпраўце іх і запішыце ўдасканаленыя варыянты тэкстаў.*

1. Родная *вёска* – гэта *вёска*, дзе пачаў жыць, пайшоў у школу. Пра сваю *вёску* ведаеш амаль усё...[...] Цяпер у *кожную* хвіліну я магу ўявіць гэтыя цудоўныя мясціны, што з дзяцінства запалі ў *маю* душу. Адным з *маіх* самых любімых *вершаў* Я. Коласа з'яўляецца *верш* "*Родныя* вобразы", дзе паэт паказвае цягу чалавека да *родных* мясцін...

2. У любую пару года *я* люблю бываць у *сваім* лесе, назіраць за яго жыццём. У *мяне* ёсць *свае* месцы, якія *я* асабліва часта наведваю, дзе адпачываю душой. *Я* люблю *сваю* вёску, людзей, якія тут жывуць. У *вёсцы* ў *мяне* ёсць блізкія сяброўкі. І куды б *я* ні паехала, *я* заўсёды смуткую па гэтым родным *мне* куточку.

3. *Калі мне* сумна, на душы штосьці трывожнае, тады *я* іду на сваю алею, і там, *калі я* прайду па ёй некалькі разоў, *мне* становіцца лепш,

весялей. Калі *я* ступаю па зямлі, якая *мяне* нарадзіла, *я* адчуваю салодкі водар зёлак і глебы ...

... Хутка *я* пакіну бацькоўскі дом, дзе вырасла... Але *я* ўпэўнена: што б са *мной* ні здарылася, *я* са спакойным сэрцам магу вярнуцца дамоў, у *куток*, дзе *я* нарадзілася. Ласкавым шолахам *мяне* сустрэне ўсё дарагое і роднае *майму* сэрцу, і *я* забуду ўсе свае няўдачы...

● *Пішучы сачыненне або рыхтуючы пераказ любога тэксту, перачытайце чарнавік і праверце, ці няма ў вас паўтораў, падобных да прыведзеных вышэй.*

# Правапіс асабовых канчаткаў дзеясловаў

Напісанне дзеясловаў з націскнымі канчаткамі не выклікае цяжкасцей. У дзеясловаў жа **з ненаціскнымі канчаткамі** спражэнне можна вызначыць **па неазначальнай форме,** а іменна:

**Да II спражэння** адносяцца

1) дзеясловы на ***-іць*** (***-ыць***), дзе ***-і- (-ы-)*** — суфікс: *насіць, даіць, тужыць* [**не блытаць:** у аднаскладовых дзеясловаў *віць, шыць, крыць* і падобных ***-і-, -ы-*** адносяцца да кораня, усе аднаскладовыя дзеясловы на ***–іць (-ыць)*** — I спражэння];

2) дзеясловы на ***-ець,*** калі ***-е-*** не захоўваецца ў 1-й асобе адзіночнага ліку**:** *вярцець — вярчу, ве́рц**іш**, ве́рц**іць**, ве́рц**ім**, ве́рц**іце**, ве́рц**яць***; *вы́лецець — вы́леч**у**, вы́лец**іш**, вы́лец**іць**, вы́лец**ім**, вы́лец**іце**, вы́лец**яць***; **але:** *хацець — хачу, хоч**а**, хоч**уць*** — I спр.;

3) асобныя дзеясловы на ***-аць:*** *гн**а**ць, ст**ая**ць, сп**а**ць, ба**я**цца, залеж**а**ць* і ўсе вытворныя ад іх.

Усе астатнія дзеясловы з ненаціскнымі канчаткамі — I спражэння: *старэць* (*старэю, старэе, старэюць*), *бялець* (*бялею, бялее, бялеюць*), *адолець, чытаць, адчуваць, вынесці, выстрыгчы, крыкнуць* і г. д.

Вытворныя прыставачныя дзеясловы заўсёды адносяцца да таго ж спражэння, што і невытворныя. Таму невыразны галосны ў канчатку і ў суфіксе прыставачнага дзеяслова часта можна праверыць адпаведным беспрыставачным дзеясловам з націскным канчаткам і суфіксам, напрыклад: *ўгле́дзець — глядзець, ён ўгле́дз**іць** — ён глядз**і́ць***; *зале́жаць — ляжаць, ты зале́ж**ыш** — ляж**ы́ш***; *ён пры́йдз**е**цца –ідз**е́***, *яны пры́йд**уць** — ід**у́ць***.

Дзеяслоў ***бегчы*** і вытворныя ад яго — **рознаспрагальныя**, у іх у 3-й асобе мн. л. канчатак I спражэння**:** *бяг-**уць,*** а ў астатніх формах — канчаткі II спражэння**:** *бяж-**ыш,** бяж-**ыць,** бяж-**ым,** беж-**ыце́.***

Дзеясловы ***есці***, ***даць*** і ўсе вытворныя ад іх спрагаюцца па асобым (нетэматычным) спражэнні, у іх ёсць спецыфічныя канчаткі, не ўласцівыя ні I, ні II спражэнням**:**

| **Адз. л.** | | | **Мн. л.** |
|---|---|---|---|
| 1-я ас. | *е-**м**,* | *да-**м*** | *я-**мо**, да-**мо*** ( і *ядз-**ім**, дадз-**ім***) |
| 2-я ас. | *я-**сі**,* | *да-**сі*** | *яс-**це**, дас-**це*** |
| 3-я ас. | *ес-**ць**,* | *дас-**ць*** | *яд-**уць**, дад-**уць*** |

Нельга змешваць з дзеясловам закончанага трывання ***даць*** дзеяслоў незакончанага трывання ***да̂ваць***, які ва ўсіх формах мае канчаткі І спражэння: *да-**ю**, да-**еш**, да-**е**, да-**ём**, да-**яце́**, да-**юць**.*

У моўнай практыцы пад уплывам рускай мовы часта дапускаюцца **памылкі** пры ўжыванні дзеясловаў у 2-й асобе множнага ліку. Трэба памятаць, што **ў 2-й асобе мн. л. націск ніколі не па́дае на першы склад канчатка.** Ён падае або а) на аснову, або б) на 2-і склад канчатка — на склад ***-цé.*** Напрыклад: а) *гуля́-**еце**, зно́йдз-**еце**, забіра́-**еце***; б) *нес-**яцé*** (а не *няс-**é**це*), *прыжыв-**яцé**-ся* (а не *прыжыв-**é**це-ся*), *сядзець — седз-**іцé** (а не сядз-**í**це), падрасці — падрасц-**яцé*** (а не *падрасц-**é**це*), *абцерці — абатр-**ацé*** (а не *абатр-**э́**це* і не *абцер-**ацé***), *смяяцца — сме-**яцé**-ся* (а не *смя-**é**це-ся*) і пад.

Неабходна **адрозніваць** таксама канчаткі дзеясловаў у абвесным і загадным ладах. У з а г а д н ы м  л а д з е ў 1-й ас. мн. л. дзеясловы могуць мець спецыфічныя для беларускай мовы канчаткі ***-éм, -э́м*** (пад націскам), ***-ма*** (не пад націскам): *нясé**м**, кладзé**м**, вяжэ́**м**, бярэ́**м**; склáдвай**мася**, канчáй**ма**.* У а б в е с н ы м  л а д з е ў 1-й ас. мн. л. гэтыя дзеясловы маюць канчаткі: *нясё**м**, кладзё**м**, вя́ж**ам**, бяро́**м**; склáдва**емся**, канчá**ем**.* Т. ч., у загадным ладзе канчаткі ***-éм*** і ***-э́м*** націскныя, а ў абвесным ладзе канчатак ***-ем*** ненаціскны.

У 2-й ас. мн. л. у загадным ладзе, у адрозненне ад абвеснага, націск можа падаць на канчатак ***-ы́-*** ( ***-í-*** ) перад постфіксам *–це*: **загадны лад:** *бял[í]це, прарасц[í]це*; **абвесны лад:** *бéл[іце], прарóсц[іце]*.

**218.** *Разгледзьце табліцу. Пад уплывам чаго часта няправільна ўжываюць дзеясловы ў форме 2-й асобы множнага ліку?*

*Што пішацца ў беларускай мове замест <u>ё</u> ў канчатках дзеясловаў у першым складзе перад націскам (гл. 2-ю ас. мн. л. абвеснага ладу)?*

| Форма | Абвесны лад | | Загадны лад | |
|---|---|---|---|---|
| | па-руску | па-беларуску | па-руску | па-беларуску |
| 1-я ас. мн. л. | *стáн-ем*<br>*вед-ём*<br>*мет-ём*<br>*бер-ём* | *стáн-ем*<br>*вядз-ём*<br>*мяц-ём*<br>*бяр-óм* | _____ | *стáнь-**ма***<br>*вядз-**éм***<br>*мяц-**éм***<br>*бяр-**э́м*** |
| 2-я ас. мн. л. | *стáн-**ете***<br>*вед-**ёте***<br>*мет-**ёте*** | *стáн-**еце***<br>*ведз-**яцé***<br>*мец-**яцé*** | *стáнь-те*<br>*вед-**и́**-те*<br>*мет-**и́**-те* | *стáнь-це*<br>*вядз-**í**-це*<br>*мяц-**í**-це* |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | *бер-**ӗ**те* (націск на 1-м складзе канчатка) | *бер-**аце́*** (націск на 2-м складзе канчатка) | *бер-**и́**-те* | *бяр-**ы́**- це* |

**219.** *Спішыце народныя выслоўі, вызначаючы спражэнне дзеясловаў і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце іх правапіс.*

1. Прыйдз.. раніца — будз..м раіцца. 2. На яго дзе сядз..ш, там і злез..ш. 3. Не навуч..шся ў маткі — людзі навуч..ць. 4. Не падмаж..ш — не паедз..ш. 5. Воран ворану вока не выдз..ўб.. . 6. Як пойдз..ш нацянькі, дык праходз..ш тры дзянькі. 7. Як дба..м, так і ма..м. 8. Ваўка ногі корм..ць. 9. Не памы..шся рукамі, дык абмы..ць языкамі. 10. Каторы конь цягн.., таго і паганя..ць. 11. Начлег з сабой не нос..ць, а ў людзей прос..ць. 12. Не кожны хворы, хто стогн.. . 13. Як кліч..ць, так і адкліка..цца. 14. Шэпты хату зводз..ць. 15. Кароўку не напо..ш, то і не падо..ш. 16. Есць — дав..цца, а бяжыць — вал..цца. 17. Кінь за сабою, дык знойдз..ш перад сабою. 18. З адным брухам на два абеды не паспе..ш. 19. Дай кішцы волю, дык сам будз..ш у няволі. 20. Зняўшы галаву, па валасах не плач..ць. 21. Не да парасят, калі свінню смал..ць. 22. Хоць гумно згарыць, але ж і мышы лясн..ць. 23. Вышэй пупа не падскоч..ш.

**220.** *Спішыце, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы патрэбныя літары. Вусна растлумачце іх правапіс. Укажыце спражэнне дзеясловаў.*

Чалавек горн..цца да прыгожага і выяўля.. (ц.ч.) гэту сваю прагу, як уме.. (ц. ч.), у розныя часы па-рознаму, быва.. (ц. ч.) — падсвядома. З..мляроб заўсёды а(д, т)горт(ы?)ваў плугам скібу на скібу, праводз..ў роўн..нька, як па шнур(у, ы), разоры, а каўзанецца па кам..н(і, ю) сашнік — вымаў яго, выгладж(ы?)ваў дазвання агрэх. Загоны баранавалі, пакуль усе грудкі (н..) стан..ць аднолькавыя, як пад адну мерку абточ..ныя. Касілі лугі, так прыціска..чы касу, каб н.. ”барады”, н.. зялінкі (н..) засталося (на) пакос(у, і, е),— словам, рабілі сваю цяжкую працу, (з, с) густам мастака аздабля..чы яе.

А як заслух(і?)валіся песняю жаўранка, спыніўшы коніка (з,с) возам, як зампралі (з, с) сякерай у хмызняку, каб (н..) спудз..ць салаўя, як апускалі долу паляўніч..ю стрэльбу, заглядз..ўшыся на харашуна лося! *(М. Лужанін)*

● *Раскажыце, як вы ўяўляеце рэалізацыю імкнення да прыгожага ў вашай будучай прафесіі.*

**221.** *Прачытайце. Якая галоўная думка тэксту? Выпішыце дзеясловы, пастаўце іх у формы 2-й асобы адз. і мн. л., вызначце спражэнне.*

Калі пісьменнік ведае прыроду слова, на сваім месцы, у залежнасці ад карціны, ён можа сказаць: падмерзла, падмарозіла, умарозіла, умерзла, падшэрхла, прыстала, зацягнула лядком, стужэла; гушкацца, гоцкацца, гутатацца, калыхацца, люляцца, гойдацца, чэкацца. Мы, на жаль, найчасцей прывыкаем да якога-небудзь аднаго слова і карыстаемся ім ва ўсіх выпадках, напрыклад: ”накіраваўся”, забываючыся, што ёсць сінонімы, якія адразу могуць ажывіць карціну сваім асаблівым каларытам: пайшоў, падаўся, пашыбаваў, папраставаў, скіраваў, узяў кірунак, узяў напрамак, пасігаў, пакрочыў. *(Паводле Я. Скрыгана)*

**222.** *Карыстаючыся вышэй прыведзенымі табліцамі, выпраўце памылкі ва ўжыванні дзеясловаў у наступных прыкладах.*

1. Куды вы бяжы́це? 2. Так не праб’е́цеся. 3. Навошта ўе́це вяроўку? 4. На мой голас адзаве́цеся. 5. Прыходзьце, як толькі прачне́цеся. 6. Скажэ́це, каб прыходзілі. 7. Як вы іх распазнае́це? 8. Ідзе́м гэта мы ўчора па лесе і раптам бачым… 9. Мы вядзе́м з сабой дзяцей. 10. З якой мэтай іх бярэ́це з сабой? 11. Як толькі паклічу — адразу адгукне́цеся. 12. Перад пачаткам новага навучальнага года мы абавязкова падстрыжэ́мся. 13. Трэба адмерыць 5 м. стужкі. 14. Яны з лёгкасцю пераскочуць канаву. 15. Коннікі праскачаць перад вокнамі.

**223.** *Устаўце прапушчаныя літары, вусна растлумачце іх правапіс (у 6-м слупку дзеясловы стаяць у абвесным ладзе).*

| Інфінітыў | Мы | Ты |
|---|---|---|
| Агледз..ць | бяр..м | адслуж..ш |
| Выгр..бціся | запіш..м | вы(я,е)в..ш |
| Заенч..ць | зверн..мся | выс(я,е)дз..ш |
| Разве..ць | калыш..м | высв(я,е)тл..ш |
| Се..ць | пол..м | выдз(я,е)ўб..ш |
| Разгледз..цца | узваж..м | мерзн..ш |
| Выб..л..ць | смя..мся | ушчува..ш |
| Перамер..ць | разгледз..м | шану..ш |
| Адол..ць | выб..р..м | кампенсу..ш |
| **Ён** | **Яны** | **Вы** |
| выб..р.. | пераскоч..ць | адарв..це |
| зачару..цца | праскач..ць | маўч..це |
| агледз..цца | разве..ць | прачн..цеся |
| піш..цца | заквохч..ць | складз..це |
| мро..цца | адвоз..ць | вы́в..дз..це |
| вымаж..цца | падгледз..ць | зав..з..це |
| паліва..цца | пабел..ць | в(я,е)дз..це |
| перакліка..цца | заквас..ць | выб..ж..це |

**224.** *Вызначце спражэнне дзеясловаў і запоўніце табліцу па ўзоры. Вусна растлумачце правапіс невыразных галосных. Якой тыповай памылкі трэба асцерагацца пры ўжыванні дзеясловаў у форме 2-й ас. мн. л.?*

***Памятайце:*** *пры змяненні формы дзеяслова* ***нельга мяняць*** *яго* ***трыванне,*** *інакш дадзены дзеяслоў падмяняецца парным паводле трывання дзеясловам.*

| Неазнач. форма | 3-я ас. адз. л.: **ён** | 3-я ас. мн. л.: **яны** | 2-я ас. мн. л.: **вы** |
|---|---|---|---|
| 1. *Вы́хадзіць* – II спр.<br>2. *Узяцца* – I спр. | *вы́хадз-**іць***<br>*во́зьм-**е**-цца* | *вы́хадз-**яць***<br>*во́зьм-**уц**-ца* | *вы́хадз-**іце***<br>*во́зьм-**еце**-ся* |

Паклікаць, засцерагчы, сядзець, імкнуцца, страц..ць, падгледз..ць, здаць, скласці, забраць, выдаваць, пазнаём..цца, адысціся, перадаць, увайсці, панесці, разгледз..цца, зберагчы, выстаяць, папасці, абтрэсці, разгладз..ць, плесці, піць.

**225.** *Успомніце правапіс суфіксаў дзеясловаў* ***-ава- (-ява-), -ва-, -ыва- (-іва-)*** *і перакладзіце словы на беларускую мову, абазначце ў іх суфіксы. З трыма-чатырма словамі (на выбар) складзіце сказы.*

Засаливать, подкармливать, переваривать, расследовать, подписывать, овладевать, разгадывать, подклеивать, обмениваться, выглаживать, надаивать, проветривать, утаивать, намыливаться, поддерживать, совершенствоваться, вымораживать, обследоваться, раскалываться, очерчивать, возглавлять.

**226.** *Выпішыце словы, якія ў 2-й асобе адз. л. маюць канчатак* ***-іш (-ыш).***

Ляжаць; адолець; разбірацца; прыгледзецца; легчы; прызнаваць; выплыць; выплываць; дагледзець; баяцца; выбрацца; падаваць; здаць; пападаць; пазнаваць; прапусціць; пасядзець; вынесці; выносіць.

**227.** *Выпішыце словы, якія ў 2-й асобе мн. л. маюць канчатак* ***-аце (-яце).***

Разабрацца; адкласці; выконваць; ткаць; перагледзець; жыць; адмахнуцца; разумець; ісці; зжаць (жыта); аддзячыць; класціся; заплысці; злавацца; закончыць.

**228.** *Выпішыце* **<u>нумары</u>** *дзеясловаў, якія ў 2-й асобе мн. л. маюць канчатак* ***-аце (-яце).***

1) выбегчы; 2) смяяцца; 3) выцерці; 4) пасыпаць; 5) даць; 6) дрыжаць; 7) назваць; 8) смажыць; 9) завезці; 10) зберагчы.

**229.** *Відаць, вам даводзілася калі-небудзь гаварыць або чуць ад сваіх знаёмых падобнае нараканне:* ***”Я гэта ведаю (разумею), але не хапае ў мяне слоў, каб выразіць думку.”*** *Прачытайце на гэты конт выказванні класікаў рускай літаратуры.*

*Як вы разумееце сэнс першага сказа ў выказванні В.Бялінскага? Ці можа чалавек думаць, мысліць без слоў?*

*Спішыце, устаўляючы прапушчаныя канчаткі дзеясловаў цяперашняга або будучага часу. У дужках пасля дзеясловаў скарочана абазначце іх спражэнне.*

Што няясна ўяўля..ш, тое няясна і выкаж..ш; недакладнасць і заблытанасць выказванняў сведч..ць толькі пра заблытанасць думак. *(М. Чарнышэўскі)*

Слова адлюстроўва.. думку: незразумелая думка — незразумелыя і словы. ...Што адчу.. і зразуме.. чалавек, тое і выкаж.. ; слоў неста.. ў людзей толькі тады, калі яны выража..ць тое, чаго самі добра не разуме..ць. Чалавек ясна выказва..цца, калі ім валода.. думка, але яшчэ ясней, калі ён валода.. думкай. *(В. Бялінскі)*

**230.** *Прачытайце. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя галосныя. Вусна растлумачце іх правапіс.*

*Якімі часцінамі мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы?*

У кожнага чалавека свае **жыццёвыя** сцяжынкі, сцежкі, дарогі. Адзін пачына.. іх ад ложк.. да стала, другі ад стала да парог.. . **Спачатку праклада..ш** самастойную сцяжынку ў свет, **абмежаваны** пакуль чатырм.. сценамі хаты. Дойдз..ш да **працягнутых** табе насустрач рук — і радасці тваёй няма межаў.

Потым табе дазвол..ць хадзіць па двар.. , а як трошкі падрасцеш, разам са **старэйшымі** пойдз..ш на поле, на луг, у лес, а то ў суседн..ю вёску або на інш..ю вуліцу, плошчу свайго любімага горад.. .
І чым далей будз..ш адыходз..ць ад той першай сцяжынкі, тым больш будз.. іх перад табою. Выб..рай сам, на свой густ, якою ісці. Ад таго, якую выб..р..ш, будз.. многае залеж..ць потым у набыцці ўласнага вопыт.. , без якога жыццё — не жыццё. *Паводле А. Пальчэўскага*

## Утварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў

**231.** *Разгледзьце табліцу ”Утварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў”.*

<table>
<tr><th colspan="2">УТВАРЭННЕ І ЎЖЫВАННЕ ДЗЕЕПРЫМЕТНІКАЎ</th></tr>
<tr><th colspan="2">Дзеепрыметнікі незалежнага стану</th></tr>
<tr><th>ц. ч.</th><th>пр. ч.</th></tr>
<tr><td>З суф. -уч-, -юч-, -ач-, -яч- не характэрныя для белар. мовы! Нельга ўжываць дзеепрыметнікі тыпу расказваючы вучань, возячы хлопчык, гаворачы кот.<br>Ужываюцца пры пераходзе ў прыметнікі: (яны) віс-(яць) → вісячыя валасы, (яны) стаj-(аць)→ стаjачая вада, (яны) піш-(уць) → пішучая машынка.<br>Дапускаецца ўжыванне ў дзелавым і навуковым стылях у тэрміналагічных спалучэннях, дзе такія ”шыпячыя” дзеепрыметнікі часта пераходзяць у прыметнікі: дзеючая армія, бастуючыя рабочыя, рухаючая сіла гісторыі, шыпячы гук, матывуючае слова і пад.</td><td>З суф. -л- шырокаўжывальныя ў беларускай мове:<br>(ён) уцале-( ў □ ) → уцалелы, парыжэ-( ў □ ) → парыжэлы, спаце-( ў □ ) → спацелы, гэтак жа: пасівелы, пачырванелы і пад.<br>З суф. -ўш-, -ш- не характэрныя для беларускай мовы:<br>прыеха-( ў □ ) → прыехаўшыя, прынёс-(∅ □ ) → прынёсшая<br>Трэба пазбягаць ужывання такіх ”шыпячых” дзеепрыметнікаў, асабліва ў форме Н. склону м. р. тыпу прыехаўшы госць, расцвіўшы вазон, апраўдаўшы суддзя, якія ствараюць аманімію з дзеепрыслоўямі закончанага трывання.</td></tr>
<tr><td colspan="2"><u>Увага</u>! У беларускай мове няма зваротных дзеепрыметнікаў з постфіксам -ся тыпу ўсміхаючыяся, спазніўшаяся !</td></tr>
<tr><th colspan="2">Дзеепрыметнікі залежнага стану</th></tr>
<tr><th>ц. ч.</th><th>пр. ч.</th></tr>
<tr><td>З суф. -ем-, -ім- не характэрны для беларускай мовы.<br>Ужываюцца ў дзелавым і навуковым стылях:<br>даследуj-(эм) → даследуjэмы, вылучаj-(эм) → вылучаj эмы, ствараj-(эм) → ствараj эмы.<br>Часта пераходзяць у прыметнікі:<br>любімы (твор), цярпімы (боль), дзялімая (лічба).<br>Варта пазбягаць ужывання такіх дзеепрыметнікаў у мастацкім і публіцыстычным стылях.</td><td>З суф. -ен-, -ан-, -н-, -т- шырока ўжывальныя ў беларускай мове:<br>прынес-(ці) → прынесены, асвятл-( і-ць) → асветлены, астудз-( і-ць) → астуджаны, жада-(ць) → жаданы, апрану-(ць) → апрануты, раскало-(ць) → расколaты.<br><u>Увага</u>! Суфіксы -ен-, -ан-, -н- пішуцца з адным <u>н</u>! У дзеепрыметнікаў не бывае суфікса -ян-! Кароткія формы дзеепрыметнікаў м. р. (тыпу дагледжан, прынесен) беларускай мове не характэрны !</td></tr>
</table>

**232.** *Знайдзіце ў сказах дзеепрыметнікі, не характэрныя беларускай мове. Якія з іх можна замяніць шырокаўжывальнымі ў беларускай мове дзеепрыметнікамі з суфіксам* ***-л-****? Выпішыце іх парамі.*

Узор: *Пасіне****ўш****ыя (рукі) — пасіне****л****ыя; узмакрэ****ўш****ы (лоб) — узмакрэ****л****ы.*

1. Вецер сагнаў апаўшае лісце з паляны ў лес, і пад дубамі зямлю густа ўсцілалі жоўта-зялёныя жалуды. 2. Чуць падняўшыся над дубоваю кудзеркаю лесу, што стаяла па той бок ракі, крыху павесялеўшы месячык зараз жа нырнуў у хмарку. 3. Яшчэ больш пасвятлеўшы месячык ізноў выплыў з-за хмаркі. 4. А то нечакана грукне з яблыні даспеўшая антонаўка ў бліжнім садзе. 5. Ён прысядаў каля кожнага грыба, падразаў ножыкам карэньчык, саскрабаў пясок і рознае смецце, прыліпшае да кораня. 6. У гары можна лёгка вырыць зямлянку, нару, магілу для пахавання памёршага родзіча. 7. Цяпер я не памятаю, хто адкрываў і вёў вечар, але затое запомніў кожнага выступаўшага. 8. Мова кожнага асобнага народа — гэта сума перажыванняў, сума душ яго жывых і даўно адышоўшых у вечнасць пакаленняў.

**233.** *Знайдзіце сказы з граматычнымі памылкамі ва ўжыванні дзеепрыметнікаў. Чаму вы іх аднеслі да памылковых?*
*Адкарэкціруйце гэтыя сказы і запішыце выпраўленыя варыянты.*

**I.** 1. Ён быў дагледжаны, падпраўлены і нядаўна пабелены, гэты журботны напамінак вайны. 2. Невялікая магілка з завялай травою і высахлымі немудрагелістымі вянкамі старанна падраўняна; пагабляваныя штыкеціны агароджы афарбаваны зялёнай фарбай — як і належыць вайскоўцам. 3. Прылажыўся дзед Талаш — і гулкі стрэл здрыгануў лясную глухмень, і трыумфуючы воўк таксама падскочыў угору і асунуўся, як мяшок. 4. У бары густым настоен пах смалісты. Падаслан пад ногі хвоям мох пушысты. 5. Кветцы засохшай зноў не цвісці. 6. Паветра было насычана ап’яняючым водарам жытнёвага поля. 7. Сярод папераў пастарэўшых, сярод запыленых лістоў радкі даўно забытых вершаў неспадзявана я знайшоў. 8. Апусцеўшае поле захмурнела высахшым быльнікам. 9. Усе гузікі папрышываты.

**II.** 1. Навокал пляцоўкі пастаўлены плот, закладзен падмурак вялікага дома. 2. Жыве загінуўшы герой у светлай памяці людской. 3. Адгукніся, вясна, мне зязюляй з-за рэчкі, дай яшчэ раз прыпасці да любай зямлі і каштанаў сваіх незгасальныя свечкі над маёй адшумеўшай вясной запалі. 4. Скінуты межы, свет разгароджан. 5. Імжа перайшла ў спарнеючы дождж. 6. Пышным, некранутым ростам стаяла трава — маладая, яшчэ не набраўшая ні соку, ні гушчыні свайго колеру. 7. Наўздагон веснавой сіле імчыцца вясёлая пераклічка прыляцеўшых птушак. 8. Пачуў плач прачнуўшыхся і прагаладаўшыхся дзяцей, потым убачыў цётку,

вяртаючуюся з лесу. 9. У гэтую пару маладое, некалі звонкае рэха коціцца па прывялай траве, слабее ў густых прырэчных туманах — і таму гукі здаюцца такімі ціхімі, нібы прыляцелі аднекуль здалёку. У такія раніцы не хочацца спяшацца, хочацца ісці паволі, удыхнуць вільготнае паветра, якое пахне маладою незагусцелаю рунню.

**234.** *Якія з прыведзеных у сказах дзеепрыметнікаў шырокаўжывальныя ў беларускай мове, а якія ёй не характэрны? Неўласцівыя беларускай мове формы замяніце на нарматыўныя дзеепрыметнікі або адпаведныя канструкцыі з іншымі часцінамі мовы.*

1. […] Чалавечаму воку трохі нязвыкла бачыць голае, апусцелае раптам поле, якое ўсю вясну і лета напружана працавала,— што ж, выгляд зжатага поля разам з радасцю за скончаную работу заўсёды, мне здаецца, пакідае нейкі вярэдлівы сум, які немагчыма растлумачыць. 2. Ажыўшыя купчастыя бярозкі стаялі ў нейкім зняменні… 3. Зялёныя кветачкі павыбіваліся ўжо на свет скрозь сухія выцвіўшыя лісці, і прынадныя пахі разлівала ў паветры маладая чаромха. 4. Яна павольна ступала па роўнай, пасыпанай чырвонаю глінай дарожцы паўз самы Мухавец. 5. Людзі, сядзеўшыя за сталом і на лавах, былі пераважна камандзіры, пачынаючы ўзводным і канчаючы камандзірам батальёна таварышам Шалёхіным. 6. Сядзелі як папала: у шапках і без шапак, у памятых, выцертых і пабачыўшых усякую бывальшчыну шынялях. 7. […] Усё навокал гарыць фарбамі згасаючага сонца… 8. Узварушаная памяць напомніла ўміг амаль, здавалася, забытае: як раскладвалі вогнішча, анямелыя ад першай згоды, ад блізкасці… 9. Паабапал гасцінца, вузкага, заросшага зялёнай мяккаю мураўкай, ляжала неагляднае поле залацістага жыта. 10. Некалькі хвілін ён цяжка, зморана соп, распластаўшыся на амаль голай, не зарослай яшчэ травою, чорнай зямлі, і на ўсе вочы глядзеў на дарогу. 11. Там, у полі, куды яны нявесела ўглядаліся, высіўся касагор з дарогай, ля якой трэслі пажоўклым лісцем дзве вялізныя каржакаватыя бярозы… 12. Сукенка markdown

розначаляровая, лёгкая, нечакана яркая на фоне прывялае, запыленае зеляніны.

● *Якая граматычная памылка дапушчана ў 3-м сказе пры ўжыванні слова* ***лісце*** *?*

**235.** *Выпішыце* ***нумары*** *словазлучэнняў з формамі дзеепрыметнікаў, якія не адпавядаюць нормам беларускай мовы.*

1) працягваемая гутарка; 2) уважліва слухаючы сын; 3) атрымаўшыеся малюнкі; 4) уцалелы кавалак лесу; 5) змолатае зерне; 6) сурова насупленыя бровы; 7) парослыя мохам купіны; 8) заінетыя дрэвы; 9) зачырванеўшаяся ад марозу дзяўчынка; 10) заросшы травою ручай; 11) засмажанны кавалак;

12) асветляныя сонцам паляны; 13) засыплены лісцем; 14) куплены на ўласныя грошы.

# Утварэнне і ўжыванне дзеепрыслоўяў

| УТВАРЭННЕ ДЗЕЕПРЫСЛОЎЯЎ | |
|---|---|
| **незаканчанага трывання** | **заканчанага трывання** |
| суф. ***-учы*** (***-ючы***), ***-ачы*** (***-ячы***)<br>ад асновы **ц. ч.:**<br>*(яны) смяј-(уц)-ца → смеј**учы**ся,*<br>*(яны) нос-(яц)-ца → нос**ячы**ся,*<br>*(яны) сп-(яць) → спл**ючы**,*<br>*(яны) крыч-(аць) → крыч**учы*** | суф. ***-ўшы, -шы***<br>ад асновы **пр. ч.:**<br>*(ён) змало-( ў □) → змало**ўшы**,*<br>*(ён) угледзе-( ў □) → угледзе**ўшы**,*<br>*(ён) знёс-( ∅ □ ) → знёс**шы**,*<br>*(ён) спёк-( ∅ □) ся → спёк**шы**ся* |

**236.** *Разгледзьце табліцу* ***”Утварэнне дзеепрыслоўяў”*** *і ўтварыце ад дзеясловаў магчымыя формы дзеепрыслоўяў. Абгрунтуйце ўжыванне выбранага вамі суфікса. Памятайце, што ад кожнага дзеяслова можна ўтварыць толькі* ***адно*** *дзеепрыслоўе.*

Тушыць агонь; патушыць святло; сагнуць у дугу; бразнуць дзвярыма; развесіць красёнцы; развешваць бялізну; старанна мыцца; наспех паснедаць; выпускаць на волю; адпусціць матылька; мінаць сенажаць; затаіцца ў куце; мінуць балота; страсянуць голлем; страсаць снег; абтрэсці шыгалле; сцерці абцас.

Пры ўтварэнні і ўжыванні дзеепрыслоўяў дапускаюцца часцей за ўсё наступныя **памылкі:**

♦ **Памылка ва ўтварэнні.**

Утвараючы дзеепрыслоўі заканчанага трывання, суфіксы ***-ўшы, -шы*** нельга далучаць да асноў дзеясловаў незаканчанага трывання. **Няправільна** ўтвораны наступныя дзеепрыслоўі**:** ~~*глядзеўшы*~~, ~~*пісаўшы*~~, ~~*насіўшыся*~~, ~~*пёкшы*~~, ~~*вёзшы*~~. Выправіць такую памылку можна двума спосабамі:

а) утварыць дзеепрыслоўе незаканчанага трывання з суфіксам ***-учы (-ючы), -ачы (-ячы)***: *гледз**ячы**, нос**ячы**ся, каж**учы**, пек**учы́**, вез**учы́*** **;**

б) далучыць прыстаўку, памяняўшы трыванне базавага дзеяслова на закончанае: *паглядзе**ўшы**, нанасі**ўшы**ся, сказа**ўшы**, спёк**шы*** і г. д.

♦ **Памылка ва ўжыванні.**

Трэба памятаць асноўнае правіла ўжывання дзеепрыслоўяў: у сказе з дзеепрыслоўем **павінен быць адзін утваральнік абодвух дзеянняў —** і асноўнага, выражанага дзеясловам-выказнікам, і дадатковага, выражанага дзеепрыслоўем**.** Калі ж такія два дзеянні выконваюцца рознымі ўтваральнікамі, то канструкцыя з’яўляецца памылковай.

## Прыёмы выпраўлення памылак ва ўжыванні дзеепрыслоўяў

1. Дзеепрыслоўны зварот можна ператварыць у дадзеную частку складаназалежнага сказа, замяніўшы дзеепрыслоўе на дзеяслоў, а астатнюю частку сказа пакінуўшы нязменнай.

2. Можна пакінуць нязменным дзеепрыслоўны зварот, а другую частку сказа змяніць такім чынам, каб быў адзін утваральнік абодвух дзеянняў. Напрыклад:

| Няправільна | Правільна |
|---|---|
| 1) *Пад'язджаючы да вёскі, нам трапляліся клёны і дубы.*<br><br>Тут два ўтваральнікі: дадатковае дзеянне *пад'язджаючы* выконваецца ўтваральнікам ***мы***, а галоўнае дзеянне *трапляліся* выконваецца ўтваральнікам ***клёны і дубы.*** | 1-ы прыём:<br>*Калі пад'язджалі да вёскі, нам трапляліся клёны і дубы.*<br>2-і прыём:<br>*Пад'язджаючы да вёскі, мы бачылі клёны і дубы.*<br>Тут адзін утваральнік абодвух дзеянняў: ***мы*** *пад'язджалі* і ***мы*** *бачылі.* |
| 2) *Лежачы на сене, лёгка дыхаецца і марыцца пра ўсё прыемнае.*<br><br>У безасабовых сказах дадатковае дзеянне выконваецца адным утваральнікам (чалавекам), а галоўнае адбываецца само сабой, без утваральніка**.** Гэта памылка ва ўжыванні дзеепрыслоўя. **Выключэнне** складаюць безасабовыя сказы, у якіх ёсць **інфінітыў** (гл. прыём 2 **).** | 1-ы прыём:<br>*Калі ляжыш на сене, лёгка дыхаецца і марыцца пра ўсё прыемнае.*<br>2-і прыём:<br>*Лежачы на сене, лёгка дыхаць і марыць пра ўсё прыемнае.* |

♦ **Лагічная памылка.**

Гэта ўжыванне дзеепрыслоўя закончанага трывання з суфіксам ***-ўшы (-шы )*** замест незакончанага ці наадварот. Напрыклад, лагічная памылка ва ўжыванні дзеепрыслоўя ў наступным сказе: *Добра* ***адпачываючы*** *на летніх канікулах, дзеці ў верасні зноў з радасцю ўзяліся за вучобу.* (Трэба**:** ***адпачыўшы*** ).

**237.** *Знайдзіце памылкі ва ўжыванні ці ва ўтварэнні дзеепрыслоўяў. Пракаменціруйце, у чым заключаецца кожная памылка. Запішыце выпраўленыя варыянты.*

**І.** 1. Прачытаўшы лірычную замалёўку, на Жэню нахлынулі ўспаміны пра дом, пра дарагія мясціны маленства. 2. Не атрымаўшы на алімпіядзе

чаканай перамогі, нашымі спартсменамі былі зроблены належныя вывады. 3. Працуючы штодня да сёмага поту, у Волі ўзнікала адзінае жаданне — адпачыць. 4. Добра адпачываючы на летніх канікулах, вучні з радасцю зноў узяліся за вучобу. 5. Падышоўшы да берага ракі, Івану стала на душы весялей і захацелася выкупацца. 6. Боль апаноўвае душу, чытаючы аповесці В. Быкава. 7. Наведаўшы Ляўкі, паэтам быў напісаны цыкл вершаў. 8. Ледзь кранаючыся зямлі, імклівы бег спрынтэраў усё больш узрастаў. 9. Агледзеўшыся ў лесе, Нічыпару кінулася ў вочы мноства чарніц.

**II.** 1. Хмары нізка плылі над палеткамі, сеючы дробны халодны дождж. 2. Харчуецца толькі раслінай ежай, зусім не ўжываўшы тлушчу, малака і мяса. 3. Дзеці гуртам выбеглі са школы, весела расказаўшы пра здарэнне і перапыніўшы адно аднаго. 4. Слухаючы на досвітку салаўёў, сэрца замірае ад радасці. 5. Агледзеўшы прыбярэжную мясціну, хлопцы спыніліся на начлег. 6. У хату ўваліўся дзед, атрасаўшы з плячэй снег. 7. Дапісваючы ліст, Аленка раз-пораз паглядвала ў акно. 8. Слухаючы плёскат хваль, на сэрцы станавілася спакайней. 9. Падзякаваўшы гаспадарам за начлег, на досвітку рушылі ў дарогу. 10. Разагнуўшы стомленую спіну, адразу прыгадалася цёплая ўтульная хата.

**238.** *Выпішыце* ***нумары*** *сказаў з памылкамі ва ўжыванні ці ва ўтварэнні дзеепрыслоўяў. Вусна пракаменціруйце, у чым заключаецца кожная памылка.*

1. Прыбегшы ў спякотны дзень да ракі, нельга разгарачанаму адразу кідацца ў ваду. 2. Не чытаўшы кніг, не вучыўшы ўрокаў, не спадзявайся на поспехі ў навуцы. 3. Слухаючы выступленне спявачкі, у людзей на сэрцы станавілася лягчэй. 4. Было так ціха, што чуваць было, як недзе, зашыўшыся ў траву, цвірчэў конік. 5. Ад'язджаючы ў горад і надоўга развітваючыся з роднымі мясцінамі, у мяне моцна заные ў сэрцы, балюча зашчыміць у грудзях. 6. Задарожны стаяў тварам да ветру, быццам прытуліўшыся шчакою да яго пругкага халадку. 7. Было чуваць, як плешча, гуляючы ў вадзе, рыба, як злосна гудуць, пралятаючы блізка каля агню, чорныя рагатыя жукі. 8. Паціху дагараўшы, дровы зрэдку ўспыхвалі дымком. 9. Зразумеўшы, што тут хва́лі яе не дастануць, жанчына спынілася. 10. Ён ціха, нерухома ляжаў, з асалодай адчуваючы, як цела прыемна ные ад стомы. 11. Седзячы на беразе возера, усплескі хваль лашчаць слых. 12. Успомніўшы каля дошкі даўно прачытаны твор, вучань хмурыў бровы, моршчыў лоб і нават чухаў патыліцу. 13. Тут, ля возера, яго душа нібыта выпроствалася і наструнена замірала, прагнучы толькі цішыні і прыгажосці. 14. Кучаравая вішня ўжо адцвітала, шчодра сыпаўшы на зямлю свае белыя пялёсткі. 15. Прыехаўшы ранкам у лес па грыбы, там было ўжо светла. 16. Развітваючыся з гаспадаром, госці адразу паехалі. 17. Дайшоўшы да свайго старога селішча, не маглі, каб не зазірнуць на яго.

# Правапіс прыслоўяў і блізкіх да іх спалучэнняў

**239.** *Раскрыйце дужкі і запішыце словы разам, асобна ці праз злучок. Вусна растлумачце правапіс прыслоўяў і блізкіх да іх спалучэнняў.*

Знаходзіцца *(не) (па)* далёку, зрабіць *(па)* свойму, свайго *(ўсё)* адно даб'ецца, злучыць *(у)* адно, зрабіць *(у)* двая больш, *(з)* даўна павялося, апрануцца *(па)* святочнаму, часу *(ў)* абрэз, з'ехаў *(з)* дому *(на)* зусім, скідваць *(на)* хаду, збірацца разам *(у)* пяцярых, друкаваць *(у)* потайкі, прыйсціся *(да)* спадобы, лезці *(на)* пралом, мала *(па)* малу наладзіцца, ісці *(па)* двое, дзейнічаць *(за)* адно, ісці *(абы)* куды, пашыць *(у)* абцяжку, пайсці *(ў)* прочкі, быць *(на)* чале ўлады, успамінаць час *(ад)* часу, галінкі трашчаць *(у)* версе, імкнуцца *(на)* перад, калёсы коцяцца *(па)* волі, чытаць *(у)* голас, жыць *(за)* мяжой, перадаваць *(з)* веку *(ў)* век, стаяць *(па)* абапал сцежкі, збягаць *(у)* бок ракі.

**240.** *Спішыце, раскрываючы дужкі. Растлумачце кожную арфаграму.*

*(У)* раўненні Альберта Эйнштэйна даюць чалавецтву надзею на магчымасць падарожжа ў іншыя зоркавыя сістэмы. Па яго тэорыі, *(з)* павелічэн(*ь, н*)ем скорасці час, *(на)* адварот, запавольваецца. Гэты эфект не дзейнічае пры вядомых нам зямных скарасцях, для яго *(ад)* чуван*(ь, н)*я патрэбна скорасць святла. Гадзіннік *(на)* борце касмічнага карабля будзе ісці больш *(па)* вольна, як, адпаведна, і атамныя, і бі(*а, я*)лагічныя гадзіннікі. Такім чынам, *(шмат)* гадовы палёт экіпажа зойме *(не)* калькі месяцаў, чалавек, які верн(*е, і*)цца з такога падарожжа, вы(*я, е*)віць, што яго сябры-аднагодкі выгляда(*я, ю*)ць *(на)* многа старэйшымі за яго. Палёты *(да)* зорак маглі *(б)* стаць крыніцай вечнай маладосці, *(па)* колькі *(пры)* дасягнен(*ь, н*)і караблём скорасці святла час практычна спыняецца. *("Звязда")*

**241.** *Складзіце ці падбярыце з мастацкай літаратуры 5 – 6 сказаў з прыслоўямі і падобнымі да іх спалучэннямі назоўнікаў з прыназоўнікамі. Вызначце сінтаксічную ролю прыслоўяў і набліжаных да іх спалучэнняў назоўнікаў з прыназоўнікамі.*

Узор. 1. А знізу гэты лес кашлаты меў зелянюсенькія шаты. (К-с) (Прыслоўе)

2. З нізу будынка сачылася вада. (Назоўнік з прыназоўнікам)

**242.** *Спішыце, раскрываючы дужкі. З пяцю-шасцю словазлучэннямі (на выбар) складзіце сказы так, каб атрымаўся звязны тэкст.*

Перавярнуцца *(з)* боку *(на)* бок, *(з)* лёгку *(за)* аралі, быць з ім *(за)* адно, змыць *(за)* адно імгненне, жыць душа *(ў)* душу, крыкнула *(на)* ўздагон, сабраўся *(да)* хаты, падышоў *(да)* хаты старшыні, *(да)* гэтуль *(не)* ведаў, паходзіў *(з)* роду дваранскага, *(з)* роду *(не)* сустракалася, заплакаць *(на)* ўзрыд, засталіся сам *(на)* сам, *(з)* рэдку бачыліся, прапанаваць *(у)* замен, разабралі *(з)* налёту, прыбіць *(на)* глуха, *(не)* відаць *(з)* надворку, прабіраліся *(на)* вобмацак, зацягнулася само *(па)* сабе, *(не)* прыходзьце *(да)* заўтра, выцер *(да)* суха, абгаворваць *(за)* вочы, усё *(адно)* перамые, пашылі *(на)* многа больш, ёй рабіць гэта не *(з)* рукі, скажу *(на)* пconfiguredаследак, прыязджала *(за)* ўчора, віднеліся *(на)* відавоку, *(з)* часам забылася, запомніць *(на)* век, *(на)* вякі захавалася *(ў)* памяці, *(за)* доўга да прыезду, прыходзіла дзень *(у)* дзень, прыехаць *(на)* заўсёды, выглядаў *(па)* баявому, падымалася *(па)* маленьку, паставіць *(у)* прытык, змяншалася *(па)* крысе, удаліся *(на)* славу.

**243.** *Выпішыце* ***нумары****, дзе ўзятыя ў дужкі словы пішуцца асобна.*

1) прагаварылася *(міма)* волі; 2) расказвалі *(ў)* разнабой; 3) абняліся *(па)* брацку; 4) устаць *(на)* досвітку; 5) сядзець *(з)* вечара да раніцы; 6) засталіся адзін *(на)* адзін; 7) мала *(па)* малу наладзілася; 8) выглядае *(па)* сучаснаму; 9) ляжыць *(на)* відавоку; 10) ішлі то паасобку, то *(па)* пары.

## Правапіс часціц

**244.** *Выпішыце прыклады са словамі, якія без* ***не (ня)*** *не ўжываюцца. Вусна растлумачце, чаму ў астатніх прыкладах* ***не (ня)*** *пішацца злітна.*

Нечаканая навіна; трава негустая, але высокая; ненавідзячы ворагаў; нязменны вартаўнік; спалохаўся ад няўдачы; незакончаны раман; непралазны гушчар; ненадрукаваны верш; непрасохлая трава; лінуў неспадзеўкі; невыказная радасць; неадчэпны назола; прашумелі недалёка; незаплеценыя валасы; неабвержны факт; неадкладная справа; нехаця рабіў; неадольная смага; неагляднае мора; несур'ёзны ўчынак; нездарма стараўся; няўрокам кажучы; неўпрыкмет падкрасціся.

**245.** *Прачытайце. Сфармулюйце вывад, да якога прыходзіць аўтар. Выпішыце словазлучэнні з часціцамі* ***не (ня), ні****, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце ўжыванне і правапіс часціц.*

Крый Божа беларусам жаліцца на свой лёс, прасіць сёння спачування да сябе, аплакваць сваю долю. Тым больш (*н*..) бяспечна рабіць гэта ў паэзіі. Бо сканцэнтраваныя ў паэтычных радках думкі, пачуцці маюць

здольнасць у галовах і сэрцах чытачоў станавіцца магутным псіхаэнергетычным клішэ. І далей жыццёвая спіраль пачынае раскручвацца ў запраграмаваным кірунку.

Найчасцей гэтае (*н..*) гатыўнае праграмаванне жыцця робіцца (*н..*) свядома: начынены (*н..*) бяспечнымі вібрацыямі, верш ”сам кладзецца на паперу”. І калі ён (*н..*) ўвабраў у сябе хоць іскрыначку святла, надзеі ці радасці ад захаплення жыццём, — ці варта ўвогуле зберагаць яго, нават у чарнавіках?

Як гэта (*н..*) горка ўсведамляць, але зярняты роспачы, адчаю, душэўнай прыгнечанасці, нігілізму і разгубленасці ў нашым грамадстве засявалі (і сёння засяваюць) (*н..*) толькі людзі з паталагічнымі адхіленнямі, але і […] паэты, кампазітары, мастакі, настаўнікі. У кожны момант часу чалавек-творца (*н..*) шта стварае ці то разбурае. ”Чым слова наша адгукнецца” — над гэтым варта ўсё (*ж*) задумвацца, хоць нам і (*н..*) дадзена прадказаць усіх наступстваў ад прыходу слова ў свет.

Паэты (*н..*) проста самавыяўляюцца. Сілаю таленту паэт праводзіць у наш свет ідэі. Насычэнне энергаінфармацыйнай прасторы нацыі ідзе кожную хвіліну. (*Н..*) водзін паэт, пэўна (*ж*), (*н..*) жадае ліха свайму роду і народу. Але (*ж*) бываюць і ў творцаў хвіліны ці то адчаю, ці то злачыннага легкадумства. Нават у класікаў часам (*н..*) ўсе радкі праменяцца Сонцам — свядомасцю.

Ці (*ж*) (*н..*) пара і нам усвядоміць, што дапушчанае ў словах, у думках, а потым і ў справах скажэнне асноўных (касмічных) законаў, легкадумства, нагняценне страхаў — усё ма́е наступствы. Памятайма пра рэальнасць Закону рэха (Закону прычын і наступстваў): што пасееш, тое і пажнеш. Энергія (*н..*) ўпэўненасці, апатыі, укладзеная ў паэтычны радок сёння, праз (*н..*) каторы час вернецца разбуральным смерчам. (*Н..*) ўжо (*ж*) нам хочацца ўвесь час жыць у слязах ды катаклізмах?

Апошнім часам пры школах ствараецца ўсё больш паэтычных гурткоў. Вельмі хочацца, каб з гэтых жыватворных крыніц улівалася ў мора беларускай і сусветнай паэзіі чыстая, светлая, радасная энергія. Няхай святло паэтычных радкоў саграе сэрцы людзей. Тады і чарноцце з нашага жыцця сплыве (*н..*) заўважна, як пачарнелы снег увесну. *(Паводле І. Ждановіча)*

**246.** *Спішыце, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы патрэбныя літары. Якое значэнне тут надаюць словам ці сказам часціцы* ***не (ня), ні*** *?*

Чалавеку больш за ўсё шкодзіць, калі ён *(н..)*навідзіць, *(усё)* роўна каго і што. Ад *(н..)*навісці ч..рс*(т,ц)*вее сэрца, а гэта — як замарудж..*(н)*ная с*(ь)*мерць. Чалавека часам крыўдз*(ю,я)*ць так жорстка і балюча, што яму *(н..)* лёгка пагасіць у сабе *(н..)*навісць. Але гэта *(н..)* абходна нават для таго, каб зажылі раны крыўды і жорсткас*(ь)*ці. *(Н..)* трэба *(н..)*навісці! Колькі *(б)*

чалаве*(ц,кс)*тва выйграла, калі *(б)* здол..ла сілы сэрца, якія заб..рае *(н..)*навісць, скіраваць на ўмацаван..е на*(і,й)*вялікшага шчасц*(ц,ь)*я жыцця — шчасц*(ц,ь)*я любіць. Гэта меркаван..і Кузьмы Чорнага.

Прызнаюся, у грозна-пакутлівыя дні вайны, калі б..злітас*(т)*ны вораг таптаў родную нашу з*(е,я)*млю, нёс *(н..)*ймавернае зло нашаму народу, мне дзіўна было слухаць падобнае з вуснаў любімага піс*(ь)*менніка. ”*(Н..)* ўжо ён такі далёкі,— думаў я,— ад грознай явы сучас*(т)*нас*(ь)*ці?! *(Н..)* ўжо яму *(ўсё)* роўна, хто на якім баку стаіць у гэтай крывавай бойні?!”

Але не. Ён *(н..)* быў далёкі ад змаган..я народа, яму *(н..)* было *(абы)* якава, хто загіне, хто пераможа. Цяпер, калі ўвесь свет пачаў ус*(ь)*ве-дамляць, што трэба навучыцца думаць *(па)* новаму, *(па)* новаму бачыць шляхі чалаве*(ц,кс)*тва, каб даць яму выжыць, захаваць ад зн*(я,і)*шчэн..я лю*(дс,ц)*кое існаван..е, выказван..і Чорнага успам*(я,і)*наю..ца з асаблівым пачуц..ём. Які ён быў праніклівы ў сваіх пераканан..ях! Піс*(ь)*меннік думаў пра будучыню, і яна *(н..)* зменна жыла ў ім самай гуман..стычнай праявай чалавечага духу — жадан..ем любіць, а *(н..)* *(н..)*навідз..ць.

*(Н..)* трэба *(н..)*навісці: ад яе ўсё гора на с*(ь)*веце, і боль, і пакуты, і прын*(і,я)*жэн..е чалавека, і самае страшнае для людзей — вайна. Вучыцеся *(н..)* паддавацца *(н..)*навісці! *(Паводле К. Кірэенкі)*

**247.** *Пры спісванні раскрыйце дужкі і ўстаўце замест кропак літары* ***е*** *або* ***і***. *Вусна абгрунтуйце напісанне вамі часціц* ***не*** *або* ***ні***.

*(Н..)* прынёс *(н..)* воднага грыба; *(н..)* змаўкалі *(н..)* днём, *(н..)* ноччу; *(н..)* мог *(н..)* дапамагчы; *(н..)* сварачыся *(н..)* колі *(н..)* з кім; ён нейкі *(н..)* рыба *(н..)* мяса; *(н..)* маглі *(н..)* зайсці; *(н..)* чутно *(н..)* слыху *(н..)* дыху; *(н..)* разу *(н..)* бываў тут; *(н..)* дзе *(н..)* відаць *(н..)* трэсачкі; *(н..)* хто *(н..)* на каго *(н..)* звяртаў увагі.

**248.** *Прачытайце. Якія тэмы закрануў аўтар у гэтым урыўку? Спішыце, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары; растлумачце іх правапіс.*

Людзі ідуць. І я іду. Іду *(без)* мэты, *(н..)* маведама куды, *(на)* сустрач цёплай вясновай ночы. Вячэрняя **сціш..*(н)*насць** высокага пагоднага неба мірам і добрас(?)цю ліецца ў ***(раз)*** **вáруш..*(н)*ную** душу.

Цяпер, праз два..цаць год, можна меркаваць *(па)* рознаму. Хоць, прызнацца, я і *(да)* гэтуль толкам не ведаю, як усё тое адбылося. Магчыма, *(ад)* ступа..чы, немцы *(на)* *(ў)* мысля пакінулі ў нашым тыл.. танкавую групоўку. А можа, нашы часці самі аб..шлі яе, гон..чыся за тэмпам **наступлен..я.** *(У)* перад, не зважа..чы *(н..)* *(на)* што, глыбей у варожы тыл — было **няпіса*(н)*ным** правілам кожнай наступальнай ап..рацыі. А танкі засталіся. Каму там клопат*(а, у)*, што ў *(не)*йкім месц.. нашага баявога парадк.. *(ў)* тварылася прарэха, у якую *(ў)* лезлі немцы.

Для фронт*(а, у)* гэта было *(н..)* страшна, для арміі *(так)* сама. Дывіз..і было горш. А вось нам… Мне, *(н..)* баракам-**паран..*(н)*ным**, *(так)* сама як і **заклапоч..(*н*)на**-бя*(з, с)*печным тылавікам, гэта было **пыта*(н)*нем**: жыць ці памерці.

Лю*(дс, ц)*кі паток *(з)* тратуараў ўліва..цца ў вялізны натоўп на плошчы. Тут помнік. *(Н..)* вядома чаго я *(пра)* ціскаюся між людзей да помніка. Да агн*(ю, я)* *(н..)* па..ступіцца. Але мне патрэбен Вечны агонь. На *(во)* шта — *(н..)* ведаю сам. У кожным агн.. ёсць *(н..)* вытлумачальная зваблівасць. Магчыма, гэта інстынкт, **выпрацава*(н)*ны** *(ў)* глыбін..х ст..го*(д)*дзяў. У старажытных агонь быў сродкам жыцця, **ачышчэн..я** і ахвярнасці. Цяпер ён сімвал іншага сэнс.. .

*(На)* пэўна, *(н..)* калі *(ў)* мінулым народ *(н..)* губляў столькі *(н..)* вядомых салдат, як у апошняй вайне…

Хай будзе **благаслаўле*(н)*ны** агонь у іх пам..ць!.. *(Паводле В. Быкава)*

● *У выдзеленых словах растлумачце правапіс* ***н*** *і* ***нн*** *у суфіксах.*

**249.** *Прачытайце тэкст. Раскажыце, што вы яшчэ ведаеце пра крыж Ефрасінні Полацкай, пошукі святыні і спробу аднавіць яго. Растлумачце правапіс часціц і прапушчаных літар.*

…Жыў у старажытн..м Полацку ў даўнія часы Лазар Богша. Па заказ*(е, у)* прападобнай княгіні Ефрасінні зрабіў ён у 1161 годзе крыж, які стаў ш..дэўрам старажытнага беларускага мастацтва. Аснова яго драўля*(н)*ная, а сам ён пакрыты каляровай эмал.. , а па ёй — срэбра, золата, каштоўныя камяні. Вызначальныя юв..лірна выкана..ыя надпісы, адзін з якіх гаворыць: ”*(Н..)* хай *(н..)* вынос..ць яго з манастыра *(н..)* колі, і *(н..)* прадаюць, і *(н..)* а..даюць. Калі *(н..)* паслухае хто і вын..се з манастыра, *(н..)* хай *(н..)* памож.. яму святы крыж *(н..)* ў жыцці гэтым, *(н..)* ў будуч..м, *(н..)* хай пракляты ён будзе…”.

Ст..годдзі прабыла р..ліквія ў Полацку. Але ўжо ў два..цатыя гады XX ст..годдзя за яе актыўна ўзяліся ”ваяўнічыя ат..істы”. У гады *(ж)* вайны сляды крыжа і зусім *(с, з)*губіліся. *(Н..)* вядома, дзе ён цяпер і каго карае сваёй прыгажосцю.

Адрадзіць адну з на*(і, й)*вялікшых беларускіх святыняў узяўся ў наш час брэс..кі мастак Мікалай Кузьміч. У доўгім шляху, у настойлівых пошуках *(з, с)*пасціжэння нашым суайчы..ікам тайнаў майстра Лазара Богшы бачы..ца сув..зь часоў і пакален..яў. *(Паводле Э. Кабяка)*

● *Аднаўленне крыжа было закончана Мікалаем Кузьмічом да свята Уздзвіжання ў верасні 1997 г. Прачытайце ў ”Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі” артыкул ”Крыж Ефрасінні Полацкай”, а таксама ў іншых крыніцах — у падручніках па гісторыі Беларусі, па літаратуры, публікацыі ў перыядычным друку — і падрыхтуйце паведамленне на тэму*

*” Свяшчэнная рэліквія беларускага народа”.*

**250.** *Выпішыце* ***нумары*** *слоў, словазлучэнняў ці сказаў, у якіх часціцы* ***не, ні*** *пішуцца асобна.*

1) абсалютна н../выхаваны хлопец; 2) аповесць н../прачытана; 3) вельмі н../ўраджайны год; 4) вокны н../зачынены; 5) далёка н../поўны аналіз; 6) зусім н../знаёмыя мясціны; 7) н../запрэжаныя коні; 8) н../змаўкальны гоман; 9) н../быліца; 10) н../больш як з кілаграм; 11) н../дабор; 12) н../давесці; 13) н../далічыцца грошай; 14) н../дасведчаны чалавек; 15) н../засеяныя грады; 16) н../даючы спакою; 17) н../зайздроснае становішча; 18) н../кага; 19) н../пакоіць; 20) н../пакора; 21) н../высокі, але дужы; 22) н../скошаны лугі; 23) н../старэйшы за мяне; 24) н../трэба; 25) н../адной жывой душы; 26) н../з чым; 27) н../лепшы за вас; 28) н../ветлівы; 29) н../падмецены двор; 30) прайсці амаль н../заўважаным.

**251.** *Выпішыце* ***нумары*** *словазлучэнняў, у якіх часціца* ***не (ня)*** *пішацца разам.*

1) стаў *(не, ня)* воліць дзяцей; 2) *(не)* маладзейшы за мяне; 3) *(не)* калі *(не)* дзе сказаў; 4) жыць *(не)* па-людску; 5) *(не)* паўналетнія дзеці; 6) *(не, ня)* скошана атава; 7) далёка *(не, ня)* просты чалавек; 8) нічуць *(не, ня)* горшая за іншых; 9) чыстае, *(не)* забруджанае азярцо; 10) *(не, ня)* гледзячы на мароз, доўга стаялі.

**252.** *Выпішыце* ***нумары****, дзе замест пропускаў трэба пісаць часціцу* ***ні.***

1. Прайшоў *н..* больш за 5 км. 2. *Н..* ў якім разе не адступаць. 3. Куды б *н..* ішоў, *н..* ехаў ты, памятай бацькаў наказ. 4. Адпачывалі ў мясцінах, дзе *н..* ступала нага чалавека. 5. *Н..* роду, *н..* племені свайго не ведае. 6. Дзе толькі я *н..* ездзіў, што толькі *н..* бачыў на сваім вяку! 7. За што б *н..* ўзялася мама, усё яна рабіла спрытна і лоўка. 8. *Н..* спакойная старасць, *н..* багацце яго не прываблівалі. 9. Ледзь *н..* штогод падарожнічалі. 10. Вернешся ў атрад *н..* пазней чым праз два дні.

**253.** *Прачытайце. Вусна раскрыйце дужкі і ўстаўце прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс часціц.*

Чым больш нацы..нальны, самабытны твор, напісаны жывой багатай народнай мовай, з глыбокім, праніклівым ведан..ем побыт.. і характараў, тым цяжэй яго перакласці на іншую мову. Ці *(н..)* таму Пушкіна *(па)* сапраўднаму разуме..ць і цэн..ць толькі ў Расіі, Міцкевіча — у Польшч.., Шаўчэнку — на Украін.., Купалу і Коласа — у Беларусі… За межамі сваіх літаратур гэтыя піс*(ь)*меннікі і іх творы *(н..)* такія папулярныя, як у

с..бе дома.

Ї *(на)* адварот — творы, напіса..ыя *(н..)* самабытна, *(н..)* ар..г..нальна, без глыбокага ведан..я і пранікнен..я ў мову, побыт і характары, на ”агульнадаступн..м”, як *(н..)* каторыя пішуць, узроўн.., лёгка перакладаю..ца і выдаю..ца, нават іншыя робяцца папулярныя сярод чытачоў. Але што дзіўна — гэтыя бы..цам папулярныя творы адыходз..ць разам са сваім часам, да іх больш *(н..)* хто *(н..)* вярта..цца, *(н..)* перакладае, *(н..)* перавыдае, *(н..)* чытае… Да твораў *(жа)* глыбока*(?)*наць..нальных, ар..г..нальных, самабытных звярта..цца зноў і зноў, зноў і зноў спрабу..ць іх перакласці на іншыя мовы… Кожнае пакален..е, якое *(н..)* бачнымі ніцямі звяз*(ы?)*вае мінулае з будучым, імкне..ца, нібы тыя альп..ністы, пакарыць сам..ю высок..ю вяршыню гары — *(да)* несці да чытачоў усё *(н..)* паўторнае багац..е думак і мовы ар..г..нала, *(па)* свойму зразумець і *(па)* тлумачыць. *(Паводле Б. Сачанкі)*

**254.** *Прачытайце тэкст. Растлумачце пастаноўку ўсіх знакаў прыпынку.*

*Чаму 2-я частка сказа* ***Ї пачуў: яе няма ўжо на бел..м с(ь?)веце…*** *не ўзята ў двукоссе? Чаму ў канцы гэтага сказа пастаўлена шматкроп'е ?*

*Вусна раскрыйце дужкі і растлумачце правапіс прапушчаных літар.*

Яна прыходзіла да нас заўсёды на другі дзень майго прыезд.. ў вёску. Садзілася каля стала на лаўку, цяжка ўздыхала і, *(з)* надзе..й паз*(я,і)*ра..чы на мяне, пыталася, ці *(н..)* пачуў я чаго пра яе сына. Каб вы толькі ведалі, як *(н..)* ёмка было мне перад гэтай старой! Я гатовы быў правалі..ца скрозь з..млю, *(абы)* толькі *(н..)* бачыць яе, *(абы)* *(н..)* чуць кожны раз аднаго і таго *(ж)* пытан..я. Сына яе, п..тна..цаці*(?)*гадовага Міцю, у час вайны выв..злі ў *(н,Н )*яме..чыну, і ён *(а..)*туль *(н..)* вярнуўся. Старая *(ад)* некуль узяла с..бе ў галаву, што я, працу..чы ў вялік..м горадзе, калі захачу, магу даведа..ца, дзе цяпер яе сын.

— Нешта зам..нае яму, інакш ён адазваўся *(б)*, — звычайна казала яна.

Я, в..дома, з дарагой душой быў *(бы)* рад памагчы, але, як на зло**,** *(як)* толькі выя..джаў *(з)* вёскі, у *(што)* дзё*(н)*най м..тусні і клопаце забываўся на про*(з,с)*ьбу старой… Так было некалькі гадоў. Ї вось, прыехаўшы зноў *(да)* дому, я на другі *(ж)* дзень *(а..)*чуў, што а..пачынак мой ідзе *(н..)* так, як усе ранейшыя леты, што мне нешта рупіць, нечага *(н..)* хапае. Ї аднойчы я здагадаўся, у чым прычына такога майго настро.. **:** ды гэта *(ж)* да мяне *(н..)* пры*(й?)*шла тая бабулька, што прыходзіла заўсёды. Я спытаўся ў маці, што са старою. Ї пачуў**:** яе няма ўжо на бел..м с*(ь)*веце**…** Ї амаль у тую *(ж)* хв..ліну падумаў, што я ў *(не)* ч..м вельмі вінаваты перад гэтай бабулькай. У горад я паехаў *(з,с)* прыкрасц*(ц, ь)*ю *(на)* душы. Ї яна, гэтая прыкрасць, *(н..)* пакінула мяне

*(н..)* праз дзень, *(н..)* праз два. *(Н..)* пакідае і сёння. *(Паводле Б. Сачанкі)*

**255.** *Прачытайце сказы з сачыненняў выпускнікоў школ. Ці з’яўляецца дарэчным выкарыстанне выдзеленых слоў у мастацкім стылі (у сачыненні)? Замяніце выдзеленыя словы з гутарковай ці кніжнай стылістычнай афарбоўкай на сінанімічныя ім стылістычна нейтральныя моўныя сродкі.*

1. Мой любімы пісьменнік нарадзіўся **пад бокам,** у суседняй вёсцы. 2. Я выбрала прафесію настаўніка **за кампанію** з сяброўкай. 3. Закончыць сваю **пісаніну** я хачу вершаванымі радкамі. 4. Дзе б ні быў, я не **выкіну з галавы** свой родны кут. 5. За час **бадзяння** па дарогах роднай Беларусі пазнаёміўся з яе краявідамі. 6. Мая мара — стаць **хімічкай.** 7. Мая любімая настаўніца хоць яшчэ зусім **зялёная,** але дасведчаная. 8. Я люблю сваю настаўніцу за тое, што яна ніколі не **чытае** нам **маралі і натацый.** 9. Побач з роднай вёскай віднеецца прыгожы **лясны масіў.** 10. А цяпер **што датычыцца** выбару свайго лёсу — сваёй будучай жыццёвай дарогі. 11. У мінулым годзе пры паступленні ва універсітэт я **пацярпеў фіяска.** 12. Пасля касавіцы, стаміўшыся махаць касой, люблю **прымаць сонечныя ванны.** 13. Перад намі стаіць пытанне: якую з **процьмы** прафесій выбраць?

**256.** *Да прапанаваных ніжэй слоў-канцылярызмаў і штампаў падбярыце сінанімічныя словы ці выразы з нейтральнай стылістычнай афарбоўкай (міжстылёвыя).*

Прымаць актыўны ўдзел у барацьбе за павышэнне —
Давесці да ведама —
Праяўляць клопат —
Аказваць вялікую дапамогу —
Правесці вялікую работу па... —
Весці барацьбу за павышэнне паспяховасці —
Прыняць рашэнне —
Аб’явіць падзяку —
У бягучым годзе —
Паставіць подпіс —
Устрымацца ад заявы аб дні старту —
Выразіць здзіўленне —
На працягу дзвюх гадзін —
Нанесці візіт —

# СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ

## СЛОВАЗЛУЧЭННЕ

**257.** *Прапанаваныя спалучэнні слоў падзяліце на словазлучэнні і несловазлучэнні. Абгрунтуйце сваё меркаванне. Прачытайце прыклады ў адпаведнасці з нормамі беларускага літаратурнага вымаўлення.*

I. Ісці па кладцы, луг і поле, рыжскі цягнік, абапал сцежкі, невялікае балотца, у рэчцы, раскінуцца вакол, не быў, самы адчайны, даспелены яблык, семдзесят восем, аб’езджаны конь, дождж ідзе.

II. Сто адзінаццаць, выпадак зручны, летаваць у вёсцы, сакавік і красавік, другі квартал, расце аер, збіраць садавіну, нібы прывід, удалы прыклад, з мармуру, пеставаць дзіця.

**258.** *Прачытайце выказванне Янкі Брыля. Выпішыце з яго словазлучэнні, вызначце ў іх галоўнае і залежнае словы. Якімі часцінамі мовы яны выражаны? Пастаўце пытанне да залежнага слова.*

Прага шчасця настолькі вялікая ў нас, што нават самыя шчаслівыя моманты, дні, тыдні, гады часцей за ўсё здаюцца … уступам да шчасця.

**259**. *Вызначце віды падпарадкавальнай сувязі слоў у словазлучэннях. Раскрыйце дужкі і растлумачце напісанне слоў. Карыстайцеся табліцай.*

| Дапасаванне | Кіраванне | Прымыканне |
|---|---|---|
| | ***Галоўнае слова*** | |
| Назоўнік, займеннік | Любая самастойная часціна мовы | Любая самастойная часціна мовы |
| | ***Залежнае слова*** | |
| Прыметнік, дзеепрыметнік, займеннік, лічэбнік | Назоўнік, займеннік | Прыслоўе, дзеепрыслоўе, інфінітыў |
| | ***Сэнсавыя адносіны*** | |
| Азначальныя | Аб’ектныя, азначальныя, акалічнасныя | Аб’ектныя, азначальныя, акалічнасныя |
| *цёплы дзень, мая кніга* | *іду ў сад, бачу вас, пяць дзён* | *ехаць стоячы, дом насупраць* |

I. Углядацца ў неба, шукаць спачування, тваё хваляванне, дом насупраць, гарадскі пейзаж, хавацца ад непагадзі, ісці спяшаючыся, шэлест лісця, вельмі смачны, скошаны луг.

II. Штосьці незвычайнае, разбурыць (да) шчэнту, падарыць (на) памяць, сустракацца (што) дзень, (абы) якое выкананне, сказаць каму (небудзь), думаць (па) інакшаму, пайсці (у) бок лесу, (не) гледзячы ў вочы.

**260.** *Знайдзіце ў тэксце словазлучэнні, якія адпавядаюць пералічаным характарыстыкам, і запішыце іх у пачатковай форме:*

а) простае, дзеяслоўнае, акалічнасныя сэнсавыя адносіны, від сувязі – кіраванне;

б) простае, назоўнікавае, азначальныя сэнсавыя адносіны, від сувязі – дапасаванне.

Ёсць у Мінску месцы, якія вызначаюць аблічча горада, з'яўляюцца яго візітоўкай. Месцы, авеяныя паэзіяй, сумесна "народжаныя" архітэктурай і скульптурай. За іх вонкава статычным воблікам прыхавана мноства гісторый. Гісторый ужо з мінулага. Усё гэта можна сказаць пра плошчу народнага пісьменніка Беларусі Якуба Коласа.

Паводле задумы аўтара мемарыяла скульптара Заіра Азгура, на "доўгай плошчы імя Якуба Коласа" мелася быць "прадаўгаватае, метраў на 45, азярцо, абрамленае дзікім каменнем… А ў цэнтры на тым баку, якім гэтая плошча мяжуе з вуліцай Якуба Коласа, павінен узвышацца вялізны валун – глыба, на якой павінна сядзець жывая, не меншая глыба – гэта сам Якуб Колас". У ансамбль павінны былі ўваходзіць і дзве дзвюхфігурныя групы – персанажы аповесці Я.Коласа "Дрыгва" і паэмы "Сымон-музыка".

Задуманае мастаком было здзейснена. *(Паводле А. Багданавай)*

**261.** *Разгледзьце табліцу "Асаблівасці беларускага кіравання". Прывядзіце свае прыклады сказаў, у якіх бы ўжываліся словазлучэнні названай будовы.*

| У беларускай мове | У рускай мове |
|---|---|
| **Аб'ектныя адносіны** | |
| • Дзякаваць, выбачаць, прабачыць, дараваць **каму** | • Благодарить, извинять **кого** |
| • Жаніцца, ажаніць **з кім** | • Жениться, женить **на ком** |
| • Жартаваць, смяяцца, рагатаць, кпіць, здзекавацца **з каго – чаго** | • Шутить, смеяться, хохотать, на-смехаться, издеваться **над кем – чем** |
| • Дзівіцца **з каго - чаго** | • Удивляться **кому – чему** |
| • Любавацца **кім – чым, на каго – што** | • Любоваться **кем – чем** |
| • Падобны **да каго – чаго, на каго – што** | • Похожий **на кого – что** |

| | |
|---|---|
| • Сумаваць (і інш. дзеясловы пачуцця) **па кім – чым** | • Тосковать, грустить **по кому – чему** |
| • Хворы, хварэць **на што** | • Болен, болеть **чем** |
| **Акалічнасныя адносіны** | |
| ***месца*** | |
| • Хадзіць, бегчы, плыць (і інш. словы са значэннем дзеяння) **па чым** | • Ходить, бегать, плавать (и др. слова со значением действия) **по чему** |
| ***мэты*** | |
| • Ісці, бегчы, плыць, паслаць **па што – каго** | • Идти, бежать, плыть, послать **за кем – чем** |
| ***прычыны*** | |
| • Не выканаць **праз каго – што, з-за каго - чаго** | • Не выполнить **из-за кого – чего** |

**262.** *Параўнайце сказы з арыгінальных і перакладных тэкстаў. Выпішыце з іх словазлучэнні, розныя паводле будовы ў беларускай і рускай мовах. Растлумачце, у чым заключаецца розніца.*

1. Потым падышоў да адчыненага акна і доўга любаваўся на каштан. *(Шам.)* – Потом подошёл к открытому окну и долго любовался каштаном. *(А. и З. О.)* 2. Ён дакрануўся вуснамі да яе шчакі. *(К.)* – Он прикоснулся губами к её щеке. *(Моз.)* 3. Прысаромлены Зазыба патрываў, пакуль пачне хіліцца на лес сонца. *(Чыгр.)* – Пристыженный Зазыба выждал, пока начнёт клониться к лесу солнце. *(Серг.)* 4. Паўз вокны ішоў старэваты чалавек. *(К. Ч.)* – Мимо окон прошёл пожилой человек. *(Шамб.)* 5. Ён перадаў гэты тэкст а пятай гадзіне дня. *(Шам.)* – Он передал этот текст в пять часов дня. *(Т. Ш.)* 6. Па азнаямленні Лабановіч падзяліў іх на тры групы. *(К-с)* – После ознакомления с ними Лобанович разделил их на три группы. *(Моз.)* 7. Мужчыны нашы днямі ўжо бачылі гэты спектакль. *(Б.)* – Мужчины наши на днях уже видели этот спектакль. *(Д. К.)*

**263.** *Прачытайце выказванні. Пра якія асаблівасці беларускага кіравання расказваюць даследчыкі? Выпішыце словазлучэнні, што іх пацвярджаюць. Прывядзіце свае прыклады словазлучэнняў такой жа будовы.*

I. Механічна ў творным склоне пачынаем ужываць прыназоўнік *за*: *паслаў за доктарам, паехаў за абсталяваннем*, калі тут патрэбен прыназоўнік *па* і назоўнік у вінавальным склоне: *паслаў па доктара, паехаў па абсталяванне*. Не *за чым* і *за кім* паслаць, з'ездзіць, схадзіць, а *па што* і *па каго*. Прызнаюся, што нядаўна я прачытаў у газеце: "Навошта ездзіць за экзотыкай на край свету" і не зразумеў адразу, пра што сказана.

Памятаючы, што *за* – гэта следам за кім, наўздагон за кім, я так і зразумеў, што следам за ёю. І толькі пасля ўжо, дачытаўшы да канца фразу, дзе сказана, што экзотыкі колькі хочаш і дома, пад бокам, здагадаўся, што гэта *па* яе. Я не жартую і не прыкідваюся: я прывык за словам бачыць той сэнс, які памятаю з матчынай мовы, з дзяцінства. *(Паводле Я. Скрыгана)*

II. Прыназоўнікі *для, дзеля* ў словазлучэннях, якія перадаюць адносіны мэты, могуць быць сінанімічнымі толькі ў адным выпадку, а іменна: калі залежным кампанентам з'яўляецца аддзеяслоўны назоўнік або назоўнік – абстрактнае паняцце, г. зн. у словазлучэннях з уласна мэтавым значэннем. У астатніх выпадках функцыі прыназоўнікаў *для, дзеля* выразна размежаваныя: з дапамогай *для* выражаюцца адносіны прызначэння *(пабудаваць дом для жылля)*, называецца адрасат *(для цябе берагу)*; з дапамогаю *дзеля* выражаецца апрычыненасць, матывіроўка дзеяння або падкрэсліваецца, дзеля каго выконваецца дзеянне. Ні ў адным з гэтых выпадкаў канструкцыі з *для* і *дзеля* сінанімічнымі быць не могуць. *(Паводле Л. Падгайскага)*

III. Прыназоўнікава-склонавыя спалучэнні *ў Беларусі* і *на Беларусі* ў літаратурнай мове ўжываюцца як раўнапраўныя; сэнсавыя адрозненні паміж імі настолькі нязначныя, што пры выбары канструкцыі з *у* ці *на* яны амаль не ўлічваюцца. Аднак пры выкарыстанні гэтых спалучэнняў варта мець на ўвазе, што прыназоўнікава-склонавая форма *на Беларусі* паводле значэння блізкая да спалучэння *на тэрыторыі Беларусі*, а *ў Беларусі* – да спалучэння *ў Беларускай рэспубліцы.* Пры абазначэнні кірунку руху прэваліруюць спалучэнні з *у (прыехаць у Беларусь). (Паводле М. Яўневіча)*

**264.** *Запішыце па-беларуску. З трыма словазлучэннямі на выбар складзіце сказы.*

I. Отдыхать по праздникам, ходить по улицам, послать за сестрой, забыть о сне, не видеться более двадцати лет, извините меня за опоздание, издеваться над животным, не горюй обо мне, благодарить учителя, заботиться о детях, улыбаться сквозь сон, рассказывать о своих родителях, пойти за черникой, болеть корью, жениться на однокурснице.

II. Принять во внимание, заведующий кабинетом, километрах в трёх от деревни, идти по тонкому льду, выбрать по своему вкусу, уволиться по собственному желанию, приехать в полночь, большой по размеру, смотреть за собой, путешествовать по городам, поехать на мельницу, создан по образцу, собраться по случаю праздника.

**265.** *Утварыце словазлучэнні з аб'ектнымі адносінамі, прывядзіце адпаведныя эквіваленты ў рускай мове. Пры неабходнасці звярніцеся па дапамогу да слоўніка-даведніка Г.У. Арашонкавай і В.П. Лемцюговай “Кіраванне ў беларускай і рускай мовах” (Мн., 1991).*

Кпіць … (сябар, малы) – …; расказаць … (выпадак, падарожжа) – …; багаты … (падзеі, грошы) – …; любавацца …(кветка, дзяўчына) – …; вырачыся …(мова, Бацькаўшчына) – …; сквапны …(слава, улада) – …; кансультавацца … (урач, праблема) – …; даглядаць … (дзеці, жывёла) – …; верхаводзіць … (хлопцы, сябры) – …; бескарысны … (падрыхтоўка, я) – …; ацэнка … (маёмасць, настаўнік) – …; пераймаць … (звычкі, салавей) – …

**266.** *Да прыказак і прымавак па магчымасці прывядзіце адпаведныя варыянты з рускай мовы. Адзначце асаблівасці словазлучэнняў з кіраваннем у беларускай мове.*

1. Хто з каго смяецца, той таму і застанецца. 2. Хто ўсім падда́кue, таму ніхто не дзякуе. 3. Праз аднаго Іванку ўсім заганка. 4. Пайшоў Апанас па квас, дык ні Апанаса, ні квасу. 5. Як шкоды наробяць, на госці не ходзяць. 6. Не цешся з чужое бяды: свая недалёка ад барады. 7. Лес па сякеры не плача. 8. Роўны з роўнага цешыцца. 9. Хто не бачыў вялікага, той з малога дзівіцца.

# ПРОСТЫ СКАЗ

## Віды сказаў паводле будовы і мэты выказвання

**267.** *Спішыце сказы, вызначце іх будову і пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку. Раскрыйце дужкі і ўстаўце прапушчаныя літары, растлумачце правапіс.*

Як усё (такі) адарваны мы ў горадзе ад прыроды!.. Сядзім у гэтым аднастайна (шэрым) каменным палоне і не бачым толкам н.. сонца н.. неба н.. зор. Усё міма нас і п..янкая квец..нь садоў і срэбразвонны гоман крыніц і чысты, гаючы спеў птушак…

Ды што там казаць! Снегу і таго нават як (след) не бачым. Ле..ь выпадзе ён як адразу (ж) кідаюцца на яго цэлай армадай – з лапатамі, мётламі, машынамі. І зграбаюць вывоз..ць хутчэй каб, не дай Бог, не паляжаў лішняй гадзіны.

Гляджу іншы раз я на гэты стаптаны брудна (рыжы) перам..шаны з пяском снег і шкада мне яго робіцца. Лішні (не) патрэбны ён тут сярод царства машын і асфальту. А як жа радуюцца яму ў вёсцы! Там ён і чароўны ўбор і вясёлая забава і незаменны работнік што клапатліва ўкрывае палі ад лютых маразоў. *(Паводле З. Прыгодзіча)*

**268**. *Прачытайце тэксты. Знайдзіце ў іх пытальныя сказы. Якія сродкі выражэння пытання выкарыстоўваюць аўтары?*

I. Што такое наша Зямля? Даўным-даўно, яшчэ з часоў Каперніка, вядома, што гэта звычайны, трохі выцягнуты ў полюсах шар, які круціцца па арбіце вакол Сонца, і што шар гэты не болей як пясчынка сярод іншых гіганцкіх планет.

А што такое мы, людзі, на гэтай пясчынцы? Што такое чалавечае жыццё ў параўнанні з вечнасцю Сусвету? Кароткае, як успышка маланкі, імгненне…

Калі думаеш пра гэта, якімі дробнымі і нікчэмнымі становяцца адразу ўсе нашы штодзённыя перажыванні і непрыемнасці, усе нашы сваркі, крыўды, згрызоты.

Мы прыходзім у свет, каб радавацца цудоўнаму і самім ствараць цудоўнае, быць шчаслівымі і клапаціцца пра шчасце іншых.

Чаму ж мы так часта і так лёгка забываем пра гэта? Нашто псуём адзін аднаму нервы, атручваем жыццё рознай грубасцю, несправядлівасцю, подласцю? Няўжо нельга абысціся без гэтага? *(Паводле З. Прыгодзіча)*

II. Хто ж ты ёсць, чалавек?

Як з’явіўся і для чаго існуеш?

Ты ўпрыгожанне зямлі ці, наадварот,— яе ганьба і цвіль?

Маленькі ў макракосмасе і вялізны ў мікракосмасе?

Тут ты не ўмяшчаешся ні ў адну з ячэй, а там ніводная ячэя не заўважае цябе – ат, нейкая пылінка.

Ты ўвесь з супярэчнасцей і нечаканасцей.

Ты пішаш кнігі, і ты ж паліш іх потым на кастрах.

Ты паказваеш сябе разумным і робіш тое, што могуць зрабіць толькі дурні.

Ты нараджаеш чалавека — свой працяг, і ты ж знішчаеш гэтага чалавека — нібыта хочаш, каб працягу гэтага не было.

Дык хто ж ты ёсць, чалавек? *(Я. Сіпакоў)*

**269.** *Адкажыце на пытанні. Назавіце тыя сродкі, пры дапамозе якіх афармляецца пытанне.*

1. Ці супадае колькасць гукаў і літар у слове *спадчына*? 2. Куды падае націск ў слове *выпадак*? 3. З якой літары пішуцца псеўданімы? 4. Колькі марфем у слове *боязна*? 5. Чаму ў складаназлучаным сказе *Ветрана і золка* не патрэбна коска? 6. Ад чаго залежыць правапіс галосных у першай частцы складанага слова? 7. Ты адказаў правільна на ўсе пытанні?

**270.** *Прачытайце пабуджальныя сказы. Якія сродкі выражэння пабуджэння выкарыстоўваюць аўтары?*

I. 1. Над словам і над гукам, даўмеўшыся пары, спярша на рукі хукай, пасля ўжо гавары. *(Стр.)* 2. Хай слова будзе як патрэба, як у прыпар вады глыток. *(Стр.)* 3. Не пакідай мяне, мой светлы сум. *(Гіл.)* 4. Дайце браму краіны любві адчыніць, нібы дзверы дома. *(П. М.)* 5. Не спяшайся, вандроўнік, прыпыніся на момант. *(В. З.)* 6. Давай з табой паслухаем, як гай спявае песню нам. *(Панч.)* 7. Жыві ж, наш край! Няхай надзея гарыць у сэрцы і мацнее!.. *(К-с)* 8. Сябры мае, жыццё будуйце, гадуйце весела малых, усмешак людзям не шкадуйце і не шкадуйце тым хвалы, хто справу любіць больш за славу. *(Панч.)*

II. Яго прасілі:

– Вырві карані свае з зямлі гэтай, ідзі за намі. Толькі ў нас цябе чакае багацце.

Не вырваў. Не пайшоў. Не захацеў багацця таго. І яго забілі.

Яму прапаноўвалі:

– Адрачыся веры свае, прымі нашу. Толькі сярод нас цябе чакае слава.

Не адрокся. Не прыняў. Не захацеў славы тае. І яго забілі.

Яму загадвалі:

– Забудзь матчыну мову, назаўсёды пакінь народ свой. Толькі ў нас ты адчуеш сябе шчаслівым.

Не забыў. Не пакінуў. Не захацеў шчасця таго. І яго забілі.

…Тройчы забіты, ён застаўся навечна СЫНАМ зямлі сваёй.

*(Я. Пархута)*

**271.** *Прывядзіце прыклады пабуджальных сказаў са значэннем а) загаду; б) просьбы; в) патрабавання; г) запрашэння; д) пажадання; е) перасцярогі.*

**272.** *Ахарактарызуйце сказы па мэце выказвання і інтанацыі. Якія сродкі выражэння пытання і пабуджэння выкарыстоўваюць аўтары?*

1. Мусіць, гэта страшна – заблудзіцца на незнаёмай вуліцы чужой душы?.. *(Пісьм.)* 2. Пакрыўдзіў, кажуць, чалавека лёс. А дзе той лёс? Які ён быў і будзе? Заўжды людзей да гора і да слёз даводзяць абыякавыя людзі. *(Луж.)* 3. Ніколі не збочваць з дарогі – зайздросная доля. Ды хай жа міне цябе доля дарогу губляць. *(У. Н.)* 4. Зямля! Дай моцы сыну, хай уваскрэсне ў ім і з Полацка Скарына, і з Крошына Багрым. *(Пісьм.)* 5. Хай светла збудзецца, што светла сніцца. *(Н.М.)* 6. Травінка і краска, спеў-гоман лясны… Няўжо гэта вы мне любоў да радзімы навечна далі? *(Кір.)* 7. Унукі Скарыны, дзе ваш гонар, моц і краса? Ёсць у вас, як і ў іншых, святыня. Не давайце святыні псам! *(Каратк.)* 8. О, як мне хочацца дадому! *(Бур.)*

**273.** *Вызначце тыпы сказаў паводле інтанацыі і мэты паведамлення. Спішыце і пастаўце патрэбныя знакі прыпынку ў канцы кожнага з іх. Устаўце прапушчаныя літары ў словах.*

I. 1. Як гэта хораша – юнацтва_ *(Пісьм.)* 2. Ах, як сэрца ня..церпна баліць за Зямлю непаўторную гэту_ *(С. З.)* 3. Хай жывуць усмешкі с..нцатварыя дабраты і шчырасці лю..ской_ *(П. М.)* 4. Крэўную сувязь са светам а..чуй, палюбі мураша і былінку_ *(Пісьм.)* 5. Ці ж да песен.. не здатны мой кут_ *(Янішч.)* 6. Спяшайцеся ў поле, у лу.., у лясы запісваць птушыныя галасы_ *(Віт.)* 7. Эх, і паго..ка ж стаіць на Палессі_ *(К-с)* 8. Дзе толькі я не пабываў На розных астравах і кантынентах, на самых вяршынях сваіх мар_ *(М. Т.)* 9. Хто ж не любіць душою нашу маці-зямлю_ *(Бр.)*

II. Затрымалі ў зоне раніцой бабулю_
“Што ж вы гэта робіце_ Ці загад.. не чулі_
Скрозь жа рады..цыя, гэта ж не навіна_
Дык жыўцом навошта ле..ці ў дамавіну_
Дык чаму блукаеце вы па зоне ўпотай_
Што, каго шукаеце за калючым дротам_”
Ля сялібы роднай, был..нягом урослай,
Слухала салдатаў, як дзіцё дарослых_
Знізу ўверх глядзела з-пад брывоў сівенькіх,
Выцірала слёзы чорнай, ..сохлай жменькай:
“ Вы, сынкі, не бойцеся_ Што ўжо мне пашкодзіць_
Дзеці не пускалі, уцякла, як злодзей_
Самі мае ножанькі прывялі дадому
Шляхам невядомым, сце..каю знаёмай_
Вы не лайце, дзеткі_ Паглядзець ахвота,
Як тут наша хатка за калючым дротам_
Вось яе а..ведала, і ля..чэй мне стала,
Можа, і знайшлося тое, што шукала_ ” *(С. Законнікаў)*

**274.** *Запішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку і пры неабходнасці ўстаўляючы прапушчаныя літары. Пабудуйце на аснове тэксту навуковае паведамленне на тэму “Выдатны беларускі асветнік”. Складзіце дзве разнавіднасці плана свайго паведамлення ў выглядзе: а) апавядальных сказаў; б) пытальных сказаў.*

Францыск Скарына пакінуў нам у спа..чыну серыю друкаваных кніг “Біблію” (22 часткі) і “Псалтыр” выдадзеныя ў чэшскай Празе ў 1517—1519 гадах “Апостал” “Малую падарожную кні..ку”… Як лепшыя ўзоры беларускага кнігадрукавання (С, с)карынаўскія выданні былі важнай крыніцай ведаў н.. толькі для царкоўнікаў але і для ўсіх людзей.

Кожнае выданне Скарыны суправаджалася прадмовай і п..сляслоўем у якіх выкладаліся яго гуманістычныя і асветні..кія погл..ды на шырокае кола пытанняў маралі палітыкі права т..орыі і практыкі дз..ржаўнага жыцця.

Скарынаўскія выданні прыкметна адроз..няваліся ад сучасных ім і больш позніх славянскіх друкаваных кніг сваім мастацка-т..хнічным афармленнем ілюстрацыямі на спецы..льных тытульных лістах гравюрамі на сюжэт кнігі, літарамі-ініцы..ламі да кожнага раздзела паслядоўнай нумарацыяй лістоў ужываннем вялікай літары ва ўласных імёнах і геаграфічных назвах. *(Паводле У. Анічэнкі)*

**275**. *Разгледзьце табліцу. Прааналізуйце спосабы граматычнага выражэння галоўнага члена ў аднасастаўных сказах. Дапоўніце адпаведныя раздзелы табліцы патрэбнымі вывадамі або прыкладамі.*

| Выражэнне галоўнага члена | Прыклады |
|---|---|
| **1. П э ў н а - а с а б о в ы я   с к а з ы** | |
| Дзеяслоў у форме абвеснага ладу | |
| 1) 1-й асобы адзіночнага ліку<br><br>2) ... ...<br><br><br>1) 1-й асобы множнага ліку<br>2) ... ... | *Напевы дзіўныя* ***збіраю*** *ў жытнім полі і бары.* (Астр.)<br>***Запяеш*** *па душы,* ***дасі ўцехі*** *гасцям – поўны гуслі насыплю дукатаў.* (Куп.)<br>**... ...**<br>*Ці* ***ўспамінаеце*** *тую нечаканую сустрэчу?* |
| Дзеяслоў у форме загаднага ладу | |
| 1) 2-й асобы адзіночнага ліку<br><br>2) ... ... | *Мама, нада мною* ***не журыся, не шукай*** *гаючае травы.* (Янішч.)<br>***Агледзьце****, братцы, добра косы.* (К-с) |
| **2. Н я п э ў н а - а с а б о в ы я   с к а з ы** | |
| Дзеяслоў у форме абвеснага ладу | |
| 1) 3-й асобы множнага ліку<br><br><br>2) ... ... | ***Даюць*** *прэміі за выдатныя творы мастацтва, музыкі, літаратуры.* (М.Т.)<br>*На Сымона* ***паглядзелі*** *з недаверам.* |
| Дзеяслоў у форме загаднага ладу | |
| 3-й асобы множнага ліку | ***Няхай*** *вам* ***падбяруць*** *цікавую кнігу.* |
| **3. А б а г у л ь н е н а - а с а б о в ы я   с к а з ы** | |
| Дзеяслоў у форме абвеснага ладу | |
| 1) 2-й асобы адзіночнага ліку<br>2) ... ... | ... ...<br>*Навуку за плячыма* ***не носяць****.* (Прык.) |

| Дзеяслоў у форме загаднага ладу | |
|---|---|
| … … | *Чужога добрага **не гань**, а свайго ліхога **не хвалі.*** (Прык.) |
| **4. Б е з а с а б о в ы я   с к а з ы** | |
| 1) Уласна безасабовы зваротны і незваротны дзеяслоў: *днее, вечарэе, развіднела, змяркаецца, падмарозіла* і інш. | ***Вечарэла.*** *Сіняватыя змрокі сла-ліся на зямлі.* (Саб.) *Было зусім ціха.* ***Распагодзілася.*** (К-с) |
| 2) Безасабовы зваротны дзеяслоў, утвораны ад асабовага незваротнага (часта ў спалучэнні з інфінітывам). | *Што вам **не жартуецца** і чаму **бунтуецца**?* (Панч). *Зараз **хочацца мець** беларускага неба багата.* (Панч.) |
| 3) Асабовы дзеяслоў у безаса-бовым значэнні. | *Вясной тут **пахла** чаромхавым цветам.* (Кудр.) *У сонечным святле **не стала** яркае пяшчоты.* (А. Ж.) |
| 4) … … (часта ў спалучэнні з дапаможным дзеясловам *было, будзе, стала, стане* або з інфінітывам). | *Мне **вольна** тут, **святочна** і **ўтульна.*** (Мельн.) ***Здорава*** *пад ушацкую завіруху **грэцца** ўтрапё-ным Парыжам.* (Р. Б.) ***Было золка і сыра***. (Сач.) |
| **5. І н ф і н і т ы ў н ы я   с к а з ы** | |
| … … | *Чужога шчасця **не выкрасці**.* (В.Р.) ***Дакрануцца б*** *да далечы, хоць **бы** на міг **абярнуцца** мне птахам шчаслівым.* (Кар.) |
| **6. Н а м і н а т ы ў н ы я (назыўныя) с к а з ы** | |
| … … | *Салёныя **хвалі.** Місхораўскі **шум**. Прыціхлае **Чорнае мора.*** (Ак.) ***Вунь і лес.*** *Трагічны **сорак першы год**.* ***2008 год. Лета. Жнівень. Пекін. Алімпійскія гульні.*** |

**276.** *Вызначце тыпы аднасастаўных сказаў.*

1. У роднай мове ёсць слова найпершае “мама”. У роднай мове апошняга слова няма. *(Кам.)* 2. Калядны снег. Зіма. Трывога. Ноч шча-драца. Ноч варажбы. *(Ак.)* 3. І мне павек не разлюбіць ні матчын дом за паваротам, ні раздарожаны бальшак. *(Ак.)* 4. Падсякаем бяздумна карэнне сваё і асновы. *(Грах.)* 5. Пагарды ці абразы не баюся і не чакаю літасці ў адказ. *(В.Р.)* 6. Ужо і кароў падаілі, а вечара ўсё няма. *(Кам.)* 7. Па нітачцы і клубок знойдзеш. *(Прык.)* 8. Ты не паверыш, што святло ад маякоў не пазычаюць. *(Ак.)* 9. Так рызыкоўна сэрцу ўвосень. *(Ак.)* 10. О, як радасна мову рабіць на багата стагоддзяў славутай. *(Р.Б.)*

**277.** *Складзіце сказы па зададзеных характарыстыках.*

1. Просты, няклічны, апавядальны, поўны, двухсастаўны, развіты, няўскладнены. 2. Просты, няклічны, пытальны, поўны, двухсастаўны, неразвіты, няўскладнены. 3. Просты, клічны, апавядальны, поўны, аднасастаўны, развіты, ускладнены аднароднымі членамі. 4. Просты, клічны, пабуджальны, поўны, аднасастаўны, неразвіты, няўскладнены.

## Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам

**278.** *Выпішыце з прапанаваных сказаў спачатку тыя, дзе дзейнік выражаны назоўнікам у назоўным склоне, потым – сказы з дзейнікам-інфінітывам. Які тып выказніка сустракаецца ў гэтых сказах? Растлумачце пастаноўку працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам або яго адсутнасць.*

1. Няшчасная доля – памерці ў смутку-тузе аднаму. *(Гіл.)* 2. Жыццё – бясконцае шматкроп’е. *(П. М.)* 3. Жыццё заўжды іспыт на мужнасць. *(Н. М.)* 4. Кажуць, барада – адзнака мудрых. *(Віт.)* 5. Пытанне ёсць прадчуванне ісціны. *(В. З.)* 6. У лодак адзіная справа – насуперак хвалям ісці. *(П. М.)* 7. Шчырасць – гэта праз мудрасць дарога. *(Ак.)* 8. Я кола. Мая доля – часамі з грукам і нехаць – круціцца ўвесь век на доле, каб вам наверсе ехаць. *(П. М.)* 9. Дараваць – не для кожнага гонар…*(Ак.)* 10. Зямля мая, ты для мяне як дзіва, як першы дотык любае рукі, як у спякоту млосную ільдзінка, як на кашулі белай васількі. *(С. З.)*

**279.** *Запішыце сказы, расстаўляючы, дзе неабходна, працяжнікі паміж дзейнікамі і выказнікамі. Абгрунтуйце сваю думку. Граматычныя асновы ў сказах падкрэсліце.*

I. 1. Тут кожная сцежка паданне, жывая легенда бары. *(В. М.)* 2. Назвы роднай зямлі гэта адзін з тых элементаў духоўнай культуры, з якіх пачынаецца ўсведамленне Радзімы. *(Раг.)* 3. О родная зямля! Ты кніга вечнага жыцця. *(М. Т.)* 4. Жывое белае срэбра між прагалаў соснаў высока над борам гэта аблокі. *(Кух.)* 5. Час як плынь рачная. *(А. З.)* 6. Баравік невыказная радасць грыбніка. *(І. А.)* 7. Адзін у полі не воін. (*Пр.)* 8. З ваўкамі жыць па-воўчы выць. *(Пр.)* 9. Я беларус, я нарадзіўся на гэтай казачнай зямлі. *(Гіл.)* 10. Бацька гарадоў беларускіх Полацк. *(У. А.)* 11. Гордасць таксама, мабыць, жаночае хараство. *(Скр.)*

II. 1. Я вязень твой, а ты мая турма, асуджан я любоўю пажыццёва. *(А. К.)* 2. Белы бусел не зімуе у нас, але вяртаннем з выраю кожную вясну пацвярджае, што гэты блакітна-зялёны край яму радзіма, а ён яе сімвал,

сімвал міралюбства, сцішанага хараства і патаемна-мудрай сілы. *(Ждан.)* 3. Мы шукаем кветкі, шукаем і паважаем іх за пах, але нават і падумаць баімся, што бадзяк таксама кветка, што ён таксама прыемна пахне, але яго пах іншы, прытоены. *(Я. С.)* 4. Ад нянавісці чарсцвее сэрца, а гэта як замаруджаная смерць. *(Кір.)* 5. Самыя каляровыя месяцы ў Белавежы, бадай, гэта чэрвень і ліпень. *(Парх.)* 6. Якая асалода жыць, знаць вартасць кожнае гадзіны, тым, што адкрыта, даражыць і адкрываць за дзівам дзіва. *(Віт.)* 7. Хто мы такія, маці Зямля? Мы ўсе твае дзеці, мы нязменныя і, як і ты, кожны час шматтварыя. *(Каратк.)* 8. Парэчча слаўная мясціна, куток прыгожы і вясёлы: як мора лес, як неба долы, зіхціць у кветках лугавіна… *(К-с)*

**280.** *Выберыце з прапанаваных сказаў тыя, у якіх працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам пастаўлены правільна.*

1. Адна з умоў выздараўлення – жаданне выздаравець. *(Сенека Малодшы)* 2. Устрыманасць і праца вось два сапраўдныя лекары чалавека. Праца абвастрае яго апетыт, а ўстрыманасць перашкаджае злоўжываць ім. *(Ж.-Ж. Русо)* 3. Здароўе – мудрых ганарар. *(П. Беранжэ)* 4. Закон – гэта не павуцінне, скрозь якое буйныя мухі прабіраюцца, а маленькія затрымліваюцца. *(А. дэ Бальзак)* 5. Іграць пры поўнай глядзельнай зале, якая спачувае вам, тое ж, што спяваць у памяшканні з добрай акустыкай. *(К. Станіслаўскі)* 6. Гісторыя – скарбніца нашых дзеянняў, сведка мінулага, прыклад і навучанне для сучаснага, перасцярога для будучага. *(М. Сервантэс)* 7. Геній – ёсць цярпенне думкі, засяроджанай у пэўным напрамку. *(І. Ньютан)* 8. Мастацтва – як пошукі алмазаў. Шукае сто чалавек, а знаходзіць адзін. *(У. Салаухін)* 9. Жывапіс – гэта паэзія, якую бачаць, а паэзія – жывапіс, які чуюць. *(Леанарда да Вінчы)*

**281.** *Выберыце з прапанаваных сказаў тыя, у якіх працяжнік стаіць паміж дзейнікам і выказнікам. Прааналізуйце выражэнне граматычных асноў у іх. Растлумачце, па якой прычыне працяжнікі ўжыты ў іншых сказах.*

1. Над лесам – поўны таямнічы месяц. *(Б.)* 2. Чалавекам быць – самая высокая пасада на зямлі. *(П. К.)* 3. На астравах, выспах, пагорках паўставалі людскія паселішчы – хутары, вёскі. *(Сач.)* 4. Наша драўлянае дойлідства – унікальная з'ява ў свеце. *(С. П.)* 5. Многа снегу – многа хлеба. *(Пр.)* 6. Відаць, адзін толькі талент – гэтае тонкае трапятанне пачуцця і думкі – здольны ў прыдарожнай былінцы знайсці гаманкую душу… *(Я. Р.)* 7. Малая радзіма – гэта тое, што на ўсё жыццё адорвае нас крыламі натхнення. *(Кап.)* 8. Жупраны ляжаць на даволі бойкай дарозе Мінск – Ашмяны – Вільнюс. *(Цв.)* 9. Павее ветрык – шурхнуць травы. *(К-с)* 10. У

ледзяныя звонкія раніцы і травы каля платоў, і палі, і стрэхі – усё было па-зімоваму белае. *(І. М.)*

**282.** *Запішыце тэкст, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Растлумачце ўсе выпадкі пастаноўкі працяжніка. Падкрэсліце граматычныя асновы ў сказах.*

У слова свая вага,
Слова розуму рэха.
Слова мая туга,
Слова мая ўцеха.
Можа нябесную высь,
Дзе хмары свінцовыя ходзяць,
Сёння, як калісь,
Слова адно распагодзіць.
Слова абрыў стром,
Слова да згоды сцежка,
Слова знішчальны гром,
Слова раптоўная ўсмешка.
Робяцца з пэўнай пары
Ад слоў, што вякі сабралі,
Ворагамі сябры,
А ворагі сябрамі…
Слова імя навізны,
Імя старадаўніх паходаў,
Слова жывы сувязны,
Стагоддзяў, шырот і народаў.
Слова над прорвай мост,
Дзе ані ўлева, ні ўправа,
А толькі наўпрост і наўпрост…
Слова таксама справа!
Даводзячы пачуццём,
Што слова думкі выснова,
Расцём,
Каб усім жыццём
Сказаць сваё слова!

*(П. Макаль)*

**283.** *Складзіце сказы па прапанаваных схемах на тэму “Маё школьнае жыццё”. Сказы запішыце, ставячы або не ставячы працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.*

1) назоўнік назоўнік
2) інфінітыў інфінітыў
3) займеннік *як* назоўнік
4) назоўнік *не* назоўнік
5) інфінітыў *гэта* назоўнік
6) назоўнік прыметнік
7) назоўнік фразеалагізм
8) лічэбнік назоўнік

**284.** *Прачытайце тэкст. Перабудуйце выдзеленыя канструкцыі ў сказы з састаўным іменным выказнікам, які мае нулявую звязку. Атрыманы тэкст запішыце. Патлумачце пастаноўку або непастаноўку працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам у запісаных сказах.*

Кожны народ ганарыцца сваімі помнікамі гістарычным асобам, палітычным дзеячам, кампазітарам, спевакам, музыкантам, пісьменнікам. *Помнікі гэтыя ўяўляюцца вехамі на гістарычным, часам досыць складаным жыццёвым шляху народа*. Асабліва ганарыцца ён помнікамі, устаноўленымі яго нацыянальным героям у іншых краінах свету. *Гэта можна лічыць міжнародным прызнаннем укладу народа ў сусветны*

*гістарычны культурны працэс*. Ёсць такія помнікі і ў беларускага народа.

*Найбольш вядомым стаў помнік Янку Купалу, адкрыты 1 чэрвеня 1973 года ў Ароу-парку паблізу Нью-Йорка ў Злучаных Штатах Амерыкі.* На пастаменце з чорнага паліраванага граніту ўстаноўлены бронзавы бюст вялікага беларускага паэта работы беларускага скульптара Анатоля Анікейчыка. *Помнік з'яўляецца падарункам нашага народа суайчыннікам у Злучаных Штатах Амерыкі.* Побач – раней устаноўленыя помнікі нацыянальным паэтам рускага, украінскага і амерыканскага народаў А. Пушкіну, Т. Шаўчэнку, У. Уітмену. *(Паводле С. Мацюніна)*

**285.** *Закончыце пачатыя сказы так, каб у іх склад увайшлі састаўныя іменныя выказнікі, а паміж дзейнікам і выказнікам а) ставіўся працяжнік, б) не ставіўся працяжнік. Ахарактарызуйце будову ўтвораных сказаў.*

У з о р: *Цікавая кніга – гэта добры падарунак таму, хто любіць чытаць. Цікавая кніга для мяне найлепшы адпачынак.*

1. Цікавая кніга… 2. Шчыра сказаныя словы… 3. Захапленне музыкай… 4. Адносіны з бацькамі… 5. Школьныя гады … 6. Беларуская літаратура…

**286.** *Прачытайце тэкст Яраслава Пархуты. Ці згодны вы з пазіцыяй аўтара? Выкажыце свае думкі ў пісьмовай форме, выкарыстоўваючы пры гэтым сказы, якія адлюстроўвалі б правіла пастаноўкі або непастаноўкі працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам.*

Як бывае крыўдна, калі іншы думае: я цар прыроды, мне дазволена рабіць з ёю ўсё, што пажадаю… Памыляецца такі чалавек! Ён усяго толькі цаглінка дзівоснага храма – прыроды… А пры такіх адносінах рана ці позна гэты храм дасць трэшчыну. А потымператворыцца ў бясформенную гару друзу…

## Просты сказ ускладненай будовы

Просты сказ можа мець ускладненую і няўскладненую будову. Асновай для гэтага з'яўляецца наяўнасць або адсутнасць у ім наступных канструкцый: аднародных членаў, адасобленых членаў, пабочных і ўстаўных канструкцый, звароткаў: *Мая радзіма – жытні* ***колас, сінь*** *мурагу, язміну* ***цвет****. (Е. Л.)* – сказ ускладнены аднароднымі дзейнікамі; *Беразняк сніць над рэчкаю сны,* ***пахіліўшы купчастае вецце****. (Астр.)* – сказ ускладнены адасобленай акалічнасцю; *Паплыў бы я,* ***здаецца, хмаркі,*** *разам з вамі! (К-с)* – сказ ускладнены пабочным словам і зваротках.

**287.** *Прачытайце тэкст. Ахарактарызуйце сказы (часткі складаных сказаў) паводле наяўнасці ў іх ускладненняў.*

Аляксей Пысін раіў вучыцца роднай мове ў вясковых жанчын. Раіў вывучаць не толькі лексіку, якая ў іх багацейшая і чысцейшая, чым у мужчын, але і ўвесь адмысловы склад і лад іхняй гаворкі. Жанчына, казаў паэт, больш блізкая да прыроды, яе мяккая і чуллівая душа бліжэй да народнай песні.

Жанчыны,
Маці-словатворцы,
Ў час калыханак вы сплялі
Імя вясне, пчале і зорцы,
Ўсім добрым дзівам на зямлі.

Гэтыя мудрыя радкі заўсёды ўсплываюць у маёй памяці, калі я сустракаюся з бабай Настай.

Вось і зараз мы з ёю не здароваемся, а *рукаемся*. А на вуліцы сёння, даруйце, *сянні* не галалёд, а *ледзяніца*, і ў рукі баба Наста бярэ не кій ці кавеньку, а *цапок*, каб цапаць коўзкую дарогу. Яна вельмі непакоіцца, што на маіх ботах амаль сцёрся *падпятак* — так мая бабуля называе абцас. На дварэ не толькі ледзяніца, але яшчэ і дужа *ёдка* — золка, ветрана.

Частуе мяне баба Наста не проста яешняй, а *цалкавухай* (неразбітыя жаўткі) і добра *ўжалелай* (смажанай) бульбай. І ў свае восемдзесят шэсць яна не любіць *верзяі* (лухты). Жыва, з цікавасцю распытвае пра сваіх праўнукаў і зычліва кажа, што яны занадта вялікія *малізыннікі* (ласуны).

Я са смакам ем цалкавуху, ужалелую бульбу, з асалодай слухаю яе гаворку і не перастаю здзіўляцца, які яна выдатны лексікограф і бліскучы стыліст. *(Паводле А. Пісьмянкова)*

● *Выпішыце з тэксту сказ, які дае адказ на пытанне: чаму роднай мове трэба вучыцца ў вясковых жанчын? Зрабіце яго сінтаксічны аналіз.*

**288.** *Спішыце сказы, вызначце іх будову. Пастаўце, дзе трэба, знакі прыпынку і абгрунтуйце іх пастаноўку. Растлумачце правапіс прапушчаных літар.*

Калі вы стан..це дарослыя, яны будуць яшчэ прыгажэйшыя нашы вёскі і гарады. Вы пройдз..це па іх вуліцах – і вам самім захочацца прыкласці свае рукі веды і ўмельства да таго, каб зрабіць іх дзівам дасканаласці, а зямлю нашу — найлепшай у свеце зямлёй.

І трэба вельмі многа ездзіць сябры. Вы маладыя, і калі будз..це жыць “на колах” шмат хадзіць і падарожнічаць, вы пагл..дзіце многае ў свеце. Але перш за ўсё вам трэба ведаць свой самы для нас прыгожы край. Ездзіце. З экскурсіямі да сваякоў або да сяброў. Вы ўбач..це ўсе канцы

нашай мілай ласкавай н..яркай краіны, якая аднак зачаруе вас сваёй н..ўлоўнай прыгажосцю. *(Паводле У. Караткевіча)*

**289.** *Дапоўніце тэкст, зрабіўшы простыя няўскладненыя сказы ўскладненымі. Якія віды ўскладненняў вы выкарыстоўваеце?*

I. Яшчэ з парога на мяне дыхнула зіма. Наўкол усё сцішылася. Сырыя вятры доўгай восені, якія штодня надакучліва шумелі ў галлі бяроз, сёння змоўклі. Шчокі прыемна шчыпаў бадзёры марозік. Снежная бель адбірала вочы, і на сэрцы ад гэтага рабілася радасна. *(Паводле І. Грамовіча)*

II. Да чаго прыгожая гэта вясновая раніца! У паветры яшчэ сыра. На вішняку вісяць буйныя кроплі начных туманоў. Узыходзіць сонца. Яно баязліва паказваецца з-за гарызонту. Першыя яго промні кладуцца густым золатам. Над стрэхамі хат вывіваюцца лёгкія дымкі. За імі на небе такое ж самае лёгкае ружовае воблачка. Здаецца, што яму нудна быць аднаму на гэтай бясконцасці неба, але запрапасціўся недзе гэты свавольнік вецер, і яно не магло скрануцца. *(Паводле Я. Скрыгана)*

## Сказы з аднароднымі членамі

**290.** *Знайдзіце ў сказах аднародныя члены. Якімі членамі сказа яны з'яўляюцца і як звязаны паміж сабой? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах.*

1. Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам. *(Я. С.)* 2. Я люблю ўсходы нашых палеткаў, і спавітыя ў зелень лугі, і шум бору пануры, глухі, і шаптанне крыніцы ўлетку. *(Куп.)* 3. Вісіць над сэрцам і над сінім верасам мядовы пах жыцця і пчолаў гуд. *(Панч.)* 4. Нарач то спявае, то пляскоча, то глыбока дрэмле ў цішыні. *(Гр.)* 5. Я гукаю, і доўгае рэха ў асенняе поле плыве, замаўкае альбо на пацеху азываецца сумнай саве. *(Грах.)* 6. Я за тваім плячом не разглядзеў у доўгую хвіліну развітання, што за акном – змярканне, ці світанне, ці месячная ноч, ці хмарны дзень. *(Бур.)* 7. І шчасце, і воля, і радасць, і боль патрэбны, відаць, чалавеку, як трэба ў дарозе звычайная соль, каб не выраджацца ў калеку. *(Гр.)* 8. Кожнаму з нас лёс адводзіць свой зямны куток, дае бясцэнны дар жыцця і непаўторную матчыну ласку, родную мову і святое адчуванне ўласнай годнасці. *(Бур.)* 9. Я слухаў музыку – наслухацца не мог. *(Панч.)* 10. Нечакана шчымліва-адчайна за туманамі, за асакой ці то кнігаўка, ці то чайка пракрычала над соннай ракой. *(А. П.)*

**291.** *Запішыце тэкст, расстаўляючы ў сказах патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце аднародныя члены. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.*

Усё жывое на зямлі складаецца ўсяго толькі з чатырох атамаў: вадароду вугляроду кісларoду і азоту.

Значыць, мы радня, самая крэўная радня дрэву і травіне кветцы і грыбу ваўку і плесні кіту і камару. Радня не па крыві не па родзе ці віду а па чатырох самых слабых атамах.

І мы, людзі, добрыя і злыя вясёлыя і змрочныя белыя і чорныя вялікія і маленькія таксама найвялікшая радня між сабою – усё па тых жа чатырох не самых моцных у прыродзе атамах. *(Паводле Я. Сіпакова)*

**292.** *Запішыце спачатку сказы, у якіх злучнікам* ***і*** *звязваюцца аднародныя члены, потым — сказы, у якіх злучнік* ***і*** *выступае сродкам сувязі частак складанага сказа, а затым — сказы, у якіх пры дапамозе гэтага злучніка звязваюцца і аднародныя члены, і часткі складанага сказа. Расстаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Граматычныя асновы і аднародныя члены падкрэсліце.*

І. 1. Навальніцаю вецер дыхнуў над ракою і раптоўна прыціх у трывожным спакоі. *(Бур.)* 2. Роднае неба, палеткі, разлогі, слаўлю ваш ранак і дзень і сутонне. *(М. К.)* 3. Зялёныя травы пажухлымі сталі і цёмнаю стала вада і дзікія гусі расстайна крычалі, нібыта іх гнала якая бяда. *(Пісьм.)* 4. Прыйшлі вятры і хмарак статкі нагналі песень дажджавых і жоўтыя паклалі латкі на ўборы паркаў гарадскіх. *(Бр.)* 5. Разарваная хмара ссоўвалася за дальні лес і неўзабаве сонечны бляск зноў заліў поле. *(Хадк.)* 6. На дрэвы і на дамы і на галовы прахожых белы дэсант зімы высаджваецца прыгожа. *(П. М.)* 7. І спынілі гамонку лясы пад празрыстым святлом месяцовым і аселі крупінкі расы на кустах і на травах мядовых. *(Астр.)* 8. Для спачування літасці і веры і ў навальнічны дождж і ў халады не зачыняйце ў вашай хаце дзверы! *(Бур.)* 9. Зімой трашчыць мароз і гул ідзе высока, аж да неба, а раніцай ляжаць снягі, ружовыя і чыстыя, як радасць. *(Стр.)*

ІІ. 1. О, як жа ўсё тут сэрцу міла: узгорак сцежка ніва гай рачулка звонкая крынічка і тын, пахілены на бок, і азярцо і груша-дзічка і воддаль рэдкі саснячок. *(Бач.)* 2. А там, дзе першы крок рабілі, дзе нашы мацеркі жывуць, растуць бярозы і рабіны і лісце падае ў траву. *(Бур.)* 3. Жанчын прыгожых трэба берагчы ад пошласці каварства і знявагі і ад мяшчанскай зайздрасці і звягі і ад залішняй ветласці і ўвагі і ад рукі нахабнай на плячы. *(Бур.)* 4. Ёсць у прыродзе светлая часіна, калі цвіце і сад і лугавіна, калі ў пяшчотным аксаміце лес і квеценню чаруе шчодра бэз. *(Гр.)* 5. Сустракаюцца і разыходзяцца стрэлкі на цыферблаце і чэрцяць свой адвечны круг. (П. М.) 6. Мы з табою маўчым і на зоркі глядзім і на неба. *(А. К.)* 7. Жаўранак песню

ўпусціў і тая аб поле разбілася. *(Я. С.)* 8. Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор і гэты твор — мова. *(А. Р.)* 9. Як у люстэрка, глядзіцца ў прыроду чалавек і бярэ ад яе і душэўнасць і ласку і мудрасць. *(Скр.)*

**293.** *Знайдзіце ў сказах азначэнні. Растлумачце ўмовы іх аднароднасці або неаднароднасці.*

1. З чырванастволай гонкаю сасной вітаюся, як даўнішні знаёмы. *(Віт.)* 2. Калаўротак бурчыць сваю песню пасівелых, далёкіх нам дзён. *(Ген.)* 3. Для нас бор медны, неабсяжны шчытом надзейным быў і хатай. *(М. Т.)* 4. Празрыстыя асеннія лясы саромеюцца яркага ўбрання. *(Гр.)* 5. Днём Куранi былі ў будзённым, нехапаткім клопаце. *(І. М.)* 6. Я заўсёды баюся напышлівых, выцвілых слоў, што звіняць, як жабрацкая медзь у асенняй журбе. *(Вял.)* 7. Бярозавыя прысады выведуць нас на шырокую, высыпаную жвірам вясковую вуліцу. *(Кам.)* 8. Неба раз'яснялася і свяцілася ўночы незлічонымі халоднымі агнямі зорак. *(К-с)* 9. Моцны, басавіты гудок прагучаў над ракою, пакаціўся па асенніх зарэчных лугах… *(Кр.)* 10. На небе ляжалі пашматаныя воблакі, нізкія і высокія, пёрыстыя і дажджавыя. *(Шам.)*

**294.** *Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго сказы з аднароднымі і неаднароднымі азначэннямі, расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку. Абгрунтуйце сваю думку.*

Дол быў услані рудым лісцем, сухой рыжай папараццю, доўгаю пераблытанаю, як іржавы дрот, травою. З-пад гэтай перапрэлай за многія гады коўдры сям-там праглядваў бледны мох, крывыя сцяблінкі ягадніку. Вострымі зялёнымі шпількамі тырчала маладая травічка.

Дрэвы яшчэ не распусціліся, былі брудна-шэрыя і рэзка вырысоўваліся на фоне густой зеляніны маладога ельніку. Вербалоз толькі што распушыў свае каткі, над ім бзынкалі першыя смелыя чмялі. На арэшніку можна было заўважыць на пупышках далікатныя ружовенькія вусікі цвету. З пупышак на бярозе вось-вось гатовы былі паказацца маладыя лісточкі, але бяроза нешта марудзіла – мо чакала, пакуль пройдуць вясеннія такія непатрэбныя але немінучыя халады. Можа, гэтую асцярожнасць яна пераняла ў дуба, бо той усё ніяк не асмельваўся скінуць сваё старое пажоўклае ўбранне.

Дуб не спяшаўся, бо па небе яшчэ снавалі непрыветлівыя кудлатыя хмары. З іх на дол, ледзь чутна шапочучы, сыпаўся часам дробны, як крупы, сняжок. І тады яшчэ больш цягнула холадам ад сырых лагчын, ад зацененых густымі елкамі, яшчэ з астаткамі наздраватага лядку, упадзін, хоць на дварэ ўжо быў канец красавіка. *(Паводле У. Дамашэвіча)*

**295.** *Дапоўніце падкрэсленыя ў сказах спалучэнні азначэння і слова, да якога яно адносіцца, яшчэ адным азначэннем, каб азначэнні з'ўляліся а) неаднароднымі, б) аднароднымі.*

1. Светлая хмарка ціха і спакойна плыла ў небе і зараз жа хавалася ад людзей *за каменнымі дамамі.* 2. *Касматыя вяршыні* трэсліся, як у шалёным танцы. 3. Вясною, як зачынаў ажываць белы свет, выбілася з зямлі *тоненькая травінка.* 4. *Цёплая ноч* толькі што апранула зямлю і раскідала свае таемныя чары, поўныя крыху смутнага хараства. 5. *Белыя хмаркі* высцілалі месяцу дарожку сваімі празрыстымі тканямі і расступаліся перад ім. 6. Шуміць-шалясціць *неспакойны вецер*, калыша лісце на дрэвах. 7. *Залатая восень* тысячамі дарог ступала на зямлю і афарбоўвала яе далі і прасторы неба. *(Паводле Я. Коласа)*

**296.** *Разгледзьце алгарытм "Знакі прыпынку ў сказах з абагульняльным словам пры аднародных членах (АЧ)". Кіруйцеся ім пры пастаноўцы знакаў прыпынку ў прапанаваных сказах. Падкрэсліце абагульняльныя словы пры аднародных членах у адпаведнасці з тым, якімі членамі сказа яны з'ўляюцца.*




I. 1. Акадэмікі і хірургі, паэты і маршалы ўсе былі вучнямі, іх талент разбудзіў просты вясковы настаўнік. *(Грах.)* 2. Уменне карыстацца словам, культура мовы і нават пісьменнасць усё залежыць ад таго, як загучала для вас слова, пачутае ў маленстве. *(Віт.)* 3. І застылыя ў нерухомасці дрэвы, і люстэрка вады, зялёнай ад перакуленага ў яе сасонніку з падлескам, і халодна-сіняе неба ўсё гэта востра трывожыць Рамана Іванавіча цягне на роздум. *(Кудр.)* 4. Усё нас хвалюе гамонка вятроў, абрысы скалы таямнічай, і зоры, і мора ў агнях караблёў усё, што Радзімаю клічам. *(Бр.)*

II. 1. Як хочацца вярнуць усё назад і маладосць і салаўіны сад і закаханы позірк той дзяўчынкі якую міма ветрам пранясло і неба без адзінай аблачынкі і на ружовай завадзі вясло. *(Бур.)* 2. Па колеры неба руху і форме аблачынак па шолаху лісця ў лесе гомане птушак па асаблівасцях

азёрнай хвалі водары кветак які то слабее то мацнее па ўсіх гэтых шматлікіх народных прыметах Колас мог вызначыць, якое будзе заўтра надвор’е. *(Лыньк.)* 3. Ёй [Валі] чамусьці здавалася, што гукі музыкі былі каляровыя і жоўтыя, як лісце пад нагамі, і блакітныя, як неба над галавой, і зялёныя, як трава пад лісцем, і нават паласатыя, як матроская цяльняшка. *(Я. С.)* 4. І цемнаватая паласа лесу на тым беразе і лёгкія белыя аблачынкі над ёю і бледная зорачка каля іх што чамусьці яшчэ не згасла ў святле раніцы ўсё выразна і хораша адбівалася ў дзівоснай люстранай чысціні возера. *(Цв.)* 5. Я веру, што ўсё мае меру і рэчы і ночы і дні і толькі не мае памеру бясконцы сусвет дабрыні. *(Гр.)*

**297.** *Перабудуйце сказы, развіўшы апошні ў радзе аднародны член дададнай часткай ці адасобленым зваротам, і запішыце іх.*

У з о р: *Поплаў, узлесак, рэчка – усё схавалася ў тумане.* — *Поплаў, узлесак, рэчка, што цячэ побач з вёскай, -- усё схавалася ў тумане.* — *Поплаў, узлесак, рэчка, зусім абмялелая за лета, – усё схавалася ў тумане.*

1. Усё вакол: дамы, вуліцы, дрэвы – блішчала пасля дажджу. 2. Ля ракі, у полі, у лесе – усюды чуваць птушыныя галасы. 3. І мне, і сяброўцы, і бацькам, і нават бабулі – усім спадабалася новая тэлеперадача. 4. Ні сустрэча з сябрамі, ні песні ля начнога вогнішча, ні паход у горы – ні адно імгненне летняга адпачынку не сцерлася з памяці.

**298.** *Адзначце сказы, у якіх пунктуацыю трэба дапоўніць коскамі.*

1. Радугі стаяць у вербалозах між птушыных светлых галасоў. 2. Пакланюся я пушчам вячыстым і крыніцам і мурагу. 3. І ў сэрцы нясу я, нібы запавет, старыя рабіны і клін жураўліны, і свет наш адзіны. 4. У доме хлеб і ружы, святло акон і святло душы людской. 5. У вырай далёкі лятуць жураўлі ад любай утульнай бацькоўскай зямлі. 6. У кожнага свае лясы і ластаўкі, і песні і жаночы голас ласкавы. 7. Я вочы цёмныя бяздонныя так блізка ўбачыў першы раз. 8. Над соснамі, асінамі гуляюць па бары зялёныя і сінія залётныя вятры.

# Сказы з адасобленымі членамі

## Адасобленыя азначэнні

**299.** *Знайдзіце ў сказах дапасаваныя азначэнні і растлумачце іх адасабленне або неадасабленне.*

1. Справа, распачатая беларускім першадрукаром Францішкам Скарынам, знайшла свой працяг і развіццё толькі гадоў праз сорак-пяцьдзесят, калі з'явіліся Сымон Будны і Васіль Цяпінскі. *(А. М.)* 2. “Катэхізіс” Сымона Буднага – першая беларуская кніга, надрукаваная на тэрыторыі сучаснай Беларусі. *(З кнігі “Беларускі “экватар”)* 3. Падрыхтаваная як даступны падручнік для народа, “Граматыка” Мялеція Сматрыцкага “працавала” ажно 150 гадоў. *(У. А.)* 4. Размешчаная на беразе Палаты і цудоўна ўштукаваная ў ландшафт, Спасаўская царква і цяпер пакідае надзвычай моцнае ўражанне завершанасці і суладнасці. *(У. А.)* 5. Пазбаўлены права выдаваць свае творы, Дунін-Марцінкевіч нелегальна, на ўласны кошт і адказнасць адкрыў у Люцінцы школку для навакольных дзяцей. І няхай яна не стала слыннай, як школа ў Яснай Паляне, бо, выкрытая царскімі ўладамі па даносе, не існавала і года, сам факт яе ўтварэння ва ўмовах самадзяржаўя яскрава падкрэслівае грамадзянскасць пісьменніка. *(Ян.)* 6. “Слова пра паход Ігаравы” – помнік літаратуры Кіеўскай Русі XII ст. Прысвечаны апісанню няўдалага паходу ноўгарад-северскага князя Ігара на полаўцаў, ён закранае таксама і старонкі беларускай гісторыі. *(Жур.)*

**300.** *Карыстаючыся алгарытмам “Адасабленне дапасаваных азначэнняў”, расстаўце знакі прыпынку ў прапанаваных сказах. Сказы запішыце.*



**5. <u>Ці</u> <u>ўваходзіць</u> <u>азначэнне</u> <u>ў</u> <u>рад</u> <u>аднародных</u> <u>членаў</u>**

уваходзіць → (адасабляецца)

не ўваходзіць → (не адасабляецца)

І. 1. Спяваюць жаваранкі. Нябачныя яны трымцяць у засмужаным злёгку блакіце. *(Б.)* 2. Пакрытыя тоўстым пластам снегу галіны дрэў гнуліся да самай зямлі. *(К-с)* 3. У кожнага з нас усе запаветныя ўспаміны звязаны з маці простай шчырай вялікай. *(Віт.)* 4. Месячык-сход падобны на акрайчык хлеба ільсніўся амаль на мяжы неба і зямлі. *(Іп.)* 5. Цень перабег на поплаў праз дарогу і сцішаны ў зялёных хвалях знік. *(Х.)* 6. Сіняватая ад глею дарога ідзе паміж тарфянога балота і поля. *(К. Ч.)*

ІІ. 1. Цьмее край зямлі і ледзь трымціць тонкаю агністаю палоскай і наструненая ўся звініць вечаровым водгаласам вёска. *(Віт.)* 2. Асіннік прыроды гадзіннік. Сцяты жоўтай журботай ён лету падводзіць вынік сваёй трапяткой лістотай. *(Гр.)* 3. Ахоплены радасным узбуджэннем чалавек як бы думаў, што другой такой восені не было і не будзе. *(К. Ч.)* 4. Родная зялёная айчына! На цябе паўнюткую святла пазіраюць круглымі вачыма птушаняты з цёплага дупла. *(Панч.)* 5. Мы цяжка ходзім па зямлі нагружаныя, бы саставы… *(Я. С.)* 6. Узмакрэлы і босы бронзавы ад загару стомлены сенакосам ліпень прылёг памарыць. *(Пісьм.)*

**301.** *Выпішыце са сказаў недапасаваныя азначэнні разам з паяснёнымі словамі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры адасобленых недапасаваных азначэннях.*

1. З хаты выйшаў на ганак, пацягваючыся, хлопец з хмурнымі, заспанымі вачыма, з калматай не то русявай, не то цёмнай чупрынай, з упартымі губамі. 2. Акрамя пажоўклай ад даўнасці карткі, на якой Дамецік, малады і хвацкі, у калматай шапцы, цягнуўся побач з нейкім незнаёмым, было тут і некалькі Міканоравых здымкаў. 3. На суседнім двары завіхаўся пры калёсах барадаты, у палатнянай доўгай сарочцы дзядзька. 4. З выгляду гэта быў падлетак, худы, даўгарукі, з тонкай шыяй, а па хадзе, па прыгорбленай постаці – мужчына. 5. Галасок Хадоські быў нясмелы, кволы – здавалася, ён, лагодны, задуменна-журботны, з недарэчнай скаргай-крыўдай, вось-вось патоне ў выбуху рогату. 6. У важкім, як бы непадступным Васілёвым позірку спадылба, з-пад калматых, непаслухмяных пасмаў шорсткіх валасоў, ва ўсёй панурай постаці ў расхрыстанай зрэбнай сарочцы і зрэбных, у рудых плямах, штанах Шабета ўлавіў штосьці нядобрае, звераватае. *(Паводле І. Мележа)*

**302.** *Складзіце з кожным з прапанаваных спалучэнняў па два сказы, каб у адным выпадку недапасаваныя азначэнні адасабляліся, а ў другім – не адасабляліся.*

У з о р: *Дзяўчына ў белай сукенцы. – Мне назаўсёды запомнілася гэтая дзяўчынка ў белай сукенцы. – У белай сукенцы, з кветкамі, дзяўчына выглядала незвычайна.*

Лужыны з цёмнай вадой, дуб таўшчынёю ў два абхваты, мужчына без шапкі, хлопчык гадоў сямі, чалавек з сівымі скронямі.

**303.** *Запішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку. Падкрэсліце адасобленыя азначэнні і словы, да якіх яны адносяцца. Растлумачце пунктуацыю пры адасобленых азначэннях.*

Дняпро ў гэтым месцы быў просты як страла і як страла імчаўся паміж берагамі высокім і нізкім. А круча на тым беразе была самым дзіўным што калі-небудзь ён свавольна ўтвараў.

Даўжынёю з вярсту і вышынёю сажняў на пяцьдзесят роўная нібы па лінейцы праведзеная ў даўжыню і вышыню яна была з крывава-чырвонай гліны цвёрдай непрыступнай ні для нягоды ні для вады. І на гэтай строме карэннем угору там-сям віселі сосны з залацістымі ствaламі і свежай гліцай віселі паміж небам і зямлёй скарлючаныя перавітыя як вязка змей няскораныя ў сваім жаданні жыць там дзе не здолеў і не захацеў жыць ніхто. *(Паводле У. Караткевіча)*

**304.** *Прачытайце тэкст. Растлумачце адасабленне або неадасабленне падкрэсленых азначэнняў. Перабудуйце сказы так, каб неадасобленыя азначэнні сталі адасобленымі і наадварот. Запішыце тэкст, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку.*

Паўднёвы бераг затокі пакрыты вечна жывым сасновым шумам.

Хораша тут, калі бывае час палюбавацца!

Густа высяцца гонкія сосны. Добра ўзняць галаву, загле́дзецца на іх шэра-зялёныя, са стальным адлівам, кучаравыя верхавіны на фоне цёплага блакіту і галубіных воблакаў. Сосны гамоняць. Возера сёння маўчыць. Каля нізкага берага, чыста пясчанага ці пабрыджанага рэдзенькай травой, ледзь чутна, раскошліва пахлёбвае хваля. Чайкі гуляюць над люстранай вадой, пікіруючы на спажыву, або садзяцца на вільготны, вылізаны прылівам пясок, толькі імі затупаны, пацярушаны іхнімі пёрцамі. Тут жа, выштурханая на бераг мноствам бурных прыбояў, парахнее, петрае на сонцы разбітая лодка. Па рыбацкім звычаі лодкі пакідаюцца назаўсёды там, дзе іх засцігне апошняя бяда.

Далей на поўдзень – абрывісты бераг, высокі, амаль з марскою галькаю ўнізе, з мыльным намывам пены. Вада дні і ночы гадамі падточвае жоўтыя пласты пяску, які абсоўваецца, здрадліва агольваючы карэнне самых смелых соснаў, што выйшлі на край абрыву. Яны – вялікія і меншыя – адчайна чапляюцца за абрыў, а потым усё ж такі падаюць…

*(Паводле Я. Брыля)*

**305.** *Дапоўніце сказы, развіўшы выдзеленае слова адасобленым азначэннем. Сказы запішыце, расстаўляючы знакі прыпынку.*

1. *Дарога* ўвесь час ішла лесам. *(К-с)* 2. *Пасля дажджоў* прырэчнае балота шырока разлілося. *(В. Б.)* 3. Хмары хутка ахіналі неба, і *яно* рабілася цямнейшым і цямнейшым. *(Лыньк.)* 4. Сонца зайшло, але над горадам яшчэ не патухлі яго *водбліскі*. *(К. Ч.)* 5. Яшчэ не сцямнела, як *на зямлю* стаў падаць мокры сняжок. *(В. Б.)* 6. *Зоры* падалі густа і часта, бы ўсё роўна сыпаўся *дождж*. *(Бяд.)*

**306.** *Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Падкрэсліце адасобленыя азначэнні і параўнайце іх выражэнне ў рускай і беларускай мовах. Паназірайце, ці супадаюць умовы адасаблення азначэнняў у абедзвюх мовах.*

Смеркалось, когда все разъехались, и Лисань погрузилась в мёртвую тишину. Волошка распахнул настежь ворота пуни, завалился на сено. Душистое, хотя и прошлогоднее, оно, словно свежая сорочка, приняло на себя усталость ног, рук, всего тела.

Через открытые ворота долетел близкий шумок ветра в кроне клёна, вознёсшегося над пуней. Над посиневшим лесом, в сумеречном небе Волошка разглядел звезду — первую, раннюю. Вспомнилась ночь последнего года войны: заснеженный переулок, старая хата, мать под окном — в ватнике, без платка. Тихо стоит, сложив руки на груди, подняв к небу глаза, смотрит на самую яркую звезду и шепчет молитву, обращённую к богу и к отцу, который на фронте, через звезду разговаривает с ним. Тогда ему, молодому и неразумному, хотелось посмеяться над матерью. Теперь же не смеялся. Теперь он по себе знал: через звезду в небе можно обозреть всю землю, общаться со всем миром, понять всех людей. *(По В. Карамазову)*

## Адасобленыя прыдаткі

**307.** *Назавіце прыдаткі і словы, да якіх яны адносяцца. Звярніце ўвагу на марфалагічнае выражэнне прыдаткаў і паяснёных слоў (агульны або ўласны назоўнік, займеннік). Пры неабходнасці выкарыстайце алгарытм "Размежаванне прыдатка і паяснёнага слова".*

**I. Агульны назоўнік + агульны назоўнік**

а) прыдатак = відавая назва; *музыка-гарманіст*

б) прыдатак = назоўнік з якасным значэннем; *хлапчук-гарэза (= гарэзлівы хлапчук)*

**II. Уласны назоўнік + агульны назоўнік**

асабовы (паяснёнае слова) *сяброўка Іна*

неасабовы → **Дзе ён знаходзіцца ў адносінах да агульнага назоўніка?**

перад агульным назоўнікам (паяснёнае слова) *Дзвіна-рака*

пасля агульнага назоўніка (прыдатак) *рака Дзвіна*

Але: *прыгажуня Дзвіна = прыгожая Дзвіна*

1. Зорка Венера ўзышла над зямлёю…*(Багд.)* 2. Верш “Слуцкія ткачыхі” Максім Багдановіч напісаў у 1912 годзе. *(Бяд.)* 3. Кіламетраў за трыццаць пяць на поўдзень ад Мазыра раскінулася па-над ракой невялічкае мястэчка Нароўля. *(Кр.)* 4. Тут, пад стогадовымі соснамі, пад волатамі-дубамі, было зусім зацішна. *(Кр.)* 5. Высокія хвоі над быстрай ракою гутораць з сястрою – пявучай сасною. *(Кір.)* 6. Вакол плошчы Перамогі – жывы калідор. *(Я. С.)* 7. “Го, падмарожваць пачало!” – весела прамовіў паляшук Сцяпан Рылка. *(К-с)* 8. І плыве, плыве імклівы, светлы Нёман-чарадзей. *(Я. П.)* 9. З барабанам-звонам ходзіць ён [мароз] шляхамі, барадой калючай шчыплецца да слёз. *(Бр.)*

**308.** *Прачытайце сказы, знайдзіце ў іх прыдаткі і растлумачце, чаму ў адных выпадках яны адасабляюцца, а ў іншых – не. Звярніце ўвагу на тое, якім знакам прыпынку паказваецца адасабленне.*

1. На працягу многіх стагоддзяў Нясвіжам валодалі магнаты Радзівілы. 2. Галоўным архітэктарам Нясвіжскага дварцова (замкавага) комплекс.. быў італьянец Ян Марыя Бернандоні. Гэта ён, маўклівы манах з невялікага горада Кома, прынёс магутныя ідэі (А, а)драджэння на землі славян. 3. На Нясвіжчыне з даўніх часоў існуе л..генда пра тое, што сюды прыяз..жаў знакаміты мастак Рэмбран..т. 4. Найвялікшая колькасць паданняў складзена пра авантурыста і дзівака Караля Станіслава, па мянушцы пане Каханку. 5. Расказваючы пра жыццё ў Нясвіжы У. Сыракомлі, экскурсаводы абавязкова ўспамінаюць той факт, што ён

з'яўляецца аўтарам слоў песні "Когда я на почте служил ямщиком". 6. У сярэдзіне XVI стагоддзя ўладаром горада быў Мікалай Радзівіл, па мянушцы Чорны. Каб выйсці з-пад улады польскай кароны і стаць незалежным каралём у княстве (Л, л)ітоўскім, Радзівіл выкарыстаў новую плынь у рэлігіі — пратэстантызм. 7. Нясвіжскі парк пасадзіла Марыя дэ Кастэлян, княгіня Радзівіл. Аб гэтым паведамляе невялікі камень-помнік у Азярыне, альбо Старым парку. 8. Героя паэмы "Сымон-музыка" — таленавітага скрыпача-самавучку — Я. Колас знайшоў менавіта на Нясвіжчыне. *(Паводле К. Шышыгінай)*

● *Раскрыйце дужкі і ўстаўце прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс слоў.*

**309.** *Запішыце сказы, падкрэсліце ў іх прыдаткі. Пры неабходнасці выдзеліце прыдаткі пунктуацыйна.*

I. 1. Вялікі доктар усялякай хворасці ў чалавечай душы час мае вечнага свайго дапаможніка працу. *(К. Ч.)* 2. Генеалогія або радавод – сістэматычны збор звестак аб паходжанні, наступстве і сваяцтве ў сваёй радзіне. *(І. З.)* 3. У рухавым клопаце была толькі адна Волечка маладая гаспадыня гэтай хаты. *(К. Ч.)* 4. Яна Белавежа ў кожнага пакідае след, свой, адметны, непаўторны. *(Парх.)* 5. На зліцці дзвюх баравых рэчак Вусы і Лошы паміж векавечных курганаў і лясоў пачынаецца Нёман. *(Прых.)* 6. У мястэчку Панямонь многа розных выдатных будынкаў і ўстаноў. *(К-с)* 7. У кожнага з нас ёсць такі шчымлівы куток наша Учора. *(Я. С.)* 8. У высокім чыстым блакіце плылі беласнежныя воблакі развед-чыкі ранняй вясны. *(Кух.)*

II. 1. Цяжка смуткуючы па роднай Беларусі, Адам Міцкевіч піша ў Парыжы апошні свой вялікі твор паэму "Пан Тадэвуш", які быў развітальнай песняй дарагой Навагрудчыне. *(С. А.)* 2. Будучая святая Ефрасіння Полацкая нарадзілася ў сям'і князя Святаслава-Георгія малодшага сына Усяслава Чарадзея. *(У. А.)* 3. У 40-ых гадах XIX ст. дырэктарам Італьянскай Оперы ў Парыжы аднаго са славутых тагачасных еўрапейскіх тэатраў быў беларускі шляхціц з далёкага ад Францыі палескага маёнтка Варацэвічы Напалеон Орда. *(Тр.)* 4. Восіп Казлоўскі беларускі шляхціц з маленькага гарадка Прапойска (Слаўгарада) на Магілёўшчыне напісаў больш за 70 паланезаў, сярод якіх патрыятычны паланез на словы Г. Дзяржавіна "Гром перамогі, раздавайся", а створаны ім цыкл "Расійскіх песень" паклаў пачатак развіццю папулярнага музычнага жанра рускага раманса. *(Тр.)* 5. Майстар-ювелір Лазар Богша зрабіў для Ефрасінні свой слынны крыж неацэнны твор стара-жытнабеларускага ўжытковага мастацтва. *(У. А.)* 6. Да дзеячаў культурна-асветнага руху першага беларускага Адраджэння належалі выдатны паэт

Мікола Гусоўскі, рэфарматары Васіль Цяпінскі і Сымон Будны, урэшце, паэт і грамадскі дзеяч Сімяон Полацкі. *(Кон.)*

**310.** *З прапанаваных сказаў выберыце спачатку тыя, у якіх працяжнік трэба паставіць паміж дзейнікам і выказнікам, а потым — тыя, у якіх працяжнікам трэба паказаць адасабленне прыдаткаў. Абгрунтуйце свой выбар. Сказы з прыдаткамі запішыце, прыдаткі падкрэсліце.*

1. Палын і чарнобыль браты з даўніны… Яны пагарэльцы і сведкі вайны па свеце вандруюць спрадвеку. *(Бар.)* 2. Вось і май падышоў неўпрыкметкі, зноў рассыпаны ля берагоў адуванчыкі рыжыя кветкі, залатыя вяснушкі лугоў. *(Панч.)* 3. Пароль неўміручасці родная мова. *(П. М.)* 4. Зноў верасень запаслівы грыбнік шчыруе па імшыстых баравінах. *(Гр.)* 5. Праходзілі вякі, адыходзілі ў нябыт пакаленні, знікалі і развальваліся магутныя імперыі, а кніга вялікі цуд, створаны чалавечым розумам, жыла, хвалявала сэрца, абуджала думку, клікала да сацыяльных перамен. *(С. А.)* 6. Якая гэта ні з чым не параўнаная краса душы чалавечая сціпласць. *(Скр.)* 7. Дзе-нідзе высяцца і імшэюць у спрадвечным сне волаты-камяні сляды дагістарычных фінскіх ледавікоў. *(Скр.)* 8. Магутная сасна, якая апляла каранямі дол, а вяршыняй кранае зоры, паэтычны вобраз, сімвал Бацькаўшчыны. *(Гіл.)*

**311.** *Перабудуйце сказы, у якіх працяжнік ставіцца паміж дзейнікам і выказнікам, у сказы з адасобленымі прыдаткамі. Атрыманыя сказы запішыце, расстаўляючы знакі прыпынку.*

1. Гасцінцы – бойкія гандлёвыя тракты, вядомыя з часоў Полацкага княства. 2. Валатоўкі – невысокія валападобныя земляныя насыпы, што лічацца пахавальнымі помнікамі крывічоў. 3. Вадохрышча – зімовае свята народнага календара, якім завяршаюцца Каляды. 4. Кірмаш – святочна абстаўлены расшыраны рынак, што адбываўся перыядычна ў пэўнай мясцовасці. 5. Талака – народны звычай узаемадапамогі, калектыўная добраахвотная праца “за пачастунак”, распаўсюджаная ў беларусаў і іншых славянскіх народаў. 6. Прошча – месца (крыніца, возера, камень і інш.), надзеленае, паводле ўяўленняў вернікаў, надзвычайнымі прыроднымі сіламі і ўласцівасцямі. *(Паводле энцыклапедычнага даведніка “Народная культура Беларусі”)*

**312.** *Знайдзіце ў тэксце сказы, у якіх ужываюцца прыдаткі. Запішыце, расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку, тыя са сказаў, у якіх прыдаткі павінны адасабляцца. Прыдаткі падкрэсліце. Растлумачце ўмовы іх адасаблення.*

Беларусы карысталіся і карыстаюцца двума алфавітамі кірыліцай і лацінкай. Акрамя таго, беларускія татары, што жывуць на гэтай зямлі ўжо шэсцьсот гадоў, свае кнігі пісалі па-беларуску арабскімі літарамі.

Асабліва вялікі ўклад зрабілі беларусы ў развіццё кірыліцы. Гэтую азбуку, створаную ў 863 годзе хрысціянскімі прапаведнікамі Кірылам і Мяфодам для тагачаснай мовы паўднёвых славян, удасканалілі і спрасцілі беларускія перапісчыкі. Яны адкінулі лішнія і стварылі новыя літары, якіх не было ў пачатковай кірыліцы ***э, й***, а таксама адмысловую літару *г* (*ганак, мазгі*).

Францішак Скарына стварыў прыгожы друкарскі шрыфт, а канчаткова наблізіў формы літар да сучасных Ілья Капіевіч выпускнік Слуцкай гімназіі  кнігавыдавец і перакладчык. У 1700 годзе ў Амстэрдаме ён заснаваў друкарню і стварыў акругленыя, падобныя да лацінскіх, літары кірыліцы для тытульных аркушаў кніг. Шрыфты Капіевіча ўпадабаў цар Пётр I, які тады быў у Нідэрландах, і замовіў майстру літары для кніг.

Новы шрыфт на аснове Капіевічавых літар Пётр I зацвердзіў у 1708 годзе. Так адбылася рэформа азбукі – увядзенне грамадзянскіх, г. зн. нецаркоўных літар. Новыя літары яшчэ доўга звалі “амстердамские литеры” ці “белорусская азбука”. Менавіта гэтымі літарамі цяпер карыстаюцца беларусы, расейцы, украінцы, македонцы, балгары, сербы і іншыя народы. *(Паводле В. Вячоркі)*

● *Пра якую “адмысловую літару г” успамінаецца ў тэксце? У чым асаблівасць вымаўлення слоў* ***мазгі, ганак****? Якімі іншымі словамі можна працягнуць гэты рад?*

**313.** *Прачытайце тэкст. Выдзеленыя канструкцыі перабудуйце ў адасобленыя прыдаткі. Растлумачце ўмовы іх адасаблення. Атрыманы тэкст запішыце, падкрэсліўшы прыдаткі.*

У з о р: *Вучоны, дыпламат, падарожнік Іосіф Антонавіч Гашкевіч – наш зямляк... — Іосіф Антонавіч Гашкевіч, вучоны, дыпламат, падарожнік, – наш зямляк...*

*Вучоны, дыпламат, падарожнік* Іосіф Антонавіч Гашкевіч – наш зямляк, аднак сваё імя і сваю Айчыну яму наканавана было праславіць на процілеглым баку планеты. За залішнюю навуковую дапытлівасць у перакладзе Бібліі ўлады выправілі яго ў своеасаблівую ссылку ў Кітай. Дзевяць гадоў працы ў Кітаі ўзбагацілі навуку шэрагам даследаванняў аб прыродзе і гісторыі гэтай краіны, мове і побыце яе народа. А ў 1852 г. Гашкевіч, *які выдатна ведаў некалькі замежных моў*, выехаў у Японію і больш за тры гады працаваў перакладчыкам рускай місіі. Пра гэта падарожжа расказаў у «Фрэгаце “Палада”» пісьменнік І. Ганчароў. *Ён таксама быў яго ўдзельнікам.* У 1858 г. Гашкевіч зноў едзе ў Японію.

*Будучы першым расійскім консулам у гэтай краіне*, ён не абмяжоўваўся толькі абавязкамі дыпламата, а займаўся ўсебаковым вывучэннем Японіі, склаў японска-рускі слоўнік, сабраў унікальныя прыродазнаўчыя калекцыі. *(З календара "Родны край")*

**314.** *Прачытайце тэкст. Што ведаеце вы пра славутых асоб, названых у ім? Дапоўніце тэкст такім чынам, каб уласныя назоўнікі выступалі або ў ролі прыдатка, або ў ролі паяснёнага слова да прыдатка. Запішыце атрыманыя тэксты, расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку. Прыдаткі падкрэсліце.*

У з о р: *Францыск Скарына і Кастусь Каліноўскі – дзве славутыя постаці, і гэтага ўжо, здаецца, дастаткова… — Першадрукар Францыск Скарына і кіраўнік паўстання 1863 года Кастусь Каліноўскі – дзве славутыя постаці, і гэтага ўжо, здаецца, дастаткова… — Францыск Скарына, першадрукар і асветнік, і Кастусь Каліноўскі, кіраўнік паўстання 1863 года, – дзве славутыя постаці, і гэтага ўжо, здаецца, дастаткова…*

I. Францыск Скарына і Кастусь Каліноўскі – дзве славутыя постаці, і гэтага ўжо, здаецца, дастаткова, каб беларускаму народу адчуць, зразумець, усвядоміць, спасцігнуць сябе народам.

А былі ж яшчэ Кірыла Тураўскі і Ефрасіння Полацкая, Сымон Будны і Пётра Мсціславец, Васіль Вашчыла і Васіль Цяпінскі, Францішак Багушэвіч і Янка Купала, Максім Багдановіч і Якуб Колас… *(Паводле Я. Сіпакова)*

II. Сярод дзяржаўных, палітычных, грамадскіх, ваенных дзеячаў, дзеячаў навукі і культуры нямала такіх, якія нарадзіліся ў Беларусі, але праявілі свой талент, здольнасці за мяжой. Можна ўзгадаць імёны Казіміра Семяновіча, Ігната Дамейкі, Германа Мінкоўскага, Яна Чэрскага, Мікалая Судзілоўскага і інш. На радзіме многія з іх да нядаўняга часу былі невядомыя. *(Паводле "Беларускага календара")*

**315.** *Складзіце сказы з прапанаванымі словамі і словазлучэннямі, каб у адных выпадках яны выступалі ў ролі прыдатка, а ў іншых – у ролі паяснёнага слова.*

У з о р: *Мяне павіншавала Валя – мая сястра. Хачу пазнаёміць цябе са сваёй сястрой – студэнткай педуніверсітэта.*

Незнаёмка, аднакласнікі, горад, велікан, Нёман, Белавежская пушча, Новы год.

# Адасобленыя акалічнасці і дапаўненні

**316.** *Прачытайце сказы і растлумачце, чаму падкрэсленыя акалічнасці адасабляюцца або не адасабляюцца.*

1. Там, за рэчкаю, увечар танула ў зелені сяло. *(Тр.)* 2. Курлыкаючы, раздумна ўзмахваючы крыламі, у далёкую дарогу плывуць жураві. *(Скр.)* 3. Дзядуля хвілінкі-часінкі не мог пасядзець рукі склаўшы ці пастаяць рукавы звесіўшы. *(Янк.)* 4. На Палессі, на самым поўдні Беларусі, ёсць куточак зямлі, асабліва мілы, дарагі майму сэрцу. *(Сач.)* 5. Сонца, зрабіўшы свой штодзённы кругабег, апусцілася зусім нізка і, стаміўшыся, пачало хіліцца на захад. *(Сач.)* 6. На другім краі поля, за рэчкай, ледзьве-ледзьве вызначалася купка дрэў. *(Р. Н.)* 7. Сядзяць грыбы, як капыты, і, разгарнуўшы парасоны, глядзяць, бы нейкія персоны. *(К-с)* 8. Жоўтыя пухаўныя каткі звісалі на вербалозінах, купаючыся на сонцы і склікаючы пчолак і чмелікаў. *(К-с)* 9. Нягледзячы на недалёкую восень, лес жыў тым актыўным, багатым жыццём, якое заўсёды бывае ў канцы лета. *(Сач.)*

**317.** *Запішыце сказы. Акалічнасці, якія адпавядаюць умовам адасаблення, выдзеліце коскамі і падкрэсліце. Растлумачце, чаму яны адасабляюцца. Знайдзіце выпадкі, калі адасабленне акалічнасцей не з'яўляецца абавязковым. Чаму?*

I. 1. Вось як цяпер перада мною ўстае куточак той прыгожа, крынічкі вузенькае ложа і елка ў пары з хваіною абняўшысь цесна над вадою, як маладыя ў час кахання. *(К-с)* 2. На прыгуменні поруч з садам павець з гумном стаяла радам. *(К-с)* 3. А ты, каханенькая, родненькая, не слухай вушы развесіўшы, а лепей гасцей глядзі. *(Куп.)* 4. Мароз – штукар і жарты любіць, не раз штукуючы загубіць таго, хто ў рукі пападзецца. *(К-с)* 5. Сярпок скрыгоча прагавіта жытцо згрызаючы сярдзіта. *(К-с)* 6. Угары высока над дамамі пазалачонымі крыжамі блішчалі цэрквы і касцёлы. *(К-с)* 7. Хлопчык сядзеў згорбіўшыся і нават не глядзеў у наш бок. *(Янк.)* 8. Па камянях, бы тая змейка, вілася шумная Вілейка і закруціўшыся дугою знікала зараз за гарою. *(К-с)*

II. Вёска была досыць вялікая, цягнулася ў адну лінію, і толькі каля цэркаўкі на ўзгорку хаты гуртаваліся гусцей і шырэй. Злева пры канцы вёскі стаяў дом валаснога праўлення з двума высокімі чырвонымі комінамі над пачарнелым дахам. Насупраць на другі бок вуліцы выглядала школа з белымі аканіцамі і двума ці трыма развіслымі вязамі каля яе. Пры дарозе ў вёску крыху наводшыбе маркотна тулілася старэнькая драўляная цэркаўка. Цяпер яна стаяла адзінокая, закінутая, забытая. Па адзін і па другі бок вёскі стаялі ветракі, як страшыдлы шырока раскінуўшы свае крылы. *(Паводле Я. Коласа)*

**318.** *Складзіце сказы з наступнымі фразеалагізмамі, выкарыстаўшы іх у якасці акалічнасцей. Сказы запішыце і расстаўце ў іх знакі прыпынку. Патлумачце значэнне фразеалагізмаў.*

Паклаўшы руку на сэрца; не пакладаючы рук; як аршын праглынуўшы; як вады ў рот набраўшы; як пшаніцу прадаўшы.

**319.** *Выпішыце з тэксту сказы з акалічнасцямі, якія павінны адасабляцца. Расстаўце патрэбныя знакі прыпынку.*

Леў Сапега – зорка першай велічыні на небасхіле палітычнай гісторыі Беларусі. Ён нарадзіўся ў маёнтку Астроўна на Віцебшчыне ў шляхецкай сям'і, атрымаў бліскучую адукацыю скончыўшы Нясвіжскую пратэстанцкую школу і Лейпцыгскі універсітэт свабодна валодаў пяццю мовамі.

Першарадная заслуга Льва Сапегі ў тым, што ён падрыхтаваў і дамогся зацвярджэння Статута 1588 года, які гарантаваў эканамічную, палітычную і культурную незалежнасць Вялікага княства ад суседніх Польшчы і Масковіі. Дзякуючы ягонай асабістай мужнасці і палітычнаму таленту беларускае гаспадарства прыкметна пашырыла свае межы вярнуўшы назад нашы старадаўнія землі.

Пра незвычайнасць асобы Льва Сапегі, яго глыбокі патрыятызм сведчыць той факт, што ў часе вайны Вялікага княства са Швецыяй у 1625 – 1629 гадах ён ахвяраваў амаль усю сваю маёмасць на ўтрыманне войска зрабіўшы ўсё магчымае дзеля выратавання Бацькаўшчыны.

Дзякуючы чыннасці Льва Сапегі нашае старадаўняе гаспадарства не толькі здолела захаваць сваю незалежнасць у складаны гістарычны момант, але і перажыло новы перыяд эканамічнага і культурнага росквіту. *(Паводле І. Саверчанкі)*

**320.** *Перабудуйце тэкст такім чынам, каб выдзеленыя канструкцыі сталі адасобленымі акалічнасцямі, выражанымі дзеепрыслоўнымі зваротамі.*

Дарога павярнула ўлева, пайшла грудамі, *шчыльней тулілася да Нёмана*, дзе ён апісваў вельмі зграбную луку *на падыходзе да лесу*. Уся гэта лука выглядала пышным старасвецкім садам, дзе замест пладовых дрэў раслі разложыстыя, дуплястыя, з асмаленымі жараламі дубы.

Нёман *не даходзіў да лукі – выгінаўся каля лесу прыгожаю дугою*, забіраў управа і *пралягаў роўнаю, бліскучаю стужкаю паміж лугамі і полем*. На адным канцы дугі стаялі кучаравыя пышныя хвоі. *Яны звешвалі над вадою махрыстыя галіны і апляталі пясчаны бераг цэлаю сеткаю смаляных каранёў*. За імі пачыналіся маладыя сакавітыя баравіны, перамешаныя са старым лесам. Там-сям з зялёнага мора маладога хвойніку высока ўзнімаліся парасоны-верхавіны хвой-старадрэвін, што як бы

аглядалі зялёныя прасторы свае маладое змены і *цешыліся яе размахам і сакавітай жыццёвасцю.* І гэты малады хвойнік, і гэты лес, і гэтыя хвоі зліваліся ў адну сцяну лесу, *вырысоўвалі прыгожую лінію паваротаў, разгортвалі сваё цёмна-зялёнае крыло і ахоплівалі пясчанае поле, дзе раскінуліся маўклівыя пагоркі.* А над усім над гэтым ляжала цішыня і спакой раніцы. *(Паводле Я. Коласа)*

**321.** *Дапоўніце сказы такім чынам, каб у кожным з іх была акалічнасць з удакладняльным значэннем. Атрыманыя сказы запішыце, расстаўляючы знакі прыпынку.*

1. Тут было зусім зацішна. 2. Дзесьці за ракой пачулася песня. 3. Горад Полацк узнік у далёкай старажытнасці. 4. Першыя вершы Янкі Купалы былі надрукаваны ў пачатку XX стагоддзя. 5. Калі-небудзь нашы нашчадкі напішуць цудоўныя кнігі пра жыццё і справы сваіх дзядоў і прадзедаў. 6. Зусім хутка пачнецца маё студэнцкае жыццё.

**322.** *Складзіце сказы з адасобленымі дапаўненнямі, выкарыстоўваючы прапанаваныя пары слоў і прыназоўнікі са значэннем выключэння, уключэння або замяшчэння.*

У з о р: *дрэва – дуб: Усе дрэвы, акрамя дуба, ужо даўно лісце скінулі.*

Свята – Вялікдзень; сям’я – я; птушка – бусел; прадмет – фізіка; брат – сястра.

**323.** *Назавіце ў сказах канструкцыі, якія павінны адасабляцца. Растлумачце, чаму адбываецца адасабленне. Расставіўшы прапанаваныя сказы ў пэўным парадку, утварыце з іх звязны тэкст, запішыце яго, расстаўляючы знакі прыпынку. Адасобленыя члены сказа падкрэсліце.*

1. У летні сезон 1892 года Ілья Рэпін напісаў у Здраўнёве партрэт старэйшай дачкі Веры вядомы пад назвай “Восеньскі букет” оду ранняй восені і паўнакроўнай жаноцкасці. 2. Некалькі плённых сезонаў у 1890-я гг. правёў у сядзібе Здраўнёва за пятнаццаць вёрст ад Віцебска Ілья Рэпін. 3. У тым жа годзе Ілья Рэпін напісаў напоўненага нацыянальным каларытам “Беларуса”. 4. Амаль дзесяцігоддзе прабыў тут мастак пераважна ў летні час спалучаючы творчую дзейнасць з клопатамі па добраўпарадкаванні сядзібы перабудовай дома па ўласных чарцяжах. 5. Паводле адной з версій мастаку пазіраваў Сідар Шаўроў сялянскі хлопец з вёскі Сахарава што непадалёк ад Здраўнёва. 6. Тым летам мастак завяршыў працу над партрэтам другой сваёй дачкі Надзі “Паляўнічы”.

**324.** *Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Падкрэсліце адасобленыя акалічнасці і параўнайце іх выражэнне ў рускай і беларускай мовах.*

Олень выбрался на солнечную поляну, нехотя тронул зубами осину, постоял около молодой берёзы и, наливаясь злостью, поддел её рогом. Потом ударил ещё раз, ещё. Сухой треск раскатился по пуще. Олень замер, прислушался и, убедившись, что никто его не видит, принялся пилить рогом её белый ствол. Пилил поначалу неспешно, исподволь увлекаясь новым занятием, всей тяжестью наваливался на дерево, будто силился выворотить его. Умаявшись, успокаивался, отдыхал, затем снова принимался воевать с берёзой. И вот рог отвалился. Олень зажмурился, пьяно закачался, уронил как-то набок голову, неуклюжую и смешную с одним рогом, грустно смотрел на отломанный рог, как на нечто чужое, с любопытством водил по нему тёплой мордой. Подивившись, снова медленно поднял голову, уставился на берёзу. Вытянув шею, припал к ней мордой и долго так стоял, не отрываясь. Лишь слышно было, как вздрагивали ноздри, как он причмокивал – пил берёзовый сок. Наконец оторвался от берёзы, завалил голову набок под тяжестью правого рога, без всякой охоты рыкнул и подался вслед за своим негромким усталым голосом.

Он долго плутал по зарослям, пока наконец и второй рог не сбросил. А сбросил – даже не взглянул на него: устало закрыл глаза и стоял неподвижно, как будто спал стоя, – правый рог дался ещё труднее, чем левый. *(По В. Карамазову)*

## Сказы з параўнальнымі зваротамі

**325.** *Прачытайце сказы. Растлумачце, чаму ў адных выпадках коска перад* ***як*** *стаіць, а ў іншых – адсутнічае.*

1. У краінах сярэдневяковай Еўропы Віцебск ведалі як буйны порт. *(Тр.)* 2. Няма на Беларусі іншага горада, які даў бы Радзіме столькі знакамітых людзей, як Полацк. *(У. А.)* 3. Францішак Багушэвіч цярпліва, як добры сейбіт, даносіў да сваіх чытачоў гістарычныя веды, знаёміў іх з гісторыяй Беларусі. *(“Зв.”)* 4. Аляксандр Твардоўскі ў адным з лістоў звяртаўся да Васіля Быкава са словамі: “Дарагі пісьменнік і чалавек”, а ў другім зазначаў: “З вялікай цікавасцю чакаю любой Вашай старонкі не толькі як рэдактар, але і як чытач”. *(Буг.)* 5. Барадулін як чалавек і паэт невычэрпны. Бо ён арганічна таленавіты. І яшчэ зменлівы. Зменлівы, як кожная жывая істота, як талент, які бярэ ад жыцця на шматпакутнай святой зямлі пад сонцам любае Бацькаўшчыны. *(В. Б.)* 6. Мінулае родных мясцін і сённяшнія праблемы Янка Брыль ведае добра, як сваю біяграфію. *(У. К.)* 7. Амаль кожны верш Янкі Купалы як споведзь, як дзённік, па якім можна

ўзнавіць увесь шлях паэта. *(Юр.)* 8. І сваім першым па-беларуску напісаным вершам, і першым вершам друкаваным Наталля Арсеннева пачынала свой шлях як паэтка восені, вобраз восені ад самых гэтых пачаткаў стаўся для яе найбліжэйшым. *(Ад.)*

**326.** *Запішыце сказы, расстаўце неабходныя знакі прыпынку і растлумачце іх. Падкрэсліце, якімі членамі сказа з'яўляюцца параўнальныя звароты.*

I. 1. Па-над белым пухам вішняў быццам сіні aгaнёк б'ецца ўецца шпаркі лёгкі сінякрылы матылёк. *(Багд.)* 2. Быццам чырванагрудыя зяблікі увесь наш сад абсыпалі яблыкі. *(М. Т.)* 3. Пясок пад нагамі як порах. *(П. М.)* 4. Вясновы першы гром скаціўся як з гары. *(У. Н.)* 5. На дварэ было ўжо не так хмурна як раніцай. *(І. М.)* 6. Свет людзей не заўсёды ўсведамляў сябе як чалавецтва. *(А. А.)* 7. На гарызонце віднеецца не што іншае як горы. *(Т. Х.)* 8. Ён, сад, не такі як дваццаць гадоў назад. Ён як і я здаецца пастарэлым. *(Бур.)* 9. Родная зямелька як зморанаму пасцелька. *(Пр.)* 10. Турбот было як і звычайна шмат. *(Т. Х.)* 11. Праўда чыстая як дзіцячыя вочы. *(Гіл.)*

II. 1. Сэрца хвалююць як у дзяцінстве рысы адметныя роднага краю. Стала над хатай таполя ў manістах стройная быццам нявеста якая. *(М. К.)* 2. Ад шчасця сэрца скача як дзіця, ад бед яно як млын шуміць начамі, варочае цяжкімі камянямі падлічваючы горычы жыцця. *(А. К.)* 3. Пасля хваробы доўгай і цяжкой сябе я адчуваю як на фронце – не ў медсанбаце не ў трафейнай роце а пехацінцам на перадавой. *(А. К.)* 4. Уся зямля нібы прылазнік вясны і цёплай цішыні. А першы шпак як домаўласнік глядзіць скептычна з вышыні… *(Панч.)* 5. Смак моды як смак мёду, а можа нават яшчэ саладзейшы. *(П. М.)* 6. Па-над гладышыкамі лотаці, над жоўтым кветкавым кастром – стракозы быццам верталёцікі: ім кожны ліст – аэрадром. *(Панч.)* 7. І тым заўсёды ганаруся, што ў шчаслівую пару я нарадзіўся ў Беларусі і так як маці гавару. *(Грах.)* 8. Тут хлеба акраец як мёд. Падушка як пух лебядзіны. *(Ген.)* 9. Адвечны час з нябачных нам дарог глядзіць на нас нібы на муравейнік: вось-вось, здаецца, возьме ў рукі венік і вымеце як смецце за парог. *(А. К.)* 10. Радзіма мая як купальская кветка. *(К. Б.)*

**327.** *У прапанаваным тэксце Уладзіміра Караткевіча знайдзіце выпадкі, калі аўтарская пастаноўка знакаў прыпынку супярэчыць пунктуацыйнай норме, правілу. Абгрунтуйце сваю думку.*

Дзе мой край? Там, дзе людзі ніколі не будуць рабамі,
Што за паліўку носяць ярмо ў безнадзейнай турме.
Дзе асілкі-хлапцы маладымі ўзрастаюць дубамі,
А мужчыны, як скалы, – ударыш, і зломіцца меч.

Дзе мой край? Там, дзе мудрыя продкі ў хвоях паснулі,
Дзе жанчыны, як радасны сон у стагах на зары,
А дзяўчаты, як дождж залаты. А сівыя матулі,
Як жніўё з павуціннем і добрае сонца ўгары.

**328.** *Патлумачце значэнне фразеалагізмаў і складзіце з імі сказы. Запішыце сказы і пры неабходнасці расстаўце ў іх знакі прыпынку. Якімі членамі сказа з'яўляюцца фразеалагізмы?*

Як ветрам здзьмула, як з вядра, як леташні снег, як магнітам, як мыла з'еўшы, як гарох пры дарозе.

**329.** *Размяжуйце сказы са злучнікам* ***як*** *у значэнні 'ў якасці' і сказы, ускладненыя адасобленым прыдаткам са злучнікам* ***як.***

I. 1. Ты як мой першы памочнік павінен заўсёды быць пад рукой. 2. Як патрыёт я скажу пра родныя мясціны толькі самыя добрыя словы. 3. Як салістка я стала выступаць толькі ў гэтым годзе. 4. Сяргей як асцярожны чалавек ніколі не паступае неабдумана. 5. Прыміце гэтую кнігу як мой падарунак вам. 6. У вёсцы Андрэй Пятровіч вядомы як непераўзыдзены рыбак. 7. Няхай гэтае сачыненне для вас будзе як узор.

II. 1. Купалу мы ведаем як паэта і драматурга, аўтара цудоўных п'ес "Паўлінка" і "Раскіданае гняздо". 2. Неацэнная роля Коласа як заснавальніка рэалістычнай беларускай прозы. 3. Як настаўнік па прафесіі Я. Колас шмат зрабіў у галіне педагагічнай літаратуры, напісаў "Другое чытанне для дзяцей беларусаў", "Методыку роднае мовы". *(Барст.)* 4. Кастусь Каліноўскі ў паўстанне 1863 – 1864 гадоў прыйшоў як палымяны паслядоўнік ідэй Бялінскага, Герцэна, Чарнышэўскага, Дабралюбава. *(Б.)* 5. Міхась з Антосем як старыя займалі месцы канцавыя. *(К-с)* 6. Яшчэ ў бурныя дні першай рэвалюцыі Якуб Колас выступіў як абаронца інтарэсаў народа. *(Крап.)* 7. Можна было б ехаць за Чарнушкамі, аддаючы знак пашаны дзядзьку Цімоху як старэйшаму і ў іншых абставінах Васіль так і зрабіў бы. *(І. М.)*

**330.** *Назавіце нумары сказаў, у якіх знакі прыпынку пры параўнальных зваротах расстаўлены правільна.*

I. 1. Я памяць сваю, нібы кнігу, гартаю. *(Астр.)* 2. З гулкай пушчы, як з радыёстудыі, салавей вясну абвясціў на ўвесь свет. *(Віт.)* 3. Мая мова, як шчасце на вуснах, хвалявання гарачы прыбой. *(Ген.)* 4. Як помнік лету, за ракой стаялі стройныя стагі. *(Бач.)* 5. А ты, лісток, зусім як сэрца. *(Р. Б.)* 6. Зімовы дзень звініць як звон, завейнай сцюжай загайданы. *(Гр.)* 7. Ёсць першабытна-дзікая краса ў ціхай свежасці кутка ляснога, дзе ні згрызот, ні звяг, ні вока злога, дзе кожная расінка, як сляза. *(Л. Д.)* 8. Як добрая

дзедава казка, адзываецца ноч таямнічасцю гукаў і слоў. *(Віт.)* 9. Вочы нібы дзве чарэшні ў дождж. *(Каратк.)* 10. Лес увайшоў у маю свядомасць, у мой светапогляд, як таямнічы волат і чараўнік, лекар і карміцель. *(С. П.)*

II. 1. Рыбак быў дзядзька наш Антоні, як і работнік, адмысловы. 2. Як пойдзе ён у лес той зранку, як цукар у вадзе растане. 3. Стары ляснічы пасвойму цаніў Міхала, як служаку. 4. Гараць дрыготна, ззяюць зоркі, як найдарожшыя пацёркі. 5. Міхал у лесе, як бы дома. 6. Антось часамі, як дзіця. 7. Угрэла сонца. Жней чародкі ідуць паважна, як лябёдкі. 8. Звоніць, скача, як дзіцятка, гэты жэўжык-ручаёк. На яго, бы тая матка, сонца кідае свой зрок. 9. Лёд на лугах як люстра ззяе, і сонца зрэдку ў ім гуляе. 10. Пад шум, пад грукат навальніцы, як бы па знаку чараўніцы, устаюць-растуць на лузе копкі. *(Я. Колас)*

**331.** *Паразважайце, якую стылістычную ролю выконваюць параўнальныя звароты ў вершы Сяргея Грахоўскага.*

Падсочаны лес,
Як падсечаны лёс,
Моліць ратунку
Ў зямлі і нябёс,
Хоць і не верыць
Збавенню і цуду
І не чакае
Адмены прысуду.
Мечаны доўгімі
Шрамамі лес
Сцішыўся, сохне,
А кожны парэз,
Быццам крывёй,
Заплывае жывіцай,
Гоячы раны,
Каб зноў ажывіцца,
Але *падпісан*
Смяротны прысуд,
Хвоі гудуць,
Як парожні сасуд.
Горда смяротнікі
Узнялі галовы,
Мабыць, гавораць
Апошняе слова.
Тут не туманяцца
Росныя ранкі,
Чэзне багун,
Нават сохнуць паганкі.
Капаюць слёзы
З глыбокай насечкі –
Сосны смалой
Аплываюць, як свечкі,
Хоць і парэзы
Не ўсе адбалелі,
Кроны ад смагі
І сонца збялелі,
Вецце пакрыла
Смяротная плесня.
Страшна і ўдзень
У асуджаным лесе.
Больш ён зялёным
Не ўкрыецца пылам –
Хутка свістаць тут
Сякерам і пілам.
Хутка лаўжы
Затрашчаць на агні,
Стануць як помнікі
Белыя пні.
Чуеце? Ноччу
На ўсе галасы
Стогнуць і просяць ратунку
Лясы.

● *Якое парушэнне граматычнай нормы дапушчана ў выдзеленым слове?*

**332.** *Прачытайце тэкст. Звярніце ўвагу на сказы, у якіх сустракаецца слова* ***як.*** *Якую функцыю яно выконвае? Растлумачце пастаноўку або непастаноўку знакаў прыпынку пры слове* ***як.***

Няправільны падзел на абзацы – гэта сэнсавая памылка, ці моўная недакладнасць. Некаторыя расейскія лінгвісты (А. Гвоздзеў, Ф. Гужва і інш.) лічаць абзацны водступ знакам прыпынку і побач з кропкай і коскай разглядаюць яго як "пагранічны знак частак тэксту". Л. Шчэрба таксама называў абзац "свайго роду знакам прыпынку". І гэта слушная думка: як кропка раздзяляе два суседнія сказы, так абзац раздзяляе папярэдні і наступны шэраг думак. Абзац, як і іншыя знакі прыпынку, мае не толькі сваё знешняе, праўда, своеасаблівае, выражэнне на пісьме – у выглядзе водступу, але і такі спадарожны ўсякаму знаку прыпынку спецыфічны элемент, як інтанацыя. Таму няправільнае выкарыстанне чырвонага радка – гэта ў пэўнай ступені і пунктуацыйная памылка. *(Паводле І. Лепешава)*

## Сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі

**333.** *Знайдзіце ў сказах пабочныя і ўстаўныя канструкцыі, растлумачце іх будову (словы, словазлучэнні, сказы). Звярніце ўвагу на іх месца ў сказе і знакі прыпынку, якімі яны выдзелены.*

1. Нам кожнаю назвай (вялікай і дробнай) патрэбна, як імем сваім, даражыць. *(Панч.)* 2. Назвы нашых сёл, гарадоў і вуліц – іх таксама трэба браць пад ахову – разам з чалавечымі прозвішчамі складаюць самае яркае ў моўным запасе і нясуць водгукі гісторыі кожнага народа. *(Луж.)* 3. Мабыць, нідзе гэтак молада не адчуваецца вясна, як у бярозавых гаях, калі лісце светлае і, здаецца, цёплае сваім зялёным цяплом. *(Ж.)* 4. Пакахаў я аднойчы дзяўчыну (хіба ў казцы пра гэта казаць), пакахаў, як сябе, як Айчыну, як не ўмеюць на свеце кахаць. *(Кл.)* 5. Цяпер, вядома, лес ужо не той, што быў калісьці. *(Сач.)* 6. З трох бакоў да вёскі падступаў лес. Ды які лес! Адны бярозы (я нават здзівіўся, як ён уцалеў, такі беразняк). *(Шам.)* 7. Зорка глядзіць у маё начное акно. Я ведаю, што гэта Венера, ці Мілавіца, як называюць яе ў нас. *(А. Ж.)* 8. Самаму стараму чоўну, знойдзенаму на Беларусі (ён зараз у Пінскім музеі), сем тысяч гадоў. Як човен збярогся? Ну, па-першае, дуб толькі мацнее ад вады, па-другое, човен трапіў у тарфянік, які і закансерваваў яго. *(Каратк.)* 9. У сярэднія вякі ў Кракаўскім універсітэце нейкі час рэктара выбіралі студэнты (шкаляры). *(У. К.)* 10. У мове Скарыны, кажучы словамі Марселя Пруста, – "формы старажытнай душы" нашага народа. *(Гіл.)* 11. У лесе многія спрадвечныя дубы былі спілены, але засталіся іх пні, шырокія, як сталы, вакол якіх багата расло заячай капусты (мы яе называлі кісліцай). *(Гаўр.)*

**334. І.** *З прапанаванага спіса пабочных слоў назавіце тыя, якія:*

а) указваюць на крыніцу інфармацыі;
б) указваюць на экспрэсіўны характар выказвання;
в) утрымліваюць ацэнку ступені верагоднасці паведамлення;
г) указваюць на адносіны паміж думкамі, парадак іх выкладу.

Безумоўна, па праўдзе сказаць, па-першае, па-мойму, сапраўды, вядома, так, акрамя жартаў, разумеецца, паводле слоў, без сумнення, напрыклад, відавочна, між намі кажучы, магчыма, з аднаго боку, па словах, як кажуць, здаецца, напэўна, прызнацца.

**ІІ.** *Устаўце ў наступныя сказы пабочныя словы, розныя паводле значэння. Як змяняецца значэнне сказаў пры гэтым?*

1. Задача нескладаная.
2. Адбылося ўсё па-іншаму.
3. Сустрэча з артыстамі ўзрушыла ўсіх.

**335.** *Вызначце, у якіх сказах выдзеленыя словы з'яўляюцца пабочнымі, а ў якіх – членамі сказа. Спішыце, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку.*

І. 1. Каму прыходзілася хоць раз пабачыць гэты куточак, той *напэўна* не забудзе яго ніколі. *(К-с)* 2. Сонца яшчэ не выкацілася з-за лесу, а ўсё было *відаць*, як удзень. *(Янк.)* 3. На небе ярка *мусіць* на пагоду, гарэлі зоркі. *(А. А.)* 4. Коні, цягнучы сані ўгору, дробна перабіралі нагамі, але хады не прыцішалі *наадварот* наддавалі яшчэ, бо пад'ём быў круты. *(Каж.)* 5. Усюды чакалі дажджу. І ён недзе пад абед *нарэшце* зашумеў. *(Я. С.)* 6. У гісторыі *бадай* што кожнага народа ёсць такія асобы, што жыццём сваім, творчай працай і грамадскай дзейнасцю нібы апярэджваюць час, у якім яны жылі. *(Яг.)*

ІІ. 1. Такой парой мінулым летам *бывала* абы занялася ружовая зара, Надзя з сяброўкамі былі з кошыкамі ў лесе. *(І. А.)* 2. Дарогі – гэта рэкі, і ўпадаюць яны *відаць* у гарады. *(Я. С.)* 3. Старое дрэва, з якога падала лісце *здавалася* да болю шкадуе кожны лісцік, што з такой любоўю гадавала цэлае лета. *(А. Ш.)* 4. Калі ёсць што найпрыгажэйшае на свеце, то *напэўна* гэта воблакі. *(Грам.)* 5. *Здавалася* што сухое празрыстае паветра застыла ад першага подыху марозу. *(А. А.)* 6. Так ціха, што *здаецца* нідзе на ўсім белым свеце ніхто не жыве. *(Сач.)*

**336.** *Прачытайце тэкст. Замест шматкроп'я ўстаўце пабочныя канструкцыі, выкарыстоўваючы даведку пасля практыкавання. Запішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку.*

Камп'ютэр усё больш трывала ўваходзіць у наша жыццё. Відавочна, што такія цесныя "кантакты" з ім могуць быць небяспечнымі для здароўя,

калі не прытрымліваецца элементарных правілаў. … памяшканне, дзе знаходзіцца камп'ютэр, павінна быць прасторным, з пастаянным абнаўленнем паветра, а мінімальная плошча для аднаго манітора павінна складаць 9 – 10 кв. метраў. … адлегласць ад вачэй да манітора не павінна быць менш за 50 см, аптымальна – адлегласць выцягнутай рукі. … нельга працаваць за камп’ютэрам у цёмным ці паўцёмным памяшканні. Рабочае месца таксама павінна адпавядаць пэўным патрабаванням. … мышка павінна знаходзіцца на адным узроўні з клавіятурай, а клавіятура – крыху вышэй узроўню бёдзер, інакш стомяцца рукі. … запаленчыя і дыстрафічныя захворванні суставаў – прафесійная хвароба ўсіх камп’ютэршчыкаў. … трэба памятаць: камп’ютэр – моцная крыніца электрамагнітнага поля, таму пасля кожных 45 – 50 мінут працы варта рабіць 10-хвілінны перапынак.

***Словы для даведкі:*** па-другое, між іншым, па-першае, акрамя таго, да таго ж, у прыватнасці.

**337.** *Запішыце сказы з устаўнымі канструкцыямі, расстаўляючы, дзе неабходна, знакі прыпынку. Устаўныя канструкцыі падкрэсліце.*

I. 1. Лабановіч так звалі маладога настаўніка слухаў апавяданне з вялікай цікавасцю. *(К-с)* 2. Чарговы аўтобусны прыпынак – каля Балотнай станцыі тут зараз аніякіх прымет балота. *(Янк.)* 3. Школа я адразу ўбачыў яе і беспамылкова пазнаў стаяла ўбаку, за гародамі, бліжэй да лесу. *(Шам.)* 4. Дзюбай забінтаванай адбіў за лета грукае дзяцел у азалелы ствол. *(Бар.)* 5. Вось гэты баравік рос там, дзе забалаць пад лён зязюльчын нават шапкі колер. *(М. Т.)* 6. Памалу, звольна і ў Парэччы такая ўрода чалавеча зжывалісь з месцам, прывыкалі, гняздо старое забывалі. *(К-с)* 7. Міхал навошта ўжо таіцца любіў-такі павесяліцца. *(К-с)*

II. 1. У розных кутках беларускай зямлі там помнікі б з мармуру высечы славутыя калісь друкарні былі – гадоў таму ледзь не паўтысячы. *(Гіл.)* 2. Змураваная за адзін будаўнічы сезон Спасаўская, або Спаса-Прэабражэнская цяпер яе часта і не зусім правільна называюць Спаса-Ефрасіннеўскай царква – вяршыня архітэктурнай думкі Полацка. *(У. А.)* 3. Хай там нейкім прарокам, празорцам, святым свет ніколі без іх не бывае ясна загадзя ўсё, але толькі не тым, хто нялёгкіх адказаў шукае. (*Бач.)* 4. Прыемна бачыць усё, што трапляе на вока: ядлоўцавыя кусты яны амаль заўсёды суседнічаюць з мурашкамі, пясчаныя прагаліны, камяні-валуны, парослыя па баках зялёным мохам. *(І. Н.)* 5. Міхал ужо нейк увайшло ў моду ў Нясвіж прад святамі штогоду вазіў для замкавых паноў грыбы, і рыбу, і зайцоў. *(К-с)* 6. Інiца – вёсачка на дваццаць двароў, сядзібы толькі на адным баку вуліцы, другі ж бок зялёны, з рачулкай пад высокімі дрэвамі таксама Інiца, якая ўпадае ў Нёман з левага боку. *(Б.)* 7. Кнігаўка за дзень не накрычалася, як з хвастом ушчэмленым, галосіць. *(Бар.)*

**338.** *Запішыце тэкст, выкарыстоўваючы замест шматкроп'я ўстаўныя канструкцыі, змешчаныя ў даведцы пасля практыкавання, і выдзяляючы іх знакамі прыпынку.*

Як вядома, самыя старажытныя славянскія тэксты X-XI стст. дайшлі да нас у дзвюх графічных сістэмах – глаголіцы … і кірыліцы … . Сёння існуе сапраўды велізарная спецыяльная літаратура …, прысвечаная гэтым алфавітам. Пасля шматлікіх дыскусій глаголіцу прызналі першай славянскай азбукай – як вынік індывідуальнага вынаходніцтва Канстанціна Філосафа … . Гэтая выснова ўлічвае арыгінальнасць графічных вырашэнняў глаголіцы, сферу і час яе распаўсюджання, характар найстаражытнейшых палімпсестаў…, а таксама некаторыя іншыя гістарычныя і моўныя сведчанні. *(М. Прыгодзіч)*

***Даведка:*** у манастве Кірыла; г. зн. напісанняў на месцы змытага або сцёртага першапачатковага тэксту; яе знакі, блізкія да грэцкіх літар, пакладзены ў аснову сучасных усходнеславянскіх алфавітаў; больш за 4,5 тысячы назваў; дзівосныя знакі яе рэзка адрозніваюцца ад звычных для нас літар балгарскага, грэцкага, лацінскага алфавітаў.

**339.** *Прачытайце верш Янкі Сіпакова. Якую ролю ў творы выконваюць устаўныя канструкцыі? Вершу ўласцівы "псіхалагічны паралелізм". Як вы разумееце гэты тэрмін?*

Давайце адзначаць дні нараджэння дрэвам!
Збяромся ў лес, пасядзем каля іх
І, адкашляўшыся ў кулак — ад хвалявання! —
Пачнём прамовы юбілейныя казаць:
Маўляў, мы любім вас і паважаем,
Але, як і сябрам сваім найлепшым,
Саромеемся пры жыцці — у вочы —
Аб гэтым прызнавацца. Ды вы й самі,
Нібыта продкі нашы — хлебаробы,
Не помніце сваіх дзён нараджэнняў:
Калі за працаю было іх святкаваць!
А ўспамінáў хто-кольвек вам між іншым —
Адмахваліся вы: "Якое гэта свята!"
Дык вось — са святам вашым, цётка Елка!
(У вас кара нібыта ў цёткі Лёксы
Ад сівераў парэпаныя рукі…)
І вас з днём нараджэння, дзядзька Клён!
(Прысадзісты, плячысты, вы падобны
На дзядзьку Аляксея, што нясе
Капішчу сена — як зялёны стог…)

І вас з сямісотгадовым юбілеем,
Дзядуля Дуб! Сабралі вы падлесак
І баеце малым, як казку, праўду
З жыцця дрэў пракаветных і лясоў.
(Вось так і нас сабраўшы ля сябе,
Калі ўсе былі на сенаванні,
Нам баяў гэтаксама дзед Кузёмка,
Але былі то казкі пра людзей…)
Са святам вашым кожнадзённым, Дрэвы,
Цярплівыя і сціплыя, як Людзі,—
У лесе ж знойдзецца штодзень хоць голька,
Якой якраз сягоння юбілей…
Давайце ж адзначаць дні нараджэння дрэвам,
Пакуль яшчэ далёка да памінак,
Калі — ля пнёў! — тужліва ўспамінаюць:
— Як сціпла пражыла на свеце цётка Вольха…
— Які харошы чалавек быў дзядзька Вяз…

## Сказы са звароткамі

**340.** *Прачытайце сказы, захоўваючы неабходную інтанацыю. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры зваротках. Вызначце, чым выражаны зваротак у кожным сказе.*

1. Вясна, вясна жаданая! Ты прыйдзеш зноў, ты вернешся. *(К-с)* 2. Я люблю цябе, лес, за тваю чалавечую шчодрасць, калі ты пакрываеш абрусам паляны-сталы...*(Я. С.)* 3. Не пакідай мяне, трывога, будзь спадарожнікам маім! *(А. П.)* 4. Не тужы ты, Нёман, адзінока па красуні Прыпяці шырокай. *(Р.)* 5. Лес мой цёмны! Чым адплаціць змагу табе, дружа? *(М. Т.)* 6. Шляхі, шляхі! О як жа многа было вас пройдзена ў жыцці! *(Прых.)* 7. Не сумуй па мне, старая, будзь здарова, маці. *(Крап.)* 8. О, рэкі, рэкі Беларусі сярод лугоў, сярод лясоў! Калі я гімн саткаць збяруся з блакітных вашых паясоў? *(Бур.)* 9. Паклон табе нізкі, што ад самай калыскі ты вяла мяне, маці, няхітрай дарогай зямною! *(Кір.)*

**341.** *Запішыце сказы, расстаўце, дзе неабходна, знакі прыпынку і растлумачце іх, звароткі падкрэсліце.*

**І.** 1. Жывеш не вечна чалавек перажывi ж у момант век. *(Багд.)* 2. Хмаркі залатыя! Вы – прастору дзеці, ходзіце вы вечна па ўсім белым свеце. *(К-с)* 3. Што ж прыстаў ты ў задуме дубе пушчы ўладар? *(Пестр.)* 4. Вітаю вас як блізкіх родных старыя хвоі на палях. *(К-с)* 5. Прырода-маці мы твая часцінка. (Панч.) 6. Дыміся бульбай край маленства…*(Бар.)*

7. Раптоўны дождж прыйдзі хутчэй сюды і дай гаючых кропель быццам доктар. *(П. М.)* 8. Цёплы вечар ціхі вецер свежы стог улажылі спаць мяне вы на зямлі. *(Багд.)* 9. Гэй ты братка Новы годзе што з сабою нам нясеш? *(Ц.)*

**II.** 1. О мой час пачакай не бяжы хоць не бегчы табе немагчыма пашапчыце грыбныя дажджы паспявайце завейныя зімы! *(Пісьм.)* 2. Жанчыны маці-словатворцы ў час калыханак вы сплялі імя вясне пчале і зорцы ўсім добрым дзівам на зямлі. *(А. П.)* 3. З дзіцячых гадоў запомніў я шырокі ліст прыкметны і добрае тваё імя мой дружа запаветны зялёны мой пакутнік трывалы мой трыпутнік. *(Віт.)* 4. Магутны Божа! Уладар сусветаў вялізных сонцаў і сэрц малых над Беларуссю ціхой і ветлай рассып праменне свае хвалы. *(Арс.)* 5. Мой сыне! Галодны ці сыты – які ні прытуліць край роднага дома арбіты ніколі не забывай. *(Гр.)* 6. Хай галосяць ветры ў цемені начной сядзем дарагая пасядзім з табой. *(Кл.)* 7. Добра знаю што ўсёй душой любіць цябе мой краю мяне з маленства навучыла матчына песня. *(Кір.)*

● *Назавіце сказы, у якіх звароткі выражаны формай клічнага склону.*

**342.** *Складзіце пяць пар сказаў, каб у адных прапанаваныя словы былі дзейнікамі, а ў другіх – зваροткамі.*

Сябры, мой горад, бярозка белая, бацькі, Алена Сяргееўна.

**343.** *Растлумачце ў сказах знакі прыпынку пры звароткy. Спачатку выпішыце тыя са сказаў, у якіх пасля* ***о*** *трэба ставіць коску, а пасля – у якіх коскі быць не павінна. Растлумачце, з чым гэта звязана.*

1. О матчына мова! Маленства вясна! Ніколі ніхто мне цябе не заменіць, бо ты, як і маці, на свеце адна. *(Бач.)* 2. О рыфмы, рыфмы… Я падчас, як здраднікаў, баюся вас…*(Віт.)* 3. О жаваранак весні – залівісты званок, тваю ў кішэні песню схаваў вяшчун-дзядок. *(Вял.)* 4. О неба ціхае, світальнае! Мы пад шатром тваім стаім. *(Бур.)* 5. О родная зямля! Ты – кніга вечнага жыцця. *(М. Т.)* 6. О ляціце, журавы, ляціце сваёй млечнай дарогай, вясёлай і шумнай, бы крыгаход. *(Стр.)* 7. О край мой мілы! Усёй душою хачу злучыцца я з табою, у тваіх палях пазычыць сілу, у тваёй зямлі сысці ў магілу. *(К-с)* 9. О край родны, край прыгожы! Мілы кут маіх дзядоў!.. Што мілей на свеце божым гэтых светлых берагоў?.. *(К-с)*

**344.** *З прапанаваных сказаў выберыце сказы са зваροткамі. Якія яшчэ вядомыя вам канструкцыі з назоўным склонам сустракаюцца ў практыкаванні?*

1. Ой, бярозы ды сосны — партызанскія сёстры, вас ніколі ў жыцці не забыць. *(Р.)* 2. Лета, навошта так рана нам расставацца з табою? *(Неп.)* 3. Птушкі… Птушкі жывуць інакш, чым людзі, яны шчаслівейшыя за людзей…*(Кап.)* 4. О шчырасць матчына! Яна нас асвятляе і гартуе. *(Хв.)* 5. Вось і Гарынь, глыбокая, шырокая, імклівая. *(В. В.)* 6. Якія горы! А сады якія! *(Панч.)* 7. Дзівак чалавек… Са стратаю непапраўнай не мірыцца ён нізашто ў жыцці. *(Вярц.)* 8. Лес мой, цуд мой… Я перадам нашу дружбу дачушцы і сыну, каб іх рукі ніколі галін не ламалі тваіх. *(Панч.)* 9. Да спаткання ж, рэчка! Да другога лета, дарагія пушчы, нівы і лугі. *(Гл.)* 10. Прыгожае возера Свіцязь! Вада ў ім чыстая і светлая, як у крыніцы. *(В. В.)*

**345.** *Знайдзіце ў тэкстах звароткі. Якую функцыю яны выконваюць? Паразважайце, чым абумоўліваецца выбар формы зваротка ў пісьмовым і вусным маўленні.*

I. Дарагі Міхал Васільевіч!

Атрымаў я, браток, тваё пісьмо. Я вельмі рад прыгадаць былое, свае маладыя гады, сваю першую школу, дзе я быў настаўнікам, і сваіх вучняў, у тым ліку і цябе, мой дарагі Міхалка. Шмат гадоў прайшло з таго часу. Многа ўсякіх падзей і змен у жыцці адбылося за гэты час. Люсіна я ніколі не забуду. Я памятаю Люсінскую школу.

Не ведаю, што з ёю сталася зараз. Напэўна, яна струхлела, а на яе месцы стаіць другая, новая, болей прасторная. Помню я і сваю бабку Мар'ю, яе сына Грыгора. Грыгор, пэўна, жыве, а старая Мар'я, як мне думаецца, даўно ўжо развіталася з гэтым светам.

Перадай, браток, маё шчырае прывітанне ўсім, хто помніць мяне.

Крэпка цісну руку.

Якуб Колас

II. З калёс загаварыў Апейка.

– Дзядзькі і цёткі, хлопцы і дзеўкі! Дарагія нашы таварышы! Мы ўсе сягоння сабраліся тут, каля грэблі, як на свята… І праўда – хіба ж не свята: от ляжыць яна, роўная, сухая, новая грэбля – у дождж, у слату, зімой і ўвесну – едзьце па ёй калёсамі, ідзіце пешкі… Ідзіце – не будзеце не толькі што тануць па пояс, а і ног не замочыце… Не толькі мужчына – дзіця можа прайсці балота цяпер любой парою!.. Можна хадзіць у школу, можна ездзіць на кірмаш, можна ў госці. Вялікая радасць – грэбля! І ўсе мы, уся воласць, радуемся з вамі і віншуем вас! *(Паводле І. Мележа)*

**346.** *Адзначце сказы, у якіх набраныя курсівам словы трэба выдзеліць коскамі.*

1. Толькі *ведаеш* позняя вішня асыпае з пялёсткамі плён. 2. *Відаць* святла не знайсці тым, хто нарадзіўся ўжо сляпым. 3. Не, не *можа* спаць хлапчына гэткім ранкам залатым: ходзіць статак па лагчыне, Федзя мусіць быць пры ім. 4. Кожнаму *вядома* радасць спаткання з кутком дзяцінства. 5. *Адначасова хмельны і цвярозы* іду ў паўдзённы заінелы лес. 6. І голас *здаецца* знаёмы, але пазнаць *каюся* не магу. 7. Над *зарослай густымі кустамі* лесасекай плыло павуцінне бабінага лета. 8. *Ціхая, млявая* плыве жнівеньская ноч над зямлёй. 9. У прысадах цяністых я сустрэўся з табой *маёй светлаю, чыстай веснавою журбой*.

# СКЛАДАНЫ СКАЗ

**347.** *Назавіце ў тэксце складаныя сказы і вызначце іх тыпы. Вусна растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.*

Янку Купалу я адкрываў сабе двойчы, а можа, тройчы. І кожны раз адкрываў па-новаму. Справядліва кажуць: усё выдатнае трэба перачытваць, і тады яно высвеціцца для цябе сваімі новымі, нечаканымі адценнямі, а то і сэнсам.

Мне захацелася паехаць у Ляўкі і сваімі вачыма засведчыць тую славу песняра, якой вянчаў яго вядомы “Ляўкоўскі цыкл” вершаў. Цёплым маёвым днём на старэнькай “Волзе” выправіўся ў дарогу. Час быў выбраны амаль той жа, купалаўскі, веснавы. У Ляўкі, як вядома, Купала завітаў у красавіку 1935 года, мы ж пачакалі да мая, далі крыху агледзецца, ажывіць свае сілы і звабы прыродзе. А дарогу тую помню, як цяпер. І сёння ўваччу бяжыць і бяжыць, блішчыць, плавіцца на сонцы яе асфальтавае палатно, і амаль на ўсім працягу не абрываецца, не радзее, а толькі раўнейшай становіцца сцяна лесу. Скрыпнуць нечакана тармазы, прыпыніцца машына, і лагодная ўсмешка асвеціць твар шафёра. Трэба ж, перад самым бамперам важна прашпацыруе дзікая качка з двума шнуркамі сонечна-жоўтых качанят. Яна азірнецца, скочыць у адхон і знікне там, дзе шырока і плаўна гойдаецца асака.

Потым будзе Орша, адкуль стужка асфальту адгалінуецца і пабяжыць на Магілёў. Ля вёскі Зубава галіна дарогі яшчэ раз заломіцца, і цяпер шлях ляжа проста ў Ляўкі. *(Паводле К. Камейшы)*

**348.** *Прачытайце тэкст, растлумачце пастаноўку прапушчаных знакаў прыпынку. Выпішыце складаныя сказы, вызначце іх тыпы.*

Быў той час калі краскі паскідалі ўжо свае ярка-святочныя ўборы і зараз будзённа і задумліва шуршэлі поўнымі каробачкамі спелых зярнят беражліва хаваючы іх ад дажджу і туману.

Спакусіўшыся сонцам і цеплынёй другі раз зацвіталі брусніцы суніцы нават крушына. Зноў успомнілі вясну званкі фіялкі канюшына. Іх кветкі былі не такія яркія і не такія буйныя як увесну але ўсё ж і яны змушалі зірнуць на сябе, убачыць іх ціхую прыгажосць...

Уранку лугі заўсёды высцілаў густы туман па якім здавалася можна было бегчы як па палатне і які сведчыў ужо што ў прыродзе пачынаецца дужанне цеплыні і холаду. Цеплыня не хацела яшчэ здавацца але і холад з кожным днём усё мацнеў. Ён халадзіў цёплае дыханне зямлі і яно выпадала росамі на пожні і туманамі вісела над атаваю. К абеду туман сыходзіў і тады ў палях і лугах рабілася так празрыста і чыста што выразна была відаць кожная капа сена і кожны крыжык ячменю кожны кусцік і кожны гаёк. І нават здалёк можна было заўважыць як на ўзлесках гарыць сіняватым агнём спелы верас. *(Паводле Я. Сіпакова)*

**349**. *Спішыце, устаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Назавіце складаныя сказы, вызначце іх структуру, сродкі сувязі частак: злучнікі (злучальныя і падпарадкавальныя), злучальныя словы, інтанацыя.*

*(Н..) (ад)* чаго гэтак *(н..)* баліць душа і *(н..)* чому гэтак *(н..)* радуецца, як роднаму свайму полю якое праплывае пад шызым крылом тваім. І там *(у)* нізе гэтак *(жа)* шыза ляжыць прыцíх*(л,ш)*ае і спустош..*(н)*нае асенн..е ворыва. І ўжо толькі ц*(ь)*мя*(н)*на пабліскваюць на сонц.. цёплым во*(ц, д)*-св..там дастаялыя шапаткія аўсы. Але яшчэ грэе роднае журботнае сонца яшчэ цёпла ад яго і *(н..)* хоч..цца да чужога дзе гэтак ярка светла дзе гэтак цёпла і дзе так нудою студзіцца душа.

Цень Апошн..га Жураўля ахіля*(ў,ла)* поле, лес азерцы і лужкі тр..вожыла яго апошняя песня ціхую паднябесную прастору. Цэлы дзень кружыўся Апошні Журавель над роднымі палеткамі цэлы дзень ён чакаў што *(н..)*дзе з зямлі адгукнецца пакінутая ім *(н..)*калі тут жураўлі*(н)*ная душа яго.

Прамінáлі часы *(н..)* стала за палямі тых вялікіх і родных балот і цяпер на новыя паселішчы другая пралегла жураўлі*(н)*ная дарога. *(З)* году *(ў)* год прыляталі жураўлі на роднае поле кружыліся доўга шукалі пакінутае і забытае і потым адляталі туды дзе *(н..)* роднае цёплае сонца. *(Паводле А. Жука)*

**350.** *Вусна ўстаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі, растлумачце пастаноўку прапушчаных знакаў прыпынку. Выпішыце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі, назавіце сродкі сувязі састаўных частак.*

Кожнаму з нас лёс адводз..ць свой зямны куток дае бясцэ*(н)*ны дар жыцця і *(н..)*паўторную ма..чыну ласку родную мову і святое адчуван..е

ўласнай годнас*(ь)*ці. А вось неба над намі — адно на ўсіх *(н..)*абдымнае і зманлівае гл..бокае і *(н..)*спазна*(н)*нае адкуль усім свец..ць зоркі.

*(На)*прыканцы дз..в..тна*(д,ц)*цатага стагоддзя ў свет пры*(й)*шл.. два нацыянальны.. геніі, а на небасхіл.. культуры чалавецтва ўспыхнул.. дзве найярчэйшы.. зоркі беларускай літаратуры. Таленты заўсёды з'яўляюцца тады калі ў іх ёсць гістарычная патрэба і народныя п..сняры Беларусі сваёй творчас*(ь)*ц..ю і сваім жыццём па*(д)*цвердзілі гэта.

У той час некаторыя пыталіся: ”А ці ёсць такі народ — беларускі? А ці патрэбна такая мова — беларуская?” Якуб Колас і Янка Купала даказалі ёсць такі народ калі ён нара*(ж, д, дж)*ае гені..ў патрэбна такая мова калі на ёй можна ствараць ш..дэўры. Яны, заснавальнікі новай беларускай літаратуры, розныя адзін вястун і прарок другі л..тапісец і філосаф. Купала і Колас пры жыцці пас*(ь)*пелі а..чуць народную любоў і ўдзячнас*(ь)*ць але толькі з гадамі пачына..ш разумець усю гл..біню іх азарэн..я і вышыню іх узлёт.. .

Калі вам захоч..цца паўзірацца ў прасторнае неба духоўнас*(ь)*ці якое атуляе ўсіх нас і кліча да вышыні ўспомніце: у сузор..і гені..ў ёс*(ь)*ць дз*(ь)*ве зоркі з простымі беларускімі імёнамі Янка Купала і Якуб Колас. *(Паводле Г.Бураўкіна)*

# Складаназлучаныя сказы

**351**. *Раскрыйце дужкі, вусна ўстаўце прапушчаныя літары, растлумачце іх правапіс. Выпішыце складаназлучаныя сказы, вызначце значэнне злучнікаў і сінтаксічныя адносіны паміж часткамі.*

Яны спусціліся *(у)* ніз і накіраваліся да *(Х,х)*рам.. *(С,с)*вятой *(С,с)*афіі. Падарожжа было доўгім, амаль праз увесь горад, і Нічыпар расказваў Жывене пра тую ці іншую славутасць горад.. .

Дзяўчына пабачыла магутныя, узнёслыя храмы. Сцены іх былі ўпрыгожаны дарагой кафляй або фрэскамі, а дзверы выразаны з каштоўных парод дрэў: эбен.., сандал.., жалезнага кедр.. . Але найпрыгажэйшыя з усіх брамаў былі м..навіта ў *(С,с)*аборы *(С,с)*вятой *(С,с)*афіі, вядомым ва ўсім свеце. Галоўныя царскія вароты былі адчынены, і ў храм сёння можна было трапіць кожнаму. Над уваходам ззяла складзе*(н)*ная з тысяч мазаічных плітак выява Хрыста. Яна была зроблена не проста майстрамі. І праз сем стагоддзяў пасля стварэн..я адчувалася яе жывое, трапяткое ўздзеянне. Нешта загадкавае, таемнае імгне*(н)*на адгукнулася ў душы, і Жывена, сама не ўсв..дамля..чы таго, апусцілася на калені.

А пасля яна разам з іншымі зайшла *(у)* сярэдзіну. Вышыня. Нібы само неба легла на цёмна-зялёныя марм..ровыя слупы і ўтварыла гэты вялізны купал, і а..туль, з-пад купал.., ідзе высокая, амаль адчувальная сіла. Колькі

загадак, чалавечых пачуццяў, колькі лёсаў уплялося ў выявы святых, у фрэскі, ва ўзоры! Пакален..е за пакален..ем укленчвалі тут людзі, шука..чы разгадкі сваіх пачуццяў, але н..многім удавалася разгадаць гэтыя таямніцы. *(Паводле В. Іпатавай)*

● *Назавіце простыя сказы (часткі складаных) з састаўнымі іменнымі выказнікамі.*

**352.** *Спішыце, замест кропак устаўце патрэбныя злучнікі. Пастаўце і растлумачце знакі прыпынку. Вызначце сінтаксічныя адносіны паміж часткамі складаназлучаных сказаў.*

1. А на двары бурліць вясна ... капяжы каля акна на сонцы ззяюць бляскам чыстым. *(К.Б.)* 2. Вые ноч ... вецер белагрывы б'ецца ў шыбы лапай снегавой. *(Ал.)* 3. Тут вецер вільготны і пругкі... ружы ў духмянай расе. *(Панч.)* 4. Лісце пажоўклае, шэрае ціха шасціць пад нагамі ... дубы па-над Свіцяззю меднымі звоняць лістамі. *(Бр.)* 5. Аднаго прычакаць бы ёй толькі ў госці ... з зямлёю яго абвянчала вайна... *(Бур.)* 6. На пасецы яшчэ зялёная трава і мох ... пастарэлі ўжо грыбы-лісіцы, пабялелі, пачалі сохнуць. *(Пташ.)* 7. Ад дажджоў стары гасцінец пашарэў і пацямнеў ... вецер ярка сініць веснавую зелень дрэў. *(М.Т.)* 8. ... праскочыць конік лугам-даліною ... прасвішча вецер у полі нада мною. *(К-с.)* 9. Мы толькі ходзім па зямлі … думкі нашыя ў нябёсах. *(Бар.)* 10. …сонца свеціць … месяц ясны вам смяецца з неба весела і шчасна. *(Куп.)* 11. Наша хата стаяла на мяжы поля, лугу і лесу …я быў поўны валадар гэтых трох дзівосных светаў. *(М.Д.)* 12. Навокал было ціха … нейкая маленькая птушка манатонна і сумна ціўкала па той бок ручая. *(Стах.)*

**353.** *Спішыце сказы, пастаўце знакі прыпынку, растлумачце іх. У складаназлучаных сказах падкрэсліце злучнікі, вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі.*

1. Маёй песні ніхто не ачэрніць і не выцвітуць строфы ад рос. *(Я.П.)* 2. Сонца ў той дзень не было але на небе адлюстравалася яго блізкасць. *(К.Ч.)* 3. Удзень прыпарвала а ўночы ішоў дождж — спорны, з перунамі і маланкамі. *(Парх.)* 4. Удзень наплылі хмары і пайшоў снег. *(Стр.)* 5. Далёкі пах бярозавага дыму і развітальны голас жураваў мяне заўсёды клічуць на радзіму і я спяшаюся дамоў. *(Грах.)* 6. Усё было на гэтым белым свеце ды толькі я на ім упершыню. *(В.Р.)* 7. Днём на сонцы звінелі капяжы і цурчалі ў снезе тоненькія ручаінкі а ўначы зноў усё ледзянела. *(Вас.)* 8. Бэз апаў а цвіце маладосць і не верыцца мне ў расстанне. *(Янішч.)* 9. Зрэбны дарогі ручнік сцелецца ўдаль пад гару толькі гарачага поту з твару ты ім не сатрэш. *(М.Т.)* 10. Ноч туманная. Ціха і золка. *(Гл.)* 11. Цішыня і вячэрняе сонца. Птушыныя бесклапотныя галасы і кветкі

дзікіх ружаў. *(Б.)* 12. Вось рака любімая і дом і дубы ў задуме ацішэлай. *(Янішч.)* 13. Вецер шастае баравы і глуха грушы старыя рыпяць... Ці то ў вырай ляцяць журавы ці то песні не хочуць спаць. *(Бур.)*

**354.** *У сказах са злучнікам* ***і*** *вызначце сінтаксічныя адносіны: а) спалучальныя — адначасовасці або паслядоўнасці, б) прычынна- або ўмоўна-выніковыя. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.*

1. І ў сцюжу нечай ласкай ты сагрэты і ў спёку жыгане цябе зіма. *(Панч.)* 2. Тут як у казцы лісіца пеўня зносіла і вечар глух ад камароў. *(Бар.)* 3. Учора шчасце толькі глянула нясмела і развеяліся хмары змрочных дум. *(Багд.)* 4. Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор і гэты твор — мова. *(А.Р.)* 5. Поле веяла воляй і дарогі ўсе звалі ісці. *(К.Ч.)* 6. Самотна зорка над зямлёй згарае і ў гурбах ліпа з холаду дрыжыць. *(Караткі.)* 7. Дзён падрэзана ніць і зямлячкі хусцінаю жураўлёва крыло паплыло ад зямлі. *(Кам.)* 8. Схаваецца сонейка за рваныя асеннія хмары і ўмомант ва ўсёй прыродзе адбудзецца рэзкая перамена. *(У.Г.)* 9. Узмах вясла і сонны бераг адразу пачынае жыць. *(Гл.)* 10. Недзе справа заходзіць сонца і роўнае спакойнае святло яго ацяпляе бронзавыя ствалы робіць іх жывымі мітуслівымі. *(Кудр.)* 11. Стаяў калісь тут бор стары і жыў лясун у тым бары. *(Багд.)*

**355.** *З простых сказаў пабудуйце і запішыце складаназлучаныя, выкарыстоўваючы патрэбныя злучнікі. У састаўных частках падкрэсліце граматычныя асновы. Адзначце выпадкі выражэння выказнікаў перыфразамі.*

1. Свяціла ясным сонцам вера. Нявер'е кідала ў адчай. 2. Заву акіян. Яго ўсё няма. Сэрца па штормах сумуе. 3. Жоўты месяц у пчаліных сотах. Ляціць ад зор пчаліны звон. 4. Рады сяброў радзеюць. Новых мне, напэўна, не знайсці. 5. Як юнакі, цяпер мы часам марым. У маладосці сталымі былі. 6. Скажы мне адно толькі слоўца, адно славечка. Я застануся з табой не на вечар — навечна. 7. Восень звоніць у звон свой медны. Вецер трубіць у доўгі рог. 8. Вось дзьмухне вецер. Вяршáліны асін пацiху закіпяць. 9. У садзе ўсё лісце апала. Адзін дуб не пажоўк. 10. Для радасці мы нарадзіліся. Гора зноў паўтараецца. 11.Словам дакладным не трэба прыкрас. Сапраўдным пачуццям не трэба аздобы. 12. Пачаўся дзень. На палетак чорны паклала сонца цёплую руку. *(З твораў П. Панчанкі)*

**356.** *Вызначце разрады злучнікаў і сінтаксічныя адносіны паміж часткамі ў складаназлучаных сказах. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку.*

1. Зоры ўжо замігалі то там то сям у небе а з-за лесу ўзнімаўся месяц. *(К-с)* 2. Неба на ўсходзе было чыстае барвовае цямнела толькі вузкая паласа хмары над даляглядам. *(Дам.)* 3. Першы верш у сябра нарадзіўся а ў суседа — першае дзіця. *(Сал.)* 4. Схлынуць гады як за вадою ды не растане праменьчык святла. *(Янішч.)* 5. Вось мне ўжо і трыццаць з гакам а ты паранейшаму маладая. *(Бар.)* 6. Працавіты наш дзень адпачыць адышоў толькі стужка зары дагарае над садам. *(М.Т.)* 7. Красна вясна кветкамі а восень — палеткамі. *(Пр.)* 8. Ты імкнулася ў далеч прастораў бясконцых марскіх я ж — да сэрца твайго. *(А.К.)* 9. Буслоў ужо не відаць не чуваць толькі жоравы абжальваюць занёманскім пераклікам заўчаснае заканчэнне лета. *(Б.)* 10. Тумановая гара ўсё яшчэ чаплялася сівымі пасмамі за нізкія бугрыстыя берагі але раніца набірала сілу. *(К-н)*

**357.** *Спішыце тэкст, устаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Вызначце сродкі сувязі частак складаназлучаных сказаў, сэнсавыя адносіны паміж імі.*

Вясна *(н..)* хацела мірыцца з упартаю зімою. Яшчэ *(у)* сакавіку то бралася адл..га то зноў вярталіся маразы ды завеі. Але красаві..кае сонца ўзяло верх над халадамі прыгрэла *(ш,с)*чодра і на палях прасеках задым..лі праталіны.

Быў збег пор года, калі ц..плынь перамагала але і халады *(н..)* зусім а..ступалі калі ў твар мя*(г,к)*кім кац..няткам *(па)* доўгу ла*(ш,с)*чылася сонейка а з палёў і прасек пав..ваў волкі сівер. *(З,с)*ляжа*(ўш,л)*ае за доўгую зіму пад снегам лісце *(дзе)* *(н..)* дзе па..сыхала з чорнага рабілася шэрым святлела а на ўзлесках запальваліся першыя пралескі. На высокіх танклявых ножках яны падымалі кволыя галоўкі, а на галоўках — то расінку, то сухую лісцінку.

У ц..плейшых м..сцінах на сонц.. пасвіствалі шпакі а жаваранак з песняю падымаўся *(у)* блакіт неба. Дні стаялі цёплыя і ў высокім небе праляцелі першыя дзікія гусі. *(Паводле В. Карамазава)*

**358.** *Назавіце складаназлучаныя сказы і простыя сказы з аднароднымі выказнікамі. Вусна пастаўце і растлумачце прапушчаныя знакі прыпынку.*

1. Бабіна лета заканчвалася і ад зямлі і ад неба цягнула холадам асабліва па начах. 2. Людскія раўчукі плывуць па тратуары і ў снежнай імгле здаюцца далёкімі. 3. Праб'юся я ў Прыбалтыку сінюю і прыйду ў Беларусь сцежкай даўняй, дзяцінаю. 4. Сад звінеў пчоламі і звон гэты быў як бы песняй цвіцення. 5. Тураўскі князь Яраслаў быў багаты і мудры і людзей каля сябе збіраў усё разумных ды моцных. 6. І статак дружны жураўліны за важаком падняў крылы і пакланіўся ўсім далінам. 7. Ранак быў цудоўны і кожны жоўты лісцік на дрэвах здаецца млеў. 8. Куе кукуля

ўсё радзей і радзей і дрэвы пахнуць першым сном і мірам. 9. У гэтым доме некалі гайдалася калыска маленькага Максіма і гучала матчына калыханка. 10. Дзівосны абсяг ляжыць на ўсе бакі і праз яго прывольна струменіцца Прыпяць. 11. У Міці ёсць сябры і яны любяць прыходзіць у будку, пад сасну.

**359.** *Назавіце складаназлучаныя сказы з прапушчанымі знакамі прыпынку. Растлумачце, чаму ў астатніх сказах знак прыпынку паміж часткамі не ставіцца.*

1. Яшчэ гарэлі быццам зоркі кветкі ля дарог і васілёк красу бярог. 2. Зранку неба было і чыстае і яснае і яснасць доўга стаяла ўдзень. 3. Толькі ноч настае і ўзрываюцца падаюць зоры. 4. Май. Чаромхавая замець і пошчак салаўіны. 5. На зямлі стаяла ноч і было цёмна. 6. Даўно адцвілі верасы і травы павялі. 7. Сярэдзіна лета. Шчодрае сонца і лагодны дождж. 8. З гары адкрываліся прыгожыя краявіды і Яворскі залюбаваўся імі. 9. Быў верасень і жаўталістая восень ужо пазалаціла кроны дрэў. 10. Толькі зрэдку пачуецца стук дзятла ці жаўны ды ўпадзе на зямлю пераспелая шышка. 11. Жнівень. Жытнія мэндлі і грэчка ў пахкай красе.

## Складаназалежныя сказы

**360.** *Вусна ўзнавіце прапушчаныя знакі прыпынку, растлумачце іх. Выпішыце складаназалежныя сказы, у якіх дададныя часткі звязваюцца з галоўнымі пры дапамозе слова* ***што****. Вызначце, дзе гэта слова — падпарадкавальны злучнік, а дзе — злучальнае слова.*

I. Свет Купалы даўно ўжо стаў маім, як і ўсіхным, мусіць светам. Свет цікавы вялікі намнога большы за той што маглі даць бацькі, маё сціплае асяроддзе і мой час. У гэтым свеце прасторна адчуваеш сябе з усім сваім бачаным і перажытым. Купалаўскае нічога не засланяе ў табе. У свеце Купалы лёгка здорава дыхаецца добра думаецца. Глядзіш на адкрытыя ім далягляды і ўяўляеш што ты сам усё гэта заўважыў вось толькі што. Кожны раз да чаго б купалаўскага ні дакрануўся ўзнікае адчуванне запаведнай свежасці і чысціні.

Трэба дзякаваць долі што мы, беларускія паэты, маем Янку Купалу. Ён першы пачынаў. Са здаровай сялянскай увішнасцю ўрабляў камяністае поле роднай літаратуры. І вырасціў такі ўраджай здабыў такія зерні што на нас пачалі з павагай глядзець блізкія і далёкія народы. *(Паводле А. Пысіна)*

II. Адам Ягоравіч пісаў успаміны пра сына праз шэсць гадоў пасля ягонай смерці. Была іронія гісторыі іронія ўласнага лёсу ў тым што магчыма не здолеў да канца зразумець Адам Ягоравіч. Іронію праўда ён

адчуў і выказаў гэта так: "Якая неадпаведнасць у тым што не ён пра мяне а я пра яго павінен пісаць успаміны". Ды справа тут не толькі ў тым што бацька перажыў сына…

Сапраўды якая трагічная неадпаведнасць! Проста вучоны непрызнаны вучоны А.Я. Багдановіч павінен пісаць успаміны пра свайго сына найвыдатнейшага беларускага паэта якому калі ён памёр не было нават дваццаці сямі гадоў. Проста вучоны непрызнаны вучоны А.Я. Багдановіч пазней піша ўспаміны пра Горкага якія праз многія гады ўпершыню будуць выдадзены ў Беларусі, на яго і сынавай радзіме. Як бы ні аддаляўся Адам Ягоравіч ад радзімы здзеклівы лёс прыводзіў яго толькі сюды. *(Паводле М. Стральцова)*

**361**. *Вусна пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку, раскрыйце дужкі. Запішыце складаназалежныя сказы, вызначце сродкі сувязі дадаcontaining частак з галоўнымі. Падкрэсліце граматычную аснову ў кожнай састаўной частцы складанага сказа.*

Калі ста..ш каля руін *(Н,н)*..ваградскага замка чу..ш здаецца пра што яны гавор..ць... Н..ваградак, ліч..ць некаторыя гісторыкі, заснаваны яшчэ Яраславам *(М,м)*удрым які быў сынам *(К,к)*іеўскага князя Уладзіміра і *(П,п)*олацкай князёўны Рагнеды. Сілком выв..з..*(н)*ная ў Кіеў, вярнулася Рагнеда назад, на родную зямлю.

У добрым сусе*(дс,ц)*тве з *(Б,б)*алтамі рос *(С,с)*лавянскі Н..ваградак прыгожы багаты горад культура якога была вядома ў далёкіх землях. Паступова *(Б,б)*алты і *(С,с)*лавяне жывучы разам зліліся перамяшаліся як бы парадніліся адзін з адным.

*(Н,н)*..ваградскае *(К,к)*нства з цягам часу аб'ядналася са *(С,с)*таражытнай *(Л,л)*ітвой. Новую дзяржаву назвалі *(В,в)*ялікім *(К,к)*няствам *(Л,л)*ітоўскім, а Н..ваградак стаў першай сталіцай гэтага княства.

Так склалася што наша гісторыя чатыры стагоддзі была звязана з Польш*(ч)*ай. Цесна звязана яна з Літвой і, вядома, з Расіяй. Перакройваліся нашы межы мяняліся але вечна жыў на гэтых землях народ. Час яму ведаць сваю гісторыю, беражліва разблытаць вузлы, спляцен..і р..знакаляровых нітоў, вярнуць тое што яму належ..ць *(з,с)*прадвеку.

Н..ваградак — таксама наша спадчына. *(Паводле В. Іпатавай)*

● *Назавіце ў тэксце аднасастаўныя сказы, вызначце іх тыпы.*

**362.** *Спішыце, пастаўце знакі прыпынку. Назавіце галоўную і даданую часткі ў складаназалежных сказах, вызначце від даданай часткі, сродак яе сувязі з галоўнай. Падкрэсліце граматычныя асновы ў галоўнай і даданай частках.*

1. Хто не шануе чужога той і свайго не мае. *(Пр.)* 2. Які куст такі і адростак. *(Пр.)* 3. Якая птушка такое і гняздзечка. *(Пр.)* 4. Хто доўга спіць той хлеб толькі сніць. *(Пр.)* 5. Які розум такая і гаворка. *(Пр.)* 6. Якое пытанне такі і адказ. *(Пр.)* 7. Хто на шпаргалкі спадзяецца той без ведаў застаецца. *(Пр.)* 8. Што аднаму з цяжкасцю даецца тое калектывам лёгка бярэцца. *(Пр.)* 9. А далей здарылася тое з чаго пачалося гэтае апавяданне. *(Вас.)* 10. На вуснах у цябе сняжынка растае. І смешна што яна не мае сілы. І дзіўна што з такіх, падобных да яе, сумёты аж пад неба накруціла. *(В.Р.)* 11. Тое што стагоддзямі беражліва захоўвалася нашымі продкамі павінна быць сабрана і перададзена нашым нашчадкам. *(Ненад.)* 12. Ты чуеш, маці, вось твае ўнукі, з маленства ім цябе нестае. Здаецца мне што ў іх такія рукі, і валасы, і вочы, як твае. *(Грах.)* 13. Бацькам нярэдка здаецца што дзеці недадаюць ім што ім, як старэйшым у родзе, належаць нейкія правы ў адносінах да маладых. *(В.Б.)* 14. Хто забыў сваіх продкаў сябе губляе. Хто забыў сваю мову ўсё згубіў. *(Каратк.)*

**363.** *Запішыце сказы, замест кропак устаўце патрэбныя злучнікі ці злучальныя словы, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Вызначце віды дадыных частак — дзейнікавыя ці выказнікавыя. У састаўных частках падкрэсліце граматычныя асновы, вызначце тыпы выказнікаў, сінтаксічную ролю злучальных слоў.*

1. … цураецца радні … цураецца сяла той як птах без вышыні той як хата без цяпла. *(Шн.)* 2. Чамусьці сёння цішыня такая … сесці хочацца і патужыць. (*Каратк.)* 3. … любіць і шануе красу зямлі той абавязкова бывае і шчырым яе абаронцам. *(Кір.)* 4. Усё … сёння трывожным здаецца заўтра стане малым успамінам. *(Ген.)* 5. Як добра ... ва ўсе вякі жывуць на свеце дзівакі. *(Грах.)* 6. Зімой згодзіцца … ўлетку родзіцца. *(Пр.)* 7. … згублена лёс не вяртае. *(Ак.)* 8. Не збярэ жнівом ураджаю … вясну маладую праспіць. *(Ген.)* 9. … карэнне такое і насенне. *(Пр.)* 10. … народ такі й паэт. … паэт такія й людзі. *(Ак.)*

**364.** *Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы з дадзенымі дзейнікавымі часткамі, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку, назавіце сродкі сувязі частак. Падкрэсліце ў частках граматычныя асновы, вызначце, якому простаму сказу — двухсастаўнаму ці аднасастаўнаму — адпавядае будова галоўнай і даданай частак.*

“Лунную санату” Бетховена Валя магла слухаць бясконца. Павольныя ціхія, нібы сарамлівыя гукі адажыо адразу ж прыносілі нейкі супакой, ціхамірнасць і яна злівалася з музыкаю нібы раствaралася ў ёй. Валі нават здавалася што музыка якраз і ёсць яна сама, толькі выяўленая ў нейкім іншым, невядомым ёй да гэтага стане. Гэтая ціхамірнасць адразу ж выклікала даўні і светлы ўспамін: жоўтая восень, цёплы сонечны дзень

пасля ўрокаў, яна, яшчэ школьніца... А навокал сонца апалае лісце пад нагамі цеплыня і цішыня якія бываюць толькі ў апошнія дні восені. І ціхая, нібы прыглушаная, музыка з акна шматпавярховага дома. Ёй нават чамусьці здавалася тады што гукі музыкі былі каляровыя: і жоўтыя, як лісце пад нагамі, і блакітныя, як неба над галавою, і зялёныя, як трава пад лісцем. І яшчэ Валю здзівіла што музыка так можа хваляваць і непакоіць змушаючы адгукацца на яе ўсёю душою. Яна не ведала яшчэ тады што гэта была саната Бетховена. *(Паводле Я. Сіпакова)*

**365.** *Прааналізуйце складаназалежныя сказы: назавіце словы (ці словазлучэнні) у галоўнай частцы, з якімі звязваецца даданая, вызначце від даданай часткі — азначальная ці дапаўняльная, сродкі сувязі частак — злучнікі ці злучальныя словы. Пастаўце знакі прыпынку.*

1. Слова — ні з чым не параўнанае багацце якое здабываецца ў пакутах а аддаецца задарма. *(М.Л.)* 2. І казачным вечарам гэтым пазнаю, быць можа, у табе таго каму сэрца санеты складала з адчаю ў журбе. *(Кар.)* 3. Агонь што ледзь з туману прабіваецца сустрэчаю з маленствам называецца. *(Кам.)* 4. Словам я сцверджу ўсё што люблю ў народзе сваім і ў сваёй Беларусі. *(Бр.)* 5. Ты горад мой даруй мне што кожнаю вясной ірвуся я да руні да засені лясной. *(Бур.)* 6. Гісторыя не могільнік глухі дзе подзвігі людскія і грахі з нябожчыкамі разам закапаны. Гісторыя балючая як рана. *(Карж.)* 7. Здаўна жыла-была думка што жаваранак гэта вясна раніца. *(В.К.)* 8. Ён ступіў на мілую зямлю ўсю ў бляску і ззянні заінелага студзеня і амаль фізічна адчуў што́ ён страціў пакінуўшы гэту зямлю. *(Вас.)* 9. Даўно пажалі тое жыта і тыя межы зааралі што дзядзькаў смутак калыхалі. *(К-с)* 10. Я горка вінаваты што рваўся так, прасцяк, з вясковай цеснай хаты на гарадскі прасцяг. *(Бур.)* 11. Я рада што праз груд гадоў не развучылася смяяцца што выняньчаны мной радок не можа з іншымі змяшацца. *(Янішч.)*

**366.** *Спішыце сказы, пастаўце знакі прыпынку. Вызначце віды дадзеных частак, іх месца ў адносінах да галоўных. Назавіце сродкі сувязі дадзеных частак з галоўнымі.*

1. Я вярнуся туды дзе яшчэ не была — да расы да зары да світальнай усмешкі. *(Янішч.)* 2. Пакуль баліць душа з надзеяй можа біцца сэрца. *(Бар.)* 3. Жыву між зямлёй і небам каб стаць з цягам часу асобна зямлёй і асобна небам. *(А.Р.)* 4. Я на раздарожжы не заблуджуся і не збочу каб чакаць падмогі. *(Б.-З.)* 5. Шчасця хітрую жар-птушку не зловіш за агністы хвост як ні прыладжвай ёй кармушку як ні бяжы за ёй наўпрост. *(Бур.)* 6. І пакуль з табою вопыт будзе старасць ціха адплыве ў чаўне. *(Бар.)* 7. З маленькіх пачуццяў не зродзіцца верш як з пустога вядзерца вада не нальецца. *(Ген.)* 8. Духоўнае жыццё дзіцяці паўнацэннае толькі тады калі яно жыве ў свеце

гульні казкі музыкі фантазіі творчасці. *(Віт.)* 9. Так адчайна і хутка мы восень каханнем назвалі як наіўна і лёгка вясну адпусцілі калісьці. *(В.Р.)* 10. Я сёння настолькі багатая што ўжо не баюся збяднець! *(Янішч.)* 11. Як бы добра ні жылося недзе на чужыне будзе ўсё ж шумець калоссем у сэрцы край наш сіні. *(Ген.)* 12. На тое і было ў прыродзе лета каб назбіраць цяпла на ўсё расстанне. *(В.Р.)* 13. Хоць навокал хамства расцвіло не збірайце для душы атруту і нікому не рабіце зло нават і ў адчайную мінуту. *(Бур.)* 14. Як толькі можа ўвысь заглянуць вока ў вырай цягнуць у небе жураўлі. *(Пестр.)*

**367.** *Спішыце сказы, замест кропак устаўце патрэбныя злучнікі або злучальныя словы. Пастаўце знакі прыпынку, вызначце віды дадаых частак.*

1. … я ўслухваюся ў непаўторны голас Марыі Захарэвіч то чую радасны звон вясновых ручаёў ласкавы плёскат нарачанскіх хваляў клапатлівую мядовую песню пчалы. *(С.З.)* 2. *Ды хіба ж загадаеш каму* … гады над табою і мною ўлады не мелі. *(Грах.)* 3. Удзень … падымалася сонца ўсюды абуджаліся тысячы гаваркіх ручайкоў. *(Кр.)* 4. Хочацца ў поле йсці сцежкай вузкай і … *калісьці Хрыстос у пустыні* маліцца і плакаць душой беларускай. *(Ген.)* 5. … толькі ты … пайшоў сустрэне прырода жывая. *(Бур.)* 6. Мне так баляць мае забітыя жаданні … *нават страшна ад з'яўлення новых. (В.Р.)* 7. Яўгенія Янішчыц увайшла ў беларускую паэзію так … гаспадыня ўваходзіць ва ўласны добра абжыты дом,— свабодна нязмушана і натуральна. *(Буг.)* 8. Але ў тое сваё першае наведванне родных мясцін я так нікому і не адкрыўся не прызнаўся … я тутэйшы вырас на тутэйшых росах. *(Каз.)* 9. Я шчыра люблю неспакойных і смелых тых … сабе не даруюць віну люблю маладых і люблю пасівелых вясёлых люблю а кахаю адну. *(Грах.)* 10. Крылы — цяжар … *у іх не верыш зацята. (Я.С.)* 11. Нават мары пра вясну даволі … вясна цвіла ў жыцці тваім. *(Вяр.)* 12. ... *цягне зямлю мне адшукаць святую, той расквечаны край без тугі і самот* але й там я мільёны разоў пашкадую і вярнуся сюды да палескіх балот. *(І.Л.)*

Д л я  д а в е д а к: *што, каб, ледзь толькі, калі, куды б ні, як, хоць і, пакуль.*

● *Вызначце, будове якога простага сказа адпавядаюць выдзеленыя часткі — двухсастаўнага або аднасастаўнага, поўнага або няпоўнага.*

**368.** *Запішыце складаназалежныя сказы, вызначце віды дадаых частак, назавіце сродкі іх сувязі з галоўнымі. Раскрыйце дужкі, пастаўце і растлумачце знакі прыпынку.*

Чалавек *(не)* выбірае радзіму. Яна даецца яму разам з матчыным малаком аднойчы і на ўсё жыццё. Куды *(б) (ні)* закінуў яго лёс а сэрца помніць той сціплы куточак вялікай Зямлі Людзей які падарыў першыя чалавечыя радасці.

Мая малая радзіма гэта край які прасціраецца па левым беразе *(прыгажуні)* чараўніцы *(З,з)*ходняй Дзвіны. Зямля тут *(не)* надта ўрадлівая — падзол пяскі гліна а яшчэ камяні і валуны якія амаль мільён гадоў таму назад ледавік упарта цягнуў з Фінляндыі і Швецыі. Рас*(с)*ыпаў так шчодра што сёння на многіх бульбяных палетках вос*(е,я)*нню камбайны падымаюць больш камянёў чым клубняў. Але *(не)* багатая на ўраджай мая зямля каб *(не)* пакрыўдзіць людзей кампенсуе гэты *(не)* дахоп сваёй *(не)* звычайнай прыгажосцю.

Па беразе нашай галоўнай ракі цягнуцца бары і нават пушча дзе растуць *(медна)* ствольныя карабельныя сосны выносныя гонкія. У нас кажуць: ”Сосны з небам гавораць”. Яны як звонкія струны нацягнутыя паміж зямлёю і небам. У любую пару года хочацца слухаць як на гэтых дзівосных цымбалах *(ня)* ўрымслівы вецер іграе то ціхія лірычныя то магутныя арганныя мелодыі. *(Паводле С. Законнікава)*

**369.** *Назавіце разнавіднасці складаназалежных сказаў з некалькімі даданымі часткамі. Вызначце віды даданых частак. Растлумачце знакі прыпынку. Пабудуйце графічныя схемы першых трох сказаў.*

1. Нашы маці цераз вопыт многіх пакаленняў добра ведалі, што першаасновы душэўнага хараства чалавека пачынаюцца з калыскі, з той самай простай, геніяльнай у сваёй мудрасці і паэтычнасці песні, якая называецца — калыханка. *(Віт.)* 2. Па красках, што сляды мае заткуць, я так спяшаюся, бо я павінен падняць галоўку кожнаму квятку і ўзняцца кожнай памагчы травіне. *(Я. С.)* 3. Калі дрэва разлучаюць з жыццём і яно падае долу, карані яшчэ гоняць па перарэзаных жылах цалюшчы сок памяці, яшчэ спадзяюцца на дзіва, яшчэ бязгучна крычаць штосьці нежывым галінам і лістоце. *(У. А.)* 4. Спачуваю чалавеку, калі ён б’ецца над пытаннямі, калі да яго прыходзяць сумненні, калі яго спасцігаюць расчараванні. (*Вярц.)* 5. Дзе ні йду, я заўжды падніму найпрыгажэйшага дрэва насенне, што тужліва сцінаецца ў жмені, прадчуваючы злую зіму. *(Карж.)* 6. Добра пайсці ў лес аднаму і моўчкі слухаць, як у сівым кудлатым тумане над вадой б’юцца прыгожыя гукі, як растаюць яны водгуллем недзе там, за Дняпром, дзе спяць сенажаці. *( Зар.)* 7. І можа, шчасце ў тым і ёсць, каб не напіцца з той крыніцы, перад якой ты — вечны госць! *(А. Л.)*

**370.** *Запішыце сказы, пастаўце знакі прыпынку. Вызначце віды падпарадкавання даданых частак — паслядоўнае, сузалежнае (аднароднае ці неаднароднае), змешанае.*

1. Я веру што і ў кветак ёсць душа якая адгукаецца, жывая, калі іх нехта ад дажджу хавае ці палівае ў спёку з гладыша. *(Бур.)* 2. Калі марнею ад нягод і сэрцу цесна я ўспамінаю радавод і продкаў песні. *(Пісьм.)* 3. Можа, таму што ў маладосці часта прыходзілася даношваць нечыя боты, нечую вопратку якія заўсёды былі то завялікія то замалыя я цяпер асцерагаюся і чужых думак. *(М.Т.)* 4. Калі не мне вясну пачуць калі не мне ісці па травах сябры мае што злева справа замоўкнуць песні не дадуць. *(Янішч.)* 5. І я ўсё чамусьці забываю што знік той дзень загублены ў цішы што час ляціць што ты ўжо не тая і што даўно я знік з тваёй душы. *(Каратк.)* 6. Жыццё кароткае як ноч што забівае і вечнае як верш які з душы ўсплывае. *(Шн.)* 7. У сэрцы ўваскрасае жальба што няма бацькоў і мае шляхі-дарогі мае гасцінцы і сцежкі з кожным годам скарачаюцца. *(В. А.)* 8. У паратунку бласлаўляю хату што вынесла ваенны дым і страту што не маўчыць калі прыеду позна і позна сяду за шырокі стол. *(Янішч.)*

**371.** *Вусна пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Выпішыце складаназалежныя сказы, вызначце віды даданых частак, сродкі іх сувязі з галоўнымі або іншымі даданымі. Пабудуйце схемы сказаў з сузалежным і змешаным падпарадкаваннем даданых частак.*

I. Край дзе чалавек жыў у шчаслівую пару сваёй маладосці дзе ў размовах і забавах сустракаў сапраўдную шчырасць і даверлівасць душы зычлівых і добрых сяброў — гэты край у памяці выгнанніка заўсёды паўстае ў найпрыгажэйшых колерах. Там здаецца яшчэ не скончыўся той залаты век калі чалавек не разумеў што такое нядоля і пакуты. Рэчкі там з малака і мёду. Хто ж з краёў далёкіх не сумуе па сваіх ваколіцах? Там нашы жаданні і думкі жывуць туды хацеў бы ляцець я на крылах! *(Паводле Я. Баршчэўскага)*

II. Калі адыходзіў з родных мясцін у новае неспазнанае жыццё ведаў што пражывеш не гэтак як бацькі тваіх бацькоў што зжывалі век за векам не ведаючы ні таго прастору ні вялікага свету што адкрываўся табе. У маладосці заўсёды шчасліва думаецца і верыцца што будучае тваё жыццё — адно толькі свята.

А цяпер калі радасць і слодыч перажытага ляжаць на тваіх руках цяжкім мазалём прасвечваюцца беллю сівізны на скронях часам можа падумацца і пра такое: там дома, відаць, лепш і патрэбней пражылося б тваё жыццё. Мусіць таму і пачынаюць сніцца радасныя светлыя прасоленыя журбою сны. У мяне гэтая пара́ сноў і позняга вяртання назад дадому пачынаецца якраз у жніўні калі чуваць ужо жураўліная туга ў прасторных і сонечных даляглядах калі асмужацца рабінавыя гронкі і з прыдарожных лазовых кустоў ападзе долу першае лісце. *(Паводле А. Жука)*

**372.** *Прачытайце тэкст, вусна пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Выпішыце складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі, вызначце віды падпарадкавання. Назавіце сродкі сувязі частак, вызначце віды даданых частак.*

Няўмольная сутнасць жыцця: “Застаецца тое, што ты пакінеш...” Ты дарагі бацька пакінуў пасля сябе трох сыноў і дачку пакінуў дом што зладзіў сваімі рукамі пакінуў дрэвы якія шмат каго радавалі вясною разлівам белай квецені. Усё сваё жыццё ты вучыў нас, сваіх дзяцей што чалавек — дзіця свайго часу. А час — гэта я, гэта ты, гэта мы, гэта тое на што мы здольныя гэта тыя святыні на якія мы молімся. Пад тваім бацькоўскім наглядам мы спасцігалі ісціну што засвоіў ты ад дзядоў сваіх: не час мінае а мінаем мы. І гэта такая ж праўда святая, як і тое што я пачуў аднойчы ад цябе калі выскачыў ранкам з хаты і ўбачыў на клумбе каля тэрасы чырвоныя ружы. І ты сказаў тады што ўначы ружы набіраюцца моцы а зацвітаюць ранкам. Тады, у маленстве, я не разумеў колькі мудрасці было ў той простай тваёй выснове...

Калі ж чалавек не моліцца памяці бацькоў і дзядоў калі не ахоўвае святыні свайго народа дык на ягонай дарозе ружы не зацвітуць ніколі. А яны павінны цвісці штогод радуючы наша вока і вочы новых пакаленняў што пойдуць па бацькоўскіх слядах. *(Паводле А. Савіцкага)*

**373.** *Адзначце сказы, у якіх слова* ***што*** *з’яўляецца займеннікам і выступае ў ролі злучальнага слова.*

1. Шматгалоссе плыве над зямлёй, *што* была і Чарнігаўскім княствам, і вялікаю вольнай Літвой. 2. Я цябе частую так спакусна, *што* сама паверыла ў каханне. 3. Коцікі на вярбе, *што* намякнуліся паказацца на свет, прытаіліся, чакалі цяпла. 4. І зноў прысніўся лес, *што* ў марыве нябескім на ручніку вясны падносіць мне пралеску. 5. Зямля здаецца гэтакай маленькай, *што* змераць лёгка птушчыным крылом. 6. Ранішняе зімовае сонца такое яркае, *што* аж баляць вочы. 7. Сонца яшчэ такое шчодрае, *што* верыцца ў працяг лета. 8. Ты скажаш, *што* песня не прапета і *што* сёння вясна, а не бабіна лета. 9. Вітанне сонцу, *што* між хмар вяслуе, гаям, траве, падлетку-жаўруку. 10. Дагнаць мне тое трэба, *што* ўпусціла, седзячы ў журбе. 11. Заглядаю ў вёску, як у слоўнік, каб упэўніцца, *што* правільна пішу. 12. Як позна зразумеў, *што* на зямлі бацькоўскай няма бязмоўных дрэў, маўклівых валуноў. 13. Журба ішла не толькі ад таго, *што* поле галела, *што* ў ім адчуваўся нядобры, пагібельны подых недалёкай восені.

**374.** *Адзначце нумары сказаў з дадзенымі дзейнікавымі часткамі.*

1. Зімовыя мяцеліцы, што заносілі снегам шашу, супакоіліся. 2. Тады здавалася, што ў яловы гушчар заплыў і застаўся там назаўсёды густы восеньскі туман. 3. І настаў такі час, што пралітыя слёзы перапоўнілі неба і паліліся назад на зямлю. 4. Тое, што бацька вяртаецца з нейкімі навінамі, крыху трывожыла Макарку. 5. І раптам яму ўявілася, якім страшным, нават жудасным здаваўся б ён з касою кветкам. 6. У яго сэрцы жыве родная мелодыя як успамін пра тую зямлю, што ўзгадавала яго. 7. На душы было радасна, што кожны крок яго набліжае к роднаму дому. 8. Усё, што нагадвае пра дзяцінства, чалавек зберагае ў душы і перадае дзецям сваім. 9. Здзіўляюся ўсмешцы немаўляці, што цмокае губамі і гудзе, і прыгажосці маладзенькай маці, што прытуліла сына да грудзей. 10. Успамінаюцца сустрэчы і самыя шчаслівыя часы, што і цяпер здаюцца нам вясною. 11. І будзе відаць у сусвеце, як неба святкуе Купалля пару на трыццаць другім маім леце. 12. Тое, што Ефрасіння Полацкая зрабіла для асветніцтва роднай зямлі ў сваю эпоху, яднае стагоддзі.

**375.** *Назавіце нумары сказаў а) з паслядоўным падпарадкаваннем дадзеных частак; б) з сузалежным падпарадкаваннем дадзеных частак.*

1. Я знаю толькі адну зорку — пяцікрылую далонь маці, на якой выраслі мы, наш хлеб, нашы песні, святло якой вечна струменіць. 2. Думаю пра тое, што, мабыць, з гэтай парослай муравою сцежкі, што вядзе ад бацькоўскай хаты ў далёкі свет, пачынаецца Радзіма. 3. Раскінутае на высокім беразе прыгожае сяло так прыціскалася да круч, што, здавалася, імкнулася ўбачыць, куды гэта бягуць рачныя воды. 4. Быццам цяпер чую, як пявуча шастаюць каласы, як лёгка серп пераразае пруткую жменю сцяблін. 5. Як бы ні гаварыў паэт сам пра сябе і як бы ні хвалілі яго крытыкі, ён уваходзіць у памяць, у пачуцці людскія творамі. 6. Бывае вецер ласкавы, якога толькі і хапае, каб пяшчотна пагладзіць траўку ды пашаптацца з закаханымі. 7. Тут, дзе вучыўся араць і сеяць, адкуль панёс і песню ў свет сваю, я з пасівелай галавой стаю і слухаю асін журботны шэлест. 8. Народная мудрасць гаворыць, што чалавек, які дзе-небудзь пасадзіў дрэўца, ніколі не пакіне думкамі той мясціны. 9. Той дзень прапаў і страчаны навекі, калі ты не зрабіў таго, што мог, калі не паспрыяў ты чалавеку, няшчыры быў, зманіў, не дапамог.

## Бяззлучнікавыя складаныя сказы

**376.** *Прачытайце сказы з адпаведнай інтанацыяй, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Дзе магчыма, вусна перабудуйце бяззлучнікавыя складаныя сказы ў складаназлучаныя або складаназалежныя, вызначце ў іх сэнсавыя адносіны паміж часткамі.*

1. Месяц сее нябесныя іскры на халодныя буйныя росы, сваю зелень красы драбналістай расплялі прыгажуні-бярозы. *(Пестр.)* 2. Ужо зацвілі верасы; пышнае ўбранне лісцвяных дрэў, асабліва бяроз, сям-там пачынала жаўцець; даспелы ліст, зрываючыся з галінак ад лёгкага подыху, трапятаўся, як матылёк. (*Пасл.)* 3. Мы — тройчы дзеці ў вечным крузе: мы — дзеці роднае сям'і, і — дзеці Маці-Беларусі, і — дзеці Матухны-Зямлі. *(Гіл.)* 4. Што ж, і сама я ўразумела: на вуснах з горыччу святла жыву няўтульна і няўмела, з нязменнай прагаю крыла. *(Янішч.)* 5. Вясна — фіялетавы май, лета — чабаровы чай, восень — сутонне імжы... *(Г.В.)* 6. Хацеў сказаць слова — язык не паварушыўся, хацеў бегчы за Максімам — ногі не слухалі. *(К-с)* 7. Мая мова не знае змярканняў: ад маленства да старасці лет буду песціць яе, як каханне, разглядаць, як чароўны букет. *(Ген.)* 8. Такі спрадвечны лёс мужчын: рвануцца з мілых рук, пайсці і зноў перамагчы сто слот і завірух, заблытаць тысячу дарог... *(Бур.)* 9. Мастак ведаў: адным-двума колерамі, нават самымі цёплымі, душы не сагрэць. *(В.К.)* 10. Умее настаўнік — будзе ўмець вучань. *(В.В.)*

**377.** *Запішыце сказы, пастаўце знакі прыпынку. Вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі. Адзначце сказы з магчымымі варыянтнымі знакамі прыпынку, патлумачце прычыны такой з'явы.*

1. Восень няўстойлівая ў канцы верасня выпадаў снег у кастрычніку былі прымаразкі. *(І.Н.)* 2. Птушкі жывуць інакш чым людзі яны шчаслівейшыя за людзей. *(Кап.)* 3. Чарот у кольцах ледзяных шапоча пра вясновы вечар. Замоўкне свіст віхураў злых туман атуліць зябка плечы. *(Бар.)* 4. Я доўга азіраўся адкуль струменіць такі тонкі амаль няўлоўны і неспазнаны водар? І нарэшце здагадаўся гэта ж пахне ён бадзяк! *(Я.С.)* 5. Вяртаючыся з грыбнога падарожжа прыемна захапіць з сабой галінку верасу яна доўга будзе захоўваць свой колер, свяціць нейкім дзіўным амаль няўлоўным восеньскім сумам. *(Парх.)* 6 Уявіш ужо зарослы лопухам, быльнікам і баркуном родны надворак душа зашчыміць і абальецца гарачынёю жалю. *(В.А.)* 7. Раны і трэшчыны нашых світальных гадоў у сэрцы бясследна не зарубцуюцца яны, асабліва ў дні нават дробных няўдач, пачынаюць пакутліва ныць і шчымець. *(М.Д.)* 8. Сцяжынка збягае ў восень кароткае лета прайшло. *(Грах.)* 9. Ужо не дацягнуцца да дзяцінства не так даўно юнацтва адгуло. *(У.В.)* 10. Міла бомы смяюцца ў цішы ціха срэбрам грукае крыніца. *(Багд.)*

**378.** *Вусна ўстаўце прапушчаныя літары, знакі прыпынку, раскрыйце дужкі. Выпішыце бяззлучнікавыя складаныя сказы, вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі. Пакажыце магчымасць перабудовы сказаў у злучнікавыя — складаназлучаныя або складаназалежныя.*

У асеннім лес.. цішыня спакой і царства фарбаў колераў. *(Н..)* зварухнецца *(н..)* адна галінка на дрэв.. . А дрэвы ў гаі — быццам у казачным палац.. . Верасень ужо кінуў на дрэвы крыху розных фарбаў. *(Не)*чакана бярозавы лісток ціха лёг мне на плячо. Я асцярожна ўзяў яго, угледз..ўся: колькі сонечнага цяпла падаравала яму лета! І яшчэ мне здалося часцінка гэтага цяпла так і засталася ў ім.

Крочу па зялён..м мякк..м мох.. далей які цудоўны дыван разаслала тут прырода! Бярозы рас*(с)*тупаюцца быццам хоч..ць даць камус*(ь)*ці месца. На *(н..)*вялікай палян.. стаіць магутны дуб. Ва ўсёй яго постаці столькі гонар.. што бярозы нават баяцца пады*(й)*сці да яго блізка. Яны тоўпяцца *(на)*вокал такія стройныя беланогія як тыя дзяўчаты ў карагодзе.

Раптам у лесе штос*(ь)*ці загуло. Я зірнуў *(у)*гору вершаліна дуб.. *(з)*лёгку варухнулася, потым яшчэ і яшчэ. Там *(у)*версе налятаў вецер. І дуб першы прыняўшы яго на сябе як *(бы)* папярэджваў сваіх суседак бярэцца вецер я прыкрываю вас, як магу, але ж і вы трымайцеся. І ў тую ж хвіліну дробна зашамацела лісце на бярозках дрэўцы нібы дзяк*(а)*валі яму дубу за перасцярогу за клопат пра іх...

Я доўга ўспам..наў гэту сустрэчу з бярозавым гаем у вушах маіх так і стаяла яго трывожная песня. І мне падумалася жыццё лес.. шмат у чым падобнае на жыццё людзей. *(Паводле М. Шыманскага)*

**379.** *Назавіце сказы, у якіх знакі прыпынку паміж састаўнымі часткамі знарок пастаўлены няправільна. Пастаўце патрэбныя знакі прыпынку, растлумачце іх, сказы запішыце.*

1. Прырода не дазваляе з сабой жартаваць — яна, заўсёды праўдзівая, заўсёды сур’ёзная і суровая, цураецца беднага духам, скараючыся, адкрываючы свае таямніцы толькі таленавітаму, сумленнаму і чыстаму. *(Т.Б.)* 2. Трапіш да кабеціны рахманай: паспытаеш, друг мой дарагі, дранікі са свежаю смятанай, бабку, клёцкі, нават пірагі. *(Панч.)* 3. Шапні, да цябе прыбягу праз сто ашалелых завеяў. *(Сал.)* 4. Як позна ліпы сёлета цвітуць: было так доўга холадна і хмарна. *(Панч.)* 5. Хочаце ўбачыць сябе вачыма дзяцей: прыгледзьцеся да іх гульняў. *(Віт.)* 6. Не трэба нянавісці: ад яе ўсё гора на свеце, і боль, і пакуты, і прыніжэнне чалавека. Вучыцеся любіць: любоў узбагачае сэрца і душу. *(Кір.)* 7. Нас грэлі цёплыя пракосы; над намі воблакі плылі; як з келіха, ад смагі росы з лілеі белае пілі. *(Грах.)* 8. Дзіўны гук уразіў мой слых, недзе далёка, як мне здалося, справа ад мяне спяваў паляўнічы рог. *(Каратк.)* 9. Нам памагае ўбачыць Час: тут толькі попел, там — алмаз, тут — зерне, там — палова, тут — пустазвонства гучных фраз, там —ісціннае слова. *(Вярц.)* 10. Хадзіў я па лесе і сведчу — ад звонкіх аглух галасоў. *(Панч.)*

**380.** *Выпішыце бяззлучнікавыя складаныя сказы, пастаўце і растлумачце знакі прыпынку, вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі. Вусна ўзнавіце прапушчаныя знакі прыпынку ў астатніх сказах тэксту.*

Восеньскія дзянькі на дзіва ясныя, цёплыя ў разгары бабіна лета. Капаю на агародзе бульбу і час ад часу даю адпачыць не так целу, як вачам якія стаміліся ўзірацца ў баразну. Разгінаюся гляджу навокал і не магу наглядзецца на родную старонку.

Дзівосны абсяг ляжыць на ўсе бакі і праз яго то знікаючы за паваротамі то паблісквaючы дугамі далёкіх плёсаў прывольна струменіцца Прыпяць. Зірнеш налева за пагоркамі, за пазалочанымі восенню ўзлескамі ўваткнуўся ў неба петрыкаўскі рэтранслятар. Паглядзіш прама за прысадзістымі стагамі цёмнай шчэццю стаяць дубровы. Глянеш направа за купкамі лазнякоў, за выцвілымі палеткамі відаць хаты роднай вёскі. Усе фарбы Палесся сышліся тут адцяняючы і дапаўняючы адна адну.

У гэту восень на бульбу быў неўраджай вымакла ўлетку на нізкіх мясцінах, была дробная. Дагоніш баразну з канца ў канец адзін кашэль бульбы назбіраеш. Таму і не было ў мяне вялікай ахвоты разграбаць бульбянішча дарэмная праца.

І раптам аднекуль з поўначы пачуліся тужлівыя гукі ад якіх сціснулася сэрца. Яны былі падобныя на жураўліныя але гэта было не курлыканне, а працяжныя воклічы расстання. Падняў галаву воддаль ад суседняй вёскі кружылася ў небе карусель. Птушкі развітваліся з радзімай. Развітваліся так быццам ніколі больш не ўбачаць гэтых родных палескіх абшараў. *(Паводле М. Капыловіча)*

**381.** *Прачытайце тэкст, вусна пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку, растлумачце іх. Раскрыйце дужкі, устаўце прапушчаныя літары. Выпішыце бяззлучнікавыя складаныя сказы, вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі.*

Цёпламу яснаму дню раду..цца кожная жывая істота. Над маёй галавой цінька..ць бе..клапотныя сініцы спрабу..ць моц сваіх крылаў імкліва нос..чыся ў небе прыгожыя ластаўкі. На мален*(ь)*кім лапік.. зямлі пад бярозай ідуць свае клопаты і турботы *(н..)*куды спяша..цца ц..гавітая мурашка *(у)*верх па сцяблінцы паўзе спакойная божая кароўка.

Над Прып..*(ц,цц)*ю сінее лес а..туль нясе густым водарам сатка*(н)*ным з пахаў хвоі прэлай зямлі грыбоў багун*(а,у)*. Шырокая лугавіна прымешвае свайго да гэтай багатай і р..знастайнай га*(м)*мы пахне аерам мурагом салодкай м..дуніцай.

Я думаю пра восень. Мабыць памыля..цца тыя паэты і піс..меннікі якія бач..ць у восені адно толькі зам..ранне жыцця. Усё *(ж)* ідзе *(як)*раз *(на)*адварот жыццё ў гэтую пару *(н..)* зам..рае а нараджа..цца. Яно проста

staіць перад пачаткам новага яшчэ шырэйшага круг.. . Бяроза пад якой я ляжу а..шумела зялёным лісц..м і паслала *(у)* свет можа міль*(ё,о)*ны новых бярозак схава*(н)*ных у яе л..тучым насенні.

Восень гэта рос*(с)*тані на вечных дарогах старога і новага жыцця. *(Паводле І.Навуменкі)*

**382.** *Выпішыце сказы, якія адпавядаюць схемам:*

а) [ ] — [ выражае дадатковае паведамленне ];
б) [ ] : [ паясняе, удакладняе слова ў першай частцы];
в) [ ] : [ дапаўняе першую частку]

1. На зямлю сырую ціха ночка пала бляскам-дрыгаценнем зорка замігала. 2. Бывае так паміж клапотаў, між працы тлумных вечароў агорне часам адзінота. 3. Агнявыя валаконцы ткуцца ў шоўк чырвоны гэта хмаркі ладзяць сонцу і зямлі карону. 4. Спадала гарачыня гусцелі фарбы наваколля духмяна пахла лугавой травой. 5. Як зманьвае, як спакушае перажытае як хочацца скупануцца ў светлай і жывой вадзе былых дзён! 6. Біяграфія ў песні маёй і ў мяне адна пад дзіравай страхой гадаваліся я і яна. 7. У Лынькова было яшчэ адно, як цяпер кажуць, хобі ён любіў фатаграфаваць праз агонь. 8. Цяпер я з гонарам магу сказаць нішто так не ўзвышае, не падымае на п’едэстал духоўнай годнасці чалавека, як мастацкая літаратура. 9. Цёплым крылом махне вясна расцвітаюць яблыні зноў. 10. Іван Мележ сцвярджаў усёй сілай свайго таленту гэтыя людзі не для паказу вам жывуць, не дзеля экзатычнай забаўкі.

**383.** *Адзначце сказы, у якіх паміж часткамі трэба паставіць: а) працяжнік; б) двукроп’е.*

1. Гарадь агнём рабіны зіма, відаць, не за гарой. 2. Чую ля вуха на кветцы загаманіла пчала. 3. У цёмным небе з’явіўся месяц засвяціліся зоркі. 4. З дубу зробіш кадзі як званы, загудуць паважна. 5. Нас грэлі цёплыя пракосы над намі воблакі плылі. 6. У славян да нядаўняга часу існаваў звычай першы сноп новага ўраджаю спавіваўся валошкамі і лічыўся імянінным. 7. Збылася мара паэта беларусы сталі людзьмі звацца. 8. Ціха каціла свае цяжкія хвалі Дзвіна ціха цякло над ёю неба. 9. Учора ішоў сцяжынкай паўз лугавую грыву і радаваўся зацвілі смолкі! 10. Народ паважаеш, адкрыта жывеш прыходзіць натхненне ад шчодрага сэрца. 11. Жыццё закон нязломны мае ніколі праўда не ўмірае. 12. Змалку мне доля казала такое трэба вучыцца без радасці жыць. 13. Пасылае маці думы ў свет па сына прылятаюць тыя думы бурай сіняй. 14. Я чую на ўзлеску верасовым зязюля лічыць і мае гады.

# Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак

**384.** *Якімі відамі сувязі аб’яднаны састаўныя часткі ў складаных сказах? Назавіце сродкі сувязі структурных частак і састаўных у межах структурных.*

1. І ўсё зноў па-ліпнёваму ажыве перад вачамі: плыве над Бярозай зіхатлівы поўдзень, то жывіцай, то чабаровым настоем дыхае з кручы высозны бор, і пад гэтаю пяшчотаю весела смяецца вада, уся светлая, адкрытая. *(Кір.)* 2. Зноў успомнілі вясну званкі, фіялкі, канюшына, іх кветкі не былі такія яркія і такія буйныя, як увесну, але ўсё ж і яны змушалі зірнуць на сябе, убачыць іх ціхую прыгажосць. *(Я.С.)* 3. Задрамлю, і, можа, зноў прысніцца, што прынесла з поплава сюды вечна маладая чараўніца прыгаршчы гаючае вады. *(Грах.)* 4. І я зразумеў: яна [вярба] прыйшла з далёкага свету, скуль нехта хоча да нас вярнуцца з вясеннім цветам. *(М.Т.)* 5. Прыслухайся: бяды не так яшчэ і многа, калі ступню пячэ адкрытая дарога, і сцелецца ў цішы сяброўская размова, і сцелецца ў душы *Купалавае* слова. *(Янішч.)* 6. Ды знаю: мяне зразумеюць не тыя, што гучна крычаць, а тыя, што плакаць умеюць і горка, самотна маўчаць. *(Бур.)*

● *Адкажыце, у чым неадпаведнасць граматычнай норме ў выдзеленым слове.*

**385.** *Спішыце сказы, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Абазначце лічбамі часткі сказаў: рымскімі — структурныя, арабскімі — часткі ў складзе структурных. Пабудуйце схемы сказаў.*

1. Праводзіш вачыма пажоўклы кляновы ліст які нехаця нібы пагойдваючыся ападае на дол і раптам уваскрэсне ў памяці блакітны летні дзень што таксама апаў-адляцеў з вечнага дрэва жыцця. *(Вар.)* 2. Ён стаяў і як зачараваны глядзеў на траву і да яго нібы аднекуль здалёку даходзіла што кожная травінка гэта ж заўсёды кветка якою трэба любавацца якую трэба шанаваць. *(Я.С.)* 3. Вечар быў млосны дзённая спёка ўжо сышла але ў паветры яшчэ патыхала духменем. *(І.М.)* 4. Міхась быў цвёрда ўпэўнены калі горад прайшоў праз стагоддзі не знік у іх не згарэў у пажарах войнаў ён набывае асаблівую высакароднасць свайго аблічча. *(Каж.)* 5. Тут неба нізкае цяжкае як безнадзейнасць ад яго аж гнуцца тундравыя хвоі ды асядаюць плечы гор. *(М.Т.)* 6. Любоў і праўда — вечныя святыні да ісціны надзейныя ключы яны дарогу да душы адчыняць каб дабратою злосць перамагчы. *(Грах.)*

**386.** *Запішыце сказы, пастаўце знакі прыпынку. Для сувязі дадзеных частак выберыце ў дужках патрэбны злучнік ці злучальнае слова. Вызначце від сувязі — злучальная або бяззлучнікавая — на мяжы структурных частак.*

1. *(Калі б, каб)* было прад людзьмі не ганебна моцна веру ў жыцці аднаму мне дажаць сваё поле патрэбна каб было з чаго сеяць яму. *(Р.Б.)* 2. Выдатныя раманы Івана Мележа будуць жыць доўга а вобразы створаныя ім пойдуць, як жывыя людзі, да новых пакаленняў *(каб, быццам)* расказаць нашым нашчадкам *(ці, як)* трэба працаваць змагацца кахаць. *(Панч.)* 3. Шумела, плыла ў ветры вясновая ноч недзе высока ляцелі дзікія гусі, гэтак высока *(наколькі, што)* відны былі ім зоркі *(чыіх, якіх)* не ўгледзіш з зямлі. *(А. Ж.)* 4. Ад бабулі давялося некалі пачуць *(што, дзе)* раней святочную літургію званоў тураўскіх падхоплівалі званы давыд-гарадоцкія і такая боская музыка напаўняла міжрэчча *(як, што)* паветра ажно свяцілася святасцю і добрасцю. *(У. Г.)* 5. Прыёмы працы ў Янкі Брыля не зусім такія *(нібы, як)* прынята ўяўляць яго рабочы стол гэта месца *(куды, дзе)* ужо завяршаюцца вынікі творчых пошукаў і знаходак *(куды,дзе)* манціруецца з вобразаў структура твора *(што, хто)* увасабляе праўду жыцця, яго соль. *(У. К.)*

**387.** *Прачытайце тэкст, вусна ўзнавіце прапушчаныя знакі прыпынку. Словы, што ў дужках, пастаўце ў патрэбнай граматычнай форме. Назавіце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі, запішыце адзін з іх, пабудуйце яго схему.*

Такія дубы цяпер рэдка дзе ўбачыш. *(Яны)* не чапіла рука людская толькі часы доўгія няўмольныя паклалі свой след пячаць глыбокай старасці. І многа ўсякіх змен *(час)* бачылі гэтыя нямыя сведкі прошласці! Жыццё многіх людскіх *(пакаленні)* прайшло перад *(яны)* і праходзіць бы тыя хвалі *(Нёман)* што пакручастым *(змей)* абвівае тут іх сялібу груд высокі і роўны а яны ўсё стаяць спакойныя важныя і жывуць сваім жыццём. Праходзяць дні ідуць сваёю чарадою зімы і леты з іх халадамі і спякотамі з іх бурамі і навальніцамі а яны спакойныя як чалавек які ўсё пераведаў на *(свет)* усё перажыў і ўжо *(нішто)* новага не чакае ад жыцця, апроч смерці…

У *(лес)* пачыналася ўжо тая ледзь значная змена той паварот *(час)* калі жыццё прыроды ідзе на спад. Скошаны луг і складзеныя курганамі стагі парыжэлыя ад дажджоў і сонца ўжо гаварылі пра гэта паміранне. *(Паводле Я. Коласа)*

**388.** *Вусна ўстаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі, пастаўце знакі прыпынку. Выпішыце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі, пабудуйце іх схемы. Зрабіце сінтаксічны разбор аднаго са сказаў.*

Над лугам *(па)* волі *(н..)* спешна ўставала сонца. Яно падыма..чыся з травы *(у)* вачаві..кі больш..ла здавалася шчодра ра..пуска..цца вялікі бутон нейкай *(ярка)* пун*(с,ц)*овай краскі.

*(У)* весь ніз сонца быў у буйн*(о,а)*й і чыстай як слёзы расе. Раса ззяла пералівалася іскрылася і Верасоўскаму які глядзеў на ўсё гэта *(не)* падымаючы галавы здавалася што расінкі перапоўне*(н)*ныя сонечнымі промнямі вось зараз, у гэтую хвіліну, нібы напухлыя пупышкі пачнуць лопацца ад лішкаў святла.

Зараз узняўшыся над травою сонца было чыстае увесь луг з..хацеў бл..скучымі і звонкімі жнівен*(ь)*скімі пацеркамі. Праз якую хвіліну сонца ўжо *(не)* стала відаць яно бы*(т,ц)*цам знікла ра..тварылася ў сва..м жа святле і толькі на тым месц.. дзе яно ўзы*(й)*шло гэтак ярка і сляпуча гарэла цэлае *(паў)* неба што ў той бок *(не)* магчыма было глядзець.

Перад самымі вачыма Верасоўскага ціха *(сам)* сабою як усё *(роўна)* яго нехта зачапіў пагойд*(ы)*ваўся рамонак які формаю нібы паўтараў сонца і гэты рамонак абуджаў у ім нейкі *(не)* выразны ўспамін але ён *(с,з)*прасоння не хацеў дашуквацца яго. *(Паводле Я. Сіпакова)*

**389.** *Адзначце нумары складаных сказаў з рознымі відамі сувязі.*

1. Чалавека нешта непакоіла ён то сядзеў воддаль ад дарогі прыхінуўшыся да камля дуба то ляжаў падклаўшы пад галаву рэчавы мяшок. 2. Да ракі на якой была прыстань Андрэй ішоў да самага вечара параход на прыстань прыплываў раніцай і хлопцу не было чаго спяшацца. 3. Пройдзе час плады вывезуць з саду і тады ён здасца яшчэ больш сумным. 4. І заўсёды так здараецца са складанага становішча выблытаешся а па ўласнай дурасці пападзешся. 5. Залессе — адна з самых паэтычных мясцін нашай радзімы а восень надавала ўсяму што мы бачылі лёгкую па́ціну чысціні і журбы. 6. І трывожна білася сэрца калі я стаяў пад караваю грушаю-дзічкаю і глядзеў як усюды падымаецца прыгнутая дажджом зеляніна. 7. Рэчка разлілася так шырока як не разлівалася ўжо шмат гадоў вада падышла пад самыя хаты а школа апынулася на выспе. 8. Хоць неба і ўсыпана зоркамі ўсё ж яны не так блішчэлі як гэта звычайна бывае пазней у жніўні калі ад іхняга бляску ўсюды робіцца светла. 9. Часамі ў позняе лета пачынае хмурнець дзень і гэта не збіраецца на дождж а незаўважна падплылі павевы восені.

**390.** *Выберыце правільны варыянт пастаноўкі знакаў прыпынку.*

1. Выбежыш бывала з двара за паркан акінеш вачыма неабсяжна шырокае неба на якім то тут то там стынуць гурбы беласнежных воблакаў зірнеш на лес што сінее зубіцца на даляглядзе і ногі самі нясуць цябе на зялёную раскошу лужка. *(Сач.)*

1) 6 косак, 1 працяжнік, 1 двукроп’е;
2) 9 косак, 1 працяжнік;
3) 8 косак, 1 двукроп’е;
4) 6 косак, 2 працяжнікі.

2. Сучаснікі дакаралі Калумба за зман але ўрэшце апамяталіся Калумбава памылка яшчэ раз пацвердзіла што свет мае мноства таямніц якія чакаюць сваіх шчасліўцаў-адкрывацеляў. *(У. К.)*

1) 3 коскі, 1 працяжнік;
2) 5 косак, адны дужкі ;
3) 3 коскі, 1 двукроп'е;
4) 5 косак, 1 працяжнік.

3. Вучыцца любіць Беларусь трэба ў Караткевіча. Мала хто столькі як ён павандраваў па яе сцежках і гасцінцах але ўсё роўна яна засталася для пісьменніка зямлёй нязнаемай якая тоіць у сабе яшчэ шмат нязведанай прыгажосці загадак таямніц якія ён усё жыццё спрабаваў разгадаць убачыць адкрыць паказаць іх нам невідушчым. *(Ляўк.)*

1) 1 працяжнік, 9 косак, 1 двукроп'е;
2) 1 двукроп'е, 10 косак;
3) 12 косак;
4) 11 косак.

# Спосабы перадачы чужой мовы

## Канструкцыі з простай мовай

У залежнасці ад месца, якое займаюць у сказе словы аўтара (**А,а**) і простая мова (**П,п**), ставяцца адпаведныя знакі прыпынку.

1. Простая мова пасля слоў аўтара

| | |
|---|---|
| **А: " П ".** Простая мова мае апавядальную інтанацыю. | *Да марака на хісткі сейнер ляціць дзіцячы галасок:* ***"Цябе чакаем вельмі, татачка, хутчэй дадому прыплывай"***. (Панч.) |
| **А: " П? "** Простая мова мае пытальную інтанацыю. | *Часта пыталася маці ў мяне:* ***"Куды падзеліся зоркі?"*** (Панч.) |
| **А: " П! "** Простая мова мае клічную інтанацыю. | *Браце мой, сказаць магу адно:* ***"Я табе зайздрошчу як нікому!"*** (Бар.) |

2. Простая мова перад словамі аўтара

| | |
|---|---|
| **" П ", — а.** Простая мова мае апавядальную інтанацыю. | ***"Канцэрт прайшоў выдатна",—*** *супакойваў я Ірыну*. (Сач.) |

| | |
|---|---|
| **“ П? ”— а.**<br>Простая мова мае пытальную інтанацыю. | ***“Што прывезлі, госці?”*** *— з расцяжкаю, каб не выдаць сваёй радасці, спытаў князь.* (Л.Д.) |
| **“ П! ” — а.**<br>Простая мова мае клічную інтанацыю. | ***“І мы табе, бацька, зычым дабра!”****—усклікнуў Расціслаў.* (Л.Д.) |

3. Словы аўтара ў сярэдзіне простай мовы

| | |
|---|---|
| **“П, — а, — п”.**<br>Словы аўтара раздзяляюць простую мову на месцы коскі, кропкі з коскай, двукроп’я, працяжніка або там, дзе не было ніякага знака прыпынку. | ***“Брат мой,*** *— гаварыў па-сяброўску даверліва мне Андрэй,—* ***лепшай, як журналістыка, працы няма”****.* (Сач.) |
| **“ П, — а. — П “.**<br>Словы аўтара раздзяляюць простую мову на месцы кропкі. | ***“Значыць, старэем,****— сказаў Аркадзь. —* ***Роздум, як і сумненне, — справа старых дзядоў”****.* (В.Б.) |
| **“ П? — а. — П ”.**<br>**“ П! — а. — П ”.**<br>Словы аўтара раздзяляюць простую мову на месцы пытальніка ці клічніка. | ***“Адчыніце вароты!****— загадаў надворнай чэлядзі князь Рагвалод Свіслацкі.—* ***Упусціце гасцей, накарміце іх коней, а гасцей я сам карміць буду”****.* (Л.Д.) |
| **“ П... — а. — П ”.**<br>Словы аўтара раздзяляюць простую мову на месцы шматкроп’я. | ***“Вы знаходзіце, што я... —*** *Ірына*<br>зніякавела.***— Я ў сабе расчаравалася даўно”****.* (Сач.) |
| **“ П, — а : — П ”**<br>**“ П? — а: — П ”.**<br>**“ П! — а : — П ”.**<br>Словы аўтара маюць два дзеясловы маўлення, адзін з якіх адносіцца да першай часткі простай мовы, а другі — да другой яе часткі. | ***“Хутка збярэцца на навальніцу,****— сказаў Аляксей і дадаў незадаволена: —* ***А чалавек той мне не спадабаўся”****.* (Хадк.) |

**391.** *Прачытайце тэкст. У канструкцыях з простай мовай назавіце словы аўтара і простую мову. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.*

Прастора ўнутры храма здавалася вялізнай. Вялікія вочы святых дакорліва глядзелі на дзяўчыну. Яна расказвала пра ўсё сваё кароткае жыццё. Запыталася тужліва: “Чаму такая жорсткасць вакол? Чаму людзі не могуць жыць, не забіваючы адзін аднаго?”

Прамаўчаў стары свяшчэннік, толькі пагладзіў схіленую галаву дзяўчыны. Твар яго з незадаволенага стаў змучаным, пакорлівым. Пасля ён

ціха прамовіў: ”Цярпі, дачка мая! Цярпі і маўчы!” Яна гнеўна ўзнялася, загаварыла хутка-хутка: “Марцін заступіўся за чалавека. Толькі заступіўся! Чаму ім можна ўсё, чаму іх называюць добрымі хрысціянамі і ім належаць душы людскія?” — “Дык што ты хочаш ад мяне? — стомлена сказаў свяшчэннік. — Я не пішу законы. Я толькі стараюся змякчыць душы людскія, дапамагчы ім знайсці сябе ў любові і міласэрнасці”. — “Я хачу даць зарок, — сказала Еўка. — Зарок на тое, што буду помніць яго да смерці. Я хачу быць абручанай з ім, мёртвым”. *(Паводле В. Іпатавай)*

**392.** *Прачытайце тэкст. Растлумачце знакі прыпынку ў канструкцыях з простай мовай. Як афармляюцца пунктуацыйна рэплікі дыялога ў мастацкім тэксце?*

Сустрэлася мне ў лесе бабка. Невысокая і сухенькая, як корчык, рухавая і лёгкая на нагу.

— Суха, няма грыбоў — з пустым вядром ходзіш... — першая загаварыла яна да мяне. — Я не люблю вядра. Бразгату, звону многа. А ў лесе трэба ціха хадзіць. Лубянка — сама лепш, хоць на грыб, хоць на ягаду.

Мы ідзём па лесе паволі. Бабка павучае:

— Не спяшайся, галубок, лесам хадзіць. Глядзі, слухай... Лес — як дом родны...

Бабка прывяла ў лагчыну, у стары, па пояс, чарнічнік. Ягады буйныя, што вішні, шызыя ад туманістай павалокі.

— Вось такіх насушыць — чыстае лякарства. А хто лета і восень спажывае суніцы і чарніцы — ніякага курорту не трэба. А яшчэ ж брусніцы, журавіны, каліна, рабіна, шыпшына... Ты паглядзі на нашу зямельку. Самая простая на выгляд, не чарназём які. А такую чарадзейную сілу мае!.. *(Паводле П. Місько)*

**393.** *Запішыце канструкцыі з простай мовай, вызначце іх састаўныя часткі — словы аўтара і ўласна простую мову. У словах аўтара падкрэсліце дзеясловы, якія ўводзяць простую мову. Пастаўце і растлумачце знакі прыпынку. Рэплікі дыялогаў пішыце ў адзін радок, выкарыстоўваючы двукоссе.*

І. Гэта не выдуманая гісторыя. У беларускага дыпламата на адной з сесій ААН яго не надта дасведчаны калега з Лацінскай Амерыкі запытаўся А што гэта за дзяржава такая — Беларусь? Наш зямляк крыху падзівіўся такому пытанню, але не пакрыўдзіўся і пачаў распавядаць пра нашы трактары, самазвалы, калійную соль і іншую прадукцыю, якую выпускае і экспартуе Беларусь, але адчуваў, што суразмоўца не задаволены яго тлумачэннем. Нарэшце лацінаамерыканец пацікавіўся А паэты ў вас ёсць?

Ёсць. Купала, Колас… Купала? О! Гэта іншая справа. Цяпер я маю ўяўленне пра вашу краіну. *(У. Гніламёдаў)*

II. — Чаму гэта ты, Костусь, усміхаешся? вярнуў паэта з успамінаў Ігнат Юр'евіч.

— Ведаеш, Ігнась, як ніколі ўвачавідкі ўбачыў і адчуў вясну свайго дзяцінства. Як жа хочацца прайсціся, дакрануцца сэрцам да пуцявін маіх мараў, да легенды-дуба, роднай Альбуці, адкуль шлях мой ляжаў на прастор шырокі ўзрушаным голасам адказаў паэт, зняў шапку і пакланіўся нёманскім працягам. *(С. Белы)*

III. — Калісьці Пціч была глыбакаводнай і суднаходнай ракой расказвае экскурсавод І вось тут, дзе ў яе ўпадае рэчачка Менка, да дзесятага стагоддзя, як лічаць вучоныя, знаходзіўся старажытны Менск.

— Гэта і паслужыла выбарам месца для музея? пытаюся я.

— Не толькі гэта. Зірніце навокал. Тутэйшыя мясціны ўвабралі ў сябе ўсё, што характэрна для пейзажу нашай Беларусі. *(М. Карпенка)*

**394.** *Запішыце канструкцыі з простай мовай і рэплікі дыялогаў у адзін радок, выкарыстоўваючы двукоссе. Пастаўце і растлумачце знакі прыпынку, раскрыйце дужкі. Запішыце схемы, якім адпавядаюць канструкцыі з простай мовай.*

— Трэба ж, каб жыць за свет ты з'ехаў (П,п)акруціла галавою, як бы пашкадавала маці (Д,д)зе тая Карэлія, быццам бліжэй прыдатнага месца табе нідзе не знайшлося.

— А што было рабіць, мама? (У,у)змаліўся, хацеў апраўдацца Раман (П,п)омніш, як усё соткі хадзілі абразаць, а я ў раён бегаў, справядлівасці шукаў? Я хоць на край свету гатовы быў уцякаць.

— Але ж я, маці твая, тут засталася. Ды і браты, сястра… І забываць, забыць зусім…

— Ды я і не забываў, не забыў…

— Эх, сын, сын (С,с)умна апусціла вочы маці (Н,н)ездарма ж кажуць: малыя дзеці — малы клопат, вялікія дзеці — вялікі клопат. *(Паводле Б. Сачанкі)*

**395.** *Запішыце канструкцыі з простай мовай, захоўваючы правілы арфаграфіі і пунктуацыі. Пабудуйце схемы, якім адпавядаюць гэтыя канструкцыі.*

1. Матчына мова за руку павяла прызнаваўся Якуб Колас і, хвіліну памаўчаўшы, дадаў (Б,б)еларускае слова, пяшчотнае і ласкавае, гнеўнае і сумнае, паслухмянае і гнуткае ў паэтычным радку, было бліжэйшае і мілейшае майму сэрцу. *(С.А.)* 2. Я зазірнуў у бяздонныя крыніцы народнай творчасці, ад якой, як зачараваны, ужо не мог адарвацца гаварыў майстра і дадаваў (Я,я) бязмежна шчаслівы, што яны дапамаглі мне захаваць

найвялікшыя каштоўнасці музычнай культуры нашага народа. *(Гіл.)* 3. Адкуль ты (В,в)ярбу я спытаў (У,у)спыхнула тут нечакана? (І) зрок я свой затрымаў на свежых траншэях, курганах. *(М.Т.)* 4. На ўзгорку крутым партызан паміраў, на ўзгорку, дзе вецер шуміць. Там воран, прысеўшы, пра раны пытаў (К,к)аторая болей баліць? (Ш,ш)то раны мае! адказаў партызан (І,і)х боль хутка згасне з зарой. Век будзе крывавіць цяжэйшая з ран — у сэрцы матулі маёй. *(М.Т.)*

## Ускосная мова

**396.** *Замяніце простую мову ўскоснай. Асаблівую ўвагу звярніце на ўжыванне займеннікаў, формаў ладоў дзеясловаў, злучнікаў, злучальных слоў. Запішыце канструкцыі з ускоснай мовай.*

1. "Мы вашы браты, дрыгавічы з Бярозы-ракі, што ў Дняпро цячэ",— адказваў, нізка кланяючыся, Страцім. *(Я.Д.)* 2. Цудоўны чалавек і таленавіты крытык-літаратар Аляксандр Макараў казаў мне: "Алена, вы абавязкова павінны блізка пазнаёміцца з Валодзем Караткевічам". *(Вас.)* 3. "Не спяшайцеся здаваць у друк свае творы, не абмяжоўвайцеся адной праўкай",— гаварыў народны паэт маладым літаратарам. *(Пруд.)* 4. А дзядзька Ігнат сказаў: "Не разумею я балельшчыкаў вашых ды хіба яшчэ рыбакоў". *(Стр.)* 5. Абуджаны раскацістым гулам грому, вяз папытаўся ў бярозкі: "Чаму ты не спіш, дзетка?" *(К-с)* 6. "Вам, дзядзька Ігнат, у вёсцы жыць трэба",— сказаў я. *(Стр.)* 7. Тыя, хто бываў у Юравічах, раілі нам яшчэ ў Мінску: "Абавязкова заедзьце ў гэтае мястэчка, параўнайце з тым, як апісаў яго Іван Мележ у рамане "Людзі на балоце". *(Сач)* 8. Марыя Іванаўна неяк сумна і спустошана паглядзела на Веру: "Гэта радасна і добра, калі людзі любяць адно аднаго". *(А.Ж.)*

**397.** *Запоўніце раздзелы табліцы па ўзоры. Патлумачце правілы выкарыстання злучнікаў, злучальных слоў, формаў займеннікаў і дзеясловаў у канструкцыях з простай і ўскоснай мовай.*

| **Канструкцыі з простай мовай** | **Канструкцыі з ускоснай мовай** |
|---|---|
| Раман загаварыў глухім усхваляваным голасам: "Да вас прыйшоў я, Пярун і Даждждбог. Дайце мне моц і ўдачу. Дапамажыце ў далёкім паходзе. Напоўніце сілай маю дружыну і маю зямлю". *(Л.Д.)* | Раман загаварыў глухім усхваляваным голасам, *што ён* прыйшоў да *іх, Перуна* і *Даждждбога, каб яны далі яму* моц і ўдачу, *дапамаглі* ў далёкім паходзе, *напоўнілі* сілай *яго* дружыну і *яго* зямлю. |
| Галубок, відаць, здагадаўся пра нашы мары і звярнуўся да нас: "От што, хлопцы, заўтра насячыце | |

| | |
|---|---|
| бярэзніку, трохі елачак і прыносьце мне, а вас за гэта пусцяць на спектакль”. *(Грах.)* | |
| | У нейкай знямозе Мікіта паглядвае то на мяне, то на грыб і цікавіцца, *ці* бачыў *я* такое. |
| Міхась Іванавіч праводзіў мяне на вакзал і, развітваючыся, папрасіў: “Пакланіцеся ад мяне роднай зямлі і сябрам, усім пажадайце дабра і шчасця”. *(Грах.)* | |
| “І не паверыш, што тут некалі быў наш двор, жылі мае бацькі, жыў я”,— задуменна прамовіў Андрэй. *(Сач.)* | |
| | Ён спакойна, быццам у даўно знаёмай, спытаў, ці хоча *яна, каб ён* напісаў *яе* партрэт. |
| “Лезь на дрэва!.. Хутчэй!” — крыкнуў Макар Ігнатавіч сыну. *(Хадк.)* | |
| Насмешлівы голас наглядчыка прагучаў на ўвесь карабель: ”Што, вярнуцца хочаш назад, крывічанін?” *(Іп.)* | |
| “Я так рады, што спаткаў цябе!”— гаварыў Ждан, ідучы побач з Шурай. *(Дам).* | |

**398.** *Запішыце тэкст ад 3-й асобы. Канструкцыі з простай мовай замяніце на канструкцыі з ускоснай мовай. Дзе такую замену зрабіць немагчыма, змест чужой мовы перадайце праз ужыванне простых развітых або ўскладненых сказаў. Аўтарскае “я” замяніце ўласным імем.*

І. Я даў бабульцы “добры дзень”, а яна, зноў здзівіўшы мяне сваім чыстым голасам, адказала:

— Добры дзень, саколік. Грыбы збіраеш?

— Грыбы, цётачка.

— А ты песні пець умееш? — раптам ні з таго ні з сяго спытала бабулька, і мне падалося, што пры гэтым яшчэ і ўсміхнулася.

— Не, цётачка…

— Шкада, жыць табе лягчэй было б. Вучыся пець, саколік. Жыві лягчэй. Шчаслівы будзь! *(Паводле К. Кірэенкі)*

II. Мастак пісаў бэзавы куст. Бэз палаў, як на мае вочы і розум, ружовым полымем, але мастак бачыў яго ў срэбры, і гэтакі бэз быў падобны да самога, пад срабрыстай шавялюрай, мастака. Я спытаў:

— Вы пішаце аўтапартрэт?

Мастак мяне не зразумеў — яго позірк пахаладнеў. А я ж не хацеў засмучаць, таму паспяшаўся сказаць цяплей і ясней:

— У вас на палатнінцы светла, як на твары.

Ён глянуў на мяне з усмешкай, а я на яго — з палёгкаю. У той момант я адчуў яго душу: яна была бэзава-светлая і добрая. *(Паводле В. Карамазава)*

**399.** *У якіх канструкцыях з простай мовай знакі прыпынку пастаўлены няправільна?*

1. “Стаміліся?” — пытаецца Арына ў Ані. — “Не… Пасядзець хачу”. 2. “Каго, мудрэц, шукаеш з ліхтаром?” — “Прызнаюся: шукаю чалавека”. 3. “Якое шчасце,— сказаў Іван — калі ёсць сын, калі ён з табой”. 4. “Гэта мая дарога ў жыццё”,— не хаваў расчуленасці Броўка. ”Па ёй я ажно да Барысава хадзіў”. 5. “Ведаеце,— сказаў селянін — я так і падумаў, што вы настаўнік”. 6. “У дуба гадоў не спытаеш — прагаварыў дзед. — Вечнае дрэва”. 7. “У лес, у партызаны, хочаш?” паглядзеў на Цімошку бацька і, не чакаючы, што адкажа, павярнуўся да маці, сказаў, як бы загадаў: “Ты, Лёдзя, не марудзь, збірайся”. 8. “У Кушляны вам? Да Мацея Бурачка? — перапытвае пажылы вусаты дзядзька. — Вось там за ліпкай звярніце налева і прастуйце аж да яго хаты”.

**400.** *У адпаведнасці з якой схемай трэба паставіць знакі прыпынку ў канструкцыі з простай мовай?*

**1.** Тут і спынімся яшчэ раз акінуўшы позіркам бераг, сказаў Алекса і дадаў (П,п)аспяшаемся, змяркацца пачынае, а трэба яшчэ выбраць месца на начлег. *(Л.Д.)*

1. “ П ” — а і а : “ П ”.
2. “ П! ” — а і а “ П ”.
3. “ П! — а і а: — П ”.
4. “ П! — А і а — П ”.

**2.** Аж хлеб не вытрымаў і так азваўся (Ш,ш)то бядуеш? Зусім не ты мяне, дзівак, але цябе нясу я (Н,н)у што ж, пабачым, хто каго! (Т,т)ой запярэчыў строга і з цяжкага мяшка свайго хлеб вытрас на дарогу. *(М.Т.)*

1. А : — “ П ”. “ П! ” — а.
2. А : “ П “. — “ П! “ — а.
3. А — “ П “. —” П! “ — а.
4. А : “ П “ — “ П! “ , А.

# Пунктуацыя

**401.** *Прачытайце “алфавіт” знакаў прыпынку, звярніце ўвагу на парадак іх пералічэння. Прывядзіце па адным прыкладзе ўжывання кожнага са знакаў.*

| | |
|---|---|
| кропка **.** | двукоссе **“ ”** |
| двукроп’е **:** | пытальнік **?** |
| шматкроп’е **…** | клічнік **!** |
| кропка з коскай **;** | працяжнік **–** |
| коска **,** | дужкі **( )** |

**402.** *Прачытайце тэкст. Паразважайце, якая прымета была пакладзена ў аснову назваў знакаў прыпынку ў розныя гады. Працягніце выказванне:* “Нацыянальны характар назваў знакаў прыпынку праяўляецца ў тым, што…”

Назвы знакаў прыпынку маюць нацыянальны характар. Беларускія назвы ствараліся пад уплывам пунктуацыйнай тэрміналогіі трох славянскіх моў – рускай, польскай і ўкраінскай. Карусь Каганец у кнізе “Беларускі лемэнтар, або Першая навука чытання” (1906 г.) даваў такія назвы: *кропка, закавыка, кропка з закавыкай, двукроп’е, працяжка, пытаннік, клічнік, недаказ, чужаслоў*. У першых выданнях “Беларускай граматыкі для школ” Б. Тарашкевіча (пачынаючы з 1918 года) знакі называліся: *пункт, коска, пункт з коскай, два пункты, працяжнік, пытальнік, клічнік, недаказ, скобкі, чужаслоў*. У пятым выданні (1929 г.) зроблены частковыя змены: *пункт з коскай (або пасрэднік), недаказ (або мнагакроп’е), дужкі, чужаслоў (або двукоссе)*. У перакладных слоўніках і школьнай граматыцы 20-х гг. (аўтары М. Гарэцкі, М. Байкоў, С. Некрашэвіч, Я. Лёсік) устойлівым робіцца тэрмін *кропка*, але яшчэ не знікаюць *недаказ* і *чужаслоў*. У 1937 годзе “Руска-беларускі слоўнік” канчаткова замацаваў сучасныя назвы. *(Паводле Р. Клюсава)*

● *Якія сінанімічныя рады ўтвараюць беларускія назвы знакаў прыпынку ў тэксце?*

● *Параўнайце назвы знакаў прыпынку ў беларускай і рускай мовах. Чым яны падобныя і чым адрозніваюцца?*

**403.** *Якія пунктуацыйныя правілы можна праілюстраваць наступным тэкстам? Якія прынцыпы пунктуацыі знайшлі адлюстраванне ў ім? Прывядзіце прыклады.*

Бацькаўшчына, зямля бацькоў, родны край. Ахоплівае шырокі спектр блізкіх па сэнсе, але рознамаштабных паняццяў ад бацькоўскай сядзібы,

родавага маёнтка, паселішча, акругі, дзе чалавек нарадзіўся (малой радзімы), да тэрыторыі рассялення народа-этнасу, айчыны. У традыцыйным уяўленні беларусаў бацькаўшчына — гэта ў першую чаргу родавая спадчына (зямля, гаспадарка, маёмасць). Яна выступала як матэрыяльная аснова, гарант існавання свайго роду. Бацькаўшчына — гэта адначасова і родная прырода, дагледжанае і ўпрыгожанае клопатам людзей культурна-экалагічнае асяроддзе, што жывіць сваімі вобразамі духоўныя скарбы народа, яго паэтычную творчасць, мову, абрадавыя традыцыі, вызначае спецыфіку гаспадаркі, уплывае на народны менталітэт. Пачуццё радзімы-бацькаўшчыны фарміруе свядомага грамадзяніна-патрыёта, а ў далечыні ад яе абарочваецца тугой і настальгіяй. Народ, які страчвае сваю этнічную тэрыторыю, чакае незайздросны лёс, ён становіцца ізгоем (нярэдка ў сябе на радзіме). Захаванне бацькаўшчыны — пытанне жыцця і смерці этнасу; яно дазваляе быць гаспадаром на ўласнай зямлі, будаваць суверэнную дзяржаву, развіваць нацыянальную культуру. *(Паводле В. Цітова)*

**404.** *Пакажыце сэнсавую розніцу паміж сказамі, аб'яднанымі ў пары.*

1. Гэта — футбольнае поле для вучняў нашай школы. Гэта футбольнае поле — для вучняў нашай школы. 2. Урач можа быць зараз у сваім кабінеце. Урач, можа быць, зараз у сваім кабінеце. 3. Хлопчык чытаў хутка, перагортваючы старонку за старонкай. Хлопчык чытаў, хутка перагортваючы старонку за старонкай. 4. Маці доўга расказвала толькі пра яго. Маці доўга расказвала — толькі пра яго. 5. Старэйшы брат — мой настаўнік. Старэйшы брат мой — настаўнік. 6. Бацька прыйшоў. Бацька прыйшоў? Бацька прыйшоў!

**405.** *Усе знакі прыпынку паводле функцыі падзяляюцца на раздзяляльныя і выдзяляльныя. Разгледзьце табліцу, а затым расстаўце знакі прыпынку ў прапанаваным тэксце. Якія знакі прыпынку ў ім з'яўляюцца раздзяляльнымі, а якія — выдзяляльнымі?*

| **Раздзяляльныя . ? ! ... , ; — :** | **Выдзяляльныя , , — — “ ” ( )** |
|---|---|
| Раздзяляюць: | Выдзяляюць: |
| ● самастойныя сказы;<br>● часткі ў складаназлучаных і бяззлучнікавых складаных сказах;<br>● састаў дзейніка і выказніка;<br>● аднародныя члены сказа;<br>● даданыя часткі ў складаназалежным сказе. | ● адасобленыя члены сказа;<br>● даданую частку, якая разрывае галоўную, у складаназалежным сказе;<br>● зваротак;<br>● пабочныя і ўстаўныя канструкцыі;<br>● простую мову, цытаты. |

Калі не чуў ты ветраў паху
Не прыпадаў на ўзлесках ніц
Каб уталіць з дарогі смагу
Вадою чыстаю крыніц
Калі ты палюбіць не здолеў
Начлежных трапяткіх агнёў
І не прыносіў летам з поля
У жмені свежых мазалёў
Калі забыўшыся пра стому
З дзяўчынай у зару не плыў
Ты жыў няблага жыў вядома
А можа браце і не жыў?..

*(М. Рудкоўскі)*

● *Сказ уяўляе сабой перыяд. Што гэта за сінтаксічная адзінка? Знайсці адказ на пытанне Вам дапамогуць "Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў" П.У. Сцяцко, М.Ф. Гуліцкага, Л.А. Антанюк, "Паэтычны слоўнік" В.П. Рагойшы, "Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў" А.Я. Ленсу, М.А. Лазарука.*

**406.** *Прачытайце тэксты. На аснове іх зместу і матэрыялу падручніка дайце пісьмовае азначэнне тэрмінаў "пунктуацыйная норма" і "пунктуацыйны варыянт".*

I. Некаторыя знакі пунктуацыі вымушаны браць на сябе некалькі сэнсавых нагрузак. Працяжнік, напрыклад, адзначае межы рэзкага супрацьпастаўлення, хуткай змены падзей, пераходу ад пералічэння да абагульнення і інш. Нагружана рознымі сэнсамі і шматкроп'е. Такія знакі пунктуацыі падобныя да мнагазначных слоў.

Іншыя знакі, як словы-сінонімы, маюць аднолькавы сэнс, а адрозніваюцца толькі сілай яго выражэння. Прыклад пунктуацыйных сінонімаў — коска і кропка з коскай. Раздзяляючы аднародныя члены або аднародныя часткі ў складаных сказах, яны маюць аднолькавы сэнс, аднак адрозніваюцца сілай і "вагой". Кропка з коскай — гэта "ўзмоцненая коска". Яны раздзяляюць адзінкі большага аб'ёму і больш далёкія па сэнсе, чым тыя, якія раздзяляюцца коскай. Менавіта таму, раздзяляючы сказы, кропка з коскай аказваецца сінонімам кропкі. Кропка з коскай — гэта "аслабленая кропка" (нездарма калісьці яе называлі паўкроп'ем). Атрымліваецца трохчленны сінанімічны рад: коска — кропка з коскай — кропка. *(Паводле А. Пянькоўскага)*

II. Пунктуацыйныя нормы — пастаноўка знакаў прыпынку ў пісьмовым тэксце ў адпаведнасці з правіламі, якія прызначаны для абслугоўвання патрэб пісьмовых зносін у грамадстве і кадыфікаваны ў адпаведных актах. Парушэнне пунктуацыйных нормаў вядзе да пунктуацыйных памылак. Яны ўзнікаюць ад недастатковага ведання ўстаноўленых правілаў або ад недакладнасці зместу. Напрыклад, не трэба ставіць коску паміж словамі, якія паўтараюцца і аб'ядноўваюцца параўнальным злучнікам *як* або супастаўляльным злучнікам *дык*: *Штаны_ як штаны; Машына_ як машына; Вось прыпякло_ дык прыпякло.*

Ад пунктуацыйных памылак істотна адрозніваюцца нарматыўныя пунктуацыйныя варыянты. Яны, не парушаючы нарматыўнасці сучаснай пунктуацыі, дазваляюць дакладна афармляць структурную разнастайнасць пісьмовых тэкстаў і выражаць самыя тонкія адценні змешчаных у іх паведамленняў. *(Паводле Л. Бурака)*

**407.** *Прачытайце сказы, выбраныя з паэмы Якуба Коласа "Новая зямля", згодна з аўтарскімі знакамі прыпынку. Растлумачце такую іх расстаноўку, разабраўшы сказы па членах сказа. Якія яшчэ варыянты расстаноўкі знакаў прыпынку магчымыя ў гэтых сказах? Як гэта звязана з будовай сказаў? Абгрунтуйце сваё меркаванне.*

1. А лес, як добры той знаёмы, стаіць збялелы, нерухомы абапал рэчачкі сцяною, над ёю сплёўшыся страхою, далёка кінуўшы галінкі. 2. Эх, луг шырокі! Як жывы, ты, травой мурожнаю закрыты, стаіш зялёны прада мною і ззяеш дзіўнаю красою! 3. У небе хмарачкі дзянныя плылі, як гускі маладыя, чародкай белай над лугамі, над свежым лесам і палямі.

**408.** *Прачытайце тэкст і раскажыце, пра якую функцыю знакаў прыпынку ідзе ў ім гаворка. Як вы зразумелі, што такое аўтарскія знакі прыпынку? Запішыце сваё азначэнне ў сшытак.*

У мастацкім тэксце сродкам стварэння выразнасці з'яўляюцца не толькі эпітэты, метафары, вобразныя параўнанні, але і пунктуацыйныя знакі, з дапамогай якіх аўтар можа перадаць найбольш тонкія сэнсавыя, эмацыйныя і інтанацыйныя адценні, якія не заўсёды могуць быць выражаны словам ці сінтаксічна. Зразумела, што самі па сабе знакі прыпынку не ствараюць выразнасці. Кожны знак можа стаць выразным, калі ён выкарыстаны матывавана, з разуменнем яго асноўнага значэння. Таму пісьменнік, афармляючы свой тэкст у адпаведнасці з нормамі сучаснай пунктуацыі і замацаванымі правіламі, усё ж творча "перапрацоўвае" і пераасэнсоўвае значэнні агульналітаратурных знакаў прыпынку. У выніку ў мастацкіх тэкстах часта назіраецца своеасаблівая аўтарская "пунктуацыйная стылістыка" з больш ці менш значнымі адхіленнямі ад стандартнай пунктуацыі.

У паэтычных творах асабліва часта па-за нормамі выкарыстоўваецца працяжнік. Яго ўжыванне нясе пэўную эмацыянальную нагрузку, служыць для стварэння экспрэсіі. Пра ролю працяжніка ў мастацкім тэксце, пра яго здольнасць павышаць выразную якасць выказвання сведчаць такія радкі Я. Янішчыц:

Ступаю на зямлю
І чую: звоняць рэкі

Світальнае — "люблю",
Вянчальнае — "навекі". *(Паводле А. Цясевіч)*

**409.** *Прачытайце тэксты. Вызначце, якія знакі прыпынку ў іх з'яўляюцца нарматыўнымі, а якія — аўтарскімі. Чаму, на Вашу думку, паэты адступілі ў прыведзеных тэкстах ад нарматыўнай пунктуацыі?*

Ты — боль, паэзія. Ты — бой.
Ты — праўды непрыступнай вежа.
Я — праведнік і грэшнік твой,
Пусці — мяне ў сваё бязмежжа. *(Л. Галубовіч)*

Мы табой ганарымся — і плачам,
Мы нясём цябе ў сэрцы праз дым.
Нізка голаў схіляю, юнача,
Перад вечным глаголам тваім! *(У. Караткевіч)*

**410.** *Прачытайце тэкст, вызначце яго тэму і асноўную думку. Падзяліце тэкст на абзацы (аўтар выдзяляе сем абзацаў). Выпішыце ключавыя словы і словазлучэнні, якія характарызуюць Кузьму Чорнага як пісьменніка.*

У Кузьмы Чорнага проба пяра была ў літаральным сэнсе, як інструмента, як адзінага пісьменніцкага начыння, якім зроблена ўсё, што паспеў зрабіць. Выбраць пяро, апрабаваць яго, упэўніцца, як яно ходзіць — лёгка, плаўна, з націскам ці са скрыпам,— гэта была заўсёды важная для яго хвіліна перад тым, як распачаць работу. Але гэтая проба не была механічнай, марным псаваннем паперы. Чорны настолькі паважаў кожны яе кавалачак, што ніколі не пісаў бяссэнсіцы, тым больш ні разу не бачыў я, каб ён па-заліхвацку практыкаваўся ў выкручванні свайго прозвішча. Яно ставілася ў канцы ўжо зробленай работы. І гэта была таксама не менш важная для яго хвіліна. Закончыўшы аповесць, раман, напісаўшы апошні сказ, ён найбольш урачыстым момантам завяршэння твора лічыў апошнюю кропку. Гэтую самую высокую місію ён даручаў сваёй, тады яшчэ малой, дачушцы.

— Ірачка, вось табе пяро. Бачыш гэтае слова? Пастаў тут кропку,— гаварыў ён. І толькі цяпер, з адчуваннем радаснай палёгкі споўненага абавязку, як пячаць, як знак уласнай адказнасці, прыкладаў свой подпіс — каржакаваты і важкі, просты і ясны: Кузьма Чорны. *(Паводле В. Віткі)*

**411.** *Прачытайце выказванне пісьменніка Янкі Сіпакова. Якую тэму яно закранае? Прадоўжыце гэты тэкст, раскажыце, для чаго існуюць*

*знакі прыпынку ў мове.*

Знакі прыпынку і прыдуманы чалавекам, каб больш даходліва выказваць сваю думку, раскрываць сваё пачуццё. Адмаўляючыся ад іх, не будзем суцяшаць сябе спадзяваннем, што робім гэта для таго, каб лепей выказаць сябе і каб чытач лепей нас зразумеў.

**Паслухайце мовазнаўцаў**

Такая звыклая для нас сістэма пунктуацыі ўтварылася далёка не адразу. Яна мае даўняе паходжанне, прайшла працяглы і цікавы шлях станаўлення. Знакі прыпынку ў славянскім пісьменстве з'яўляліся паступова. Напрыклад, кропка сустракаецца ўжо ў самых ранніх рукапісных тэкстах XI-XIII стст., коска вядомая з XIV ст., двукроп'е — з XV ст., пытальнік і дужкі фіксуюцца ў канцы XVI ст., клічнік і двукоссе — прыблізна ў XVII ст. Пунктуацыйныя знакі, акрамя таго, характарызаваліся храналагічнымі зменамі ўласцівых ім палеаграфічных і функцыянальных асаблівасцяў. Так, кропка не адразу знайшла сваё месца ў нізе радка, знак кропкі з коскай спачатку служыў для абазначэння пытальнага зместу сказа і г. д. *(І. Гапоненка)*

# ПАДРЫХТОЎКА ДА ДЫКТАНТА

**412.** *Спішыце, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы патрэбныя літары і знакі прыпынку.*

*Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў 2-м абзацы. Ці магчымы тут іншыя варыянты знакаў прыпынку?*

*Зрабіце словаўтваральны аналіз выдзеленых слоў.*

*Падрыхтуйцеся да напісання* ***кантрольнага дыктанта.***

Бярозка падрасла, выц..гнулася пастрайнела густа ра..кінула вецце. Заходз..чы раніцай у дыспе..ч..рскі пакой Люда перш за ўсё кідала поз..рк на бярозку **в..та(*я, ю*)чыся** (*з, с*) ёй як (*з, с*) сяброўкай, і **заўважа(*я, ю*)чы** як дзень за днём вясна (*з, с*)мяняе яе выгл..д. Яшчэ ляжаў снег і дні былі (*па*) хмурныя а на гол..і бярозкі а..чуўшы вясну жвавей заварушыліся вераб..і і сініцы; яны сумяціліся, прыхарош(*ы*)валіся гаманілі безупынку.

Бярозка **пац..мнела** (*з, с*)пярша, акрэслілася кожная галінка на ёй, потым выпусціла кволыя **шэра**(?)**жоўтыя** (*за*) вушнічкі, і (*а..*) гэтага ўсё дрэўца **асв..тлілася** мя..кім, празрыстым **з..яннем.** Мінула яшчэ колькі дзён, і аднойчы, **за(*й*)шоўшы** ў пакой, Люда, як **заварож..(*н*)ная,** застыла (*ў*) захаплен..і: яркая, пя(*с,ш*)чотная зеляніна прыбрала бярозку, яна закрасавала і кожным лістком, **абла(*с,ш*)ча(*н*)ным** сонцам, выпрамен..вала прыгажосць вясны.

Як і (*што*) год, вясна пры(*й*)шла ў магутным шуме паводак у сер..брыстым шуме ручаёў у не(*з, с*)ціха(*н*)ных трэлях жаваранкаў у шаўкавістым **шапацен..і** першай **зеляніны** на пожнях. Сон..чнымі ключамі яна а(*д, т*)амкнула дз(*ь*)веры цёплым вятрам (*з, с*) поўдня, і яны пан(*е,я*)слі па прасторах неўгамо(*н*)ную яе сілу перад якой (*з, с*)карылася зіма, **паспешліва** а..ступіла з лютымі маразамі сів(*е,я*)рам заве(*я,е*)мі. *(Паводле Т. Хадкевіча)*

**413.** *Прачытайце. Растлумачце пастаноўку ўсіх знакаў прыпынку і правапіс прапушчаных літар. Падрыхтуйцеся да напісання* ***кантрольнага дыктанта.***

Калі (*с, з*)гад(*ы*)вае..ца імя Васіля Быкава, то ў маёй пам..ці (*ад*) разу ўзнікае — ”(*ж, Ж*)ураўлі(*н*)ны крык”. І мяне (*н..*) хто (*н..*)пераканае ў тым, што ўсё напіса(*н*)*н*ае піс(*ь*)меннікам, уключа..чы яго апошнія апавядан..і, (*н..*) прасякнута гэтым (*н..*) с(*ь*)мяротн..м і журботн..м крыкам ...

Васіля Быкава гэт..лькі ла(*е, я*)лі і хвалілі, што да таго і да другога цяжка і дадаваць што (*небудзь*), каб хто і хацеў. Праўда, ла(*е, я*)лі больш дома, а хвалілі ў с(*ь*)веце. У тым вялік..м с(*ь*)веце, дзе кнігі Васіля Быкава былі в..зітнай карткай Беларусі, пра якую (*н..*) ведаў абывац..ль у (*е,Е*)ўрапейскай Францыі, (*н..*) каж..чы ўжо пра далёк(*ія,ую*) ЗША...

У каротк..м слове (*н*..) буду сілі..ца ацаніць напіса(*н*)нае Быкав..м, яго значэн..е для беларускай, еўрапейскай ды ўсёй сусветнай культуры. Пра гэта ёсць і будуць яшчэ спецы..льныя даслед(*а*)ван..і. Гэтым ра(*з, с*)-парадзі..ца (*ў*) рэшце яе вялікас(*ь*)ць Гісторыя.

Але ўжо сёння (*без*) спрэчны прыклад Быкава(?)піс(*ь*)менніка, Быкава(?)грамадзя(*н*)ніна (*н*..) толькі для сваіх равес(*т*)нікаў, (*н*..) толькі для людзей сярэдняга век.., але і для маладзейшага і зусім маладога ўзрост.. . Прыклад сама(?)ахвярнас(*ь*)ці і подзвіг.. ў служэн..і сваёй (*б,Б*)ацькаўшчыне годнага мастака і сапраўднага сына. (*А. Жук)*

**414.** ***Папераджальны дыктант.*** *Прачытайце, сфармулюйце галоўную думку тэксту. Растлумачце пастаноўку ў сказах знакаў прыпынку і выдзеленых арфаграм.*

*Назавіце словы, утвораныя нульсуфіксальным спосабам.*

***Паў***стаго***ддз***я ***з*** дня ***П***ерамогі… Азірае***ш***ся — і бачыш сябе, галоднага хлапчука, ***па***сярод разрухі, пасярод вайны, і ***між***волі — ***да***гэтуль! — сціска***е***цца разв***я***рэдж***ан***ае балюч***ы***мі ў***с***памінамі сэ***рц***а: няўжо так хутка мінае чалавечае жыццё? Няўжо пражыта цэлае жыццё, якога магло і ***не*** быць, як не было яго ў дз***е***сяткаў тыс***я***ч забітых, ***с***пал***ен***ых жыўцом дзяцей той вайны? Ды яшчэ як магло! І сёння ж гінуць дзеці — няхай не тут, не ў нашых гарадах і вёсках, а на ***п***оўдні, на паўднёвым ***з***ахадзе ці ў Афрыцы. І сёння ж чалавек падымае руку на чалавека!..

Разумею, мастацтва можа не ўсё. Часам яно н***і***чога не можа. І ўсё ж — зноў і зноў ***супраць***стаіць яно злу і насіл***л***ю, ***бяс***пам***я***цтву і б***е***здухоўнасці. Таму і не ***ады***хо***дж***у я ад мальберта. Таму і шукаю ў глыбіні пам***я***ці, у глыбіні душы тыя іскр***а***чкі, што асветл***я***ць новае, бачнае яшчэ толькі ў задуме палатно — новую сцежку да людзей. *(Паводле Г. Вашчанкі)*

**415.** *Прачытайце. Спішыце, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы патрэбныя літары. Зрабіце словаўтваральны аналіз выдзеленых слоў. Падрыхтуйцеся да напісання* ***кантрольнага дыктанта.***

Звычайнае **прывітанне — поціск** рукі — узнікла шмат ст..годдзяў *(на)* зад. Тады нашы продкі былі вандроўнымі **паляўнічымі** ў *(н..)* а..сяжных прасторах лясоў і стэпаў, а свет для іх быў поўны *(н..)* бяспекі. Калі сустракаліся *(н..)* знаёмыя людзі, яны **нейкі** час ***(с, з)*****далёк уважліва вывучалі**, **ра..глядалі** адзін аднаго, потым, калі былі мірна **настро*(е, я)*-ны, набліжаліся** *(с, з)* працягнутай *(на)* перад далон..ю рукі. Тым самым паказвалі, што ў ёй *(н..)* заціснуты камень ці іншая зброя. **С*(ы, й)*-шоўшыся**, яны **абмацвалі** адзін у аднаго правую руку, каб пераканацца ў мірных *(на)* мерах. Так і ўзнік звычай **рук..паціскан..я.**

**Пацалунак** выказваў **пачцівасць** уладным людзям. *(У)* залежнасці

*(а..)* становішча, якое займала п*(е, я)*рсона, ёй цалавалі ногі, калені, бараду, валасы ці руку. *(У)* сув*(е, я)*зі *(з, с)* гэтым была нават прафесія ”рук..цалавальніка”. Ён **абавязкова** прысутнічаў на ўсіх **в..лік..свецкіх** аўдыенцыях. У перы*(а, я)*д с..рэдн..вякоўя **лічылася**, што, **пацалаваўшы** прыгожую жанчыну, мужчына можа **пазбаві..ца** а.. галаўнога болю. А*(т, д)*сюль і **па*(й?)*шоў** выраз ”з хворай галавы на здаровую”. *(Паводле І. Шпадарука)*

**416.** ***Папераджальны дыктант.*** *Прачытайце, дайце загаловак тэксту. Якімі часцінамі мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы? Ці можна гэта вызначыць без уліку ролі выдзеленых слоў у кантэксце? Якімі яшчэ часцінамі мовы могуць быць падкрэсленыя словы?*

Любо***ў*** да горада нагад***ва***е каха***нн***е да ***жа***нчыны.

Гэта вялікае ***ш***час***ц***е, калі недзе ёс***ць*** горад, які чакае цябе, каб затулі***ць*** крылом спакою і зрабі***ць*** мацнейшым. Горад, чыё імя ты часта паўтара***е***ш у думках, як імя блізкага чалавека, шука***ючы*** і заўсёды знаходз***ячы*** нейкі патаемны сэнс з усё новымі і новымі а***д***це***нн***ямі: чу***е***ш у ім то ціхамірнае цурча***нн***е ***П***алаты́ з яе расч***а***са***н***ымі плы***нн***ю з***я***лёнымі ”русалчы***н***ымі косамі”, то вая***ў***нічы поступ ***п***олацкіх палкоў, то вусц***і***шны гу***д*** полымя над аблож***ан***ымі ворагам замкамі…

Любоў да горада — вялікая та***я***мніца, у якой ***ня***лёгка пр***ы***знацца. І ўсё ***ж*** я а***д***важ***ва***юся зрабі***ць*** гэта. Маім пр***ы***зна***нне***м будзе кніга. *(У. Арлоў)*

● *У якім значэнні і з якой мэтай ужыты займеннікі 2-й асобы адзіночнага ліку* ***цябе, ты*** *і дзеясловы ў форме 2-й асобы адзіночнага ліку* ***паўтараеш, чуеш?*** *Хто з’яўляецца субяседнікам аўтара?*

**417.** *Устаўце прапушчаныя літары і расстаўце знакі прыпынку. Падрыхтуйцеся напісаць тэкст пад дыктоўку настаўніка.*

Здаецца хтос..ці майстэрскай рукой уставіў вялікае люстэрка ў з..ляніну змеш..(*н*)нага лес... Гледз..чы на яго (*між*) волі ўспаміна..ш словы: “Паміж (*не*) праходнага лес.. густога дзе нібы люстэрка гладзь з..зяе там возера Свіц..зь вялікай па(*т, д*)ковай крыштальны прастор рас..цілае”. Аўтар гэтых радкоў вялікі польскі паэт Адам Міцкевіч сучас(*т*)нік Пушкіна наш з..мляк і суайчы(*н*)нік.

Возера Свіц..зь! Каго яно н(*е, і*) зачаро(*вы, ў*)вае сваёй прыгажос(*ц*)цю! На яго берагах у зас..ні стара(-?)све(*тс, ц*)кіх дубоў заўсёды знаходзілі на(*т, д*)хненне славутыя людзі. Акрамя таго тут (*што*) год бывае мноства турыстаў і экскурсантаў. (*У*) летку ў сонечны дзень воз..ра іскрыцца то срэбрам то пазалотай. Дзівос(*т*)нае і чароўнае яно захо(*вы, ў*)вае ў сабе многа та..мнічага і (*не*) звычайнага асабліва ў ціхі вячэрні час калі навокал у сасновым бары (*ні*) бы па (*ў*) казцы д..р..жора барадатага дуба што расце тут жа (*не*) далёка ад бераг.. ўзнікае цудоўная м..лодыя салаўі(*н*)нага

канцэрт... Услухо(*вы, ў*)ва..чыся ў гэтую музыку(-?)песню кожны хто толькі пабывае тут становіцца ўважлівым да гэтага казачнага кутка Беларусі да яго л..генд і падан..яў. *(Паводле Л. Мірачыцкага)*

**418.** *Да якога стылю і тыпу маўлення адносіцца тэкст? Абгрунтуйце сваё меркаванне. Дайце тэксту загаловак, у якім бы адлюстроўвалася асноўная думка.*

*Расстаўце знакі прыпынку ў першым абзацы.*

Мы ўсе прывыклі што прырода чыстая цнатлівая шчодрая. І ўжо толькі адзін напамін пра яе заўсёды выклікае ў нас нейкае вельмі ж ужо цёплае замілаванае як ласка пачуццё. Халоднай снежнаю зімою калі ад завірух не відно дзе канчаецца зямля і пачынаецца неба цёпла думалася пра зялёнае лета мокра прастуджанай восенню выхаджанай і вытаптанай наскрозь дажджлівымі вятрамі хораша марылася пра сонечную вясну… І неяк не хацелася верыць што можа быць яшчэ і іншая думка пра святыню твайго пакалення раззлаваная суровая злосная.

Маўляў, прырода — бязлітасны вораг чалавека. Яна часта, вельмі часта прымушае “цара прыроды” плакаць ад сваёй бездапаможнасці падчас пажараў, ураганаў, мяцеліц, буранаў, тайфунаў, землетрасенняў, вывяржэнняў, падчас нашэсця шкоднікаў, падчас чумы і голаду.

Маўляў, прырода нарадзіла чалавека недасканалым стварэннем. Ён прыйшоў у свет голы і безабаронны, у яго не было нават тых інстынктаў, што ў звяроў, не было іхніх сродкаў абароны і нападзення — рагоў, капытоў, ваўчыных зубоў. Таму і не дзіўна, што чалавек тысячагоддзямі пакланяўся жывёлам, якія былі надзелены ўсім гэтым і таму здаваліся больш любімымі дзецьмі прыроды.

Маўляў, наваколле прывячае варожыя нам сілы: зямля перапоўнена злосцю, неба цёмнае ад лютасці, і таму чалавек прыйшоў да будаўніцтва вялікага горада — адзінага пэўнага месца, якое ўратуе яго ад бесчалавечнасці, ад бессардэчнасці прыроды…

Гэтыя разважанні аб прыродзе належаць амерыканскаму сацыёлагу Эрыку Хоферу. Каго не ўразяць гэтыя словы, хто прачытае такую характарыстыку прыродзе! Але, між іншым, кожны, мусіць, адчуе, што тут ёсць добрая доля праўды, якую нам чамусьці ўжо дужа не хочацца ведаць. *(Паводле Я. Сіпакова)*

● *Выпішыце з тэксту па дзесяць прыкладаў слоў, правапіс якіх грунтуецца на фанетычным і марфалагічным прынцыпах.*

● *Растлумачце ўсе выпадкі правапісу ў тэксце часціц* ***не, ні.***

● *Якія сінанімічныя рады ўтвараюць назвы з’яў прыроды ў тэксце?*

● *Выпішыце з тэксту сказ, які адпавядаў бы наступным умовам: а) складаецца з нераўнапраўных частак; б) адна з частак пабудавана як безасабовы сказ; в) адна з частак ускладнена пабочным словам.*

**419.** *Расстаўце і растлумачце знакі прыпынку ў сказах.*

1. Канечне трэба ўмець пераадольваць цяжкасці але трэба ўмець і не ствараць іх перад сабой. *(П. Капіца)* 2. Чалавек абавязкова павінен вучыцца нягледзячы на свае поспехі свае дасягненні да смерці. *(С. Вавілаў)* 3. Пытанне правільна сфармуляванае гэта палова адказу. *(Афарызм)* 4. Жалеза ржавее не знаходзячы сабе прымянення а розум чалавека не знаходзячы сабе прымянення марнее. *(Леанарда да Вінчы)* 5. Тры шляхі вядуць да пазнання шлях разважанняў гэта шлях самы высакародны, шлях пераймання гэта шлях самы лёгкі, шлях вопыту гэта шлях самы горкі. *(Канфуцый)* 6. Адукацыя гэта не “багаж” ведаў а ўменне валодаць гэтым багажом. *(А. Несмиянаў)* 7. Навуцы як і каханню ўсе ўзросты пакорныя. *(Ю. Аўчыннікаў)* 8. Наша мова мудрая паміж выразамі *я ўпэўнены* і *я ўпэўніўся* вялікая розніца. *(К. Чапэк)* 9. Добра быць вучоным паэтам воінам заканадаўцам але дрэнна не быць пры гэтым чалавекам. *(В. Бялінскі)*

● *Разбярыце першы сказ па членах сказа.*

● *Выберыце са сказаў словы, утвораныя суфіксальным спосабам.*

**420.** *Расстаўце і растлумачце знакі прыпынку ў сказах. Сказы запішыце. Выберыце з іх словы, правапіс якіх грунтуецца на фанетычным і марфалагічным прынцыпах.*

1. Літара а затым слова прачытанае па складах заўсёды былі на пачатку сцежкі ў свет “мудрасці кніжнай”. *(А. Б.)* 2. Хай славіцца наш беларускі род душой з вясны а воляю са сталі каб з гнёздаў нам не пеўнікі на плот а горда арляняты вылятаді. *(Ген.)* 3. Дзяды і продкі карчавалі ляды на лапіку сасмяглае зямлі засекі вымяталі на каляды ад ветру гнуліся а ўсё-такі жылі. *(Грах.)* 4. Тры пісьменнікі не змаглі ў нас па-сапраўднаму разгарнуць свае крылы не сталі тым чым маглі стаць Багдановіч Гарэцкі і Чорны. *(Б.)* 5. Кожны з нас прыпасае Радзімы куток каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны дым над хатай снапамі прыціснуты ток матчын спеў і гароды прапахлыя кмінам. *(Панч.)* 6. Напэўна нашым песням лёс падараваў вітальную сваю няўрымслівую сілу настоеную на цяністым шуме траў на водары малін крушын і жывасілу. *(М. Т.)* 7. Людзям хочацца песні звонкай не пра мудрасць высокіх пасад а пра сінія матчыны вокны і пра раніцу і пра сад. *(Бур.)* 8. Беларуская мова спалучае ў сабе дзіўную мяккасць а зрэдку і цвёрдасць замілаваную пяшчотнасць і шырокую магутнасць плаўную пявучасць і хуткую дынамічнасць. У гэтай мове гучыць сэрца й душа народа добрага працавітага сціплага і сумленнага. *(Р. Г.)* 8. Я беларус і хоць сягоння яшчэ малы але скажу: я родам з племя непакорных і ў час бяды не задрыжу. *(Гіл.)* 9. Жыві шукай усё рабі як след каб на Радзіме твой свяціўся след. *(Грах.)*

**421.** *Прачытайце тэкст, вусна ўстаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі, растлумачце знакі прыпынку.*

Малая радзіма — гэта абсяг нашага дзяцінства, гэта тое, што могуць бачыць дзіцячыя вочы і што прагне *(ў)* вабраць у сябе чыстая, шчырая душа. Малая радзіма там, дзе гэтая душа *(у)* першыню здзівілася, *(уз)* радавалася і аж за*(й)*шлася ад шчасця і дзе *(у)* першыню засумавала або перажыла сваё першае ўзрушэн..е.

Ціхая вуліца, ма*(т,ч)*чын *(а)*гародчык, які запрашае, цягне да сябе, каб пачаставаць самымі смачнымі в..сковымі ласункамі: морквaю, *(а)*гуркамі, бобам. Потым — сад, дзе вісне з яблын*(ь)* цыбул..вымі пл..цёнкамі гал..ё з чырв..набокімі яблыкамі. За садам — духмяны абшар поплав*(а, у)*, да якога хоч..цца, як у дзяцінстве, *(на)* перагонкі пабегчы і бухнуцца там у аз..рыну, якая бл..шчыць на сонцы *(у)* канцы сенажа*(ц)*ці. За рэчкаю — с..седняя вёска, і заходзіць за р..ку *(не)* трэба: гэта ўжо іншы, забарон..*(н)*ны прасцяг.

Вось, *(з)* рэшты, і ўвесь дзіцячы сусвет. Але і гэтага абшар*(а, у)* хапае, каб за дзень, пакуль *(н..)* закоц..цца за лес сонца, набегацца і змарыцца. А потым цябе, ужо со*(н)*нага, падхопіць на рукі маці і панясе тваё падрапа*(н)*нае цела ў ложак. І табе прысніцца, бы*(т, ц)*цам з халадком пад грудз*(ь )*мі карабка..шся на самае высокае дрэва, каб паглядзець, што ж там далей, за неба*(-?)*схілам.

Малая радзіма — гэта тое, што на ўсё жыццё адор*(ы)*вае нас крыламі на*(д, т)*хнен..я. *(Паводле М. Капыловіча)*

**422.** *Прачытайце тэкст, вусна ўстаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі, пастаўце і растлумачце знакі прыпынку.*

Сіні чысты купал неба абдымаў спрадвечна плодную зямлю што зрадзіла высп..ліла ўсё і аддаўшы свой плён зараз змора*(н)*на адпачывала ў со*(н)*ным цяпле позн..га лета. *(Дзе)* нідзе бялеў авёс і цвіў яшчэ *(не)* заара*(н)*ны пад новае жыта сіні высокі лубін. На межах ды пал..вых дарогах улёгшыся ў карычн..в..м быльніку і сівым пахуч..м палын.. грэлі свае бакі старыя кам..ні. І калматыя межы і зямля пахлі гаркаватым палыном і палег*(л,ш)*ай ужо чырванавата *(-?)* рудою травою. Толькі пакалыхваў марнымі белымі кветачкамі б..злісты сухотнік ды стракацеў ужо трохі згас*(л,ш)*ымі кругл..нькімі *(с, ш)*чоткамі перастая*(л,ўш)*ы кр*(ы,а)*-ваўнік.

Зн*(я,е)*быўшыся па вос..ні ўсё зам..рала і сціш(*ы)*валася ў вялікім *(н..)* разгада*(н)*ным спакоі чака..чы яе. А ў сінім чыстым небе плаўна і *(н..)* спешна кружыліся плылі адзін за адным распасцёршы тугія і шырокія крылы што здаваліся цёмнымі з зямлі белыя буслы. Здавалася што гэтаму ціхаму і бя..концаму лёту *(н..)* будзе канца. Усё меншаў аддаля..чыся ў гл..бокае неба павольны бусліны круг рабіліся малымі буслы што ўсё

плылі *(н..)* збіва..чыся са сваіх пазнача*(н)*ных дарог у гэтым крузе. *(Паводле В. Адамчыка)*

**423.** *Запішыце тэкст, устаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі, пастаўце знакі прыпынку.*

Зерне і вочы… Вось што за*(ні, й)*мала мяне на*(й, і)*больш *(з)* малку. Цэлымі днямі я мог глядзець на арэх гарош..ну альбо на іншае якое *(небудзь)* з..рнятка дзів..чыся той *(н..)* верагоднай сіле што закладз..на ў ім. Варта яму толькі дакрануцца да зямлі і адбыва..цца цуд зерне ажывае пускае карані прарастае. Само пам..рае каб даць жыццё другім з..рняткам. Тых другіх чакае той *(жа)* лёс пас*(ь)*пеўшы яны так *(сама)* змуша*(н)*ны будуць загінуць і нарадзіць новыя з..рняты. І так бя..конца так вечна адно пам..рае другое нара*(жд, дж)*аецца.

Яшчэ цікавей думаць пра вочы. Дзеля чаго яны дадз..ны ўсяму ж..вому? Каб бачыць свет яго колеры барвы. Але *(ж)* вочы *(н..)* толькі бач..ць яны і гавор..ць без слоў што ў каго ў думках на сэрц.. на душ.. . Шмат самых розных вачэй сустракаў я на сва..м вяку блакітных як вало*(ж, ш)*ка чорных бы вугаль карых як згусткі мёд.. шчырых даверлівых і хітрых смелых і сарамлівых сумных і ўсмешлівых цікаўных задумлівых і б..зуважных да ўсіх і ўсяго. Але з тых вачэй што давялося мне бачыць запомніліся на ўсё жыц..ё толькі вочы матулі.

Было гэта на сам..м пачатку маёй св..домасці. Я тады цяжка хварэў і мама *(н..)* адыходзіла ад мяне *(н..)* на хвіліну. І калі мне стала л..гчэй я ра..плюшч..ў павекі і ўбачыў матуліны вочы. Колькі адча.. надзеі і ласкі было ў іх! Шмат разоў бачыў я потым маміны вочы ў радасці і ў журбе ў горы і ў *(н..)* шчасц*(ь, ц)*і але такіх вачэй як тады *(н..)* колі *(н..)* выпадала бачыць. *(Паводле Б. Сачанкі)*

**424.** *Вусна ўстаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі, пастаўце і растлумачце знакі прыпынку. Выпішыце бяззлучнікавыя складаныя сказы, вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі.*

Як і ўсе апошнія дні верасня пачатак кастрычніка выдаўся цёплы ясны б..зветра*(н)*ны. Лес *(н..)* прыхапілі яшчэ замаразкі і ў цёплых сховах яго лезлі па *(і)*мша*(н)*ніках розныя грыбы. У такія асен*(н)*ія дні трэба быць толькі ў лес.. каб разам з ім перажыць нешта такое чаму і назвы *(н..)* падбярэш. А пачуццё можна выказаць так зажура*(н)*насць і а..чуван..е шчасц*(ь)*я.

Я ішоў паўз дарожку *(з, с)* права ад якой разлеглася сухое балота а *(з, с)* лева сасняковыя *(і)*мша*(н)*ныя груды. Ішоў і сціш..*(н)*на думаў пра та..мнічую вабнасць лясной задумнасці якая заўсёды нешта згадвае куды *(с..ці)* кліча нараджае ў душ.. самыя розныя пачуцці.

Мяне прыпыніла *(н..)* далёкая пес*(ь)*ня. Гэта быў *(н..)* моцны але прыемны жаночы голас. Разабраць словы дакладна *(н..)* магчыма але па ўс..м што пачулася можна сказаць: пес*(ь)*ня пра маладос*(ь)*ць, нешта пра "пас*(ь)*цель белую", якую "пас*(т)*лаць хацела я", а яна *(н..)* с*(т)*лалася, "сэрца надрывалася". І *(с, ш)*чымлівай тугой веяла ад пес*(ь)*ні і сардэчнай летуце*(н)*насцю зв..неў яе ціхі матыў…

І вось на дарозе паказалася жанчына. Я ступіў *(на)* сустрач ёй і пес*(ь)*ня абарвалася. І дзіва паўстала перада мною спявачкай была нізенькая квол..нькая сівенькая бабулька. Мяне як токам ударыла так моцна ўразіла яе аблічча і пасеч..*(н)*ны гл..бокімі маршчынамі сухенькі тварык. Як *(н..)* пасавала ўсё гэта да выразнага яснага голас.. які толькі *(што)* выводзіў чароўную лясную пес*(ь)*ню.

Бабулька ады*(й)*шлася зусім недалёчка і зноў пачулася пес*(ь)*ня сумная і радас*(т)*ная як і яе старас*(ь)*ць. А я слухаў гэта хвалюючае с*(ь)*пяван..е і *(н..)* мог утрымацца ад малітвы дажыць бы самому да такіх гадоў і захаваць гарачую любасць да ўсяго на с*(ь)*вец... Захаваць да гл..бокай старас*(ь)*ці маладую душу. *(Паводле К. Кірэенкі)*

**425.** *Перапішыце тэксты, устаўце прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі, пастаўце патрэбныя знакі прыпынку. Падкрэсліце граматычныя асновы ў кожнай частцы складанага сказа. У складаназалежных сказах вызначце від даданых частак, сродкі іх сувязі з галоўнымі.*

І. Мусіць *(н..)* толькі на мяне аднаго жоўтай і шапаткой вос*(е,я)*н..ю *(н..)*як *(н..)*чакана і без асаблівай *(дай)* прычыны навалі..ца раптам ціхі нават трошкі прыемны ў сваёй сціша*(н)*нас*(ь)*ці сум які *(н..)* спакойна трывожыць цябе дзе *(б)* ты *(н..)* быў куды *(б)* *(н..)* ішоў *(н..)* ехаў. Трывожыць м..навіта так як *(у)* весну хвалюе бярэ цябе *(ў)* палон радас*(ь)*ць буйная *(н..)* ўтаймоўная *(н..)* абдымная. Адкуль ён гэты *(с, ш)*ч..млівы *(н..)*спакой жоўтай вос..ні?

Вос..нь гэта вечар года. Яшчэ *(н..)*даўна вось тут ш..пацела ш..ргацела ж..ўцела св..цілася св..тку*(ю, я)*чы свой час лагоднае бабіна лета. Былі такія раніцы і вечары калі нават мро*(і, е)*лася што можна адчуць *(на)* дотык як кожны дзень робі..ца ўсё карацейшы і карацейшы як пругка струменіць адыходз*(ю,я)*чы спяша*(я, ю)*чыся лета. І сёння праз колькі халодных дзён кастрычніка зноў раскашу*(е, я)*цца сонца і ціхая-ціхая ц..плыня. Здаецца нават што бабіна лета в..рнулася зноў каб адбыць у пол*(і,е)* яшчэ некалькі дзён.

Дрэвы стаяць абапал дарогі ў сон..чных промнях — такія ціхія што колькі *(н..)* глядзі на іх колькі *(н..)* напруж*(ы)*вай вочы так і *(н..)* убач..ш каб дзе *(н..)*будзь зварухнуўся хоць адзін лісток… *(Паводле Я. Сіпакова)*

● *Зрабіце поўны сінтаксічны разбор апошняга сказа, пабудуйце яго схему.*

II. Маста*(кс, ц)*кі вопыт такіх майстроў як Рыгор Шырма гэта выдатная школа для творчай моладзі для тыс..ч юнакоў і дзяўчат што вырашылі прысв..ціць с..бе музыцы тэатру літаратуры. Безумоўна яму многае было дадз..на ад прыроды валявая дзейсная натура жывы і дапытлівы розум дасканалы музычны сл..х тонкі маста..кі густ. Але як *(бы)* многа *(н..)* дала прырода яго дасягнен..і гэта перш *(на)* перш вынік *(што)* дзё*(н)*най напруж..*(н)*най працы.

Для Рыгора Шырмы былі ўласцівыя ў найвышэйшай ступені чыстыя рыцарскія адносіны да маста*(кс, ц)*тва і таму ён праз усё жыццё актыўна і *(н..)* стомна змагаўся з безаблічнай шэрасц*(ц, ь)*ю ў музыцы. Памыляю..ца як лічыў ён тыя кампазітары якія думаюць што слова ў песн.. мае другараднае значэн..е. Была б толькі прыгожая кранальная і запам..нальная м..лодыя. Такія разважан..і *(н..)* толькі *(н..)* правільныя але і шкодныя імі карыстаю..ца розныя рамес*(т)*нікі якія *(н..)* маюць *(н..)*чога агульнага *(н..)* з маста*(кс, ц)*твам *(н..)* з літаратурай а разглядаюць творчас*(ь)*ць толькі як самы кароткі шлях да вядомас*(ь)*ці. *(Н..)* забываць пра сваю культуру шанаваць яе гэта і ёсць галоўнае чаму ўсе маладыя творцы павінны вучыцца ў Рыгора Шырмы. *(Паводле Н. Гілевіча)*

● *Знайдзіце складаны сказ з рознымі відамі сувязі, прааналізуйце будову састаўных частак, пабудуйце схему сказа.*

**426.** *Спішыце тэкст, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку, растлумачце правілы іх пастаноўкі. Вызначце структурныя тыпы простых і складаных сказаў. Пабудуйце графічныя схемы складаных сказаў. У простых сказах і ў частках складаных сказаў падкрэсліце граматычныя асновы.*

Кожны раз калі я недзе блізка, я іду да цябе маё слаўнае поле. Іду радасны трапятлівы і з любасцю думаю што за сіла ў табе?

Упершыню я ўбачыў цябе з бацькавых плячэй. Убачыў і аціх ад тваёй дзіваты ад адкрыцця новай старонкі ў сваім дзіцячым свеце трошкі азмрочаны тым што тое было далёка. З тае хвіліны ўжо кожны дзень быў святам калі бацька падміргнуўшы мне гаварыў Пойдзем сын у Баравы Лясок. І я нецярпліва чакаючы гэтай хвіліны першы выкочваўся клубком за вароты.

Гэта было правілам у вясенні Міколаў дзень ішоў араты на поле пабачыць пасевы. На полі бацька нядоўга бавіўся ля сваёй паласы. Акідваў яе ад дарогі поглядам кранаў рукою адно-другое жытнёвае сцябло пяшчотна пагладжваў і падаваўся са мной на плячах па ўзмежку ў бераг дзе пышнай зялёнай сцяной віслі над полем бярозы. На самым узмежку ён апускаўся на мяккія грывы сіўцу клаўся тварам да поля і бясконца гаманіў поўны сваёй сялянскай радасці. Яму было вельмі хораша. І я адчуваў

здагадваўся што ён ішоў сюды не так пабачыць сваю азіміну як проста пабыць тут адпачыць душою і целам у Баравым Ляску.

Мабыць у кожнага з нас ёсць свой Баравы Лясок калыска маленства з сінім раздольным полагам пад якім трапеча і звініць у вышыні маленькая птушка. І колькі ні жывём мы чуем яе спеў над самай роднай часцінкай зямлі якая ўзгадавала нас і ўпершыню адкрыла шырыню і прыгажосць свету. *(Паводле М. Ракітнага)*

**427.** ***Папераджальны дыктант.*** *Знайдзіце ў тэксце адасобленыя азначэнні, патлумачце ўмовы іх адасаблення. Запішыце тэкст пад дыктоўку настаўніка.*

Раман Іванавіч убачыў высокую магутную сасну. Тоўсты, у два абхваты, камель цёмным маналітам вырастаў з зямлі, каб уверсе, метраў праз дзесяць-дванаццаць, раздзяліцца на два новыя гладкія ствалы. Правільна круглыя, яны ўздымаліся роўна, густазалацістыя, чыстай сасновай пароды. Яны нагадвалі дзве нагі здаровага чалавечага цела — добра загарэлыя, мускулістыя, поўныя жывой пругкай сілы. І там, дзе па прапорцыі ў чалавечых нагах павінен пачынацца пераход у ступакі, угадваўся ён і тут — у выглядзе тых жа залацістых сукоў, што адпачкоўваліся ад ствалоў і ішлі ў строга супраціўныя бакі. Абсыпаныя на канцах пушыста-зялёнымі кутасамі іголак, разам з гэтакай жа зялёнай раскідзістай вяршыняй яны ўтваралі акругла прыгожую, нібы падпраўленую нажніцамі, прычоску-карону. Нешта сапраўды мацярынскае было ва ўсім гэтым магутным целе сасны, якая нібыта сваёй жывой сілай рассунула зямлю і выйшла на святло адразу ўсёй сваёй мажной закончанай постаццю.

Была адметная ў дрэва і кара. У старых соснаў яна звычайна палопаная, сухая. У гэтай жа яна была гладкая, быццам сшытая з бронзавых латак, акуратна падагнаных адна да адной. Малада-чырвоныя, яны толькі па беражках, у месцах стыкаў, абраслі срабрыста-зялёнай аблямоўкай. *(Паводле А. Кудраўца)*

**428.** ***Папераджальны дыктант.*** *Растлумачце ў тэксце арфаграмы і пунктаграмы.*

Дрэва без каранёў не бывае. Ёсць свае карані і ў кожнага з нас. І ўваходзяць яны ў глыбіню стагоддзяў. Праўда, не заўсёды лёгка іх адшукаць, адкапаць. Не ва ўсіх, далёка не ва ўсіх продкі чым-небудзь адзначаліся ў гісторыі. Ды і хто яны такія, каб трапляць на старонкі летапісаў? У большасці гэта былі людзі, якія адсочвалі звяроў, лавілі рыбу, засявалі палі, даглядалі жывёлу, гадавалі дзяцей, словам, жылі. Жылі ціха, малапрыкметна. Тады ж, у даўнія часы, заўважалася, адводзілася большае значэнне больш важным асобам і падзеям: князям, царам, іх паходам і

бітвам, таму, што адбывалася ў полацкіх землях. Калі ж прозвішча якога-небудзь мужыка і трапляла ў летапісы, дык выпадкова, рэдка. Таму пра сваіх продкаў мы можам меркаваць хіба па ўспамінах, апавяданнях бацькоў, дзядоў ды па тых паданнях, былях, што дайшлі з сівой мінуўшчыны. Падводзяць нас да лепшага знаёмства з продкамі помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры, звычаі і абрады, апісанні родных мясцін. Напрыклад, па рэштках лясоў, балот, што дзе-нідзе яшчэ захаваліся, можна сказаць, якія лясы і балоты былі ў нас калісьці, колькі рознай дзічыны вадзілася. Колькі было рыбы, ягад, грыбоў! З гэтага можна заключыць, што продкам нашым галадаць не даводзілася. Зямля падкормлівала родзіча. *(Паводле Б. Сачанкі)*

**429.** ***Кантрольны дыктант***. *Усе даты запісвайце словамі.*

### Пачатак княжання Вітаўта

Вітаўт не мог задаволіцца становішчам служылага князя, у якім апынуўся пасля Крэўскай уніі. Натхнёны падтрымкай мясцовых баяраў, ён паўстаў супраць Ягайлы ўзімку 1389-1390 гадоў, але не здолеў захапіць Вільню і ўцёк да нямецкіх рыцараў. Ордэн, які толькі і чакаў падставы для агрэсіі, узяўся дапамагаць Вітаўту змагацца за віленскі пасад.

Пры дапамозе магістра Ордэна Конрада Валенрода і яго рыцараў Вітаўт паспрабаваў авалодаць Вільняй, у 1391 годзе захапіў замак у Гародні, у 1392 заняў Навагрудак ды зноў стаў пагражаць сталіцы.

Ягайла пабачыў, што без кампрамісу не здолее ўтрымаць пад сваёй уладай тэрыторыю Беларусі і Літвы. Ягайла прапанаваў Вітаўту ўладанні яго бацькі Кейстута — і той згадзіўся здрадзіць Ордэну.

У хуткім часе Вітаўт і Ягайла памірыліся. 4 жніўня 1392 года на сустрэчы ў Востраве пад Лідай яны падпісалі пагадненне, паводле якога ўлада ў Вялікім княстве пажыццёва перадавалася Вітаўту. Вітаўт стаў непасрэдным уладаром дзяржавы. Самае важнае, што пасля Крэўскага акта 1385 года Востраўскае пагадненне дало беларуска-літоўскай дзяржаве правы на пэўную самастойнасць. Атрымаўшы ўладу, Вітаўт пачаў умацоўваць дзяржаву знутры, цэнтралізаваць яе. І ўжо праз некалькі гадоў ён, падтрыманы князямі і баярамі, ледзь не разарваў ранейшыя зносіны з Польшчай. *(Паводле Г. Сагановіча)*

# ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЕРАКАЗУ

**430.** *Чаму прыведзены ніжэй запіс нельга назваць тэкстам? Расстаўце нумары частак тэксту ў правільнай паслядоўнасці.*

*Назавіце марфалагічныя сродкі сувязі сказаў і частак тэксту.*

I. У той жа час прыборы паказалі, што на расліну добра ўплываюць ласкавыя, пяшчотныя дотыкі. Жывая прырода адчувае ласку і чакае яе.

II. Расліна хварэе некалькі сутак. Так адбываецца, калі сарваны толькі адзін ліст. А калі адламана цэлая галінка? Ці надламана ўся расліна?

III. Калі ў расліны адарваць ліст, то ўся яна робіцца хворай. Гэта ўстаноўлена вучонымі з дапамогай дакладных прыбораў. *(Паводле М. Даніні)*

З а ў в а г а. *Запісваючы пераказ любога тэксту ці пішучы сачыненне, сачыце, каб захоўвалася лагічная сувязь паміж яго часткамі.*

**431.** *Прачытайце тэкст. Падрыхтуйцеся да пісьмовага пераказу. Добра асэнсуйце тэкст, адказаўшы на пытанні і выканаўшы заданні.*

- *Які стыль і тып гэтага тэксту? Якія творы В.Віткі вы чыталі?*
- *Вызначце тэму і асноўную думку тэксту і дайце яму загаловак.*
- *Ці можна дадзены тэкст падзяліць на тры асноўныя часткі: I — уступ, II — галоўная частка з тэзісам і яго доказамі, III — вывад (канцоўка, заключэнне)?*
- *Растлумачце заключныя радкі. Як вы разумееце, ад чаго і ад каго залежыць удаласць першай ступені жыцця чалавека, яго шчасце? Прывядзіце з тэксту доказы гэтага вываду.*
- *Чаму дарослыя смяюцца, калі нованароджанае дзіця голасна плача?*
- *З якога часу трэба пачынаць выхаванне дзіцяці? Зачытайце адказ на гэтае пытанне ў трэцім абзацы.*
- *Які факт пра пазнанне свету і развіццё сваёй асобы прыводзіць Л.М.Талстой?*
- *Як гэты вывад вялікага чалавеказнаўцы ўдакладняе славуты педагог А.С.Макаранка?*
- *Якую недаравальную памылку — на думку В. Віткі — дапускаюць дарослыя ў адносінах да сваіх дзяцей?*
- *Чаму так многа, часта і з такой цяжкасцю дарослым прыходзіцца займацца перавыхаваннем?*
- *Ці згодны вы з вывадам Настаўніка і пісьменніка Васіля Віткі?*
- *Вусна растлумачце пастаноўку ўсіх знакаў прыпынку. Звярніце ўвагу на правапіс слоў, якія выклікалі ў вас цяжкасць.*
- *Складзіце план пераказу, прачытайце тэкст яшчэ раз і запішыце* ***сціслы*** *пераказ.*

Колькі ў прыродзе таямніц і загадак, але самая складаная — чалавек.

Вось толькі што нарадзілася дзіця. Першы плач, першы крык. Чым галасней яно плача, тым радасней мы, дарослыя, смяёмся. Чым мацней яно крычыць, тым большая наша ўпэўненасць — новы насельнік зямлі стартаваў удала.

А між іншым, нельга траціць марна ніводнай хвіліны! Якім стане чалавек — ужо цяпер, у першыя дні, месяцы, гады — залежыць ад дарослых! Трывожыцца ёсць з-за чаго. Загадка чалавечай асобы вызначаецца рэкордна кароткім часам.

Колькі б ты ні пражыў (семдзесят, восемдзесят, дзевяноста, сто гадоў), але залаты запас усяго твайго жыцця, які абумовіў усю тваю чалавечую сутнасць ,— гэта твае першыя гады, тваё маленства.

Л. М. Талстой прызнаваўся, што за ўсё астатняе жыццё ён не набыў і аднае сотае таго, што набыў у маленстве. Канкрэтызуючы гэты вывад, А. С. Макаранка ўдакладняе суадносіны паміж магчымасцямі чалавека да пяцігадовага ўзросту і пасля — на працягу ўсяго жыцця: ”Галоўныя асновы выхавання закладаюцца да пяці гадоў,— гэта 90 працэнтаў усяго выхаваўчага працэсу”.

Удумайцеся ў парадаксальную няўмольнасць гэтай загадкі: пяць гадоў — 90 працэнтаў! Божа мой, як часта мы, дарослыя, самі таго не думаючы, становімся ворагамі сваім дзецям толькі таму, што іх маленства прыстасоўваем да ўласных выгод, звычак, камфорту, гвалтуючы іх волю, падаўляючы іх энергію, глушачы іх цікаўнасць, дапытлівасць, фантазію!.. Якім будзе чалавек — гаворыць Макаранка,— залежыць ад таго, якім вы яго зробіце да пятага года жыцця. Калі вы да пяці гадоў не выхавалі яго як трэба, потым прыйдзецца перавыхоўваць.

Перавыхоўваць неймаверна цяжка. Але, як ні дзіўна, найбольшыя нашы сродкі трацяцца на перавыхаванне. Мы толькі тым і займаемся, што перавыхоўваем. Як бы загадзя разлічваем, што ўпушчанае намі, недаробленае намі, а то і злачынна сапсаванае намі павінен выправіць нехта наступны, хто падымае чалавека на чарговую ступень.

Колькі ступеней у ракеты, што кожнага з нас падымае ў свой жыццёвы космас: маленства, малалецтва, юнацтва, сталасць… Але, бывае, падняўшыся нават на самую высокую, чалавек так і не ўбачыць, дзеля чаго ён падымаўся: ні радасці адчування прасторы для думкі, для творчасці, ні прыгажосці жыцця, таму што бачанню, адчуванню ўсяго гэтага яго не навучылі на першай, на самай галоўнай ступені — у тыя пяць-сем гадоў, калі яго істота была здольная ўзбагаціцца запасамі на ўсё жыццё.

Першая ступень жыцця, у адрозненне ад касмічнай ракеты, не толькі не адпадае, а прырастае навек. І калі яна была ўдалая — чалавек шчаслівы, лёгка і радасна яго душы́, калі няўдалая — усё жыццё адчувае яе пакутны цяжар. *(Паводле В. Віткі)* *(375 слоў)*

**432.** *Уважліва прачытайце тэкст і падрыхтуйцеся да яго* ***сціслага*** *пераказу. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту, дайце яму загаловак.*

*Запішыце складаны план, адказаўшы на пытанні і выканаўшы заданні:*

1. *Якую задачу рашае аўтар?*
2. *Колькі падтэм можна вылучыць у тэме? Дайце загаловак кожнай з іх. Што апісваецца ў першым абзацы?*
3. *Пералічыце, якія звычаі і абрады звязаны ў народзе з* ***парогам*** *і чым тлумачыцца такая яго роля?*
4. *У якіх мэтах выкарыстоўвалі парог чараўнікі?*
5. *Якая сімволіка* ***смецця*** *існуе ў народзе і чаму? Якія вераванні і звычаі звязаны з ім?*
6. *Сімвалам чаго з’яўляецца* ***венік*** *і якія вераванні звязаны з ім?*
7. *Выпішыце апорныя словы да ключавых сказаў з кожнай падтэмы.*
8. *Выпішыце з кожнай падтэмы сродкі выразнасці мовы.*
9. *Выпішыце словы, цяжкія для напісання. Звярніце ўвагу, як запісваюцца ўстойлівыя звароты (у двукоссі) і іх значэнні (у адзіночных косках зверху). Растлумачце правапіс слоў, запісаных праз злучок.*
10. *Прачытайце тэкст яшчэ раз, вусна ўзнавіце яго, а затым пісьмова перакажыце.*

Многім народам вядомы звычай, згодна з якім жаніх уносіць нявесту ў дом на руках, г. зн. пераносіць яе цераз парог. З гэтым звычаем мы сустракаемся і зараз, на сучасным вяселлі, але ўспрымаем яго толькі як выяўленне пачуццяў маладога да сваёй жонкі. У сувязі з гэтым зварот *”насіць на руках”* ужываецца ў значэнні ’песціць каго-небудзь, празмерна апякаць, балаваць’. Зразумела, што першапачаткова гэты звычай не меў нічога агульнага з балаваннем. Гэта быў сур’ёзны звычай-засцярога**:** малады пераносіў нявесту цераз парог на руках, каб духі-продкі, якія жывуць пад парогам, не змаглі неяк пашкодзіць маладой пры пераходзе яе ў дом мужа, да іншай сям’і.

Спрадвеку **парог** уяўляўся людзям вельмі важным месцам, якое прыраўноўвалася да значэння печы ў хаце. Паколькі душы памёрлых продкаў знаходзіліся менавіта пад парогам, то са старажытных часоў верылі**:** з чалавекам, які спатыкаецца аб парог, здарыцца непрыемнасць; гасцей трэба сустракаць, выходзячы за парог; нельга вітацца праз парог, каб не пакрыўдзіць гэтым продкаў.

У шматлікіх звычаях адлюстравалася роля парога як часткі і ўвасаблення ўсяго дома. Трэсачку ад роднага парога бралі з сабой, каб лягчэй было ў чужым краі, каб памятаць пра дом. У дзень першага выгану жывёлы на па́шу гаспадыня карміла жывёлу з прыполу на парозе хаты, каб карова заўсёды знаходзіла дарогу дадому. Для гэтага ж карову кармілі з

пячной за́сланкі, каб яна ”памятала” пах свайго вогнішча. Каляднікі, заходзячы ў хату і жадаючы гаспадарам добрага ўраджаю ў новым годзе, спачатку сыпалі зерне на парог, а ўжо потым — па ўсёй хаце.

Злыя людзі — ведзьмакі і чараўнікі — таксама выкарыстоўвалі парог у сваіх мэтах: калі яны жадалі наслаць на каго-небудзь хваробу, то абсыпалі парог гэтага чалавека ”нагаворанай” соллю, г. зн. соллю, над якой рабілі замову. Дарэчы, адно са значэнняў слова *насаліць* — ’нашкодзіць, зрабіць непрыемнасць каму-небудзь’— звязана з прыёмам чараўніцтва.

З архаічнымі ўяўленнямі пра парог звязана і прыкмета-перасцярога**:** ”*Ад парога хату не мятуць*”. Але чаму хату трэба месці да парога? Тут да вядомай ужо нам сімволікі парога дабаўляюцца ўяўленні пра **смецце.** Згодна з гэтымі ўяўленнямі, смецце, пыл, рэшткі ежы — гэта частка самога чалавека, паколькі ўсё гэта было з ім у датыкненні. Месці смецце да парога — значыць даручаць смецце і самога чалавека ахове парога, г. зн. духам продкаў. Менавіта таму смецце ніколі не выносілі з хаты, асабліва вечарам. Выкінуць, вынесці смецце з хаты — значыць зрабіць вельмі рызыкоўны, нават небяспечны ўчынак, таму што вядзьмак або ведзьма могуць праз выкінутае смецце наслаць на чалавека хваробу або нават выклікаць смерць. Ахоўная роля парога, як ужо адзначалася, прыраўноўвалася да ролі печы, і таму смецце дазвалялася ўкідаць у печ, каб яно ”з дымам выйшла”.

Рэшткі старажытнага звычаю не выносіць смецце з хаты захаваліся да нашых дзён. І зараз у дзень ад’езду гасцей з дому гаспадары не вымятаюць смецця, не мыюць посуд і падлогу з мэтай перасцярогі, каб нічога не пашкодзіла людзям у дарозе.

Са смеццем звязаны яшчэ адзін прадмет хатняй гаспадаркі — **венік.** Здавалася б, што ў ім незвычайнага? А ў народных уяўленнях венік — рэч вельмі незвычайная. Успомнім перш за ўсё, што ведзьма, баба-яга заўсёды выкарыстоўвае венік для сваіх паветраных ”падарожжаў”. Ён з’яўляецца ўвасабленнем стыхіі ветру, віхру, выкліканага ім. У рускіх сялян ёсць цікавы звычай**:** перад тым як ісці ў сваты, бацька маладога або сват прывязваюць да чаго-небудзь венік, каб ён не вы́клікаў вецер і не замёў дарогі сватам. У некаторых вёсках на Гомельшчыне і ў нашы дні сяляне падкідаюць угору мётлы і венікі, каб выклікаць вецер, які прыгоніць доўгачаканы дождж.

Адначасова венік выкарыстоўваўся і як перасцярога ад нячыстай сілы і хваробы. Напрыклад, каб дзіця, якое раптоўна ўпадзе, не спужалася, неабходна на тое месца, дзе яно ўпала, тройчы лінуць ваду і расцерці венікам. Для абароны вуллёў ад чужых пчол выкарыстоўвалі асінавыя калкі і венік. У ноч на 1 мая, калі, згодна з народнымі вераваннямі, асабліва актывізуецца нечысць, немцы клалі перад домам на дарогу венік, каб узняты ім вецер замёў дарогу ведзьмам.

А ў зваротах *”сядзець як мыш пад венікам”, ”сядзець як верабей у веніку”*, г. зн. паводзіць сябе ціха, нерухома, адлюстраваліся ўяўленні пра венік як месца, дзе можа знаходзіцца дамавік — добры дух дома. Выдатны фалькларыст і этнограф А. К. Сержпутоўскі пісаў пра гэтае вераванне: ”У хаце разам не павінна быць двух венікаў, бо дамавікі не ўжываюцца ў згодзе, а захочуць дзяліцца”. А мыш, як і верабей, у вераваннях народа прыраўноўвалася амаль што да нячыстай сілы. Таму натуральна, што і мыш, і верабей вымушаны паводзіць сябе ціха пад венікам, адчуваючы ўздзеянне дужага і добрага духа — дамавіка.

Такім чынам, як бачым, у моўных адзінках — фразеалагізмах — захоўваецца вельмі важная, цікавая і патрэбная для ўзбагачэння чалавека пазамоўная інфармацыя пра народную духоўную культуру. *(Паводле У. Коваля)*

**433.** *Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму, стыль і тып маўлення. Вызначце мікратэмы і ў адпаведнасці з імі падзяліце тэкст на абзацы. Адкажыце на пытанні і выканайце заданні. Прапануйце план пераказу тэксту і параўнайце яго з прыведзеным ніжэй.*

## ЛІСТ ДА МАЦІ

У дні, калі не пісалася, стары славуты пісьменнік браўся перабіраць даўнія свае запісы. Запакаваныя ў рыжыя кардонныя папкі, старанна перавязаныя шпагатам, яны ляжалі ў яго кабінеце на стэлажах. Там былі чарнавікі, незакончаныя творы, накіды, трапныя назіранні, зусім гатовыя апавяданні, вершы, здаваць у друк якія пісьменнік пакуль што не рашаўся. Папак з такімі запісамі назбіралася нямала. Можна ўявіць, з якім хваляваннем ён браў кожную ў рукі, гартаў, пераглядаў старонкі, адкладаючы вартае, над чым можна працаваць, і выкідаючы тое, што без асаблівага жалю і шкадавання можна спаліць. Так, перабіраючы папку за папкай, пісьменнік дабраўся да той, што ляжала на самым сподзе і ў якой былі яго самыя раннія запісы — запісы тых гадоў, калі ён быў яшчэ малады і толькі-толькі пачынаў пісаць. Развязаў шпагат, перагарнуў адзін лісток, другі... І раптам рукі ў яго закалаціліся: на вочы трапіў невялікі, вырваны са школьнага сшытка аркушок, спісаны не яго сціслым, прыгожым і трошкі спешным почыркам, а... Гэты почырк ён пазнаў бы, вылучыў бы з соцень, тысяч самых нечаканых почыркаў, бо то быў почырк яго маці, амаль непісьменнай вясковай жанчыны. “Дарагі сынок,— пісала маці,— я не ведаю, як і прасіць цябе, каб ты не маўчаў, каб хоць зрэдку прысылаў мне па некалькі слоў пра сябе. Я твая маці і хачу ведаць, што з табою, дзе ты. Некалі ты таксама будзеш стары, будзеш мець дарослых дзяцей, і тады ты, напэўна, сам адчуеш, як пагана гэта, калі не піша табе той, дзеля каго ты так стараўся, дзеля каго ты толькі і жыў...” Далей пісьменнік не мог чытаць. Сцялася сэрца, вочы засланілі слёзы. Ён успомніў маці,

непрыгожую вясковую жанчыну, якая ніколі не разгінала спіны то на сваім, то на калгасным полі і ад таго пад старасць зусім згарбацела. Успомніў яе рукі, якія яго абдымалі, якія выводзілі на паперы вось гэтыя каракулі,— чорныя, парэпаныя рукі гаротніцы-працаўніцы. Маці нічога не шкадавала, хацела, каб ён вучыўся. Думала: можа, на старасць будзе ёй лягчэй, будзе ад сына хоць якая помач... Прыгадаў пісьменнік і тое, як ён, хочучы выбіцца ў людзі, паехаў пасля школы ў горад, паступіў у інстытут. Як днямі і начамі пісаў, крэсліў, зноў пісаў і зноў крэсліў. Ён жыў тады ўпрогаладзь на прыватнай кватэры, у маленечкім пакойчыку. Дзе там было помніць пра маці, якая, каб і хацела, нічым не магла памагчы сыну. Дзе там было пісаць маме лісты! Яна і памерла, так і не дачакаўшыся ад яго хоць бы аднаго доўгага падрабязнага ліста… Пісьменнік прыгадаў усё гэта і, як гэта здаралася ўжо неаднойчы, кінуўся да стала. Схапіў шарыкавую ручку і пачаў спешна-спешна пісаць. Ён аж калаціўся ўвесь ад неспадзяванага ўзрушэння і таго пачуцця, што так нечакана ахапіла, запаланіла яго, ён пісаў ліст да сваёй роднай мамы, якой ужо не было гадоў, мусіць, дваццаць на свеце і якая жыла ў сынавых думках, у сынавым сэрцы... Той ліст да маці, як толькі ён быў надрукаваны, крытыкі ў адзін голас назвалі шэдэўрам, найлепшым творам старога славутага майстра. За кароткі час ліст быў перакладзены амаль на ўсе еўрапейскія мовы. Яго чыталі, ім захапляліся, радаваліся, плакалі... Не чытала таго ліста толькі маці пісьменніка, тая, што дала яму жыццё і якая заўсёды хацела атрымаць ад сына хоць якую вестачку... *(Паводле Б. Сачанкі)*

### ***П ы т а н н і   і   з а д а н н і***

*1. У якія моманты свайго жыцця славуты пісьменнік звяртаўся да старых запісаў?*

*2. Якая знаходка ў архіве моцна ўзрушыла старога пісьменніка?*

*3. Пра што пісала маці сыну, што яе турбавала?*

*4. Паразважайце, у чым мудрасць заключных слоў у пісьме маці.*

*5. Раскажыце, якой ва ўспамінах пісьменніка паўстае яго маці. Назавіце эпітэты, якія характарызуюць яе знешнасць.*

*6. Чаму хлопец у горадзе забыўся на сваю маці?*

*7. Якую цану заплаціў пісьменнік за свой жыццёвы поспех?*

*8. Як бы вы назвалі твор? Ці ўдалай, на вашу думку, з'яўляецца аўтарская назва "Ліст да маці"?*

### ***П р ы к л а д н ы   п л а н***

1. Старыя папкі.
2. Нечаканая знаходка.
3. Ліст маці.
4. Дарагі і шчымлівы ўспамін.
5. Маладыя гады пісьменніка.
6. Запозненае раскаянне.

● *Падрыхтуйце пісьмовы пераказ тэксту. Змест пісьма маці перадайце ад імя аўтара.*

**434.** *Прачытайце тэкст, адкажыце на пытанні, выканайце заданні. Падрыхтуйцеся да* ***кантрольнага пераказу.***

Жыццё ніколі не было вельмі **літасцівым** да Рамана. Застаўшыся рана без бацькі, ён, як старэйшы, яшчэ ў акупацыю ўзваліў на сябе нялёгкія клопаты пра сям'ю. Хлопец ва ўсім трымаўся **няхітрых**, правераных вякамі жыццёвых правілаў: не лезь наперад, але і не адставай; як людзі, так і ты; не імкніся ніколі больш гаварыць, а больш рабі… Сям'я перажыла і акупацыю, і выгнанне ў Нямеччыну. Калі вярнуліся з чужыны, давялося ўсё пачынаць з нічога: на селішчы не засталося ні кала ні двара. Адбудаваліся, трохі абжыліся — у армію забралі. Вяртацца пасля службы дадому, у вёску, не хацелася: ведаў, што чакае яго там. І, як і многія іншыя саслужбоўцы, надумаў пашукаць іншага, лягчэйшага хлеба.

На вярбовачным пункце прапанавалі ехаць у Карэлію. Залатых гор не абяцалі, але давалі і на дарогу грошы, і пад'ёмныя, і сутачныя. Ды і работа была знаёмая, звыклая — лес валіць, суччa абсякаць, траляваць хлысты. Вербаваліся многія, завербаваўся і ён, Раман. Там, у Карэліі — халоднай, камяністай,— таксама з вярбовачных і жонку знайшоў. Сваю ж дзяўчыну, з Беларусі, толькі не з Палесся, а з Магілёўшчыны. Жонка трапілася **працавітая,** пакладзістая характарам і эканомная, ашчадная ва ўсім. І хату сваю збудавалі, і гаспадарку займелі. Дзеткі пайшлі — сынок і дачушка. Не заўважылі, як і павырасталі. У школу пайшлі, адвучыліся сваё і … разляцеліся. Зноў Раман з жонкай засталіся адны. Усё часцей па начах сталі сніць ды згадваць дамоўку, вёску. Нарэшце парашылі праведаць радзіму: ён, Раман, паедзе да сябе на Палессе, а яна, Поля, — да сябе пад Крычаў.

І вось ён дома, на родным селішчы, у матчынай хаце. Нават на ложку тым самым ляжыць, на якім ляжаў у дзяцінстве. Не спіцца… У вачах стаіць, праносіцца, мільгаціць усё, што ўбачыў, пачуў за дзень дома, у сваёй вёсцы. Ды і многае з таго, што дагэтуль бачылася, перажылося…

— Шкадуеш, што не дома жывеш?— маці глядзела на яго спачувальна, быццам з надзеяй.

— Як і сказаць табе,— адвёў вочы ўбок, задумаўся Раман. — Усё ў мяне там, у Карэліі, ёсць. І хлеб, і да хлеба. Паважаюць мяне людзі. А… Быццам пустата на сэрцы, чагось не хапае. Чаго — і сам не ведаў, пакуль сюды, дадому, не прыехаў, па вёсцы не прайшоў, на неба, на лес, краявіды нашы не паглядзеў. Тады толькі зразумеў: усяго гэтага мне якраз і не хапала там. Як бы задыхáўся, паветра мала. А тут на ўсе грудзі дыхаю…

— Дык перабірайся, пераязджай сюды жыць. Хату, селішча ў парадак прывядзі і жыві.

— Да сённяшняга дня не думаў пра гэта. А селішча сваё ўбачыў, хату… Скрабанула, па самым сэрцы скрабанула — гэта ж наша селішча, наша хата. Гадамі, вякамі жылі тут продкі. І дзед, і бацька… І яно, гэтае селішча, можа пуставаць…

Раман змоўк. Думкі не давалі заснуць… А што, калі… І праўда паслухаць маці? Прадаць тое селішча, што займелі з Поляю там, у Карэліі, ды назад, дадому, у вёску пераехаць? І жыць тут, як і ўсе людзі жывуць? І маці будзе дагледжана, і селішча іх, **спрадвечнае…** Бо што, што трымае іх там, у Карэліі? Дзеці разляцеліся, раз’ехаліся. А ўсё астатняе … Нажыўное. Тут жа і маці, браты, сястра. Ды і магілы продкаў усіх… А там, што там? Хата, двор? Але ж яны нібы свае і не свае… І неба, краявід, поле не тыя, што тут, дома. Не, дом яго тут, дамоўка тут. І ўсё яго тут… З гэтымі думкамі Раман нечакана для сябе заснуў. І снілася яму… *(Паводле Б. Сачанкі)*

### ***Пытанні і заданні***

*1. Вызначце асноўную думку тэксту, дайце яму загаловак.*

*2. На якія сэнсава-кампазіцыйныя часткі можна падзяліць тэкст? Вызначце мікратэму кожнай часткі.*

*3. Пра якія жыццёвыя прынцыпы юнага Рамана гаворыць аўтар? Ці падаюцца яны вам бясспрэчнымі?*

*4. Чаму Раман не вярнуўся ў родную вёску пасля службы ў арміі? Пра што, па-вашаму, гавораць аўтарскія словы* ***“…ведаў, што чакае яго там”****?*

*5. Растлумачце значэнні выдзеленых прыметнікаў, падбярыце да іх сінонімы.*

*6. Знайдзіце аднасастаўныя сказы, вызначце іх віды. Якую сэнсава-стылістычную нагрузку выконваюць яны ў тэксце?*

*7. Як вы разумееце сэнс выразаў* ***“Надумаў пашукаць іншага, лягчэйшага хлеба”, “Залатых гор не абяцалі”****? Ці знайшоў Раман “лягчэйшы хлеб” у далёкай Карэліі?*

*8. Што спрадвечнае селішча значыць для Рамана, для яго старэнькай маці?*

*9. Ці змяніліся ў Рамана погляды на сэнс жыцця пасля прыезду ў куток дзяцінства і юнацтва? Падмацуйце свае разважанні словамі з тэксту.*

*10. Як пунктуацыйна аформлены сказы, мэта якіх — перадаць унутраны стан, пачуцці, сумненні, душэўную трывогу Рамана?*

*11. Што, на вашу думку, снілася Раману ў роднай хаце? Двума-трыма сказамі закончыце тэкст.*

*12. Складзіце план пераказу тэксту. Напішыце пераказ ад імя аўтара. Замест канструкцый з простай мовай скарыстайце канструкцыі з ускоснай мовай.*

# ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЕРАКЛАДУ

**435.** *Прачытайце. Успомніце, ці часта вашы аднакласнікі, вы самі дапускаеце ў сваёй пісьмовай і асабліва вуснай мове ўжыванне слоў з заніжанай стылёвай афарбоўкай, а таксама штампаў, канцылярызмаў.*

*Ці прыемна бывае, калі з вамі размаўляюць ”засмечанай мовай”? Ці ўспрымаеце вы такога суразмоўцу як чалавека культурнага?*

*Перакладзіце тэкст на беларускую мову і запішыце.*

Детишкам показывают по телевидению говорящего попугая. Ему надо бы поздороваться со зрителями, а он вдруг ”выдаёт”:

— Жрать хочешь?

— Что ты, Петя! Так не говорят.

А попугай опять своё.

Попугай — он и есть попугай, что слышал, то и повторяет. Ну а мы, люди? Мы сетуем: молодёжь говорит неправильно, растёт не очень грамотной, язык наш портится, становится бедным, канцелярским, засорённым. Но ведь ученики повторяют то, что слышат от учителей, от взрослых, читатели — то, чем изо дня в день питают их литераторы и издатели. На кого же нам пенять?

Отлично придумано — по радио учить ребят правильной речи. Мол, неверно сказать: ”На субботник пойдут *где-то* триста человек” — не стоит ”заменять точное слово *приблизительно* неправильным *где-то*”. Справедливо. Хотя очень уж плохо сочетается ”точное” с ”приблизительно”. Но это уже мелочи. А беда в том, что следом диктор произнёс ни много ни мало: ”Такие замены *не способствуют пониманию вас вашими собеседниками”* !!!

Дали хороший, добрый совет, исправили одну ошибку — и тут же совершили другую, много хуже, подали пример чудовищного уродования речи. Ибо и сами эти тяжеловесные слова, и неестественный, невразумительный строй фразы — всё это казёнщина и уродство. Почему редактор передачи не поправил хотя бы уж так: ”Такие замены *не помогают собеседникам понять вас*”? Неужто не легче и не лучше?

*(Н. Галь)*

● *У якім склоне ў рускім тэксце ўжыты назоўнік у канструкцыі ”по телевидению”? Якая канструкцыя адпавядае ёй у беларускім перакладзе?*

● *Які канчатак маюць неасабовыя назоўнікі 2-га склан. у М. склоне?*

● *Які з двух варыянтаў перакладу наступных слоў з тэксту з’яўляецца дарэчным, больш удалым? Абгрунтуйце свой выбар.*

***”выдаёт” — ”выдае”*** *ці* ***”выпальвае”*** *?*

***сетуем — наракаем*** *ці* ***скардзімся*** *?*

***на кого пенять — на каго наракаць (крыўдаваць)*** *ці* ***каго дакараць?***

***питают* — *жывяць*** *ці* ***кормяць?***
***неверно (сказать)* — *няправільна*** *ці* ***нельга (сказаць)*** *?*
***произнёс* — *вымавіў, сказаў, прамовіў ці абвясціў*** *?*
***уродования* — *калецтва*** *ці* ***нявечання*** *?*
***уродство* — *нявечанне*** *ці* ***калецтва*** *?*
***мелочи* — *дробязь*** *ці* *дэталі ?*
***много хуже* — *многа горш*** *ці* ***горшую*** *?*

**436.** *Прачытайце тэкст. Ці з'яўляецца, на вашу думку, характэрнай не толькі для рускай, але і для беларускай мовы ўзнятая аўтарам праблема засілля канцылярыту? Дзе часцей вы чулі або чыталі падобныя штампы на беларускай мове? Перакладзіце на беларускую мову першы і апошні абзацы.*

БЕРЕГИСЬ КАНЦЕЛЯРИТА!!!

Это — самая распространённая, самая злокачественная болезнь нашей речи. Канцелярит не сдаётся, он наступает, ширится. Это окаянный и зловредный недуг нашей речи. Сущий рак: разрастаются чужеродные, губительные клетки — постылые штампы, которые не несут ни мысли, ни чувства, ни на грош информации.

Пишут: “*процесс развития движения за укрепление сотрудничества*”, “*...принимают активное участие в борьбе за повышение производительности труда...*”, “*ведут борьбу за повышение...*”. Метастазы канцелярита поползли дальше: “*участвуют в борьбе за повышение*” — и ещё дальше: “*принимают активное участие в борьбе за повышение...*”.

Таким примерам нет числа. Слишком много пустых, бессодержательных, мёртвых слов. А от них становится неподвижной фраза — тяжеловесная, застойная, она прямо противоположна действию, о котором говорит, чужда борьбе, движению, экономности. Суть её можно выразить вдвое, втрое короче — и выйдет живее и выразительней. Пять длинных слов да два коротких — там, где хватило бы одного слова, причём — что очень важно — одного глагола!

Лишние, мёртвые слова-канцеляризмы, слова-штампы не безвредны. Пустые, пустопорожние, они ничему не учат, ничего не сообщают и уж, конечно, никого не способны взволновать, взять за душу. Это словесный мусор, шелуха. И читатель, слушатель перестаёт воспринимать шелуху, а заодно упускает и важное, он уже не в силах докопаться до зерна, до сути. *(Н. Галь)*

*Дадатак 1*

# ВІДЫ МОЎНЫХ РАЗБОРАЎ

## ФАНЕТЫЧНЫ РАЗБОР

Парадак разбору

1. Запісаць слова ў фанетычнай транскрыпцыі.
2. Падзяліць слова на склады, абазначыць націскны.
3. Назваць (запісаць) літары і абазначаныя імі гукі.
4. Ахарактарызаваць гукі: галосныя — націскны ці ненаціскны; зычныя — цвёрды, мяккі або зацвярдзелы; глухі, звонкі або санорны; адзначыць, калі гук шыпячы або свісцячы.
5. Вызначыць колькасць гукаў і літар у слове.

Узор разбору

***Адцураецца:*** **[*а - ц̄у- ра́- јэ- ц̄а*]** — у слове пяць складоў, трэці склад націскны.

А — [ ***а*** ] — галосны; ненаціскны;<br>
д, ц — [ ***ц̄*** ] — зычны, глухі, зацвярдзелы, свісцячы, падоўжаны;<br>
у — [ ***у*** ] — галосны, ненаціскны;<br>
р — [ ***р*** ] — зычны, санорны, зацвярдзелы;<br>
а — [ ***а́*** ] — галосны, націскны;<br>
е — [ ***ј*** ] — зычны, санорны, мяккі;<br>
    [ ***э*** ] — галосны, ненаціскны;<br>
ц, ц — [ ***ц̄*** ] — зычны, глухі, зацвярдзелы, свісцячы, падоўжаны;<br>
а — [ ***а*** ] — галосны, ненаціскны

---

10 літар, 9 гукаў

## МАРФЕМНЫ РАЗБОР

Парадак разбору

1. Часціна мовы.
2. Слова зменнае ці нязменнае. Калі зменнае, адзначыць, па чым змяняецца.
3. Канчатак (у тым ліку і нулявы). Значэнні канчатка.
4. Аснова, яе тып: члянімая ці не члянімая на марфемы. Калі перарваная, то адзначыць гэта.
5. Афіксы:

а) постфікс; падабраць 2-3 словы з гэтым постфіксам і з такім жа значэннем постфікса;

б) суфіксы; падабраць па 2-3 словы з кожным суфіксам і з такім жа значэннем суфіксаў;

в) прыстаўкі; падабраць словы з такімі ж прыстаўкамі.

6. Корань. Падабраць роднасныя словы (у тым ліку з варыянтамі кораня), абазначыць у іх корань.

7. Графічнае абазначэнне марфемнага складу слова.

## Узоры разбору

1. ***Узнесеную*** — дзеепрыметнік, слова зменнае, змяняецца па родах, ліках, склонах: *узнесен*|*ая*|, *узнесен*|*ых*|, *узнесен*|*ы*|.

Канчатак ***-ую***, указвае на ж. р., адз. л., В. скл.

Аснова *узнесен-* — члянімая на марфемы.

Суфікс *-ен-* . Словы з такім жа суфіксам: *прывезе**н**ы, асветле**н**ы, пастаўле**н**ы.*

Прыстаўка *уз-*. Словы з такой жа прыстаўкай: ***уз**лезці, **уз**бегчы, **уза**брацца.*

Корань *-нес'-;* роднасныя словы: ***нес**ці, вы**нас**, **нас**іць.*

Графічны разбор: *узнесен*|*ую*|.

2. ***Прытаміўся*** — дзеяслоў, слова зменнае, змяняецца па родах, ліках, ладах і інш.: *прытаміл*|*а*|*ся, прытаміл*|*і*|*ся, прытаміл*|*а*|*ся б.*

Канчатак нулявы, указвае на м. р., адз. л., пр. ч.

Аснова *прытаміў-..-ся* — члянімая на марфемы; перарваная.

Постфікс *-ся.* Словы з такім жа постфіксам: *нагнуў**ся**, змяніў**ся**, сцерагчы**ся**.*

Суфікс *-ў-*. Словы з такім жа суфіксам: *аберагаў, шанаваў, любіў.*

Суфікс *-і-*. Словы з такім жа суфіксам: *раб**і**ў, нас**і**ць, будз**і**ць.*

Прыстаўка *пры-*. Словы з такой жа прыстаўкай: ***пры**пыніўся, **пры**пазніцца, **пры**помніць.*

Корань *-там'-* ; роднасныя словы: *с**томa**, с**тамл**юся, на**там**іцца.*

Графічны разбор: *прытаміў*|  |*ся*.

3. ***Душна*** (у хаце) — безасабова-прэдыкатыўнае слова, нязменнае слова. Канчатка не мае.

Аснова *душна* — члянімая на марфемы.

Суфікс *-а.* Словы з такім жа суфіксам: *зелен**а**, млосн**а**, ветран**а**.*

Суфікс *-н-*. Словы з такім жа суфіксам: *халод**н**ы, смеш**н**ы, чароў**н**ы.*

Корань *душ-;* роднасныя словы: ***дух**, **душ**ны, за**дух**а.*

Графічны разбор: *душна* .

# СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ РАЗБОР

Парадак разбору

1. Вызначыць часціну мовы, да якой адносіцца вытворнае слова.
2. Паставіць слова ў пачатковую форму.
3. Пошук базавага слова фармальным шляхам (спачатку шляхам адкідання апошняй словаўтваральнай марфемы ці першай, затым — 2-х ці 3-х марфем).
4. Растлумачыць лексічнае значэнне вытворнага слова з дапамогай аднакаранёвага, знойдзенага фармальным шляхам. Гэтае аднакаранёвае слова па колькасці марфем павінна знаходзіцца ў словаўтваральным ланцужку найбліжэй да аналізуемага.
5. Параўнаць састаў утворанага слова з базавым і выдзеліць (падкрэсліць) у базавым слове словаўтваральную базу (г. зн. агульную частку базавага і ўтворанага слоў).
6. Вылучыць (абазначыць сімвалам) словаўтваральны сродак.
7. Вызначыць спосаб словаўтварэння.

*Вось так во рынешся **дзе-небудзь** пасярод лугу ці на беразе рэчкі ў **шчыкатлівую** траву, **зарыешся** ў яе носам ці пакладзеш рукі пад галаву, будзеш ляжаць **доўга,** усведамляючы, што на гэты час **усё** — і машыны, і спрэчкі, і нарады, і **штодзённая мітусня** — засталося недзе далёка-далёка і ўжо вось тут, у траве, уяўляецца як нешта нерэальнае і **неакрэсленае.*** (Я. С.)

Узоры графічнага словаўтваральнага разбору

*Дзе* → *дзе-**небудзь*** (постфіксальны спосаб).
*Шчыкатаць* → *шчыкат**лів**ы* (суфіксальны спосаб).
*Зарыць* → *зарыць**ца*** (постфіксальны спосаб).
*Доўгі* → *доўг**а*** (суфіксальны спосаб).
*Штодня* (або: *штодзень*∅ ) → *штодзён**н**ы* (суфіксальны спосаб)
*Мітусіцца* → *мітус**н**я* (суфіксальны спосаб).
(Нешта) ***неакрэсленае.***
*Акрэслены* → ***не**акрэслены* (прыставачны спосаб).

***Усё*** (засталося). ***Усё** жыццё прайшло* (займ. у форме н. р.; азначэнне). → ***Усё** засталося* (назоўнік н. р.; дзейнік). (Пераход займенніка ў назоўнік).

# МАРФАЛАГІЧНЫ РАЗБОР

## Назоўнік

1. Часціна мовы.
2. Пачатковая форма (Н. скл., адз. л.).
3. Лексіка-граматычныя разрады: а) агульны ці ўласны; б) адушаўлёны ці неадушаўлёны; в) асабовы ці неасабовы (сярод адушаўлёных); г) зборны; д) рэчыўны.
4. Пастаянныя (нязменныя) марфалагічныя прыметы: род, скланенне.
5. Зменныя марфалагічныя прыметы: форма ліку, склону.
6. Сінтаксічная роля ў сказе.

## Прыметнік

1. Часціна мовы.
2. Пачатковая форма (Н. скл., адз. л., м. р.).
3. Лексіка-граматычны разрад: якасны, адносны ці прыналежны.
4. Зменныя марфалагічныя прыметы: форма ліку, роду (у адз. ліку), склону.
5. У поўнай ці кароткай форме.
6. У якой форме ступені параўнання (калі ёсць): у простай або складанай форме вышэйшай ці найвышэйшай ступені параўнання.
7. Да якога назоўніка (займенніка) дапасуецца.
8. Сінтаксічная роля ў сказе.

## Лічэбнік

1. Часціна мовы.
2. Пачатковая форма: Н. скл., адз. л. (калі ёсць), м. р. (калі ёсць).
3. Разрад паводле значэння: колькасны (уласна-колькасны, г. зн. які абазначае цэлы лік; дробавы; зборны) або парадкавы.
4. Разрад паводле структуры: просты, складаны ці састаўны.
5. Марфалагічныя прыметы: форма роду (калі ёсць), ліку (калі ёсць), склону.
6. Да якога назоўніка (займенніка) дапасуецца (калі лічэбнік парадкавы).
7. Сінтаксічная роля ў сказе.

## Займеннік

1. Часціна мовы.
2. Пачатковая форма: Н. скл., адз. л. (калі ёсць), м. р. (калі ёсць).

3. Разрад паводле значэння: асабовы (уласна-асабовы ці асабова-ўказальны), зваротны, прыналежны, указальны, азначальны, пытальны, адносны, адмоўны, неазначальны (няпэўны).

4. Марфалагічныя прыметы: асоба (для асабовых), форма роду (калі ёсць), ліку (калі ёсць), склону.

5. Да якога назоўніка дапасуецца (калі змяняецца як прыметнік).

6. Сінтаксічная роля ў сказе.

### Дзеяслоў

1. Часціна мовы.

2. Пачатковая форма (інфінітыў).

3. Асновы дзеяслова: а) аснова інфінітыва; б) аснова цяперашняга (будучага простага) часу; в) аснова прошлага часу (вызначаецца тады, калі аснова прошлага часу і аснова інфінітыва не супадаюць).

4. Пастаянныя (нязменныя) марфалагічныя прыметы:

а) пераходны ці непераходны;

б) зваротны ці незваротны;

в) закончанага ці незакончанага трывання;

г) асабовы ці безасабовы;

д) I ці II спражэння, рознаспрагальны.

5. Зменныя марфалагічныя прыметы: форма ладу (абвеснага, загаднага ці ўмоўнага), часу (калі ёсць), асобы (калі ёсць), ліку, роду (для пр. ч. адз. л. і ўмоўнага ладу адз. л.).

6. Сінтаксічная роля ў сказе.

### Дзеепрыметнік

1. Часціна мовы (асобая форма дзеяслова — дзеепрыметнік).

2. Пачатковая форма (Н. скл., адз. л., м. р.).

3. Пастаянныя (нязменныя) марфалагічныя прыметы: а) залежнага ці незалежнага стану; б) прошлага ці цяперашняга часу; в) закончанага ці незакончанага трывання.

4. Зменныя марфалагічныя прыметы: форма ліку, роду (у адз. ліку), склону.

5. У поўнай ці кароткай форме.

6. Да якога назоўніка (займенніка) дапасуецца.

7. Спосаб утварэння (ад якой дзеяслоўнай асновы і пры дапамозе якога суфікса ўтвораны).

8. Сінтаксічная роля ў сказе.

### Дзеепрыслоўе

1. Часціна мовы (нязменная форма дзеяслова — дзеепрыслоўе).

2. Марфалагічныя прыметы: а) закончанага ці незакончанага трывання; б) зваротнае ці незваротнае; в) пераходнае ці непераходнае.

3. Спосаб утварэння (ад якой дзеяслоўнай асновы і пры дапамозе якога суфікса ўтворана).

4. Сінтаксічная роля ў сказе.

### П р ы с л о ў е

1. Часціна мовы.

2. Разрад паводле значэння: спосабу дзеяння; меры і ступені; месца; часу; прычыны; мэты.

3. Разрад паводле ўтварэння: невытворнае ці вытворнае (ад якой часціны мовы).

4. У якой форме ступені параўнання (калі ёсць): у простай або складанай форме вышэйшай ці найвышэйшай ступені параўнання.

5. Сінтаксічная роля ў сказе.

### Б е з а с а б о в а - п р э д ы к а т ы ў н а е  с л о в а
### (прэдыкатыўнае прыслоўе)

1. Часціна мовы.

2. Разрад паводле значэння: абазначае псіхічны стан чалавека, фізічны стан чалавека, стан прыроды, стан асяроддзя, ацэнку стану з маральнага боку, з мадальнага боку, з боку часу, зрокавых ці слыхавых успрыняццяў, меру чаго-небудзь і інш.

3. Разрад паводле паходжання: невытворнае ці вытворнае (суадноснае з прыметнікам, назоўнікам, прыслоўем, інфінітывам).

4. У якой форме ступені параўнання (калі ёсць): у простай або складанай форме вышэйшай ці найвышэйшай ступені параўнання.

5. Сінтаксічная роля ў сказе.

### П р ы н а з о ў н і к

1. Часціна мовы.

2. Разрад паводле ўтварэння: невытворны ці вытворны (ад якой часціны мовы паходзіць).

3. Разрад паводле структуры: просты, складаны, састаўны.

4. З якім склонам назоўніка (займенніка) ужыты.

5. Разам з назоўнікам (займеннікам) якія адносіны (якое значэнне) выражае: прасторавыя, ча́савыя, аб’ектныя, азначальныя, прычынныя, мэтавыя, спосабу дзеяння, меры і ступені, сумеснасці).

### З л у ч н і к

1. Часціна мовы.

2. Разрад паводле значэння: злучальны ці падпарадкавальны.

3. Разрад паводле структуры: просты, састаўны, парны.

4. Разрад паводле спосабу ўжывання: адзіночны, паўторны.

5. Якія сінтаксічныя адзінкі звязвае (члены сказа, часткі складаназлучанага ці складаназалежнага сказа).

### Часціца

1. Часціна мовы.

2. Разрад паводле паходжання: невытворная ці вытворная (ад якой часціны мовы паходзіць).

3. Разрад паводле значэння: сэнсавая (указальная, выдзяляльна-абмежавальная), мадальная (сцвярджальная, адмоўная, пытальная, пабуджальная), эмацыянальная (клічная, узмацняльная), формаўтваральная.

4. Роля часціцы: выражае абмежаванне, пажаданне, сцвярджэнне, пытанне, пачуццё, служыць для ўтварэння формы слова.

### Узоры марфалагічнага аналізу

*Кожны чалавек — прыгожы.* ***Адзін*** *прыгожы тварам. А ў* ***другога*** *твар не прыгожы****, але ён неяк вельмі*** *ж ужо* ***цёпла асвятляецца*** *ўнутраным* ***святлом, ад чаго*** *чалавек прыгажэе... Трэба толькі* ***ўлавіць той*** *момант****, калі чалавечы твар можна*** *чытаць, як* ***цудоўную*** *займальную кнігу, не* ***звяртаючы*** *ўвагі* ***на*** *афармленне. Праўда, для гэтага* ***трэба, каб*** *і нашы душы былі таксама добрыя...* (Я. Сіпакоў. Акно, **расчыненае** ў зіму)

(...асвятляецца) ***святлом*** — назоўнік; пачатковая форма — *святло*; агульны, неадуш.; н. р., 2-га склан., адзіночналікавы (г. зн. мае толькі форму адз. л.); ужыты ў форме Т. скл.; выконвае сінтаксічную ролю ўскоснага дапаўнення.

(...чытаць) ***твар*** — назоўнік; пачатковая форма — *твар*; агульны, неадуш.; м. р., 2-га склан.; ужыты ў форме адз. л., В. скл.; выконвае сінтаксічную ролю прамога дапаўнення.

(...чытаць) ***чалавечы*** (твар) — прыметнік; пачатковая форма — *чалавечы*; прыналежны; ужыты ў форме м. р., адз. л., В. скл., у поўнай форме; дапасуецца да назоўніка *твар*; выконвае сінтаксічную ролю дапасаванага азначэння.

(...чытаць, як) ***цудоўную*** (кнігу) — прыметнік; пачатковая форма — *цудоўны*; якасны; ужыты ў форме ж. р., адз. л., В. скл., у поўнай форме; дапасуецца да назоўніка *кнігу*; уваходзіць у склад акалічнасці спосабу дзеяння, выражанай параўнальным зваротам.

***Адзін*** (чалавек прыгожы тварам) — лічэбнік; пачатковая форма — *адзін*; колькасны (уласна-колькасны), просты; ужыты ў форме м. р., адз. л., Н. скл.; уваходзіць у склад дзейніка *адзін чалавек.*

(…у) ***другога*** (чалавека твар…) — лічэбнік; пачатковая форма — *другі*; парадкавы, просты; ужыты ў форме м. р., адз. л., Р. скл.; дапасуецца да назоўніка чалавека; выконвае сінтаксічную ролю дапасаванага азначэння.

***…ён*** (асвятляецца) — займеннік; пачатковая форма — *ён*; асабовы (асабова-ўказальны), 3-й асобы; ужыты ў форме м. р., адз. л., Н. скл.; выконвае сінтаксічную ролю дзейніка.

(…ад) ***чаго*** (…прыгажэе) — займеннік; пачатковая форма — *што*; адносны; ужыты ў форме Р. скл.; разам з прыназоўнікам ад выконвае сінтаксічную ролю акалічнасці прычыны.

(…улавіць) ***той*** (момант) — займеннік; пачатковая форма — *той*; указальны; ужыты ў форме м. р., адз. л., В. скл.; дапасуецца да назоўніка момант; выконвае сінтаксічную ролю дапасаванага азначэння.

(…ён) ***асвятляецца*** (святлом) — дзеяслоў; пачатковая форма — *асвятляцца*; аснова інфінітыва — *асвятля-.. -ца*, аснова ц. ч. — *асвятля*[ j ]-.. *-ца* ; непераходны, зваротны, незаконч. трыв., асабовы, І спр.; ужыты ў форме абвеснага ладу, ц. ч., 3-й ас., адз. л.; выконвае сінтаксічную ролю выказніка.

(Трэба) ***улавіць*** (…момант) — дзеяслоў; пачатковая форма — *улавіць*; аснова інфінітыва — *улаві-* , аснова ц. ч. — *улов'-* ; пераходны, незваротны, законч. трыв., асабовы, ІІ спр.; ужыты ў форме інфінітыва; уваходзіць у склад галоўнага члена безасабовага сказа *трэба ўлавіць.*

(Акно), ***расчыненае*** (у зіму) — асобая форма дзеяслова: дзеепрыметнік; пачатковая форма — *расчынены;* залежнага стану, пр. ч., законч. трыв.; ужыты ў форме н. р., адз. л., Н. скл., у поўнай форме; дапасуецца да назоўніка *акно*; утвораны ад усечанай асновы інфінітыва *расчын'-* пры дапамозе суф. *-ен-*; уваходзіць у склад дапасаванага азначэння, выражанага дзеепрыметным зваротам.

(…чытаць, не) ***звяртаючы*** (увагі) — нязменная форма дзеяслова: дзеепрыслоўе; незаконч. трыв., незваротнае, пераходнае; утворана ад асновы ц. ч. *звярта*[j]- пры дапамозе суф. *-учы*; уваходзіць у склад акалічнасці спосабу дзеяння, выражанай дзеепрыслоўным зваротам.

(…неяк) ***вельмі*** (ж ужо цёпла) — прыслоўе меры і ступені; невытворнае; разам з часціцамі неяк, ж, ужо выконвае сінтаксічную ролю акалічнасці меры і ступені.

…***цёпла*** (асвятляецца) — прыслоўе спосабу дзеяння; вытворнае (ад прыметніка *цёплы*); выконвае сінтаксічную ролю акалічнасці спосабу дзеяння.

(…момант,) ***калі*** (…твар можна чытаць) — прыслоўе часу; невытворнае; выконвае ролю адноснага слова ў дададай частцы складаназалежнага сказа і з’яўляецца акалічнасцю часу.

(…твар) ***можна*** (чытаць) — безасабова-прэдыкатыўнае слова; абазначае ацэнку стану з боку магчымасці дзеяння; невытворнае; уваходзіць у склад галоўнага члена безасабовага сказа.

(…для гэтага) ***трэба,*** (каб) — безасабова-прэдыкатыўнае слова; абазначае ацэнку стану з боку неабходнасці дзеяння; невытворнае; уваходзіць у склад галоўнага члена безасабовага сказа.

(…асвятляецца… святлом,) ***ад*** (чаго чалавек прыгажэе) — прыназоўнік; невытворны, просты; ужыты з Р. скл. займенніка *чаго* і разам з ім выражае прычынныя адносіны.

(…не звяртаючы ўвагі) ***на*** (афармленне) — прыназоўнік; невытворны, просты; ужыты з В. скл. назоўніка *афармленне* і разам з ім выражае аб’ектныя адносіны.

(…твар не прыгожы,) ***але*** (ён… асвятляецца) — злучнік; злучальны (супраціўны), просты, адзіночны; звязвае часткі складаназлучанага сказа.

(…трэба,) ***каб*** (і нашы душы…) — злучнік; падпарадкавальны, просты, адзіночны; звязвае часткі складаназалежнага сказа.

…***неяк*** (вельмі ж ужо цёпла…) — часціца; вытворная (ад прыслоўя *як* з часціцай *не*), узмацняльная, выражае пачуццё няўпэўненасці і ўзмацнення ступені якасці.

(…трэба, каб) ***і*** (нашы душы былі…) — часціца; вытворная (ад злучніка ***і*** ), узмацняльная, надае слову *нашы* значэнне ўзмацнення.

# СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР СЛОВАЗЛУЧЭННЯ

## Парадак разбору

1. Вылучыць у сказе спалучэнні слоў, якія не з’яўляюцца словазлучэннямі (спалучэнне дзейніка і выказніка, група аднародных членаў і інш.).

2. Выдзеліць словазлучэнне, назваць у ім галоўны і залежны кампаненты.

3. Вызначыць разрад словазлучэння паводле марфалагічнай прыроды галоўнага слова: дзеяслоўнае, іменнае, прыслоўнае.

4. Вызначыць спосаб падпарадкавальнай сувязі слоў: дапасаванне, кіраванне, прымыканне.

5. Назваць сродкі сінтаксічнай сувязі: канчатак; прыназоўнік; канчатак і прыназоўнік разам; сувязь па сэнсе.

6. Ахарактарызаваць сінтаксічныя адносіны ў словазлучэнні: азначальныя, аб’ектныя, акалічнасныя.

### У з о р ы   р а з б о р у

*Мы будзем далёка ці блізка, але не забудзем сустрэч вечары, агні залатыя над Мінскам.* (Зв.)

Словазлучэннямі ў прыведзеным сказе не з’яўляюцца спалучэнне дзейніка і аднародных выказнікаў: мы будзем, але не забудзем; рад аднародных дапаўненняў: вечары, агні; аднародных акалічнасцей: далёка ці блізка.

### А н а л і з   с л о в а з л у ч э н н я ў:

дзе ?

*будзем далёка ці блізка* — словазлучэнне; галоўнае слова — дзеяслоў *будзем*, залежным кампанентам выступае спалучэнне слоў *далёка ці блізка*; дзеяслоўнае; від сувязі — прымыканне; сувязь ажыццяўляецца па сэнсе; сінтаксічныя адносіны — акалічнасныя, прасторавыя;

што ?

*не забудзем вечар|ы* — словазлучэнне; галоўнае слова — дзеяслоў *забудзем*, залежнае — назоўнік вечары; дзеяслоўнае; від сувязі — кіраванне; сродак сувязі — канчатак; сінтаксічныя адносіны — аб’ектныя.

якія ?

*сустрэч □ вечары* — словазлучэнне; галоўнае слова — назоўнік *вечары*, залежнае — назоўнік сустрэч; іменнае, назоўнікавае; від сувязі — кіраванне; сродак сувязі — канчатак; сінтаксічныя адносіны — азначальныя.

якія ?

*агні залат|ыя* — словазлучэнне; галоўнае слова — назоўнік *агні,* залежнае — прыметнік залатыя; іменнае, назоўнікавае; від сувязі — дапасаванне; сродак сувязі — канчатак; сінтаксічныя адносіны — азначальныя.

якія ?

*агні над Мінск|ам* — словазлучэнне; галоўнае слова — назоўнік *агні,* залежнае — назоўнік з прыназоўнікам над Мінскам; іменнае, назоўнікавае; від сувязі — кіраванне; сродак сувязі — канчатак і прыназоўнік; сінтаксічныя адносіны — азначальныя.

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР ПРОСТАГА СКАЗА

### П а р а д а к   р а з б о р у

1. Вылучыць (падкрэсліць) граматычную аснову сказа.
2. Вызначыць тып сказа па мэце выказвання: апавядальны, пытальны ці пабуджальны;
3. Вызначыць тып сказа па інтанацыі: клічны ці няклічны.
4. Вызначыць від сказа паводле будовы:

а) двухсастаўны ці аднасастаўны; калі сказ аднасастаўны — вызначыць яго тып: пэўна-асабовы, няпэўна-асабовы, абагульнена-асабовы, безасабовы, інфінітыўны, намінатыўны (назыўны);

б) развіты ці неразвіты;

в) поўны ці няпоўны; у няпоўным назваць, які член сказа апушчаны.

5. Адзначыць, калі сказ ускладнены аднароднымі членамі, адасобленымі членамі сказа, зваротkам, пабочнымі канструкцыямі, параўнальнымі зваротамі.

6. Разабраць сказ па членах: спачатку вызначыць галоўныя члены сказа і чым яны выражаны (у двухсастаўным сказе ўказваецца тып выказніка), потым — даданыя члены саставу дзейніка, затым — даданыя члены саставу выказніка.

7. Растлумачыць знакі прыпынку.

### Узор разбору

*Засумаваў я па табе, радзіма, па недаступнай тваёй красе.* (Сяд.)

Сказ просты, апавядальны, няклічны, двухсастаўны, развіты, поўны, ускладнены аднароднымі дапаўненнямі і зваротkам.

Граматычная аснова — ***я засумаваў:*** дзейнік ***я*** выражаны ўласна-асабовым займеннікам у назоўным склоне; выказнік ***засумаваў*** просты дзеяслоўны, выражаны асабовай формай дзеяслова;

***па табе*** — ускоснае дапаўненне, выражана ўласна-асабовым займеннікам у месным склоне з прыназоўнікам;

***па красе*** — ускоснае дапаўненне, выражана назоўнікам у месным склоне з прыназоўнікам;

***недаступнай*** — дапасаванае азначэнне, выражана прыметнікам;

***тваёй*** — дапасаванае азначэнне, выражана прыналежным займеннікам

Сказ апавядальны, няклічны, таму ў канцы яго ставіцца кропка. Сказ ускладнены зваротkам, які стаіць у сярэдзіне сказа і выдзяляецца з двух бакоў коскамі.

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР СКЛАДАНАГА СКАЗА

### Парадак разбору

1. Вылучыць (падкрэсліць) граматычныя асновы састаўных частак складанага сказа, якія адпавядаюць будове простых сказаў.

2. Вызначыць тып складанага сказа і прааналізаваць яго ў адпаведнасці з ніжэй прыведзеным тыпам.

## Складаназлучаны сказ

### Парадак разбору

1. Вызначыць, колькі састаўных частак (прэдыкатыўных адзінак, або простых сказаў) у яго ўваходзіць.

2. Вызначыць від злучальнага злучніка, якім звязваюцца часткі: спалучальны, супраціўны, размеркавальны.

3. Вызначыць від сінтаксічных адносін паміж часткамі: спалучальныя (адначасовасці або паслядоўнасці дзеянняў ці з'яў), размеркавальныя, супраціўныя, прычынна- або ўмоўна-выніковыя.

4. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнай састаўной часткі (гл. разбор простага сказа).

5. Пабудаваць схему сказа.

### Узор разбору

[1] *Як даўно тое было, а* [2] *памяць усё захоўвае: і сінь далёкага лесу, і купчастыя ліпы над хатамі, і бязмежную раскаваную радасць быцця.* (Вар.)

Сказ складаназлучаны; складаецца з дзвюх частак (назваць), якія звязваюцца паміж сабой супраціўным злучнікам ***а;*** у сказе выражаюцца супраціўныя адносіны.

Першая частка сказа [1]*Як даўно тое было* пабудавана па схеме простага сказа, апавядальнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага.

Другая частка [2] *памяць усё захоўвае: і сінь далёкага лесу, і купчастыя ліпы над хатамі, і бязмежную раскаваную радасць быцця* пабудавана па схеме простага сказа, апавядальнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, ускладненага аднароднымі дапаўненнямі.

Схема сказа:

[1], а [2].

## Складаназалежны сказ

### Парадак разбору

1. Вызначыць галоўную і даданую (або даданыя) часткі сказа.

2. Вызначыць від даданай часткі (або даданых).

3. Вызначыць сродкі сувязі даданых частак з галоўнай (злучнікі, злучальныя словы).

4. Калі ў сказе некалькі даданых частак, вызначыць від падпарадкавання — паслядоўнае, сузалежнае, змешанае. Пры сузалежным

падпарадкаванні паказаць, аднароднымі ці неаднароднымі з’яўляюцца дадзеныя часткі.

5. Зрабіць сінтаксічны разбор галоўнай і даданай (даданых) частак.
6. Пабудаваць схему складанага сказа.

### Узор разбору

[1] *Хоць і разлукі горкія былі,* [0] *а толькі ўспамінаюцца сустрэчы і шчаслівыя часы,* [2] *што і цяпер здаюцца нам вясною*. (Грах.)

Сказ складаназалежны з сузалежным падпарадкаваннем.

Галоўная частка [0] *а толькі ўспамінаюцца сустрэчы і шчаслівыя часы.*

Першая даданая частка [1]*Хоць і разлукі горкія былі* адказвае на пытанне *нягледзячы на што?*; даданая ўступальная, звязваецца з галоўнай падпарадкавальным злучнікам ***хоць і*** (у галоўнай частцы ўжыты супраціўны злучнік ***а***).

Другая даданая частка [2] *што і цяпер здаюцца нам вясною* адказвае на пытанне *якія часы?;* даданая азначальная, звязваецца з галоўнай злучальным словам — адносным займеннікам ***што.*** Даданыя часткі неаднародныя.

Галоўная частка пабудавана па схеме простага сказа, апавядальнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, ускладненага аднароднымі дзейнікамі. Першая даданая частка (уступальная) пабудавана па схеме простага сказа, апавядальнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага. Другая даданая частка (азначальная) пабудавана па схеме простага сказа, апавядальнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага.

### Схема сказа блочная:




### Схема сказа лінейная:



## Бяззлучнікавы складаны сказ

П а р а д а к   р а з б о р у

1. Вызначыць састаўныя часткі, якія ўваходзяць у сказ.
2. Вызначыць, якія адносіны яны выражаюць: пералічэнне дзеянняў ці з'яў, іх супастаўленне, умову і вынік, прычыну і вынік, факт і яго прычыну.
3. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку.
4. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнай часткі.
5. Пабудаваць схему складанага сказа.

У з о р   р а з б о р у

[1]*Беднае зернетка згубіла ўжо ўсякую надзею ўбачыць калі-небудзь белы свет:* [2]*так было цёмна яму ў зямлі пад снегам, так холадна і маркотна*. (К-с)

Сказ складаны, бяззлучнікавы; складаецца з дзвюх частак. У першай частцы [1]*Беднае зернетка згубіла ўжо ўсякую надзею ўбачыць калі-небудзь белы свет* называецца факт, у другой [2]*так было цёмна яму ў зямлі пад снегам, так холадна і маркотна* — прычына, таму паміж імі ставіцца двукроп'е.

Першая частка пабудавана па схеме простага апавядальнага сказа, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага.

Другая частка пабудавана па схеме простага апавядальнага сказа, аднасастаўнага безасабовага, развітага, поўнага, ускладненага аднароднымі галоўнымі членамі.

С х е м а   с к а з а:

[1] : [2] .

## Складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак

П а р а д а к   р а з б о р у

1. Вызначыць колькасць састаўных частак (простых сказаў).
2. Вылучыць і абазначыць рымскімі лічбамі I і II структурныя часткі, вызначыць від сувязі паміж імі (злучальная, бяззлучнікавая).
3. Разабраць кожную структурную частку (адна з іх абавязкова будзе складаным сказам). У складанай структурнай частцы ахарактарызаваць састаўныя часткі.
4. Растлумачыць знакі прыпынку.
5. Пабудаваць схему сказа.

### Узор разбору

[I 1] *Як цуд чужы вачэй ні цешыў*, [0] *душа шаптала мне сама*: [II 1] *ёсць край цяплейшы, багацейшы*, *але* [2] *раднейшага няма*. (Бур.)

Складаны сказ з рознымі відамі сувязі; складаецца з чатырох састаўных частак (простых сказаў), якія звязваюцца бяззлучнікавай і злучнікавай (злучальнай і падпарадкавальнай) сувяззю.

Сказ складаецца з дзвюх структурных частак **I, II**, якія звязваюцца бяззлучнікавай сувяззю. Другая частка **II** дапаўняе выказнік са значэннем маўлення ў першай частцы **I**, таму паміж імі ставіцца двукроп’е.

Структурная частка **I** пабудавана па схеме складаназалежнага сказа з даданай уступальнай, якая звязваецца з галоўнай злучальным словам — прыслоўем ***як*** з часціцай ***ні.*** Галоўная частка [0] *душа шаптала мне сама* пабудавана па схеме простага апавядальнага сказа, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага. Даданая частка [1] *Як цуд чужы вачэй ні цешыў* — даданая ўступальная, пабудавана па схеме простага апавядальнага сказа, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага.

Структурная частка **II** пабудавана па схеме складаназлучанага сказа з супраціўнымі адносінамі, састаўныя часткі якога звязваюцца супраціўным злучнікам ***але.*** Першая частка [1] у логіка-структурнай частцы **II** пабудавана па схеме простага апавядальнага сказа, двухсастаўнага, развітага, поўнага, ускладненага аднароднымі азначэннямі. Другая частка [2] пабудавана па схеме простага апавядальнага сказа, аднасастаўнага (безасабовага), развітага, няўскладненага, няпоўнага (апушчана дапаўненне *краю*, якое паясняецца наяўным азначэннем *раднейшага*).

Схема сказа блочная:




Схема сказа лінейная:



*Дадатак 2*

# С Л О Ў Н І К Н А Ц І С К А Ў

### А

абагу́ленне
абагульне́нне
абве́сці
абе́руч
абу́тнік (-ніца)
абшарпа́ць (-ны)
абзаве́сціся
аб’і́нець (-лы)
абіўны́
абы́граны і абыгра́ны
абыржаве́лы
аб’язны́
аге́нт
агрэ́ст
агульнапрыня́ты
адбуксі́раваць (-ны)
адзіна́ццаць
аднаакто́вы
аднасаста́ўны (сказ)
адпая́ны (-ць)
ае́р
азбе́ст
айва́
аку́нь
алфаві́т
ампе́р
ана́пест
а́нкер
апра́нуты
ара́тай
ара́хіс
аржаны́
асіме́трыя
а́тлас *(геагр.)*
атла́с (‘тканіна’)
атле́т
ашчы́паны

### Б

ба́лавацца
ба́рмен
баро́даўка (-чаты)
басі́ць
бахчавы́
ба́цькі (*мн. ад* бацька)
бацькі́ (*рус.* родители)
біржавы́
біту́м
блакірава́ць (-ны)
бліжэ́й і блі́жай
бліскаві́ца
блі́скаць
блі́снуць
блука́ць
бляха́р
бо́бслей
браву́рна (-сць)
браву́рны
бра́тацца (-нне)
бра́ткі *(бат.)*
бу́дны (дзень)
буйны́ (‘вялікі’)
бу́йны (‘раз’юшаны’)
буксі́раванне
бульбяны́

### В

вага́
вага́нне
вадзяны́
валавы́ (даход)
валё́нкі
валту́зіць
варсяны́
вашчы́на
ве́жавы
ве́зці
в**е**ліза́рны і в**я**лі́зарны
ве́рфавы
ве́стэрн
ветэрына́рыя
відары́с
ву́дзіць
ву́зіць
вуллі́
ву́сы, вусо́ў
вы́гадна (*ад* выгада) і
выго́дна (*ад* выгода —
’зручнасць’)
выгна́нец (-нне)
вы́гнаны
вы́падак
вы́чварны (-а, -асць)
вы́чварыць
вэ́люм
вярба́
вясну́шкаваты
вяха́, ве́хі

### Г

галіна́ (дзейнасці) *мн.л.*:
галі́ны
галі́на (дрэва)
гарко́та
гаро́хавінне
гастрано́мія
ге́незіс
глі́нішча
гліня́ны
гні́сці і гні́ць
грамадзя́нін

гро́ша, *мн.* гро́шы
гру́бы (‘нявыхаваны’)
грубы́ (‘тоўсты’)
грунтавы́
губа́ *(анат., геагр.)*
гу́ба *(бат.)*
гу́капіс
гульня́вы *(разм.)*
гусце́нькі
гучне́й

## Д

дабры́дзень
давідна́
дагаво́р
дазіме́тр
дазіме́трыя
да́ктыль
дале́й
дане́сці
дані́зу
дапрызы́ўнік (-і)
да́рма (‘бясплатна’)
дарма́ (‘марна’)
дасу́ха
дасы́та
даччы́н (-на́, -но́)
дачы́рвана
дачы́ста
джэнтльме́н
джэрсі́
дзевя́цера
дзеся́цера
дзе́ячы
дзічы́на
дзядзі́нец
до́света
драцяны́
дрэсірава́ны
дублі́раваць
ды́скант *(муз.)*
дыспансе́р *(мед.)*
дыспансе́рны
дыяме́нт
дэфі́с
дэцыме́тр

## Е

ерэты́к
еўразі́йскі

## Ж

жа́льба
жалюзі́
жарсцвя́ны
жаўна́
жві́рыстасць
жваве́й
жваве́ць
жылі́
жыха́р
жыццяпі́с
жэ́рабя (кінуць)

## З

за́відкі *(разм.)*
за́відна
за́вязка (’за́сцежка’)
загаво́р (‘змова’)
за́гадзя
за́гарадка і загаро́дка
за́грудкі
за́даўга
зае́чы, *часцей* за́ячы
за́жыва
за́зімак і зазі́мак
заі́нець
заі́нелы
за́ймішча
за́йца, зайцы́
закаба́лены
закалыха́ць
закалыха́ны
закапа́ная (я́ма)
за́кід
закі́даны
за́крутка
за́кут
заку́так
зале́ва
за́малада
за́мчышча
заня́ць (-ты)
заня́тасць
запальні́ца
запе́чак
заржаве́ць
за́светла
за́сцежка
заці́шак
зачаса́ны
збажына́
звіхну́ты
звы́чай
згада́ны
здаўна́
зло́дзей, зладзе́ям
зму́ляць і зму́ліць
знаха́р
знаха́рыць
зубры́

## І

ігры́шча
ігу́мен
і́канапіс
і́каць
і́кнуць
ільня́нішча
ільняны́
іме́нны (выказнік)
імянны́ (спіс)
імя́
іна́чай
інду́стрыя

інсцэні́раванне
інтэрв’юе́р
і́скра
існую́
і́шыяс

### К

ка́даўб
кадаўбе́ц
казе́лец *(бат.)* і
казяле́ц
казы́рны
кайда́ны і кайданы́
калігра́фія
калі́ўе
ка́ліўца
каля́ны
камба́йнер
ка́мбала
каме́ль
каме́нны
касцяны́
катава́ць
катало́г
каўчу́к (-авы)
ка́фля
ка́фляны
ка́шляць
каштары́с
кварта́л
кве́тнік
ке́та
кіслі́ца
кіслі́ць
кі́шка
клеявы́
кляцьба́
кля́штар (-ны)
красаві́к
крапіва́
крупяны́
крывізна́
крывічы́
крыху́
крэ́дыт *(бухг.)* і крэды́т
ку́даса (‘мяцеліца’)
куліна́рыя і
кулінары́я *(разм.)*
курганы́
ку́хар
куха́рскі
куха́рыць
кухо́нны

### Л

ла́савацца
ласасі́на
лёгкаатле́т
ліставы́
лі́сцевы
літасці́васць
лі́тасцівы і літасці́вы
лі́фты *(мн. ад* ліфт*)*
ло́пух
лубяны́
лу́шчыць
лютава́ць

### М

магазі́н
мале́нькі
мане́ўры
ма́рмур
мармуро́вы
медзяны́
медыкаме́нты
металу́ргія
межавы́
ме́зены
мені́ск
ме́шалка
ме́сці
мізэ́рнасць
му́ляр (-скі)
мы́сленне
мышле́нне

### Н

наблука́цца
навіна́
навя́заны
на́гала
на́глуха
надзвы́чай
надзвыча́йна
нажні́цы
нажы́ты
назва́ны
накі́дка
на́крыўка
на́мітка
нані́заны
наня́ты
на праця́гу
насме́рць
наспе́х
насці́л
натру́дзіць
на́чыста
нашы́ўка
недагле́дзець (дзіця)
не дагледзе́ць (фільм)
непрыя́зь
непрыя́зна
непрыя́цель *(ваен.)*
не́прыяцель
неразвіты́ (чалавек)
неразві́ты *(грам.)*
неразгада́насць
неразга́даны і
неразгада́ны
не́сці (-ла)
ні́бы
нібы́та
ніку́ды

но́здра
ну́дзіць
нудзі́цца
Нясві́ж

## О

о́птавы
о́рдэнаў

## П

паве́даміць
паву́зіць
падпара́дкаванне
падпара́дкаваць
падчысту́ю
пажылы́
палігра́фія
па́кулле
памя́нуты
памяну́ць
папа́р
па-прыя́цельску
пара́ліч
партэ́р
пасланéц
пасы́льны
пасяджэ́нне
пахму́рны (-а)
пацве́рдзіць
паці́хеньку
пачу́цце і пачуццё́
пашпарты́
пе́равязь
перагні́лы
пе́рапіс
перахо́дзіць
пе́рчыць
пе́ршынец
першынствава́ць
першынство́
пле́сці
пляцы́
праме́ні *(мн.)*
праме́нне *(зб.)*
прасціна́
прасяны́
про́паліс
пру́дзіць
пры́від
прызыўні́к
прыку́с
прыня́та
пры́печак
пры́свіст
пры́смак
прысма́кі (‘ласункі’)
прысту́пка
прыя́нне
пры́яцель
прэміравáць (нне)
пуло́вер
пу́рпур
пурпу́рны

## Р

разбуры́ць
разві́ты (сказ, вяроўка — ’расплецены’)
развіты́ (чалавек — ’дасканалы, усебакова адукаваны’ )
раку́шка
раска́заны
расхіну́ты
расхіста́ны
ржаве́ць
ро́спыт
ры́мар
рыма́рня
ры́марскі
ры́марства
ры́млянін (-е )
рыхле́нне
рыхлі́ць
рэ́гент
рэкру́цкі
рэ́мень

## С

садавіна́
сакаві́к
сам-на́сам
сантыме́тр
све́рдзел
сестрына́
сівы́
сіве́нькі
Скары́на Францыск
ску́ла
скураны́
сла́бы
слабе́й
слабе́йшы
сла́бенькі
слабіна́
слата́
слі́вавы
смаляны́
спады́спаду
спакусі́цца
спая́ны (-асць)
спі́на
спінны́
спіртавы́ і спірто́вы
спіртаме́р
сплы́сці (-ся)
сталя́р
стары́
старэ́нькі
стату́т (*у СБМ апіска?*: ста́тут)
стра́шыць
су́павы
суста́ўны
суту́лаваты (-асць)
сухе́нькі
сцёблы

**Т**

тавары́скі
тара́нтул
тарфяны́
тастаме́нт
тваро́г, тварагу́
тлумі́ць
тлу́сціць
трактары́
трапе́за (-зная)
трызненне
трыпціх
туні́ка
ту́фель
тэ́ндэм *(спец.)*

**У**

уваскрэ́сенне
уда́лы
удаўжкі́
Украі́на (-нцы)
уна́ймы
упры́сядкі
урду́
уча́дзець
ушыркі́

**Ф**

факсі́міле
факсі́мільны
фармірава́ць
фарту́х
фарфо́р
фено́мен
феты́ш
флюараграфія
фо́льга
фо́рзац (-ы) *(палігр.)*
фурма́н (-ка)

**Х**

ха́бар (-нік)
хао́с
хваі́на
храбры́цца
хрысція́нін
ху́тарны
хутарскі́

**Ц**

ценявы́
цікаве́й
ці́хенечка
ці́хенькі
цу́карніца
цыга́н, цыганы́ (-но́ў)
цьмяне́й
цэме́нт
цэ́нтнер
цэ́хавы
ця́жкі і цяжкі́
цяжа́р
ця́жба

**Ч**

ча́йны *(прыметнік)*
чайна́я *(назоўнік)*
чатырна́ццаць (-ты)
чарэ́мшына (-вы)
чэ́рпаць (-нне)

**Ш**

шарсцяны́
шасі́
шкада́ *(ад* шкадава́ць*)*
шко́да *(ад* шко́дзіць*)*
шпа́цыр
штурмавы́
шту́рхаць (-цца)
шту́рханне
штыкавы́
шчыпцы́
шэсцьдзеся́т і
шэ́сцьдзесят

**Э**

экіпірава́ны
экспе́рт (-ны)
эмалірава́ны

**Я**

язмі́н
як мага́
я́лавічына
ялка́вы (-ець, -асць)
ярына́
ясака́р
я́чны

*Дадатак 3*

# ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК

**Абша́р** — неабсяжная прастора, адлегласць; участак вялікіх памераў.

**Агіягра́фія** — навука, якая вывучае жыцці — біяграфіі асоб, далучаных да ліку святых.

**Агрэ́х** — 1. Дрэнна ўзараная, прапушчаная пры ворыве лапіна на полі. 2. *перан.* Недаробкі, недагляды. *Моўныя агрэхі.*

**Адво́льны** — 1. Нічым не абмежаваны, вольны. 2. Які праводзіцца самавольна. 3. Бяздоказны, неперакана ўчы, беспадстаўны.

**Адпаве́днік** — раўназначнае, раўнацэннае чаму-н.; эквівалент.

**Акаймава́нне** — палоска, якая акружае край чаго-н.; акаймоўка.

**Акванаўт** — даследчык мора, які праводзіць назіранне пад вадой.

**Аксамі́тны** — які мае адносіны да шаўковай тканіны з кароткім густым ворсам; // *перан.* прыемны, мяккі (пра голас, гукі).

**Акусты́чны** — які мае дачыненне да акустыкі (ад грэч. akustikos – слыхавы).

**Амбі́цыя** — празмернае пачуццё асабістай годнасці; самалюбства.

**Амплуа́** — пэўнае характэрнае кола роляў, якія выконваюцца акцёрам; // *перан.* кола заняткаў каго-н.

**А́мфара** — вялікая звужаная ўніз круглая пасудзіна з дзвюма ручкамі і вузкім горлам. Была пашырана ў антычным свеце і ў Кіеўскай Русі.

**Антрацы́т** — від высакаякаснага каменнага вугалю чорнага колеру з яркім бляскам.

**Апанта́ны** — ахоплены крайнім душэўным узрушэннем.

**Арсена́л** — склад зброі і ваеннай амуніцыі; // *перан.* запас, вялікая колькасць чаго-небудзь.

**Арты́кул** — 1. Навуковы або публіцыстычны твор невялікага памеру ў зборніку, часопісе, газеце. 2. Асобны раздзел, параграф у юрыдычных дакументах. 3. Раздзел фінансавага плана, каштарыс *(расходны артыкул)*. 4. Умоўнае абазначэнне тавараў, тып вырабу *(артыкул тканіны).*

**Асімілява́ць** — відазмяняючы, прыпадобніць (прыпадабняць).

**Ата́ва** — трава, якая вырасла ў той жа год на пакошы.

**Аўдые́нцыя** — афіцыйны прыём у высокапастаўленай асобы.

**Аўтса́йдэр** — каманда ці спартсмен, якія займаюць апошняе месца ў спаборніцтве.

**Бале́сны** — *абл.* 1. Хваравіты. 2. Які адбываецца з болем, выкліканы болем, балючы.

**Барaві́на** — узвышаны ўчастак лесу ў бары.

**Безгусто́ўны** — які не адпавядае запатрабаванням, разуменню прыгожага, эстэтычнай ацэнцы.

**Бескампрамі́сны** — які не прызнае ўзаемных уступак, які выключае мажлівасць прымірэння.

**Бліскаві́ца** — маланка, разрад атмасфернай электрычнасці ў паветры, звычайна ў выглядзе яркай звілістай лініі.

**Бо́мы** — *адз. (рэдка)* бо́ма; званочкі (*руск.* колокольчики).

**Бурштын** — скамянелая, жоўтая, празрыстая смала хвойных дрэў, якая ўжываецца для вырабу ўпрыгожванняў.

**Бы́льнік** — адзін з відаў палыну — чарнобыль.

**Вало́шка** — васілёк.

**Ва́ртасць** — 1. Каштоўнасць; цана грашовага знака. 2. Кошт чаго-н. у грашовых адзінках. 3. *перан.* Станоўчая якасць, важнасць; значэнне.

**Варшта́т** — спецыяльна абсталяваны стол для ручной сталярнай, слясарнай і іншай работы.

**Ве́нзель** — пачатковыя літары імя і прозвішча або двух імён, звязаныя агульным малюнкам.

**Верф** — прадпрыемства, якое будуе і рамантуе судны.

**Ве́снічкі** — *адз. няма.* Вузкія дзверцы ў плоце; варотцы.

**Ве́тах** — Месяц у апошняй квадры, у адной з чатырох фаз, на зыходзе.

**Во́дар** — прыемны пах, духмянасць.

**Во́лкі** — вільготны, вогкі, сыры.

**Ву́сцішны** — 1. Ціхі, спакойны. 2. Страшны, жудасны.

**Вярста́**— 1. Мера даўжыні, роўная 1,06 км. 2. *уст.* Дарожны слуп, які абазначае гэту меру.

**Вясту́н** — той, хто сваім з'яўленнем нагадвае пра набліжэнне чаго-н. (*руск.* вестник).

**Га́за** — гаручая вадкасць, якая атрымліваецца пры перапрацоўцы нафты (*руск.* керосин).

**Гарэ́злівы** — вясёлы, спешчаны.

**Гасці́нец** [1] — рэч, ласунак, якім госць або блізкія частуюць каго-н. (*руск.* угощение).

**Гасці́нец** [2] — шлях, вялікая бойкая дарога, звычайна абсаджаная дрэвамі.

**Гумно́**— вялікая халодная будыніна для складвання і абмалоту зжатага збожжа, а таксама пляцоўка перад гэтай будынінай.

**Густ** — 1. Адчуванне, разуменне прыгожага. 2. Схільнасць да чаго-н. 3. Стыль, манера.

**ДАЇ** — дзяржаўная аўтамабільная інспекцыя.

**Дасканаласць** — найвышэйшая ступень і паўната станоўчых якасцей; узорнасць, беззаганнасць, бездакорнасць.

**Дастая́лы** — *дзеепрым. ад дзеясл.* дастаяць; пра збожжавыя: выспелы.

**Ды́бацць** — *разм.* Ісці размерна і важна або нязграбна. *На дыбачках (на дыбачкі)* – на кончыках пальцаў ног (падысці, стаць і пад.).

**Дзядзі́нец** — *уст.* 1. Цэнтральная частка старажытнага горада, умацаваная валамі. 2. Прасторны двор, агароджаны плац (звычайна перад маёнткам, царквой.

**Друз** — сукупнасць бітага камення, цэглы, шкла і пад.

**Дрэдно́ўт** — *уст.* Вялікі быстраходны браняносец з магутнай артылерыяй, папярэднік лінейнага карабля.

**Ду́жанне** — *дзеянне паводле дзеясл.* дужацца — мерацца сілай; схапіўшыся адзін з другім, старацца асіліць праціўніка.

**Дылета́нт** — той, хто займаецца чымсьці без спецыяльнай падрыхтоўкі.

**Дыяле́ктыка** — 1. Філасофскае вучэнне аб усеагульных законах руху і развіцця прыроды, чалавечага грамадства і мыслення. 2. *уст.* Майстэрства весці спрэчкі, выяўляючы супярэчнасці ў разважаннях праціўніка.

**Дыяметра́льны** — 1. Ад слова дыяметр – адрэзак прамой лініі, якая злучае дзве кропкі акружнасці і праходзіць праз яе цэнтр. 2. *кніжн.* У некаторых спалучэннях: поўны, дакладны. *Дыяметральная супрацьлегласць* — поўная супрацьлегласць.

**Дыяра́ма** — *спец.* 1. Карціна, намаляваная з двух бакоў тканіны, што прасвечваецца, матавага шкла, і спецыяльна асветленая для стварэння ўражання аб'ёмнасці. 2. Стужкападобная, загнутая паўкругам жывапісная карціна рэальнымі або бутафорскімі прадметамі на пярэднім плане.

**Еўрапео́ід** — чалавек, які належыць да еўрапейскай расы.

**Жарало́** — глыбокая адтуліна ў чым-н.

**Жвір** — буйназярністы жоўты пясок.

**Затулі́ць** — 1. Закрыць, засланіць чым-н.; засланіўшы, зрабіць нябачным. 2. Захінуць у што-н., схаваць.

**Змясто́ўны** — з багатым зместам, з вялікім унутраным сэнсам, значэннем, сутнасцю.

**Знячэ́ўку** — 1. Знянацку, нечакана. 2. Незнарок, мімаволі.

**Зо́лак** — пачатак світання; досвітак.

**Зрэ́б'е** — грубая кастра́вая кудзеля, што аддзяляецца пры трапанні лёну, пянькі, а таксама палатно з такой кудзелі і адзенне з такога палатна (*руск.* вере́тье, поско́нина, по́сконь).

**Зрэ́бны** — зроблены, пашыты са зрэб'я.

**Імправіза́цыя** — 1. Тое, што ствараецца без папярэдняй падрыхтоўкі, у час выканання. 2. Імправізаваны твор.

**Кадыфікава́ць** — класіфікуючы, звесці (зводзіць) у кодэкс, зрабіць (рабіць) кадыфікацыю.

**Калары́т** — 1. Спалучэнне фарбаў, колераў, якое стварае пэўнае адзінства ў карціне, каляровай гравюры, мазаіцы і пад. 2. *перан.* Сукупнасць характэрных рыс, своесаблівасць чаго-н.

**Калаўро́т** — прыстасаванне для ручнога прадзення, якое прыводзіцца ў рух панажом.

**Камунікаты́ўны** — які звязаны з перадачай інфармацыі пры дапамозе мовы.

**Канані́чны** — 1. Які з’яўляецца канонам (у 1 знач.). 2. Прызнаны царквой у якасці свяшчэннага пісання; які ўваходзіць у склад канона (у 3 знач.). 3. *кніжн.* Цвёрда ўстаноўлены, прыняты за ўзор.

**Кано́н** — 1. Правіла або сукупнасць правіл якога-н. напрамку, вучэння. 2. *кніжн.* Царкоўнае ўстанаўленне, правіла. 3. *спец.* Царкоўнае песнапенне ў пахвалу святога або свята.

**Капе́ж** — 1. Каплі дажджу або талага снегу, якія падаюць са стрэх (*руск.* капе́ль). 2. Ніжні край страхі, даху, які выдаецца над сцяной. 3. Месца падзення капель са стрэх.

**Каплі́ца** — малельня; невялічкая царква або касцёл з іконамі без алтара.

**Каржакава́ты** — 1. Нізкі, з тоўстым сукаватым ствалом у выглядзе карча́ (каржака́). 2. Каранасты, невысокі, шыракаплечы, моцнага целаскладу (пра чалавека).

**Кару́нкі** — *адз. няма.* Ажурныя, сятчастыя вырабы з нітак для аздобы бялізны, адзення; // *перан.* тое, што сваім выглядам нагадвае такі выраб.

**Като́к** — суквецце дробных кветак у выглядзе маленькіх пушыстых шарыкаў.

**Катэхі́зіс** — кароткі выклад хрысціянскага веравучэння ў пытаннях і адказах.

**Каўчэ́г** – 1. У біблейскай міфалогіі: судна, у якім Ной выратаваў людзей і жывёл ад сусветнага патопу. 2. У праваслаўнай царкве: скрынка для захоўвання некаторых асабліва каштоўных рэчаў.

**Каштары́с** — фінанасавы дакумент для вызначэння і планавання выдаткаў і прыбыткаў.

**Кво́лы** — 1. Фізічна не развіты́, слабага здароўя; які дрэнна развіваецца, расце (пра расліны). 2. Невялікі па сіле, напружанасці (пра полымя, вецер, голас).

**Ке́ліх** — вялікая, звычайна высокая чарка.

**Клішэ́** — 1. Штамп; рэльефны малюнак, чарцёж, план на металічнай ці драўлянай дошцы для ўзнаўлення ў друку (*цынкавае клішэ*). 2. Збітая фраза, хадзячы выраз, штамп.

**Кля́штар** — каталіцкі манастыр.

**Ко́нік** [1] — *памянш.-ласк. да* конь; невялікі конь.

**Ко́нік** [2] — насякомае, якое скача і стракоча крыламі (*руск.* кузнечик).

**Кра́ска** — кветка.

**Крэазо́т** — прадукт сухой перагонкі драўніны — масляністая вадкасць з пахам драўніннага дзёгцю, якая выкарыстоўваецца ў медыцыне і тэхніцы.

**Крэо́л —** нашчадак першых іспанскіх і партугальскіх каланізатараў у Лацінскай Амерыцы.

**Лексіко́н —** 1. *уст*. Слоўнік. 2. Запас слоў і выразаў.

**Ло́таць —** расліна сямейства казяльцовых з жоўтымі кветкамі, якая расце на балотах, берагах сажалак і інш.

**Лоўж —** куча сухога галля.

**Лу́бін —** расліна сямейства бабовых (*руск.* люпи́н).

**Ля́хі,** *адз.* **лях —** *уст*. палякі.

**Ма́жны —** дзябёлы, моцнага целаскладу.

**Мае́масць —** рэчы, прадметы, каштоўнасці, якія належаць каму-н.; знаходзяцца ў чыім-н. уладанні.

**Мае́нтак —** зямельнае ўладанне памешчыка.

**Манагра́фія —** навуковы твор, што даследуе адно якое-небудзь пытанне, асвятляе адну тэму.

**Мані́сты —** *адз. няма*. Упрыгожанне з пацерак, манет, каштоўных камянёў, якое жанчыны носяць на шыі.

**Маста́к —** 1. Творчы работнік у галіне выяўленчага мастацтва (жывапісец, графік, скульптар). 2. Чалавек, які творыць у галіне мастацтва, літаратуры. 3. Пра таго, хто дасягнуў высокай дасканаласці ў якой-н. справе.

**Мацу́нак —** 1. Уласцівасць моцнага; моц, трываласць. 2. Тое, чым можна падмацавацца, чаго можна пад’есці.

**Мех** [1] **—** мяшок; прадмет для захоўвання і перавозкі сыпучых рэчываў, дробных рэчаў.

**Мех** [2] **—** прыстасаванне для нагнятання паветра (у кавальскай, шкляной вытворчасці, у некаторых музычных інструментах).

**Мітка́ль —** самая простая тонкая баваўняная тканіна.

**Мол** – партовае збудаванне ў выглядзе высокага і доўгага вала, якое засцерагае параходы ад марскіх хваль.

**Мэ́ндлік —** бабка; пяць снапоў ячменю, аўса, пастаўленых у кучкі для прасушкі і накрытых распасцёртым снапом зверху.

**На́валач** – 1. Хмары, туман, смуга. 2. Зброд, варожыя людзі *(пагард.)* 3. *перан.* напасць.

**Насе́льнік —** той, хто насяляе пэўную тэрыторыю.

**Наўпро́ст —** нацянькі; прама, найкарацейшым шляхам.

**Нацянькі́ —** прама, наўпрост, самым кароткім шляхам.

**Нашча́дак —** 1. Чалавек у адносінах да сваіх продкаў. 2. *мн.* Будучыя пакаленні. 3. Сын, наследнік або наогул сваё дзіця.

**Нэ́ндза —** 1. *разм.* Галеча, беднасць, незабяспечанасць сродкамі існавання. 2. *аг. р.* Той (тая), хто ўвесь час ные, скардзіцца. 3. Нуда́.

**Няве́чыць —** калечыць каго-н., наносячы фізічныя пашкоджанні; // *перан.* аказваць дрэнны ўплыў на каго-н.; псаваць.

**Паве́ць** — 1. Пляцоўка пад дахам на слупах для хавання чаго-н. ад дажджу, непагоды. 2. Памяшканне, дзе звычайна складваюць дровы.

**Пагаблява́ны** — апрацаваны гэблем, рубанкам; гладкі, струганы.

**Пага́нскі** — *уст.* Нехрысціянскі, якой-н. іншай веры.

**Падбухто́рыць** — 1. Падбіць што-н. зрабіць (звычайна дрэннае). 2. Настроіць супраць каго-н.

**Падле́сак** — кусты і маладыя дрэвы ў лесе, якія не дасягнулі вышыні асноўнага лясного масіву, маладняк.

**Падсо́чка** — *спец.* Аадразанне дрэў для атрымання жывіцы, соку.

**Палане́з** — польскі ўрачысты танец-шэсце, а таксама музыка ў яго рытме.

**Палані́зм** — слова або выраз, запазычаныя з польскай мовы.

**Палеагра́фія** — навука аб развіцці пісьменства і старажытных рукапісах, мэта якой — вызначыць час і месца іх узнікнення паводле знешняга выгляду і пісьма.

**Пале́так** — участак поля, які выкарыстоўваецца пад пасевы.

**Пало́ва**[1] — *разм.* 1. Адна з дзвюх роўных частак чаго-н. 2. Сярэдзіна якой-н. адлегласці, прамежка часу і пад.

**Пало́ва**[2] — рэшткі, якія застаюцца пры абмалоце збожжа і ачыстцы зерня; мякіна.

**Пало́ззе** — *зб. да* полаз — дзве ніжнія часткі саней у выглядзе загнутай спераду драўлянай або металічнай паласы.

**Парка́ль** — лёгкая баваўняная тканіна.

**Паса́г** — маёмасць, якую давалі бацькі́ або родзічы маладой, калі тая выходзіла замуж (*руск.* приданое).

**Па́сма** — 1. Некалькі нітак або валокнаў, складзеных удоўж. 2. Пучок валасоў, якога-н. валакністага матэрыялу, шэрсці.

**Патэнцыя́льны** — магчымы; які існуе ў скрытым выглядзе і можа праявіцца пры пэўных умовах.

**Па́церкі** — *адз.* па́церка. 1. Невялічкія прадметы з бурштыну, шкла і пад. з дзірачкай пасярэдзіне для працягвання ніткі (*руск.* бусы) . 2. Кара́лі; упрыгожанне з такіх прадметаў.

**Пі́сьменнасць** — 1. Сістэма графічных знакаў, якія ўжываюцца для пісьма. 2. Сукупнасць пісьмовых помнікаў якой-н. гістарычнай эпохі пэўнага народа.

**Пісьме́ннасць** — пі́сьменнасць: 1. Уменне чытаць і пісаць. 2. Адсутнасць граматычных і стылістычных памылак.

**Пісьме́нства** — 1. Сукупнасць моўных і графічных сродкаў пісьмовых зносін. 2. Сукупнасць пісьмовых помнікаў якой-н. гістарычнай эпохі пэўнага народа.

**Пе́рнік** — салодкае печыва на мёдзе, патацы або цукры з духмянымі прыправамі (*руск.* пряник).

**Пе́трацьʼ** — 1. Высыхаючы, страчваць свае якасці, колер і пад. 2. *перан.* Рабіцца худым, сухім.

**По́быт** — 1. Быт. 2. Знаходжанне, прабыванне дзе-н.

**По́ліўка** — 1. Страва з якой-н. прыправай. 2. Рэдкая частка якой-н. ежы.

**По́плаў** — луг у пойме ракі.

**Постпазіцы́йны** — які знаходзіцца пасля іншага слова або сказа, звязанага з ім.

**По́шчак** — 1. Пералівісты дрыжачы гук; трэль (*руск.* дробь). 2. Водгук, рэха.

**Прадпіса́ць** — аддаць распараджэнне, загадаць, зрабіць абавязковым.

**Праславя́нскі** — які належыць да старажытнага, агульнага для ўсіх славян перыяду іх гісторыі.

**Пру́гкі** — 1. Які не паддаецца сцісканню, згінанню. 2. Не друзлы, не вялы; крамяны, моцны. 3. Лёгкі, спружыністы (пра рухі).

**Прыва́тны** — 1. Які з’яўляецца асобнай часткай чаго-небудзь, не агульны, не тыповы. 2. Асабісты, не грамадскі, не дзяржаўны. 3. Які належыць пэўнай асобе, не грамадству, не дзяржаве. 4. Які мае адносіны да асабістага, індывідуальнага.

**Прыла́знік** — памяшканне для раздзявання ў лазні.

**Прыса́ды** — *адз. няма.* Дрэвы, пасаджаныя вакол дарогі, вуліцы, будынкаў.

**Пры́сак** — гарачы, распалены попел, які застаецца пасля згарання, спальвання чаго-н.

**Публіцы́стыка** — жанр (творы гэтага жанру) грамадска-палітычнай літаратуры на тэмы сучаснасці.

**Пэ́ндзаль** — пучок шчаціння або шэрсці, прымацаваны да ручкі, для нанясення фарбы, клею і пад. (*руск.* кисть).

**Ранцье́** — той, хто жыве на працэнты ад пазыкі капіталу, з даходаў ад акцый.

**Ра́ут** — *уст.* Урачысты, званы вечар, прыём.

**Ру́піць і ру́пець** — 1. Карцець; хацецца; пра неадольнае жаданне рабіць што-н. 2. Турбаваць, не даваць спакою.

**Рэзюме́** — кароткі выклад зместу артыкула, прамовы; кароткі вывад са сказанага.

**Са́жань** — старая руская і беларуская мера даўжыні, роўная 3 аршынам (2, 13 м).

**Сацыялінгві́стыка** — раздзел мовазнаўства, які даследуе праблемы, звязаныя з сацыяльнай (грамадскай) прыродай мовы, яе грамадскімі функцыямі і ўздзеяннем сацыяльных фактараў на мову.

**Сі́вер** — халодны паўночны вецер.

**Сіло́** — 1. Прыстасаванне ў выглядзе петляў для лоўлі птушак і дробных жывёлін. 2. *перан.* Тое, што пазбаўляе волі; пастка.

**Скарб** — 1. Грошы, каштоўныя рэчы. 2. *перан.* Пра тое, што ма́е асабліва вялікую вартасць; духоўныя і культурныя каштоўнасці. 3. Багацце, маёмасць.

**Славі́ст** — спецыяліст у галіне славянскай філалогіі, славяназнаўства.

**Слата́ (сло́та)** — 1. Сырое надвор'е з дажджом і мокрым снегам. 2. *перан.* Пра чалавека, які надакучае, прыстае.

**Спакусі́ўшыся** — *дзеепрысл. ад дзеясл.* спакусіцца — не ўстаяць перад якім-н. жаданнем, спакусай (*руск.* соблазнившись).

**Спор** — удача, поспех у працы.

**Спо́рны** — 1. Які спорыцца, хуткі, паспяховы (пра дзейнасць, працу). 2. Часты (пра снег, дождж), які хутка змочвае або пакрывае зямлю.

**Ста́лы** — 1. Які стаў дарослым, дасягнуў поўнага развіцця. 2. Вопытны, які дасягнуў майстэрства ў чым-н. 3. Пастаянны, нязменны, разлічаны на доўгі час, не часовы.

**Стрыно́жыць** — *зак. да* **трыножыць** (трыног∅а ← тры нагі) — звязваць путам пярэднія ногі каня́ з адной задняй.

**Столь** — верхняе ўнутранае пакрыццё памяшкання, процілеглае падлозе (*руск.* потолок).

**Стро́мы** — *прым.* Вельмі круты (стро́ма *наз.* — круты схіл, абрыў).

**Сумё́т** — намеценая ветрам гурба снегу.

**Сумяці́цца** — утвараць сумятню́ — бязладную мітусню, беганіну.

**Су́тнасць** — самае істотнае, галоўнае, унутраны змест чаго-н.

**Суто́нне** — паўзмрок; час пасля заходу сонца перад надыходам ночы.

**Суцэ́льны** — 1. Які цягнецца без прамежкаў, цалкам займае сабой усю прастору. 2. Паўсюдны, усеагульны. 3. Зроблены з аднаго кавалка; не састаўны.

**Тапані́мія** — сукупнасць геаграфічных назваў (населеных пунктаў, рэк, азёр і інш.) якой-н. мясцовасці.

**Таўтало́гія** — абазначэнне названага паняцця іншым, якое не ўдакладняе сэнсу сказанага.

**То́есны** — зусім падобны, аднолькавы, такі ж.

**Транскры́пцыя** — дакладная перадача на пісьме ўсіх асаблівасцей жывой гаворкі літарамі алфавіта і некаторымі спецыяльнымі знакамі.

**Трыумвіра́т** — 1. Саюз трох дзяржаўных дзеячаў для ажыццяўлення захопу вярхоўнай улады. 2. *перан.* Пагадненне трох асоб для сумеснай дзейнасці, звычайна палітычнай.

**Тын** — агароджа з вертыкальных або папярочных жэрдак, пераплеценых прутамі лазы.

**Тэза́ўрус** — 1. Аднамоўны слоўнік, які поўна ахоплівае лексіку пэўнай мовы. 2. Поўны, семантычна сістэматызаваны галіновы тэрміналагічны слоўнік, прызначаны для інфармацыйнага пошуку.

**Увачаві́дкі —** 1. Хутка, на вачах, імгненна. 2. Сваімі вачамі, асабіста (*руск.* воочию).

**Уві́шнасць —** уласцівасць увішнога, жвавасць, спрытнасць.

**Удзе́л —** сумесная дзейнасць пры выкананні чаго-н.; супрацоўніцтва.

**Уе́зд —** 1. *Дзеянне паводле дзеясл.* уехаць. 2. Месца, праз якое ўязджаюць.

**Укле́нчыць —** стаць на калені (на калена).

**Унікум —** рэдкі, адзіны ў сваім родзе экземпляр (прадмет або чалавек).

**Уро́да —** натура, характар; прырода.

**Уро́чышча —** любая частка мясцовасці, якая адрозніваецца чым-н. ад навакольных тэрыторый і звычайна мае сваю назву.

**Факсі́міле —** 1. Дакладна ўзноўлены, у дакладнай рэпрадукцыі. 2. Клішэ, пячатка з чым-н. подпісам.

**ФАП —** фельчарска-акушэрскі пункт.

**Флеш —** старадаўняе палявое ўмацаванне ў выглядзе тупога вугла.

**Ханжа́ —** *разм.* крывадушнік; прытворна дабрадушны ці прытворна набожны чалавек.

**Цвіль —** 1. Плесневы налёт на чым-н., які ўзнікае ад сырасці, гніення і пад.; (на вадкасці) бросня. 2. *перан.* Аб чым-н. застойным, шкодным.

**Цурча́ць** і **цурчэ́ць —** 1. Цячы, ліцца цуркам (*руск.* журчать, струиться). 2. Утвараць гукі булькання, пералівання (пра вадкасць).

**Цыні́чны —** бессаромны, нахабны.

**Цьмець —** 1. Цьмяна гарэць, ледзь свяціцца. 2. Станавіцца менш выразным, менш яскравым. 3. Вылучацца цьмяным колерам, цямнецца.

**Цю́ркскі —** які мае адносіны да групы роднасных па мове народаў, да якіх адносяцца татары, азербайджанцы, узбекі, казахі, кіргізы, туркі, туркмены і інш.

**Чы́ннасць —** 1. Дзейнасць. 2. Уласцівасць чыннага.

**Шрот —** дробныя свінцовыя шарыкі, якія разам з порахам служаць зарадам для стрэльбы; // пра тое, што знешнім выглядам нагадвае такія шарыкі (*руск.* дробь).

**Штыке́ціна —** адна планка ў штыкетніку (у плоце).

**Шы́галле —** *абл.* ігліца.

**Шы́зы —** шэра-блакітны, цёмна-шэры з сіняватым адлівам.

**Экслі́брыс —** па-мастацку афармлены кніжны знак, які наклейваецца на ўнутраным баку вокладкі кнігі і паказвае на прыналежнасць яе ўладальніку.

**Эліны —** назва старажытных грэкаў.

**Этнагра́фія** — 1. Навука, аб’ектам вывучыэння якой з’яўляецца матэрыяльная і духоўная культура народаў і іх культурна-гістарычныя ўзаемаадносіны. 2. Сукупнасць усіх асаблівасцей быту, культуры, звычаяў якога-н. народа, мясцовасці і пад.

**Этымало́гія** — 1. Раздзел мовазнаўства, які вывучае паходжанне і роднасныя сувязі слоў. 2. Паходжанне таго ці іншага слова ці выразу.

**Язмі́н** — дэкаратыўны куст сямейства каменяломнікавых з белымі пахучымі кветкамі, сабранымі ў гронкі (*рус*. жасмин).

# УМОЎНЫЯ СКАРАЧЭННІ

Ад. — А. Адамовіч
А. Ж. — А. Жук
Ак. — В. Аколава
А. К. — А. Куляшоў
Ал. — А. Александровіч
А. Л. — А. Лойка
А. М. — А. Мальдзіс
А. П. — А. Пысін
А. Р. — А. Разанаў
Б. — Я. Брыль
Багд. — М. Багдановіч
Бар. — Р. Барадулін
Б.-З. — Д. Бічэль-Загнетава
Бр. — П. Броўка
Буг. — Д. Бугаёў
Бур. — Г. Бураўкін
В. А. — В. Адамчык
Вар. — А. Варановіч
Вас. — А. Васілевіч
В. Б. — В. Быкаў
В. В. — В. Вольскі
В. Г. — В. Гігевіч
В. Ж. — В. Жуковіч
Віт. — В. Вітка
В. К. — В. Карамазаў
В. Р. — В. Русілка
Вяр. — В. Вярба
Вярц. — А. Вярцінскі
Г. В. — Г. Вязіцкая
Ген. — Л. Геніюш
Гіл. — Н. Гілевіч
Гл. — П. Глебка
Грах. — С. Грахоўскі
Грам. — І. Грамовіч
Г. Ш. — Г. Шыловіч
Дал. — Г. Далідовіч
Дам. — У. Дамашэвіч
Дуд. — А. Дудараў
Жур. — А. Жураўскі
Заг. — Н. Загорская
Зар. — М. Зарэцкі
Зв. — А. Звонак
"Зв." — "Звязда"
І . Л. — І . Ляшкевіч
І. М. — І. Мележ
І. Н. — І. Навуменка
Іп. — В. Іпатава
І. С. — І. Сяркоў
Каж. — А. Кажадуб
Каз. — В. Казько
Кам. — К. Камейша
Кап. — М. Капыловіч
Кар. — В. Каржанец
Каратк. — У. Караткевіч
Карж. — Г. Каржанеўская
К. Б. — К. Буйло
Кір. — К. Кірэенка
К-н — В. Коўтун
Кр. — У. Краўчанка
Крап. — К. Крапіва
К-с — Я. Колас
Кудр. — А. Кудравец
Кул. — А. Кулакоўскі
Куп. — Я. Купала
Кус. — М. Кусянкоў
К. Ч. — К. Чорны
Л. Д. — Л. Дайнека
Луж. — М. Лужанін
Лупс. — М. Лупсякоў
Лыньк. — М. Лынькоў
Ляўк. — А.Ляўковіч
Марц. — А. Марціновіч
М. В. — М. Вайцяшонак
М. Д. — М. Дукса
Мік. — Б. Мікуліч
М. К. — М. Калачынскі
М. Л. — М. Лобан
М. П.— М. Паўленка
М. Т. — М. Танк
Ненад. — А. Ненадавец
Неп. — Я. Непачаловіч
Н. М. — Н. Мацяш

Панч. — П. Панчанка
Парх. — Я. Пархута
Пасл. — М. Паслядовіч
Пестр. — П. Пестрак
Пісьм. — А. Пісьмянкоў
П. М. — П. Макаль
Пр. — Прыказка
Пруд. — П. Пруднікаў
Прых. — П. Прыходзька
Пташн. — І. Пташнікаў
Р. — А. Русак
Рак. — М. Ракітны
Рам. — М. Раманюк
Р. Б. — Р. Баравікова
Р. Н. — Р. Няхай
С. А. — С. Александровіч
Саб. — Р. Сабаленка
Сал. — А. Салтук
Сам. — Э. Самуйлёнак
Сач. — Б. Сачанка
С. З. — С. Законнікаў
Скр. — Я. Скрыган
Стар. — В. Старычонак
Стах. — А. Стаховіч
Стр. — М. Стральцоў
Т. Б. — Т. Бондар
Тр. — П. Трус
У. А. — У. Арлоў
У. В. — У. Верамейчык
У. Г. — У. Глушакоў
У. Ж. — У. Жылка
У. К. — У. Калеснік
У. П. — У. Паўлаў
Хадк. — Т. Хадкевіч
Хв. — М. Хведаровіч
Ц. Г. — Ц. Гартны
Шам. — І. Шамякін
Шаш. — А. Шашкоў
Шн. — В. Шніп
Ю. С. — Ю. Станкевіч
Я. Д. — Я. Дыла
Як. — А. Якімовіч
Я. М. — Я. Маўр
Янішч. — Я. Янішчыц
Я. П. — Я. Пушча
Я. С. — Я. Сіпакоў

# ЗМЕСТ

**ФАНЕТЫКА. АРФАЭПІЯ. ГРАФІКА. АРФАГРАФІЯ** 4
Прынцыпы беларускай арфаграфіі ........................................... 9
Правапіс галосных *О, Э – А; Е, Ё – Я* ........................................ 10
Правапіс галосных у складаных словах ........................................ 12
Правапіс спалучэнняў галосных у іншамоўных словах .................. 13
Правапіс *У, Ў* пасля галосных у іншамоўных словах ..................... 16
Правапіс прыстаўных галосных і зычных .................................... 18
Правапіс зычных і іх спалучэнняў .............................................. 19
Правапіс *Д- Дз, Т- Ц* ............................................................... 21
Правапіс прыставак. Правапіс *І, Ы, Й* пасля прыставак .................. 22
Правапіс падоўжаных зычных. Марфалагічнае падваенне ............... 24
Правапіс мяккага знака і апострафа ........................................... 26
Ужыванне вялікай літары ........................................................... 27
Правапіс складаных назоўнікаў .................................................. 31
Правапіс складаных прыметнікаў ................................................ 33
**ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ. МАРФЕМІКА** 39
Марфемная будова слова ............................................................ 43
Аснова, яе віды ......................................................................... 46
**СЛОВАЎТВАРЭННЕ** 50
Спосабы словаўтварэння ............................................................ 53
**МАРФАЛОГІЯ** 59
Сістэма часцін мовы .................................................................. 59
Прынцыпы размежавання слоў па часцінах мовы ........................... 61
Род і лік назоўнікаў .................................................................... 63
Тыпы назоўнікавага скланення .................................................... 68
Канчаткі назоўнікаў 1-га скланення на ***-а (-я)*** .......................... 68
Канчаткі рознаскланяльных назоўнікаў на ***-а (-я)*** ......................... 69
Правапіс канчаткаў назоўнікаў м. р. 2-га скланення ........................ 71
Ступені параўнання прыметнікаў ................................................. 78
Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі ................................. 82
Ужыванне некаторых займеннікаў ................................................ 86
Правапіс асабовых канчаткаў дзеясловаў ...................................... 91
Утварэнне і ўжыванне дзеепрыметнікаў........................................ 96
Утварэнне і ўжыванне дзеепрыслоўяў ........................................... 100
Правапіс прыслоўяў і блізкіх да іх спалучэнняў .............................. 103
Правапіс часціц .......................................................................... 104
**СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ** 111
**СЛОВАЗЛУЧЭННЕ** ................................................................... 111
**ПРОСТЫ СКАЗ** ...................................................................... 115
Віды сказаў паводле структуры і мэты выказвання ......................... 115
Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам ...................................... 121

Просты сказ ускладненай будовы .................................................. 124
Сказы з аднароднымі членамі .................................................. 126
Сказы з адасобленымі членамі .................................................. 130
Адасобленыя азначэнні .................................................. 130
Адасобленыя прыдаткі .................................................. 134
Адасобленыя акалічнасці і дапаўненні .................................................. 140
Сказы з параўнальнымі зваротамі .................................................. 143
Сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі .................................................. 147
Сказы са звароткамі .................................................. 151
**СКЛАДАНЫ СКАЗ** .................................................. 154
Складаназлучаныя сказы .................................................. 156
Складаназалежныя сказы .................................................. 160
Бяззлучнікавыя складаныя сказы .................................................. 169
Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак .................................................. 173
Спосабы перадачы чужой мовы .................................................. 176
Канструкцыі з простай мовай .................................................. 176
Ускосная мова .................................................. 180
Пунктуацыя .................................................. 183
**ПАДРЫХТОЎКА ДА ДЫКТАНТА** .................................................. 189
**ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЕРАКАЗУ** .................................................. 200
**ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЕРАКЛАДУ** .................................................. 208
**Дадатак 1. ВІДЫ МОЎНЫХ РАЗБОРАЎ** .................................................. 210
Фанетычны разбор .................................................. 210
Марфемны разбор .................................................. 210
Словаўтваральны разбор .................................................. 212
Марфалагічны разбор .................................................. 213
Сінтаксічны разбор словазлучэння .................................................. 218
Сінтаксічны разбор простага сказа .................................................. 219
Сінтаксічны разбор складанага сказа .................................................. 220
**Дадатак 2. СЛОЎНІК НАЦІСКАЎ** .................................................. 225
**Дадатак 3. ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК** .................................................. 230
Умоўныя скарачэнні .................................................. 240